ШТОМЕСЯЧНЫ НАВУКОВЫ І МЕТАДЫЧНЫ ЧАСОПІС

Родное слова

2008/1
(241)
студзень

ЗАСНАВАЛЬНІК:
МІНІСТЭРСТВА
АДУКАЦЫІ
РЭСПУБЛІКІ
БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА
«РЭДАКЦЫЯ ЧАСОПІСА
“РОДНАЕ СЛОВА”»

Часопіс выходзіць
з 1988 года
(у 1988 – 1991,
№№ 1 – 48,
выдаваўся пад назвай
**“Беларуская мова
і літаратура ў школе”**)

Галоўны рэдактар
кандыдат
філалагічных навук,
дацэнт
Уладзімір КУЛІКОВІЧ

Рэдакцыйная калегія

доктар філалагічных навук М. Прыгодзіч (намеснік)
доктар філалагічных навук В. Максімовіч (намеснік)
доктар мастацтвазнаўства Т. Габрусь
доктар філалагічных навук У. Гніламёдаў
доктар мастацтвазнаўства В. Дадзіёмава
доктар філалагічных навук В. Іўчанкаў
доктар гістарычных навук, доктар архітэктуры А. Лакотка
доктар філалагічных навук А. Ліс
доктар філалагічных навук А. Лукашанец
доктар мастацтвазнаўства У. Мартынаў
доктар філалагічных навук І. Казакова
доктар філалагічных навук А. Ненадавец
доктар філалагічных навук В. Новак
доктар мастацтвазнаўства В. Нячай
доктар філалагічных навук В. Рагойша
доктар філалагічных навук І. Роўда
доктар філалагічных навук І. Саверчанка
доктар філалагічных навук В. Старычонак
доктар філалагічных навук М. Тычына
доктар філалагічных навук І. Чарота
доктар філалагічных навук Т. Шамякіна
доктар педагагічных навук М. Яленскі

Навуковыя кансультанты

Г. Адамовіч, Р. Аладава, М. Аляхновіч,
Г. Арцямёнак, А. Багданава, З. Бадзевіч,
Т. Казакова, В. Карамазаў, У. Каяла, І. Крук,
В. Лемцюгова, І. Лепешаў, А. Лойка,
Е. Лявонава, В. Ляшук, В. Ляшчынская,
А. Макарэвіч, У. Мархель, З. Мельнікава,
П. Міхайлаў, М. Мішчанчук, А. Міхневіч,
М. Мушынскі, М. Новік, В. Рагаўцоў, В. Русілка,
У. Рынкевіч, У. Сенькавец, А. Солахаў, А. Станкевіч,
П. Сцяцко, Т. Тамашэвіч, Н. Усава, І. Штэйнер

Рэдакцыйная рада

Р. Бабашка, М. Бубешка, М. Жуковіч,
Р. Ільіна, В. Кажура, Л. Лазарчык,
Н. Левічава, З. Падліпская, А. Панфіленка,
Т. Прадзед, А. Тарайковіч, І. Таяноўская

Над нумарам працавалі

рэдактары:

Віктар Жыбуль (*Літаратура і час:* Імгненне і вечнасць, Сусветная літаратура, Літаратура ў кантэксце жыцця, Лабараторыя паэта, Паэтычны кругабег, На скрыжаванні культур, ВНУ – школе, Настаўнік прапануе; *Алімпіяды. Конкурсы. Іспыты:* Водгук на мастацкі твор; *Будні педагога:* Вясёлы перапынак),

Эдвард Карбановіч (*Літаратура і час:* Тэорыя літаратуры, Звесткі для энцыклапедыі; *Мовы рысы непаўторныя:* Мова мастацкіх твораў),

Крысціна Пучынская (*Літаратура і час:* Старажытная літаратура; *Мовы рысы непаўторныя:* Падагульняльны ўрок; *Алімпіяды. Конкурсы. Іспыты:* Вуснае выказванне; *Калі закончыўся ўрок:* Школа юнага журналіста; *Будні педагога:* Адрасы педагагічнага майстэрства; *Нацыянальная і сусветная культура:* Мастацтва ў кантэксце часу, Рупліўцы, Дыялог з карцінай, Беларускія мудрагелінкі; Крыжаванка, Каляндар памятных датаў і юбілейных дзён),

Ларыса Сагановіч (*Мовы рысы непаўторныя:* З гісторыі назвы, Свет моў і святло мовы, Новае ў методыцы, Віншуем!, Віншуем з юбілеем!, Функцыянальная стылістыка, Кірунак сказаў, Паслухаем мовазнаўцаў, Дыдактычны матэрыял, Кладзі слова ў лад, Крытыка і бібліяграфія; *Падзея:* Разам з краінай),

Тамара Саўчук (*Мовы рысы непаўторныя:* З вопыту настаўніка, Моўныя самацветы; *Алімпіяды. Конкурсы. Іспыты:* Рыхтуемся да тэсціравання, Рыхтуемся да алімпіяды),

Вольга Сідарава (*Калі закончыўся ўрок:* Беларусь – мая Радзіма),

намеснік галоўнага рэдактара **Людміла Бохан,**
адказны сакратар **Дзмітрый Літвіненка,**
дзяжурны рэдактар **Ларыса Сагановіч,**
літаратурны рэдактар **Алена Высоцкая,**
камп’ютэрны набор **Наталлі Ярмоленкі,**
камп’ютэрная вёрстка **Канстанціна Лісецкага,**
галоўны бухгалтар **Святлана Яфімчык,**
вядучы бухгалтар **Вікторыя Вальковіч,**
загадчык рэдакцыі **Галіна Сташэўская.**

Аўтар вокладкі – мастак, кандыдат мастацтвазнаўства **Уладзімір Рынкевіч.**

Змест

Куліковіч Уладзімір. Зварот да чытачоў 3
Карбановіч Эдвард. З гісторыі часопіса "Роднае слова" ... 3
Нас віншуюць 5

ЛІТАРАТУРА І ЧАС

Саверчанка Іван. Ранні помнік прыгожага пісьменства Беларусі 11
Слова пра славянскія плямёны, іх звычаі і пісьменства (*пераклад І. Саверчанкі*) 14
Зенава Галіна. Эвалюцыя жанру апавядання ў працэсе мастацкага асэнсавання рэчаіснасці канца XX ст. ... 17
Янушкевіч Язэп. Калі Халімон ездзіў на каранацыю?: Быліца "Халімон на каранацыі" Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча 22
Содаль Уладзімір. Фотаздымак на вякі: З гісторыі аднаго здымка Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча 24
Бярозка Аляксандр. Бязмерная шчырасць пісьменніка: міф ці праўда?: З гісторыі жанру літаратурнай споведзі 26
Курыленка Галіна. Унікальная форма самавыяўлення: Элементы споведзі ў творах беларускай літаратуры ... 29
Касатая Карына. Гукапісная фактура вершаў Еўдакіі Лось 30
Гальпяровіч Навум. "Трэба жыць па-за ўзростам…": Вершы 33
Вальчук Алена. Перасягнуўшы ўсходні полюс: Беларуская прастора драмы "Вялікі князь Маскоўскі і пераследаваны імператар" Лопэ дэ Вэгі 34
Трус Мікола. Памятнае гасцяванне ў славацкім мястэчку Святы Юр 36
Труцько Вікторыя. Асаблівасці аналізу апавядання "Мэры Кэт" Міколы Лупсякова: VII клас 39
Навумчык Мікалай. Твор "Нямоглы бацька" Уладзіміра Караткевіча: Абагульняльны ўрок у форме тэста ў VI класе 44

МОВЫ РЫСЫ НЕПАЎТОРНЫЯ

Лемцюгова Валянціна. Чаму ты белая, Белая Русь? ... 47
Кананенка Дзмітрый. Неасвоеныя словы нямецкага паходжання ў сучаснай беларускай прозе 51
Міхневіч Арнольд. Стракатая лінгвістычная энцыклапедыя 53
Зелянко Вольга. Лінгвакультуралагічны падыход да навучання беларускай мове 55
Міхайлаў Павел. Педагог, навуковец, асоба: Да 80-годдзя Анатоля Бардовіча 58
Крыўко Мікалай. Слова пра Георгія Юрчанку 60
Старасценка Таццяна. Афіцыйна-справавы стыль: Тэма 1 61
Старасценка Таццяна. Шчодрасць яе душы: Да юбілею Клары Панюціч 64
Важнік Сяргей. Нацыянальная сінтаксічная ідыяматыка: Прэм'ера рубрыкі 65
Філімонава Наталля. Падарожжа па краіне Лексіка: Урок-падагульненне (з выкарыстаннем элементаў гульнёвай тэхналогіі). V клас 67
Барысаў: Дыдактычны матэрыял 71
Кніга Галіна. Падарожжа па краіне Прыметнік. VI клас ... 73
Перавалава Наталля. *Адкрыць* ці *адчыніць*? 77

АЛІМПІЯДЫ. КОНКУРСЫ. ІСПЫТЫ

Куліковіч Уладзімір. Кантрольныя тэсты для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання ў 2007/2008 навучальным годзе: Фанетыка. Графіка 78
Куліковіч Уладзімір. Матэрыялы для правядзення другога (раённага, гарадскога) этапу алімпіяды па беларускай мове і літаратуры ў 2007/2008 навучальным годзе: XI клас 82
Падпорынава Любоў. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч: Вуснае выказванне 86
Красоўскі Сяргей. Асуджаны на неўміручасць: Досвед прачытання аднаго верша ["Уладзімір Караткевіч" В. Жуковіча] 87

КАЛІ ЗАКОНЧЫЎСЯ ЎРОК

Падаляк Таццяна. Рэпарцёр атрымаў заданне…: Спецыфіка рэпартажу ў сучаснай прэсе 91
Красоўская Алена. "Вежы замкаў у неба лятуць…": Вусны часопіс. VIII клас 93

БУДНІ ПЕДАГОГА

Кавалевіч Зінаіда. Умее кіраваць срабрыстым караблём [Галіна Кніга] 97
Шабовіч Мікола. Пародыі: Вясёлы перапынак 98

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ І СУСВЕТНАЯ КУЛЬТУРА

Багданава Аксана. Партрэтаваны летапіс эпохі: Да 100-годдзя з дня нараджэння Заіра Азгура 99
Марозава Таццяна. Нястомны збіральнік фальклорных скарбаў: Канферэнцыя да 115-годдзя з дня нараджэння Рыгора Шырмы 102
Карамазаў Віктар. Зімовы сон: Эсэ 104
Харак Аляксей. Вітольд Бялыніцкі-Біруля 105
Казакова Ірына. Прыйшлі калядкі – бліны ды аладкі ... 106

ПАДЗЕЯ

Лукашанец Аляксандр. Моўныя праблемы жыцця сучаснага беларускага грамадства: Даклад на гуманітарнай секцыі Першага з'езда вучоных Рэспублікі Беларусь 108

Целеш Лявон. Крыжаванка "Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч" 112

Крытыка і бібліяграфія. **Фацеева С.** Доўгачаканыя выданні: Пра кнігі "Школьны марфемны слоўнік беларускай мовы" *А. Бардовіча, Л. Мормыш, Л. Шакуна* і "Школьны словаўтваральны слоўнік беларускай мовы" *А. Бардовіча, М. Круталевіча, А. Лукашанца* (58).
Гуліцкая В., Пісарэнка А. Імя: гісторыя і сучаснасць: Пра кнігу "Віцебшчына ва ўласных імёнах: мінулае і сучаснасць" *Г. Мезенкі, В. Ляшкевіч, Г. Семяньковай* (76).
Паэтычная старонка. *Гальпяровіч Н.* "Як звычайна і проста…". "Мне падарожжы наталяюць розум…". "Пажар рабін палае зноў…". "Намалюй мяне, мастак…" (33). *Шабовіч М.* Зацалаваны світэр. Што было – тое было. Хор болей не спявае. Камейша. Па візу – да Ермалаева (98).
Каляндар памятных датаў і юбілейных дзён на 2008 год: Сакавік (28, 43).

У адпаведнасці з Законам аб друку аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць прыведзеных у артыкуле фактаў і звестак.
Рэдакцыя пакідае за сабой права друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

ПАВАЖАНЫЯ КАЛЕГІ!



Уладзімір Куліковіч з настаўнікамі Мінскай вобласці. Лістапад 2007 г.

2008 год – юбілейны для нашага з вамі часопіса. Мы шчыра ўдзячныя ўсім, хто жыве з "Родным словам", падтрымлівае і папулярызуе яго, верыць у жыццёвыя сілы нацыянальнай літаратуры, культуры, мовы і сваёй плённай працай стварае гісторыю краіны, гісторыю народа. Першачарговыя задачы, якія стаяць сёння перад калектывам рэдакцыі, – палепшыць паліграфічнае афармленне выдання, стварыць сайт часопіса, наладзіць выпуск тэматычных дадаткаў, рэгулярна сустракацца з чытачамі і падпісчыкамі. Але па-ранейшаму самай галоўнай задачай застаецца для нас якасць зместу часопіса, забяспечыць якую можаце толькі вы – вядучыя беларусісты і настаўнікі роднай мовы і літаратуры, сусветнай мастацкай культуры. Таму нам хацелася б на працягу гэтага і наступных гадоў наладзіць новыя творчыя кантакты, пачуць вашы прапановы і парады па ўдасканаленні нашага выдання, атрымаць ад вас новыя артыкулы, метадычныя распрацоўкі, сцэнарыі пазакласных мерапрыемстваў.

Спадзяёмся, што з вашай дапамогай кола падпісчыкаў і прыхільнікаў "Роднага слова" год ад году будзе пашырацца.

З павагай У. Куліковіч

З ГІСТОРЫІ ЧАСОПІСА "РОДНАЕ СЛОВА"

Вось ужо 240 нумароў стаяць на паліцы. Розныя па аб'ёме, афармленні, яны аб'яднаныя адзіным намерам беларускіх вучоных і рэдакцыйнага калектыву – даць педагогам матэрыялы па выхаванні гарманічна развітой асобы, здольнай успрымаць сябе творчай адзінкай у грамадстве і Сусвеце. Супрацоўнікі рэдакцыі арганізоўваюць такія артыкулы па мове, літаратуры, культуры, якія спрыялі б адраджэнню нашага нацыянальнага духу, адраджэнню беларускасці.

Пачыналася ўсё з раздзела "Беларуская мова і літаратура" ў часопісе "Народная асвета". Як вядома, гэтае выданне на сваіх старонках адлюстроўвае ўсе навучальныя прадметы, што выкладаюцца ў школе: гэта і матэматыка, і хімія, і фізіка, і г. д. Матэрыялаў па беларускай мове і літаратуры збіралася ўсё больш і больш, а месца не хапала. Пачалі ўзнікаць думкі пра выданне самастойнага часопіса. Гэтую ідэю падтрымала Міністэрства асветы (цяпер – адукацыі) Беларусі, і ў студзені 1988 г. у Мінску накладам 9435 асобнікаў выйшаў першы нумар штомесячнага навукова-метадычнага часопіса "Беларуская мова і літаратура ў школе", заснавальнікам якога выступіла Міністэрства асветы Беларусі. З нагоды выхаду ў свет першага нумара часопіс віншавалі Міністэрства культуры, Міністэрства асветы, Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа Акадэміі навук Беларусі, Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Акадэміі навук Беларусі, "Настаўніцкая газета", часопісы "Полымя", "Народная асвета", тэлечасопіс "Роднае слова", першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі Ніл Гілевіч і іншыя.

Міністэрства асветы паставіла перад часопісам пэўныя задачы. Найважнейшыя з іх – стаць цэнтрам метадычнай думкі асветнікаў краіны; дапамагаць настаўнікам школ і выкладчыкам педагагічных навучальных устаноў ва ўдасканаленні выкладання роднай мовы і літаратуры, арганізацыі навучання і выхавання маладога пакалення як адзінага працэсу; разам з праблемамі мовы і літаратуры асвятляць пытанні гісторыі беларускага народа, яго культуры.

Часопіс створаны ў 1987 г. Пад назвай "Беларуская мова і літаратура ў школе" ён выходзіў у 1988 – 1991 гг. (№№ 1 – 48). Ад самага пачатку на яго старонках друкуюцца не толькі артыкулы па мове і літаратуры, але і цікавыя і карысныя матэрыялы па архітэктуры і гісторыі Беларусі. Самы першы нумар часопіса быў прысвечаны Кастусю Каліноўскаму. Цэлы раздзел аддаваўся пад культуру Беларусі.

Неўзабаве ў рэдакцыі задумаліся пра наданне новай назвы. Над ёй разважалі доўга (нават на кафедры методыкі выкладання беларускай мовы і літаратуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта). Нарэшце спыніліся на "Родным слове". Так часопіс і называецца з 1992 г. Выданне абрала культурна-асветніцкі кірунак: з'явілася значна больш публікацый па гісторыі, архітэктуры, культуры, міфалогіі. Матэрыялы, пададзеныя пад рубрыкамі "Знакі вечнасці", "Чалавек у далонях Сусвету", "Першавера продкаў",

“Родныя вобразы”, “Паэтычны каляндар прыроды”, “Мова маёй зямлі”, выходзяць за межы навучальнай праграмы. Бо рэдакцыя галоўнай задачай бачыць выхаванне гарманічна развітой асобы, якая адчувала б знітаванасць свайго лёсу з гісторыяй краіны.

Галоўным рэдактарам часопіса ад моманту заснавання і да сярэдзіны снежня 2006 г. з’яўляўся Міхась Шавыркін. Акрамя яго, у першы год выдання ў рэдкалегію ўваходзілі Павел Васючэнка (намеснік галоўнага рэдактара), Ірына Граковіч, Павел Дзюбайла, Васіль Протчанка, Жана Прыймак, Святлана Рыжкоўская, Тамара Саўчук, Ларыса Чарняк; у рэдакцыйны савет – Людміла Афанасенка, Сымон Барыс, Мікалай Бірыла, Валянціна Войцік, Таіса Грамадчанка, Раіса Грынкевіч, Марыя Давыдоўская, Клара Кончыц, Міхаіл Крот, Вольга Кузьміч, Міхась Лазарук, Іван Лепешаў, Аляксандр Лукашанец, Галіна Малажай, Валянціна Марозава, Зоя Навадворская, Яўген Несцяровіч, Тамара Прадзед, Алена Руцкая, Барыс Сачанка, Валянціна Смыкоўская, Яніна Трахімовіч, Уладзімір Філіновіч, Павел Шуба, Мікалай Яленскі, Тамара Яроміна. І да сёння з часопісам супрацоўнічаюць Ж. Прыймак, В. Кузьміч, Т. Прадзед, В. Смыкоўская. З сярэдзіны снежня 2006 г. да 7 жніўня 2007 г. абавязкі галоўнага рэдактара выконвала Ларыса Сагановіч, якая працуе ў “Родным слове” з 1993 г. З 8 жніўня 2007 г. часопіс узначаліў кандыдат філалагічных навук дацэнт Уладзімір Куліковіч.

У 1988 – 1989 гг. часопіс складаўся з раздзелаў “Школа і перабудова”, “Мовазнаўства”, “Методыка мовы і вопыт”, “Літаратуразнаўства”, “Методыка літаратуры і вопыт”, “Культура Беларусі”, “Педагагічны субяседнік”. Існавалі рубрыкі “Слова да чытача”, “Сустрэчы для вас” (гутаркі з Кандратам Крапівой, Яўгеніяй Янішчыц, Сяргеем Грахоўскім і іншымі), «Клуб “Роднае слова”» (як правільна казаць па-беларуску).

У 1990 – 2007 гг. артыкулы падаваліся ў раздзелах “Школа і нацыянальнае адраджэнне”, “Філалогія”, “Методыка і вопыт”, “Калі закончыўся ўрок”, “Міжпрадметныя сувязі”, “Культура Беларусі”, “На ростанях”. Публікацыі пад рубрыкамі “У свеце слоў”, “З гісторыі назваў”, “Чаму мы так гаворым”, “Лінгвістычныя заданні” аб’яднаныя агульнай назвай “Лінгвістычная мазаіка” (з 1993 г. – “Лінгвістычны досвед”). Тады ж з’явілася рубрыка “Наш каляндар”, у якой адзначаюцца юбілейныя і памятныя даты, у 1991 г. – “І песню родную люблю я...”. У тым самым годзе ўпершыню з’явіліся каляровыя малюнкі-ўклейкі.

Калектыў рэдакцыі “Роднага слова” пастаянна знаходзіцца ў творчым пошуку, не стаіць на месцы. Шмат разоў узнікалі новыя раздзелы і рубрыкі. Адны павялічваліся або змяншаліся ў аб’ёме, іншыя знікалі ці трансфармаваліся. Так, з 1993 г. з’явіліся рубрыкі “Вясёлая фурманка”, “Паэтычная старонка”, “Літаратурны ветразь”, “Крытыка і бібліяграфія”, “Літаратура беларускага замежжа”, “Песню бярыце з сабой”, з 1994 г. – “Адрасы педагагічнага майстэрства”, “Паэтычны каляндар прыроды”, “З беларускай нівы”, “Дыялог з карцінай”, з 1995 г. – “Дайсці да Беларусі”, “Светапогляд”, з 1996 г. – “Самае галоўнае”, “Першавера продкаў”, “Гасцёўня”, “Навуковыя паведамленні”, “Малады даследчык”, “Зямля наша спеўная”, “Анталогія беларускага раманса”, з 1997 г. – “Мастацкі каляндар прыроды”, “Род блізкі і далёкі”, “З гісторыі сусветнай і айчыннай культуры”, “Зоркі сусветнай літаратуры”, “Дзе льецца Нёман срэбраводны...”, з 1998 г. – “Звесткі для энцыклапедыі”, “Пад стрэхамі прадзедаў”, “Вяртанне да вытокаў”, “У дапамогу абітурыентам”, “Родныя вобразы”, “Скарбніца беларускага пісьменства”, “Нам засталася спадчына”, “Ідзі і глядзі”, з 1999 г. – “Народныя абрады і звычаі”, “На хвалях рамантызму”, “Літаратура ў гуманітарным ліцэі”, “Крыжовым шляхам”. “Тэорыя літаратуры”, “Вывучаем этыкет”, у 2000 г. – “Псіхалагічны універсітэт”, “Зорны свет”, “Шматгалосае рэха”, у 2001 г. – “Лаўрэаты Нобелеўскай прэміі”, “Анталогія старабеларускай літаратуры”, “Паэтычны краявід”, у 2002 г. – “Тэорыя сатыры і гумару”, “З гісторыі выяўленчага мастацтва”, у 2003 г. – “Літаратурнае краязнаўства”, у 2004 г. – “Імя ў школьнай праграме”, “Дрэвы Беларусі”, “Дрэвы-вобразы”, “Зямлі адзінай людзі”, “Музейны квартал”, “Моўнае аблічча планеты”, “Мовы свету”, у 2005 г. – “Скарбніца сусветнай педагогікі”, “Твор у школьнай праграме”, “Школа юнага журналіста”, “Мова ў кантэксце культуры”, “Запаветныя мясціны”, у 2006 г. – “Гісторыя экспаната”, “Чароўная маляўнічасць прасторы”, у 2007 г. – “Аз, букі…”.

Разам з матэрыяламі па мове, літаратуры, культуры змяшчаліся і змяшчаюцца разнастайныя метадычныя артыкулы, распрацоўкі ўрокаў, сцэнарыі. Друкуюцца ў “Родным слове” і нататкі з алімпіяд па мове і літаратуры, дыдактычны і займальны матэрыялы, факультатывы і курсы на выбар, літаратурныя партрэты, артыкулы па музыцы, выяўленчым мастацтве, архітэктуры, народнай культуры. Цягам усяго існавання часопіс сваімі публікацыямі актывізуе педагагічную думку, пабуджае чытачоў уважліва ставіцца да фізічнага, разумовага і духоўнага развіцця асобы.

Шырока асвятляецца ў часопісе тэма “Любоў і каханне ў беларускай літаратуры”. Унікальнай з’явай сталі публікацыі паэтычнай пераклічкі шлюбных параў: Антаніны Хатэнкі і Алеся Емяльянава, Людмілы Рублеўскай і Віктара Шніпа, Валянціны Аксак і Уладзіміра Арлова, Яўгеніі Пфляўмбаўм і Максіма Лужаніна, Яўгеніі Янішчыц і Сяргея Панізніка.

У 1996 г. рэдакцыя часопіса сумесна з беларусканямецкай фірмай “Dittrich” ладзіла філалагічны конкурс “Беларуская ластаўка”, што праходзіў у два туры, кожны з якіх складаўся з трох этапаў. Пераможцы конкурсу, а таксама яго тураў і этапаў, самыя актыўныя ўдзельнікі атрымалі ад фірмы прызы.

Штогод часопіс выходзіць у новым афармленні. Толькі першыя два гады вокладка была аднолькавая. На ўнутраным яе баку з 1990 г. змяшчаюцца партрэты пісьменнікаў, а з пятага нумара за 2007 г. – жанравыя карціны з выявамі класікаў нашай літаратуры.

Часопіс “Роднае слова” – лідэр на рынку навукова-метадычных выданняў Беларусі. На яго старонках друкуюцца акадэмікі, дактары і кандыдаты навук, перадавыя метадысты і настаўнікі дзеляцца досведам з маладзейшымі калегамі. Не чужы часопіс і аспірантам, студэнтам і нават школьнікам.

Абсягізацікаўленняў выдання вялізныя. На далягляд зе – новыя задумы, тэмы, падыходы да іх асвятлення…

Эдвард КАРБАНОВІЧ.

НАС ВІНШУЮЦЬ



Паважаныя калегі, дарагія сябры!

Прыміце сардэчныя віншаванні з нагоды знамянальнага юбілею навукова-метадычнага часопіса “Роднае слова” – 20-годдзя з дня заснавання.

Гэта па-сапраўднаму значная падзея для педагагічнай і навуковай грамадскасці нашай краіны, для ўсіх, хто шануе і любіць беларускае слова.

Пачынаючы з 1988 года, калі часопіс упершыню выйшаў з друку пад назвай “Беларуская мова і літаратура ў школе”, настаўнікі-філолагі знайшлі ў ім вернага сябра і дасведчанага дарадцу.

Калектыў часопіса творча і з гонарам выконвае сваю асноўную задачу – заставацца ў цэнтры ўвагі надзённых праблем культурнага і навуковага жыцця нашай краіны, адчуваць патрэбы навукі і практыкі, хутка і кампетэнтна на іх рэагаваць.

Захаваўшы навукова-метадычную скіраванасць і гарманічна спалучаючы яе з культурна-асветніцкай дзейнасцю, часопіс “Роднае слова” адыгрывае адметную ролю ў прапагандзе беларускага слова, нацыянальнай культуры і народных традыцый.

Высокі прафесіяналізм, пачуццё дзяржаўнай адказнасці за даручаную справу даюць вам магчымасць вырашаць самыя складаныя задачы адпаведна патрабаванням часу, пашыраць поле сваёй даследчыцкай і папулярызатарскай дзейнасці, быць надзейнай крыніцай аўтарытэтнай прафесійнай інфармацыі, скарбонкай беларускай педагагічнай думкі.

У дзень юбілею прыміце шчырую падзяку за вашу нястомную працу, вернасць прафесійнаму абавязку.

Жадаю калектыву часопіса “Роднае слова” новых творчых поспехаў на ніве нацыянальнай адукацыі, натхнёнай працы на карысць нашай дзяржавы, добрага здароўя, шчасця і дабрабыту.

А. М. Радзькоў,
міністр адукацыі.

Паважаныя сябры!

Сардэчна віншую вас з 20-годдзем з дня выхаду ў свет першага нумара выдання.



Заснаванне часопіса “Роднае слова” стала ў свой час сапраўднай падзеяй у навуковым і адукацыйным жыцці Беларусі. У рэспубліцы з’явілася выданне, галоўнымі мэтамі якога сталі аказанне практычнай дапамогі настаўнікам і выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры ў якасным ажыццяўленні навучальнага працэсу, прапаганда лепшых узораў айчыннага прыгожага пісьменства, далучэнне маладога пакалення да жыватворнай крыніцы роднага слова.

Шчыра жадаю супрацоўнікам рэдакцыі часопіса “Роднае слова” моцнага здароўя, аптымізму і дабрабыту. Няхай спадарожнічае вам поспех, не згасае творчае натхненне!

Уладзімір Русакевіч,
міністр інфармацыі.

Паважаныя супрацоўнікі часопіса “Роднае слова”!

Упраўленне адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта ад імя ўсіх педагогаў Міншчыны віншуе Вас з 20-годдзем заснавання часопіса!

За два дзесяцігоддзі “Роднае слова” праклала прыкметны шлях у адукацыі. Часопіс стаў духоўнай скарбніцай для педагогаў. Чытаючы часопіс, сотні настаўнікаў знаёмяцца з літаратурнымі партрэтамі, нарысамі, прысвечанымі мастакам і кампазітарам, з матэрыяламі пра лучнасць літаратуры, мастацтва і музыкі, расповедамі пра родныя вобразы і народныя святы, звычаі...

Асабліва карысныя для настаўнікаў метадычна-выхаваўчыя артыкулы: лінгвістычныя матэрыялы з гісторыі слоў, распрацоўкі музейна-педагагічных заняткаў, сцэнарыі мерапрыемстваў.

Кожны нумар – новы крок у спазнанне нацыянальнай духоўнай культуры. Родны край і зорны свет, патрыятызм і сям’я, паэзія і культура мовы – разнастайная тэматыка, неабходная для гарманічнага выхавання асобы.

Прыемна адзначыць, што часопіс адлюстроўвае стан духоўнай культуры народа. Творча працуючы, рэдкалегія часопіса імкнецца раскрыць крэатыўны патэнцыял кожнага педагога, напоўніць яго душэўнай цеплынёй і пяшчотай.

Хай і далей роднасловаўцы працуюць для развіцця, узмацнення і росквіту беларускага слова, дзеля пашырэння высакароднай духоўнасці.

Шчыра, па-сяброўску зычым Вам натхнення і радасці, светлай любові, плённай працы і вернай службы на карысць Беларусі, роднай зямлі!

Творчых пошукаў, шчаслівых здзяйсненняў ВАМ!

Т. І. Данілевіч,
начальнік упраўлення адукацыі
Мінскага абласнога выканаўчага камітэта.

Паважаны Уладзімір Іванавіч!

Камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама ад свайго імя і ад імя педагогаў сталіцы сардэчна віншуе Вас і калектыў рэдакцыі часопіса з юбілеем!

За 20 гадоў свайго існавання часопіс унёс значны ўклад у развіццё адукацыйнай сістэмы нашай рэспублікі і заняў дастойнае месца сярод друкаваных выданняў навукова-метадычнага накірунку.

"Роднае слова" – гэта адзін з самых старэйшых і вядомых у рэспубліцы часопісаў, які садзейнічае эфектыўнаму развіццю і павышэнню ўзроўню прафесійных ведаў настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, з'яўляючыся для іх настольным выданнем.

Увесь гэты час часопіс лічыцца прызнаным лідэрам сярод перыядычнай літаратуры для настаўнікаў, метадыстаў і навукоўцаў. Ён адыгрывае асаблівую ролю ў станаўленні і развіцці сталічнай адукацыі. Часопіс заўсёды падтрымлівае інавацыйныя працэсы, якія адбываюцца ў сталічным рэгіёне, і з'яўляецца правадніком перадавой метадычнай думкі, ён пастаянна развіваецца, адлюстроўваючы на сваіх старонках самыя сучасныя ідэі і актуальныя пытанні выкладання прадмета.

Лепшыя настаўнікі горада Мінска з задавальненнем друкуюцца на старонках Вашага часопіса, а маладыя мінскія педагогі з удзячнасцю карыстаюцца Вашымі прафесійнымі распрацоўкамі і метадычнымі парадамі. Камітэт па адукацыі і педагагічная грамадскасць горада бачаць у выданні надзейнага партнёра і памочніка ў прафесійнай дзейнасці сталічных педагогаў.

Часопіс "Роднае слова" – гэта з'ява ў педагагічным жыцці нашага горада і краіны. А 20 гадоў яго існавання – пацверджанне запатрабаванасці і аўтарытэту сярод Вашай чытацкай аўдыторыі.

Дзякуй Вам за Вашу працу і высокі прафесіяналізм!

Віншуем з юбілеем усіх, хто стварае гэты часопіс, і жадаем Вам і Вашаму калектыву актыўнага даўгалецця, душэўных сіл, невычарпальнай энергіі, святла і творчага натхнення!

З павагай,
У. К. Шчэрба,
старшыня камітэта па адукацыі
Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта.

Паважаныя сябры!

Упраўленне адукацыі Віцебскага аблвыканкама шчыра віншуе калектыў часопіса "Роднае слова", яго аўтараў і чытачоў з 20-годдзем з дня выхаду ў свет.

На працягу ўсяго перыяду існавання часопіс забяспечвае ўмовы для шырокага абмену ідэямі паміж вучонымі і практыкамі, для якаснага і своечасовага інфармавання педагагічнай грамадскасці аб лепшым вопыце работы беларускіх настаўнікаў, аб усіх новаўвядзеннях у беларускай школе, аб сучасных дасягненнях беларускай філалогіі. За гэты час часопіс зарэкамендаваў сябе як адно з самых аўтарытэтных, шматпланавых і глыбока прафесійных выданняў Беларусі.

Часопіс спалучае ў сабе высокі навуковы ўзровень і практычную накіраванасць, змест яго рубрык з'яўляецца актуальным і выклікае зацікаўленасць педагагічнай грамадскасці краіны.

Жадаем калектыву рэдакцыі часопіса "Роднае слова" далейшых творчых поспехаў, плёну ў працы, ажыццяўлення новых задумак і планаў, надзейных сяброў і ўдзячных чытачоў, бадзёрасці і невычарпальнага творчага аптымізму.

І. А. Шчурок,
начальнік упраўлення адукацыі
Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта.

Паважаны Уладзімір Іванавіч!

Педагогі Гомельшчыны сардэчна віншуюць Вас і супрацоўнікаў навукова-метадычнага часопіса "Роднае слова" з юбілеем!

20 год у гісторыі Вашага выдання адзначаны штодзённым пошукам шляхоў удасканалення метадычнай і навуковай думкі.

Высокай адзнакай працы калектыву часопіса з'яўляецца папулярнасць яго сярод настаўніцкай, вучнёўскай, студэнцкай аўдыторый.

Сёння "Роднае слова" – гэта жывы канструктыўны дыялог паміж чытачом і яго стваральнікамі. На старонках выдання друкуецца шмат метадычных распрацовак настаўнікаў, цікавых публіцыстычных і літаратуразнаўчых артыкулаў, крытычных рэцэнзій навукоўцаў, мастацкіх твораў сучасных пісьменнікаў. Сярод іх нямала вядомых імёнаў і Гомельскай вобласці.

Выказваем Вам словы шчырай павагі і прызнання за прафесіяналізм, адданасць справе, творчасць, неўтаймаванасць.

Добрага ўсім здароўя, шчасця, аптымізму і натхнення! Няхай здзяйсняюцца ўсе мары і надзеі, напаўняюцца светам і цяплом Вашы сэрцы.

З павагай,
М. А. Бондар,
начальнік упраўлення адукацыі
Гомельскага аблвыканкама.

"Роднае слова" – цудоўнае слова
Настаўніцкіх думак уток і аснова!
Нам ты – дарунак, паклон табе нізкі!
Тут самацветаў яскравая нізка!

Агеньчык беларускасці
У настаўніцкіх душах віруе,
Бо над нашым "Родным словам"
Калектыў аднадумцаў шчыруе!

Хай кожны год за годам
Вам плёну прыдае,
І аўтараў ад Бога
Хай школа вам дае!

І актуальны, патрэбны
Матэрыял артыкулаў ваш.
З 20-годдзем, любімы
Часопіс настаўніцкі наш!

Упраўленне адукацыі
Брэсцкага аблвыканкама.

Прыміце самыя шчырыя словы з нагоды Вашага 20-годдзя!

Мы жадаем Вам самабытнасці, творчага плёну, незгасальнай энергіі, цікавых сустрэч, адданых чытачоў, натхнення ў працы, упэўнена крочыць па жыцці абраным шляхам.

Гартаем часопісы "Роднае слова"...
Вось тут ён маленькі, а тут – патлусцеў
І вырасці вырас, заклаўшы аснову,
Стаць кнігай настольнай адразу паспеў.

Узрост хай юначы ў часопіса сёння,
Ды мудрасці толькі – не пазычаць!
З трыбуны ягонай гучалі імёны
Вялікіх Настаўнікаў. Хай і гучаць!

Дарадчык і сябар часопіс сягоння,
І слова ягонае добра чуваць.
Шаноўны чытач, на ягоных старонках
Юнацтва сваё паспяшайся спаткаць!

Гучы і сталей, наш часопіс любімы,
Вядзі па жыцці і вучы, настаўляй,
І шырся, расці на прасторах краіны,
І роднасці Слова ты не губляй!

Перамог табе, дружа, ва ўсіх пачынаннях,
Мы цябе падтрымаем заўжды.
Словы ўдзячнасці шлём у сваім віншаванні,
Будзь такім маладым праз гады.

Педагогі Магілёўскай вобласці,
М. М. Стральцоў,
в.а. начальніка ўпраўлення адукацыі
Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта.

Паважаныя сябры!

Прыміце шчырыя віншаванні з нагоды 20-годдзя з дня заснавання часопіса – аднаго са старэйшых і вядомых у рэспубліцы навукова-метадычных выданняў.

За гады існавання часопіс "Роднае слова" стаў своеасаблівай энцыклапедыяй для педагогаў, навукоўцаў краіны. Вашы публікацыі з'яўляюцца неацэнным інтэлектуальным і духоўным набыткам, маюць вялікую каштоўнасць для беларускага настаўніцтва, для сучаснай школы і яе будучыні.

Вы дбайна клапоціцеся пра найвялікшы скарб дзяржавы і нацыі – мову бацькоў і дзядоў, вучыце любіць і шанаваць яе, выхоўваеце ў сэрцах беларусаў гордасць за гісторыю сваей Бацькаўшчыны, славутых суайчыннікаў.

Калектыву рэдакцыі жадаю далейшых творчых пошукаў і набыткаў, новых тэм, рубрык, мудрых аўтараў і ўдзячных чытачоў, спору і плёну ў пачэснай, высакароднай працы.

Ад імя педагогаў Гродзенскай вобласці
з павагаю,
А.І.Сягоднік,
начальнік упраўлення.

Шаноўныя калегі!

Рэктарат, калектыў УА "Акадэмія паслядыпломнай адукацыі" сардэчна віншуе часопіс "Роднае слова" з 20-годдзем творчай дзейнасці.

У гэты ўрачысты і святочны дзень мы выказваем Вам словы шчырай падзякі за вялікі ўклад у развіццё педагагічнай навукі Рэспублікі Беларусь.

Дваццаць гадоў гісторыі Вашага часопіса – яскравы прыклад таго, якіх вынікаў можна дасягнуць, калі годна падтрымліваць талент, ініцыятыву і прафесіяналізм.

За гэты час змяняўся змест навучання і выхавання, мадэрнізавалася сістэма адукацыі, але нязменным засталося Ваша бескарыслівае служэнне тым, хто аддае сэрца і веды дзецям, – нашым педагогам.

Прыемна адзначыць, што часопіс ажыццяўляе плённае супрацоўніцтва з навукоўцамі і педагогамі рэспублікі.

Вы, паважаныя калегі, заўсёды садзейнічаеце пазітыўным зменам, з'яўляецеся добрымі дарадцамі, надзейнымі памочнікамі ў справе навучання і выхавання падрастаючага пакалення. Вашы прафесійнае майстэрства, кампетэнтнасць служаць узорам творчай працы для ўсіх тых, хто аддае свой талент высакароднай справе росквіту нашай Бацькаўшчыны.

Шчыра жадаем Вам плёну ў працы, здзяйснення планаў, творчага натхнення, моцнага здароўя, дабрабыту Вашым сем'ям, цудоўнага настрою!

Няхай спраўдзяцца ўсе Вашы мары, напоўняцца святлом і цеплынёй Вашы сэрцы!

Паважаны Уладзімір Іванавіч!

Рэктарат і калектыў Мінскага гарадскога інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў адукацыі віншуе Вас і рэдакцыю часопіса "Роднае слова" з юбілеем!

На працягу 20 гадоў Ваш часопіс заставаўся і застаецца адным з самых кампетэнтных і аўтарытэтных выданняў метадычнага накірунку, бо стварае яго каманда прафесіяналаў.

Сёння часопіс "Роднае слова" выйшаў на якасна новы ўзровень падачы інфармацыі, стварыў магчымасць для абмеркавання на сваіх старонках актуальных пытанняў выкладання прадмета. Ён узбагачае метадычную скарбонку і павышае прафесійны ўзровень настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры не толькі нашай сталіцы, але і ўсёй рэспублікі.

Метадысты нашага інстытута з задавальненнем супрацоўнічаюць з Вашым выданнем і выкарыстоўваюць надрукаваныя матэрыялы ў сваёй дзейнасці.

20 гадоў працы – гэта дастойны паказчык стабільнасці развіцця, вопыту і запатрабаванасці сярод чытачоў.

Віншуем усіх, хто прымае ўдзел у стварэнні часопіса. Выказваем шчырую ўдзячнасць за магчымасць супрацоўніцтва і абмену вопытам з калегамі на яго старонках, за ўклад у развіццё сталічнай сістэмы адукацыі.

Творчых Вам знаходак, шматгадовай плённай працы, святочнага настрою, поспехаў і пакарэння новых вяршынь!

З павагай і ўдзячнасцю,
А. В. Воранаў,
рэктар інстытута.

За два дзесяцігоддзі часопіс "Роднае слова" займеў свой адметны імідж, важкі прафесійны статус і ўвайшоў у шэраг найбольш значных філалагічных і педагагічных выданняў краіны. Ён, па сутнасці, стаў адным з цэнтраў нацыянальнай адукацыі і культуры. За гэты перыяд адбылося станаўленне і канцэптуальнае развіццё выдання (у гэтым несумненная заслуга яго былога галоўнага рэдактара М. М. Шавыркіна). Часопіс нарошчваў навуковы патэнцыял у галіне беларускай філалогіі, забяспечваў адпаведнымі матэрыяламі інавацыйную дзейнасць педагогаў.

Больш за дзвесце нумароў "Роднага слова" – гэта цэлая бібліятэчка, якая запатрабавана настаўнікамі, метадыстамі, выкладчыкамі, студэнтамі, шматлікімі зацікаўленымі чытачамі, найперш тымі, хто навучае іншых ці вучыцца ў школе. Часопіс з'яўляецца для многіх надзейным дапаможнікам у працы. Назапашаны багаты і разнастайны матэрыял, які далучае да сучаснай метадычнай думкі, скарбаў і таямніц роднай мовы, выводзіць чытачоў на культуралагічныя прасцягі і глыбіні, дапамагае ў спасціжэнні гісторыі літаратуры і мастацтва, духоўнай спадчыны беларускага народа.

Вітаючы калектыў з 20-годдзем з дня выхаду першага нумара часопіса "Роднае слова", зычым і надалей актыўна, плённа працаваць на ніве нацыянальнай адукацыі, прымнажаць асветніцкія і культурныя традыцыі вялікіх папярэднікаў – Скарыны, Купалы, Коласа…

Алесь Бельскі,
доктар філалагічных навук, прафесар,
галоўны рэдактар
часопіса "Беларуская мова і літаратура".

Рэдакцыя газеты "Переходный возраст" ад усяго сэрца віншуе часопіс "Роднае слова" з дваццацігоддзем.

Каб не разгубіцца ў пачуццях і не заблытацца ў віншаваннях, мы вырашылі скласці спіс абавязковых рэчаў, якія павінны быць побач з вамі мінімум вечнасць.

1. Юнацтва...

Мы, яшчэ трынаццацігадовыя малыя, з захапленнем і добрай зайздрасцю глядзім на вас, нашых старэйшых сяброў. І гэта пытанне не толькі ўзросту, але і майстэрства! Хай у свае дваццаць вы знойдзеце час для сапраўдных дзіцячых радасцяў: веры ў казку, катання на каруселях і салодкіх ласункаў.

2. Творчасць…

Мы не па чутках ведаем пра пакуты творчасці. Падаецца, пасля дваццаці гадоў прафесійнай штодзённай працы пра якія "пакуты" можна весці гаворку? Але ж, згадзіцеся, бывае. Таму "Переходный возраст" жадае сонечнага настрою, няспыннай энергіі і беласнежных вяршынь у творчым працэсе!

3. Роднае слова...

Ёсць шмат родных слоў: каханне, пяшчота, ласка, надзея, сяброўства, шчасце, вера... Але ж усе яны – абстрактныя. Вы ж – наша сапраўднае Роднае слова, да якога можна дакрануцца.

4. І, вядома, шакаладны торцік з дваццаццю маленькімі свечкамі…

Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь сардэчна віншуе калектыў часопіса "Роднае слова" са знамянальнай падзеяй – 20-годдзем стварэння.

За доўгія гады свайго існавання Ваш часопіс стаў тым выданнем, аўтарытэту якога давяраюць шматлікія чытачы. На яго старонках абмяркоўваюцца праблемы адукацыі, філалогіі і культуры Беларусі.

Публікавацца ў "Родным слове" лічаць за гонар і шматлікія супрацоўнікі нашага музея.

І калі прэса – адзін з найважнейшых сродкаў распаўсюджвання ведаў і інфармацыі, які дазваляе стварыць агульную культурна-нацыянальную прастору, то "Роднае слова" годна спраўляецца з гэтай задачай у поўнай адпаведнасці са сваёй назвай.

Аднак поспех Вашага часопіса – гэта ў першую чаргу, без сумнення, вынік велізарных намаганняў рэдакцыйнай калегіі і рады.

Жадаем Вам новых арыгінальных публікацый, творчага поспеху, выдавецкага даўгалецця і невычэрпнага запалу і энергіі ў справе развіцця Вашага выдатнага навукова-метадычнага выдання – часопіса "Роднае слова"!

Шаноўныя супрацоўнікі-роднасловаўцы!

Шчыра віншуем з юбілеем Вашага цудоўнага часопіса "Роднае слова", які на працягу 20 гадоў – самы жаданы госць ужо не аднаго пакалення чытачоў.

Ваш часопіс за не вельмі доўгі адрэзак часу стаў сябрам, настаўнікам, дарадцам шматлікай аўдыторыі, і сёння ён з'яўляецца сапраўднай энцыклапедыяй, дзе можна пачарпнуць звесткі ў розных галінах: мове, літаратуры, культуры, педагогіцы, гісторыі і сучаснасці – ва ўсім, што хвалюе людзей розных спецыяльнасцей і рознага ўзросту.

Кожны Ваш нумар – свята для чытача, для ўсіх, хто трымае руку на пульсе жыцця.

Дзякуючы Вашаму прафесіяналізму, руплівасці і энтузіязму часопіс па праву лідзіруе ў моры лепшых перыядычных выданняў.

Для кожнага рэспандэнта вялікі гонар надрукаваць на старонках Вашага выдання свой матэрыял, паколькі Вы здзяйсняеце ў жыцці запавет вялікіх класікаў нашай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа – шанаваць спадчыну свайго народа – родную мову.

У 1956 годзе ў лісце да выхаванцаў дзіцячага дома г. Брэста Якуб Колас пісаў: "...Не трэба зневажаць мову народа, сярод якога вы жывяце, не трэба рабіць так, каб наша роднае слова не мела сабе прытулку ў сваёй роднай краіне".

Ваш часопіс – яркі прыклад любві і пашаны да сваёй Бацькаўшчыны.

Дык заставайцеся і надалей пад лёгкім крылом Слова Коласа. Жадаем Вам здароўя, творчага натхнення, святла і ладу на працы і ў сем'ях.

Ад імя калектыву
Зінаіда Камароўская,
дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа.

Дарагое нам "Роднае слова"!

З асаблівым настроем чакаем кожны Ваш нумар, бо ведаем, што сустрэнем на старонках дарагія імёны класікаў літаратуры, выдатную паэзію і прозу, літаратуразнаўчыя і мовазнаўчыя працы, тое, без чаго не пражыць ні навукоўцу, ні настаўніку, ні архівісту. З трапяткім адчуваннем гонару і ўдзячнасці адзначаем, што "Роднае слова" заўсёды знаходзіць магчымасць друкаваць матэрыялы аб архівах і архіўных знаходках, а супрацоўнікі рэдакцыі самі не раз былі адкрывальнікамі многіх архіўных таямніц. Ведаем, з якой любоўю і шчырым клопатам ствараецца Ваш часопіс, з якой увагай да чытача, да яго імкнення спасцігаць глыбіні беларускай мовы і літаратуры Вы працуеце над кожнай старонкай. "Роднае слова" – чаканы і безумоўна выдатны часопіс з цікавай гісторыяй і моцнымі традыцыямі, часопіс, які мае свой адметны воблік і стыль. У гэтую юбілейную дату мы зычым калектыву рэдакцыі моцнага здароўя, вытрымкі, новых ідэй і выдатных вынікаў, а "Роднаму слову" быць, быць і быць, радаваць сваіх чытачоў і гадаваць новыя пакаленні сыноў і дачок Беларусі.

Калектыў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва.

Шаноўныя сябры!

Прыміце шчырыя, сардэчныя віншаванні ад калектыву Дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Рэспублікі Беларусь у сувязі з 20-годдзем з дня заснавання часопіса "Роднае слова".

Калісьці Змітрок Бядуля сказаў: "Не саромейся, беларус, размаўляць па-свойму – на роднай мове бацькоў і дзядоў сваіх. Беражы сваю мову, беражы свае песні, свае казкі, звычаі і ўсё роднае – гэта спадчына дзядоў і вялікі нацыянальны здабытак".

Менавіта на выкананне гэтага запавету пісьменніка і скіравана дзейнасць калектыву часопіса "Роднае слова".

Жадаем вам творчага натхнення, здароўя, дабрабыту, жыццёвай мудрасці і аптымізму, поспехаў ва ўсіх Вашых пачынаннях.

Няхай колькасць прыхільнікаў часопіса "Роднае слова" шырыцца штодзённа.

З павагай ад Вашых сяброў і прыхільнікаў
Зінаіда Кучар,
дырэктар Дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Рэспублікі Беларусь.

Паважанае спадарства часопіса "Роднае слова", з юбілеем!

Што ні край – то звычай – так казалі нашы продкі. І нам нельга губляць самае святое, што адрознівае беларусаў: мову, святы, паданні, прыказкі, песні – тое, чым розніліся мы ад іншых, а тыя – ад нас. Гэта наш менталітэт, "адзежа душы". Менавіта з гэтага ўсяго і складаецца наша гісторыя.

А ў сённяшніх умовах незалежнай Беларусі абавязкам кожнага з'яўляецца захаванне культурных традыцый, звычаяў, мовы, каб яны не адышлі ў нябыт, а разам з імі і мы. Гэтай пачэснай справе Вы і служыце.

Прыміце ад пастаянных падпісчыкаў і чытачоў пажаданні плёну і настойлівасці ў авалоданні таямніцамі педагагічнага і моўнага жыцця.

Шчыра зычым калектыву часопіса новых творчых здабыткаў, аптымізму, жыццёвай паэзіі і паэзіі ў жыцці.

Калектыў настаўнікаў і вучняў
Лужаснянскай школы-інтэрната-гімназіі
для здольных і
таленавітых дзяцей Віцебскай вобласці.

Паважаныя калегі, супрацоўнікі часопіса "Роднае слова"!

За 20 гадоў цеснага ўзаемадзеяння з вамі мы сталі добрымі сябрамі, бо старонкі часопіса – цудоўная магчымасць пачуць адзін аднаго, падзяліцца сваімі інавацыйнымі напрацоўкамі і знаходкамі, арыгінальнымі ідэямі, практычным вопытам, знайсці неабходнае, пачарпнуць свежую ідэю. Гэта выдатна, што кожны з нас можа надрукаваць свае распрацоўкі і вершы на яго старонках, пераняць перадавы вопыт іншых настаўнікаў рэспублікі.

Многа змен адбылося за гэты час, не адно пакаленне настаўнікаў стала чытачамі "Роднага слова". Але часопіс заўсёды застаецца верным сабе: працуе на перспектыву, а яго калектыў знаходзіцца ў пошуку новых падыходаў да вырашэння актуальных задач удасканалення выкладання роднай мовы і літаратуры.

З нагоды гэтага цудоўнага юбілею жадаем і часопісу, і калектыву супрацоўнікаў поспехаў у аказанні пастаяннай падтрымкі творча працуючаму настаўніку, у пошуку, вывучэнні і распаўсюджанні інавацыйнага вопыту, у стварэнні атмасферы творчасці, ап-

тымізму, захаплення агульнай справай, актыўных і ўдзячных чытачоў.

І няхай заўсёды застаецца нязгасная зорка, імя якой – "Роднае слова"!

Настаўнікі Мінскага раёна.

Часопісу "Роднае слова" споўнілася нядаўна 20 гадоў. Для многіх настаўнікаў за гэты час ён стаў шчырым дарадцам, клапатлівым памочнікам, верным сябрам, з якім хочацца крочыць па жыцці і далей.

Якімі сёння павінны быць урокі беларускай мовы і літаратуры, каб вучні спяшаліся на іх з радасцю і надзеяй? Як зрабіць так, каб нашы дзеці не толькі добра валодалі роднай мовай, ведалі літаратуру, але і сталі іх апантанымі прыхільнікамі, абаронцамі? Адказы на гэтыя актуальныя пытанні можна знайсці ў часопісе "Роднае слова", разнастайныя рубрыкі якога "працуюць" на праблематыку сучаснай школы.

Янка Брыль пісаў: "Чытача не ашукаеш. Калі ты любіш, што любіш, па-сапраўднаму, а ненавідзіш таксама на ўсю душу, калі ты ўкладваеш у тое, што пішаш, усё, што маеш найлепшага, калі робіш гэта натуральна, шчыра, без усякай нізкай думкі, – чытач гэта бачыць, ён прымае тваю руку, працягнутую на дружбу".

Колькі ж нас, настаўнікаў і вучняў, навучэнцаў гімназій і ліцэяў, студэнтаў ВНУ, прыняло за гэтае дваццацігоддзе працягнутую часопісам руку на дружбу! Некаторыя бацькі маіх вучняў з'яўляюцца пастаяннымі яго чытачамі ўжо не адзін год. Матэрыялы часопіса многім педагогам адкрываюць магчымасць для прафесійнага сталення, дазваляюць мацней і глыбей адчуць сваю прыналежнасць да Беларусі, асэнсаваць сувязь асабістага лёсу з гісторыяй краіны.

Сёння "Роднае слова" – гэта не толькі стартавая пляцоўка для новых ідэй, цікавых праектаў, але і невычэрпная крыніца ведаў. На яго старонках штомесяц друкуюцца лепшыя метадычныя распрацоўкі ўрокаў, матэрыялы для правядзення алімпіяд, сцэнарыі школьных святаў, матэрыялы падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання, праграмы курсаў на выбар. Словам, усё, што неабходна для працы настаўніку.

Колькі цікавай, карыснай, грунтоўнай інфармацыі даў часопіс сваім чытачам за гады існавання! Колькі вядомых мовазнаўцаў, выдатных літаратараў, творчых педагогаў выступіла са сваімі прапановамі!

Скарбы мовы, наша спадчына, найноўшыя навуковыя дасягненні, літаратура ў кантэксце жыцця, культура Беларусі – гэтыя і іншыя тэмы заўсёды на яго старонках, таму не дзіўна, што многіх далучыў ён да роднай мовы, літаратуры, гісторыі, культуры, да Беларусі.

Што пажадаць юбіляру? Самае галоўнае – даўгалецця, надалей шчырай падзякі чытачоў і адданага служэння беларускай мове і Радзіме.

Ніна Юрцэвіч,
настаўніца беларускай мовы і літаратуры
ДУА "Прылуцкая АСШ".

"Роднаму слову"

Дабраслаў, маё Слова роднае!
Самабытнае. Непаўторнае.
Санцадайнае. Велічальнае.
Пракаветнае. Шчыравальнае.
Слынны люд Цябе пашаноўвае,
На Гасподзе нашай узворвае.

Гэй, спадарства, вітаема голасна,
Што мы, ўнукі Купалы і Коласа,
Ўзяўшы светач – паходню Скарыны, –
Талакой рушым з роднай Айчынай
Наталяць Мовай вусны засмяглыя,
Абуджаць Мовай сэрцы пабляклыя.

Асвяці, Божа, слова роднае!
Самабытнае. Непаўторнае.
Санцадайнае. Велічальнае.
Пракаветнае. Шчыравальнае.
Зробім Слова крыніцай магутнаю,
Каб убачыў Бог ўсё пачутае.

Вітаю шчырапаважаную рэдакцыю часопіса і яго прыхільнікаў з 20-годдзем красавання "Роднага слова" на ніве беларушчыны. Паступіўшы ў Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут у 1990 годзе, выпісваю часопіс з 1993 г., дзякуючы плённаму Слову выкладчыка беларускай літаратуры Анатоля Мікалаевіча Канапелькі, які меў талент заахвочваць да чытання свайго і спакушаў набываць, не шкадуючы грошай, сваю Літаратуру.

Дзякуй вам, шаноўнае спадарства, хто нашу Мову ахоўвае і аздабляе, натхнёна нясе ў свет і ахвяруе сабой дзеля будучыні. Няхай з вамі прыходзіць да настаўнікаў праўда і воля, мудрасць і любоў, вера і адказнасць. Чакаем адвагі ў пошуках, сумлення ў адборы матэрыялу і дзеянняў, карысных для Вечнасці.

Настаўнікі беларушчыны! Гуртуймася вакол "Роднага слова", размаўляйма па-беларуску, бо хто ж яшчэ, як не мы?!

Любоў Лукашэнка,
настаўніца ліцэя № 1 г. Віцебска.

Паважаных супрацоўнікаў рэдакцыі, шматлікі аўтарскі актыў часопіса сардэчна віншую з 20-годдзем з дня заснавання.

Замежныя чытачы заўсёды прыхільна ўспрымаюць публікацыі Вашага выдання і жадаюць Вам толькі поспехаў. Мы вельмі рады, што на старонках часопіса перыядычна змяшчаюцца артыкулы пра выдатных замежных беларусістаў.

Паслядоўнай пазіцыі ў адстойванні правоў нашай мовы. Плёну Вам у працы і шчасця ў жыцці!

Ад імя камітэта
Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў
Сяргей Запрудскі.

Старажытная літаратура

Іван САВЕРЧАНКА

РАННІ ПОМНІК ПРЫГОЖАГА ПІСЬМЕНСТВА БЕЛАРУСІ

“Слова пра славянскія плямёны, іх звычаі і пісьменства” – умоўная назва найбольш ранняга твора, напісанага на ўсходнеславянскіх землях прыкладна ў другой палове XI ст.

Аўтограф “Слова…” не захаваўся. Твор увайшоў у склад “Аповесці мінулых гадоў” – аднаго з першых усходнеславянскіх летапісных зводаў XII ст. “Слова…” найбольш поўна чытаецца паводле Лаўрэнцьеўскага і Радзівілаўскага летапісаў.

Месца напісання “Слова пра славянскія плямёны, іх звычаі і пісьменства” дакладна невядома. Яно магло быць створана ў адным з пяці тагачасных цэнтраў усходнеславянскай цывілізацыі – Полацку, Тураве, Смаленску, Ноўгарадзе ці Кіеве. Найбольш верагодна, што яно было напісана ў Полацку, магчыма, у перыяд найвышэйшага росквіту Полацкага княства падчас княжання Усяслава Чарадзея, калі ён адначасова на працягу сямі месяцаў, з верасня 1066 да сакавіка 1067 г., займаў і пасаду кіеўскага князя.

Твор мае шматпланавую і даволі складаную архітэктоніку. Ён уключае прынамсі дзевяць асноўных структурна-кампазіцыйных элементаў – мікранавелаў, летапісных звестак і аповедаў, семантычна надзвычай насычаных.

Першая мікранавела падае відавочна легендарныя, біблейскія звесткі пра паходжанне славянаў паводле волі Бога, які пасля разбурэння Вавілонскай вежы стварыў 72 народы і рассеяў іх па зямлі. Сярод першых народаў былі і славяне, якія падпарадкоўваліся валадарам з роду Яфета. Паводле аўтара, славяне мелі тады назоў “нарцы”.

Паводле Лаўрэнцьеўскага летапісу, у гэтай мікранавеле “Слова…” літаральна напісана: *“И съмеси Бог языки, и раздели на 70 и 2 языка и расъсея по всей земли. По размешеньи же язык Бог ветром великим разраши столп, и есть останок его промежю Асюра и Вавилона, и есть въ высоту и въ ширину локот 5433, и в лета многа храним останок. По размешеньи же столпа и по разделеньи язык прияша сынове Симови въсточныя страны, а Хамови сынове полуденьныя страны. Афетови же прияша запад и полунощныя страны. От сих же 70 и 2 языку бысть язык словенеск, от племени Афетова, нарци, еже суть словене”* [1, с. 24].

Як відаць, аўтар на пачатку “Слова…” імкнецца старанна абгрунтаваць богавыбранасць славянскіх плямёнаў, давесці іх гістарычную роўнасць з іншымі старажытнымі народамі, усебакова пацвердзіць неад’емнае права славянаў займаць адметнае месца ў цывілізацыйнай супольнасці.

У другой мікранавеле “Слова…” апавядаецца пра прыход славянаў на Дунай і Балканы і наступную каланізацыю імі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Пісьменнік дэталёва падае геаграфію рассялення асноўных славянскіх плямёнаў – чэхаў, мараваў, харватаў, сербаў, палякаў, люцічаў, мазаўшанаў, памаранаў, палянаў, драўлянаў, дрыгавічоў, палачанаў у басейнах найбуйнейшых еўрапейскіх рэк – Дуная, Дзвіны, Дняпра, Вісты, Прыпяці, Дзясны, Сулы, а таксама возера Ільмень. Пры гэтым аўтар раскрывае этымалогію і паходжанне назваў славянскіх плямёнаў і народаў.

У творы, паводле Лаўрэнцьеўскага летапісу, пішацца: *“По мнозех же временех сели суть словени на Дунаеви, где есть ныне Угорьска земля и Болгарьска. От тех словен разидошася по земле и прозвашася имены своими, где седше на котором месте. Яко пришедшее седоша на реце имянем Марава, и прозвашася Морава, а друзии чеси нарекошася. А си ти же словени: хровате белии и серебь и хорутане. Волхом бо нашедшем на словени на дунайския, и седшем в них и населящем им, словени же ови пришедшее седоша на Висле, и прозвашася Ляхове, а от тех ляхов прозвашася поляне, Ляхове друзии лутичи, ини мазовшане, ини поморяне. Тако же и ти словене пришедшее и седоша по Днепру и нарекошася поляне, а друзии древляне, зане седоша в лесех. А друзии седоша межю Припетью и Двиною и нарекошася дреговичи. Инии седоша на Двине и нарекошася полочане, речьки ради, яже втечеть въ Двину, имянем Полота, от сея прозвашася полочане. Словени же седоша около езера Илмеря, и прозвашася своим имянем, и сделаша град и нарекоша и Новъгород. А друзии седоша по Десне, и по Семи, по Суле, и нарекошася север. И тако розидеся словеньский язык, темже и грамота прозвася словеньская”* [1, с. 24 – 26].

Прыведзеная мікранавела даказвала агульныя этнічныя карані славянскіх народаў, што павінна было, паводле меркавання аўтара “Слова…”, спрыяць кансалідацыі славянаў у змаганні са знешнімі ворагамі. Аўтар сцвярджае вельмі важнае палажэнне пра спрадвечную прыналежнасць велізарных тэрыторый у басейнах Дуная, Дзвіны, Дняпра, Вісты, а таксама вакол возера Ільмень – менавіта славянам. Такім парадкам, у “Слове…” абгрунтоўвалася справядлівасць змагання славянаў за свае тэрыторыі супроць агрэсіўных германскіх плямёнаў і ўсходніх качэўнікаў.

У трэцяй мікранавеле аўтар “Слова…” апавядае пра надзвычай выгоднае геаграфічнае становішча



Іван Васілевіч Саверчанка *– спецыяліст у галіне гуманітарных і сацыяльных навук. Доктар філалагічных навук (2000). Закончыў Магілёўскі педагагічны інстытут (1983), аспірантуру пры Інстытуце літаратуры АН Беларусі (1988). Вядучы супрацоўнік Інстытута літаратуры НАН Беларусі. Апублікаваў фундаментальныя працы "Канцлер Вялікага Княства: Леў Сапега", "Старажытная паэзія Беларусі: XVI – першая палова XVII ст.", "Астафей Валовіч" (усе 1992), "Сымон Будны – гуманіст і рэфарматар" (1993), "Апостал яднання і веры: Язэп Руцкі" (1994), "Aurea mediokritas. Кніжна-пісьмовая культура Беларусі: Адраджэнне і ранняе Барока", "Хрысціянскі катэхізіс у кніжна-пісьмовай культуры ўсходніх славян эпохі Адраджэння і Барока: атрыбуцыя, паэтыка, семіётыка" (абедзве 1998). Сааўтар кніг "Нарысы па гісторыі беларуска-рускіх літаратурных сувязяў" (1993), "Гісторыя беларускай літаратуры: Старажытны перыяд" (1996). Распрацаваў "Праграму-праспект па беларускай літаратуры для VIII – XI класаў сярэдняй школы" (1992). Аўтар артыкулаў пра Францішка Скарыну, Міколу Гусоўскага, Сільвестра Косава, Іпація Пацея, Андрэя Рымшу, Мікалая Радзівіла Чорнага і інш.*

славянскіх народаў, наяўнасць разгалінаванай сістэмы водных артэрый, якія дазвалялі весці надзвычай шырокі міжнародны гандаль. Асаблівае значэнне, на думку аўтара, меў старадаўні гандлёвы шлях "з варагаў у грэкі", які праходзіў па Дняпры: *"Бе путь изъ Варяг въ греки и из Грек по Днепру. И верх Днепра волок до Ловати. И по Ловоти в Ылмерь озеро великое, из него же озера потечеть Волхов и втечеть в озеро великое Нево. И того озера внидеть устье в море Варяжское. И по тому морю ити до Рима, а от Рима прити по тому же морю ко Царюгороду, а от Царягорода прити в Понт море, в не же втечет Днепр-река. Днепр бо потече из Оковьскаго леса, и потечеть на полъдне, а Двина ис того же леса потечет, а идеть на полунощье и внидеть в море Варяжьское. Ис того же леса потече Волга на въсток, и вътечеть семьюдесят жерел в море Хвалиськое. Темже и из Руси можеть ити по Волзе в Болгары и въ Хвалисы, и на въсток доити въ жребий Симов. А по Двине въ Варяги, изъ Варяг до Рима, от Рима же до племени Хамова. А Днепр втечеть в Понетьское море жерелом, еже море словеть Руское, по нему же учил святый Оньдрей, брат Петров, якоже реша"* [1, с. 26].

Чацвёртая мікранавела "Слова…" – бадай, найбольш канцэптуальная ва ўсім творы. Яна ўключае звесткі пра першыя ўсходнеславянскія княжацкія дынастыі. Найперш паведамляецца, што палянамі пасля смерці братоў Шчэка і Харыва кіравалі іх прамыя нашчадкі, а іншыя плямёны – крывічы і дрыгавічы – мелі сваіх валадароў. Потым аўтар падае надзвычай істотныя звесткі пра тое, што частка полацкіх крывічоў накіравалася на ўсход і каланізавала вярхоўі Волгі, Дзвіны і Дняпра, заснавала на ўсходзе буйны крывіцкі цэнтр – Смаленск. Паводле аўтара "Слова…", менавіта ад крывічоў паходзіць і славянскае племя – севяране. У гэтай мікранавеле "Слова…" зноў пералічваюцца народы, якія размаўляюць на славянскіх мовах, а таксама згадваюцца плямёны, што плацілі даніну славянам.



Рассяленне ўсходніх славянаў і ўзвядзенне імі гарадоў (Радзівілаўскі летапіс. Арк. 3).

Паводле Лаўрэнцьеўскага летапісу, чацвёртая навела "Слова…" чытаецца наступным чынам: *"И по сих братьи* [Щеку и Хориву] *держати почаша род их княженье в полях, а вдеревлях свое, а дреговичи свое, а словени свое в Новегороде, а другое на Полоте, иже полочане. От них же кривичи, иже седять на верх Волги, и на верх Двины и на верх Днепра, их же град есть Смоленск. Туда бо седять кривичи. Таже север от них. На Белеозере седять весь, а на Ростовьском озере меря, а на Клещине озере меря же. А по Оце реце, где втечеть в Волгу, мурома язык свой, и черемиси свой язык, моръдва свой язык. Се бо токмо словенеск язык в Руси: поляне, деревляне, ноугородьци, полочане, дреговичи, север, бужане, зане седоша по Бугу, после же велыняне. А се суть инии языци, иже дань дають Руси: чюдь, меря, весь, мурома, черемись, моръдва, пермь, печера, ямь, литва, зимигола, корсь, нерома, либь"* [1, 28].

Аўтар праводзіць надзвычай важную думку пра мясцовае паходжанне княжацкай дынастыі крывічоў, найперш палачанаў. Выключную каштоўнасць маюць паведамленні летапісца пра заснаванне менавіта полацкімі крывічамі новага ўсходнеславянскага цэнтра – Смаленска, а таксама ўказанне на паходжанне севяранаў ад полацкіх крывічоў. Гэтыя літаратурныя пасажы з'яўляліся ідэалагічнай асновай і яркім гістарычным абгрунтаваннем актыўнай знешняй палітыкі князя Усяслава Чарадзея, які імкнуўся рэалізаваць геапалітычную стратэгію аб'яднання крывіцкіх і ўсіх славянскіх тэрыторый вакол Полацка. Яны таксама ў найбольшай ступені пацвярджаюць гіпотэзу пра крывіцкую прыналежнасць аўтара "Слова…", яго набліжанасць да легендарнага полацкага князя.

Пятая мікранавела "Слова…" распавядае пра напады на землі славянаў качавых плямёнаў – балгараў, уграў і обраў, прыцясненні і здзекі, якія чынілі захопнікі са славянскага насельніцтва.

Шостая мікранавела – адна з ключавых у "Слове...". У ёй робіцца акцэнт на крэўныя сувязі славян-

скіх народаў, іх мірнае суіснаванне: *“Поляном же живущим особе, якоже рекохом, сущим от рода словеньска, и нарекошася поляне, а деревляне от словень же, и нарекошася древляне. Радимичи бо и вятичи от ляхов. Бяста бо 2 брата в лясех, – Радим, а другий Вятко. И пришедъша седоста Радим на Съжю, и прозвашася радимичи. А Вятко седе съ родом своим по Оце, от него же прозвашася вятичи. И живяху в мире поляне, и деревляне, и север, и радимичи, вятичи и хрвате. Дулеби живяху по Бугу, где ныне велыняне. А уличи и тиверьци седяху бо по Днестру оли до моря. Суть гради их и до сего дне, да то ся зваху от Грек Великая скуфь”* [1, с. 30].

Аўтар распавядае пра паходжанне радзімічаў і вяцічаў ад племя ляхаў, каб падкрэсліць глыбокія крэўныя сувязі заходніх і ўсходніх славянаў. Ідэйная квінтэсенцыя аповеду – выказванне пра мір і згоду паміж славянскімі народамі.

У цэнтры с ё м а й мікранавелы “Слова…” – вельмі каларытныя апісанні звычаяў, традыцый і рытуалаў славянскіх народаў дахрысціянскага перыяду. Аўтар “Слова…” асуджае паганскія традыцыі славянскіх плямён, імкнецца давесці перавагі хрысціянскай этыкі над варварскімі звычаямі. Такім чынам, ён апраўдвае і падтрымлівае працэс хрысціянізацыі славянаў, паказвае універсальнае значэнне і жыццёвую неабходнасць усталявання хрысціянскай маралі, хрысціянскага ладу жыцця сярод усіх славянскіх народаў.

В о с ь м а я мікранавела – гэта ўрывак з элементамі адвольнага пераказу з візантыйскай “Хронікі” Георгія Амартола (IX), якая створана паводле паданняў і іншых гісторыка-літаратурных твораў Антычнасці і Ранняга Сярэднявечча. У агульнай паэтыцы “Слова…” яна выступае як разгорнутая цытата, паходжанне якой аўтар указвае адразу, напачатку, канкрэтна спасылаючыся на крыніцу: *“Глаголеть Георгий в летописаньи…”* [1, с. 32]. Восьмая мікранавела, у адрозненне ад папярэдняй, раскрывае законы і запаветы – пісаныя і звычаёвыя, – паводле якіх жылі іншыя, неславянскія народы: сірыйцы, бактрыяне, індыйцы, халдэі, вавіланяне, гілііі, племя амазонак. Праз апісанні жыцця іншых народаў, плямён і краін аўтар “Слова…” сфармуляваў уласную сістэму этычных каштоўнасцяў. Ён рэзка асуджае палігамію, распуснасць, беспадстаўныя забойствы людзей, ненатуральныя і нялюдскія звычаі. Такім чынам, старажытны пісьменнік імкнуўся выпрацаваць і сфармуляваць стратэгію для славян, акрэсліць сістэму іх маральных арыенціраў, культурныя прыярытэты і цывілізацыйны выбар.

Д з е в я т а я, заключная, мікранавела – гэта разгорнуты аповед пра ўзнікненне славянскага пісьменства, асветніцкую і перакладчыцкую дзейнасць салунскіх братоў Кірылы (Канстанціна) і Мяфодзія. Яна напісана паводле матываў прынамсі трох паўднёваславянскіх твораў: “Пра азбуку” Чарнарызца Храбра, ананімных “Жыція Канстанціна Філосафа – першага настаўніка славянскага народа” і “Жыція айца і настаўніка Мяфодзія, архіепіскапа мараўскага” [3; 4].



Здзекі абраў са славянскіх жанчын (Радзівілаўскі летапіс. Арк. 5, адв.).

Навела пра ўзнікненне славянскага пісьменства, на думку аўтара “Слова…”, павінна была выразна засведчыць агульныя культурныя вытокі славянскіх народаў, іх духоўную лучнасць, пацвердзіць даўнюю прыналежнасць славянаў да цывілізаваных народаў свету, якія мелі ўласнае пісьменства і кнігі.

Такім чынам, галоўная ідэя “Слова…” – у тым, каб давесці гістарычнае права славянскіх народаў на занятыя тэрыторыі, справядлівасць іх змагання з качэўнікамі. Аўтар як чалавек хрысціянскага светапогляду імкнуўся сцвердзіць неабходнасць хрысціянізацыі славянскіх народаў, паказваючы перавагі хрысціянскай маралі над паганскімі звычаямі, традыцыямі і законамі. Старажытны пісьменнік нязменна праводзіць думку пра неабходнасць скаардынаванасці знешнепалітычных дзеянняў славянскіх князёў.

Аналіз асноўных сюжэтных ліній і семантыка твора дазваляюць прасвятліць пытанне пра аўтарства, час і месца напісання “Слова…” – выдатнага помніка ўсходнеславянскага прыгожага пісьменства і гістарыяграфіі. Верагодней за ўсё, стваральнікам шэдэўра з’яўляўся нехта з адукаваных і начытаных людзей мясцовага паходжання, набліжаных да полацкага князя, аўтар добра ведаў вусныя паданні, легенды і міфы пра славянскія плямёны, меў багатыя ўласныя назіранні. Ён напэўна быў знаёмы з творамі візантыйскіх пісьменнікаў Ранняга Сярэднявечча: Пракопія Кесарыйскага, Псеўда-Кесарыя, якія шмат пісалі пра славянскія плямёны. Магчыма, ён меў нейкія



Мяфодзій з вучнямі перакладаюць кнігі з грэчаскай на царкоўнаславянскую мову (Радзівілаўскі летапіс. Арк. 14).



Рытуальныя скокі і гульбішчы ў старажытных славянаў: радзімічаў, вяцічаў, севяранаў (Радзівілаўскі летапіс. Арк. 6, адв.).

сувязі з хрысціянскімі місіянерамі, што наведваліся з асветніцкімі мэтамі на ўсходнеславянскія абшары з Візантыі.

"Слова пра славянскія плямёны, іх звычаі і пісьменства" – сапраўдны шэдэўр гістарыяграфіі і прыгожага пісьменства, які належыць да агульнай культурнай спадчыны ўсходніх славян. На працягу стагоддзяў "Слова…" надзвычай шанавалася адукаванымі продкамі сучасных беларусаў, украінцаў і рускіх, неаднаразова старанна перапісвалася, друкавалася і цытавалася ўсходнеславянскімі кніжнікамі, летапісцамі, пісьменнікамі і гісторыкамі.

У Радзівілаўскім летапісе найважнейшыя эпізоды "Слова пра славянскія плямёны, іх звычаі і пісьменства" шыкоўна праілюстраваныя больш чым дзесяццю красамоўнымі малюнкамі [2, арк. 2, адв. – 6 адв.].

Пераклад "Слова пра славянскія плямёны, іх звычаі і пісьменства" выкананы паводле Лаўрэнцьеўскага летапісу, яго найбольш карэктнай публікацыі: "Памятники литературы Древней Руси" (Масква, 1978). Асобныя месцы ўдакладнены паводле Радзівілаўскага летапісу: "Радзивиловская летопись: Текст, исследование, описание миниатюр" (С.-Пецярбург – Масква, 1994).

Спіс літаратуры

1. **Памятники литературы Древней Руси.** – М., 1978. – С. 22 – 277.

2. **Радзивиловская летопись :** Текст, исследование, описание миниатюр. – СПб. – М., 1994.

3. **Сказания о начале славянской письменности** / Вступ. статья, перевод и комментарии Б. Флори. – М., 1981.

4. **Хрестоматия по истории южных и западных славян.** Т. 1. – Минск, 1987.

СЛОВА ПРА СЛАВЯНСКІЯ ПЛЯМЁНЫ, ІХ ЗВЫЧАІ І ПІСЬМЕНСТВА

I

І змяшаў Бог людзей, і падзяліў на семдзесят два народы, і рассеяў па ўсёй зямлі. Потым моцным ветрам пабурыў Госпад Вавілонскі слуп, рэшткі якога засталіся паміж Асірыяй і Вавілонам. Гэтыя руіны маюць у вышыню і ў шырыню 5433 локці і захоўваюцца ўжо шмат гадоў.

Пасля разбурэння слупа і раздзялення народаў нашчадкі Сіма атрымалі ўсходнія краіны, а нашчадкі Хама – паўднёвыя тэрыторыі. Яфетавы спадкаемцы атрымалі Захад і паўночныя абшары.

Ад сямідзесяці двух народаў паходзяць і славяне, з племя Яфетава. *Нарцы* – гэта акурат і ёсць славяне.

II

У старадаўнія часы славяне аселі на Дунаі, дзе цяпер Вугорская і Балгарская землі. Ад іх пайшлі ўсе астатнія славяне на зямлі.

Кожнае славянскае племя атрымлівала найменне ў залежнасці ад месца аселасці.

Маравы атрымалі свой назоў ад рэчкі Маравы, дзе яны пасяліліся.

Іншыя славяне сталі называцца *чэхамі*.

Да славянаў належаць *белыя харваты, сербы* і *харутане*.

Калі на дунайскіх славянаў пачалі нападаць волхі, захопліваць славянскія землі і ўсяляк прыцясняць, многія славяне накіраваліся да Віслы і аселі там. Яны сталі называцца *ляхамі*. Ад тых ляхаў пайшлі *палякі, люцічы, мазаўшане* і *памаране*.

Частка славянаў асела на Дняпры. Адны з іх атрымалі найменне *паляне*, іншыя – *драўляне*, бо жылі ў лясах.

Славяне, якія пасяліліся між Прыпяццю і Дзвіной, называліся *дрыгавічы*.

Славяне, што жылі ўздоўж Дзвіны, мелі назоў *палачане* – ад наймення рэчкі Палаты, якая ўпадае ў Дзвіну.

Славяне, якія пасяліліся ля возера Ільмень, захавалі свой старадаўні назоў – *славяне*. Яны ўзвялі горад і назвалі яго Ноўгарад.

Іншыя славяне, што аселі ўздоўж Дзясны, Сейма, Сулы, назваліся *севяране*.

Гэтак рассяліўся славянскі народ. У адпаведнасці з найменнем славян іх пісьменства называлася славянскім.

III

Шлях з варагаў у грэкі і з грэкаў у варагі праходзіць па Дняпры. У вярхоўі Дняпра ёсць волак да Ловаці. А па Ловаці можна даплысці да Ільмень-возера.

З Ільмень-возера цячэ Волхаў, які ўпадае ў вялізнае возера Нява (Ладажскае возера. – **І. С.**). Неўскае возера злучана з Варажскім морам (Балтыйскім. – **І. С.**). Праз тое мора можна плысці ажно да Рыма. А ад Рыма можна ісці морам да Царграда. А ад Царгарда можна даплысці ў Понт мора (Чорнае мора. – **І. С.**), у якое ўпадае Дняпро.

Дняпро выцякае з Акоўскага лесу і цячэ на поўдзень.

Дзвіна гэтаксама мае вытокі ў тым лесе. Яна цячэ на поўнач і ўпадае ў Варажскае мора.

З Акоўскага лесу пачынаецца і Волга. Яна цячэ на ўсход і ўпадае ў Хвалынскае мора (Каспійскае. – **І. С.**) сямюдзесяццю сутокамі.

Як бачна, з Русі льга ісці Волгай да булгараў (волжскіх. – **І. С.**) і ў Хвалісы, а потым далей на ўсход, у землі Сіма.

Дзвіной можна плысці ў землі варагаў, а ад варагаў – да Рыма, а з Рыма – да племя Хамава.

Сутокі Дняпра ўпадаюць у Панційскае мора, якое інакш называецца Рускім. На яго ўзбярэжжы, як кажуць, некалі прапаведаваў святы Андрэй, брат апостала Пятра.

IV

Па смерці братоў Шчэка і Харыва іх спадчыннікі княжылі ў палянаў. Драўляне мелі ўласных валадароў, дрыгавічы мелі сваіх князёў. Славяне, якія ў Ноўгарадзе, мелі ўласных князёў. І палачане, якія на Палаце, мелі сваіх князёў.

Ад палачанаў паходзяць крывічы, якія аселі ў вярхоўях Волгі, Дзвіны і Дняпра. Іх галоўны горад – Смаленск, дзе жывуць крывічы.

Ад крывічоў паходзяць севяране.

На Белвозеры пасялілася племя *весь*. На Растоўскім возеры і Клешчыне – *мера*.

На рацэ Ака, там, дзе яна ўпадае ў Волгу, жыве *мурама*. Яны гавораць на ўласнай мове. Сваю мову маюць таксама *чарамісы і мардва*.

Славянскімі мовамі на Русі карыстаюцца наступныя народы: паляне, драўляне, ноўгарадцы, палачане, дрыгавічы, севяране, бужане, названыя так паводле месца аселасці – ракі Буг.

Вось народы, якія плацяць Русі даніну: чудзь, мера, весь, мурама, чарамісы, мардва, перм, пячора, ям, літва, зімігола, корсь, нерома, ліб.

V

Калі славяне жылі на Дунаі, на іх землі ад скіфаў, або ад хазараў, прыйшлі *балгары*. Яны пасяліліся ўздоўж Дуная і пачалі выцясняць славянаў.

Пасля балгараў прыйшлі *белыя угры* і аселі на славянскіх землях. Гэтыя угры з'явіліся аднекуль пры цару Іраклію, які хадзіў на персідскага цара Хаздроя.

У тыя часы жылі і *обры*. Яны ваявалі з царом Іракліем і ледзьве не паланілі яго. Обры нападалі на славянаў, асабліва назалялі дулебам. Обры гвалцілі дулебскіх жанчын і здзекаваліся з іх. Калі обрын хацеў некуды паехаць, дык не дазваляў запрагаць каня ці вала, а загадваў запрэгчы тры, чатыры або пяць дулебскіх жанчын і везці яго, обрына. Гэтак нялюдска здзекаваліся з дулебаў!

Обры былі велізарнага росту, надта ганарлівыя. Але Бог прыбраў іх, знішчыў пад корань, не засталося аніводнага обрына. І пайшла на Русі з тых часоў прымаўка: "Згінулі, як обры". Цяпер няма ні іх племя, ні іх нашчадкаў.

VI

Такім чынам, паляне і драўляне наўпрост паходзяць ад славянскага кораня. Адметныя найменні яны атрымалі пазней.

Радзімічы і *вяцічы* пайшлі ад ляхаў. Жылі два браты-ляхі ў лясах: першы – Радзім, а другі – Вятка.

Радзім са сваім родам пайшоў на Сож і асеў там. Яго нашчадкі атрымалі найменне радзімічы.

Вятка са сваім родам пайшоў на Аку. Паводле яго імя народ назваўся вяцічы.

Усе славянскія народы – паляне, драўляне, севяране, радзімічы, вяцічы і харваты – жывуць у міры і згодзе.

Дулебы жылі ўздоўж Буга, дзе цяпер сядзяць валыняне.

Улічы і *цівercы* жылі па Днястры, суседзілі з Дунаем. Іх налічвалася велізарная колькасць. Яны займалі



Нарада візантыйскага імператара Міхаіла III з філосафамі пра накіраванне настаўнікаў-асветнікаў у славянскія землі (Радзівілаўскі летапіс. Арк. 13, мал. 1).

абшары ўздоўж Днястра ажно да мора. Гарады улічаў і цівercаў стаяць да сёння. Нездарма грэкі называлі іх "Вялікая Скіф".

VII

Славянскія плямёны маюць уласныя звычаі і традыцыі, шануюць запаветы і законы сваіх продкаў, захоўваюць адметныя норавы і рытуалы.

Паляне – стрыманыя і разважлівыя, сарамлівыя перад нявесткамі, сёстрамі, маткамі і бацькамі. Яны таксама вельмі сарамлівыя перад свякроўкамі і дзеверамі. Паляне маюць адмысловы шлюбны рытуал: зяць не ходзіць за нявестай, яе прыводзяць яму ўвечары, а назаўтра прыносяць пасаг у яго дом.

Драўляне жывуць нібы звяры, жывёльным статкам. Яны забіваюць адзін аднаго, ядуць усякія нечыстоты. Шлюбу ў іх няма, дзевак ловяць і клочаць (умыкаюць) каля рэчак.

Радзімічы, вяцічы і севяране маюць аднолькавыя звычаі. Жывуць у лясах, нібы дзікія звяры. Ядуць усё, што трапляецца. Брыдкасловяць перад бацькамі і свякроўкамі. Шлюбаў не маюць. Збіраюцца з навакольных паселішчаў на гульбішчы, дзе скачуць і спяваюць паганскія песні. Пасля кожны валодае дзеўкай паводле яе згоды. Маюць адразу па дзве ці тры дзеўкі.

Калі хто памірае, учыняюць над ім трызну. Збіраюць вялікую сцірту дроў, зверху кладуць памерлага і спальваюць цела. Потым попел і рэшткі касцей кладуць у жбан і ставяць на слупы каля дарог.

Гэтакія рытуалы маюць і крывічы, а таксама тыя славяне, што не ведаюць Божага закону, але самі сабе чыняць законы.

VIII

Піша Георгій у сваім летапісе: "Кожны народ мае ўласны закон. У адных – законы выкладзены на пісьме. Іншыя народы жывуць паводле звычаёвага (агульнага) права, што існуе ў форме вусных запаветаў продкаў.

Звычаёвым правам карыстаюцца *сірыйцы*, якія жывуць на краі свету. Яны строга выконваюць запаветы продкаў – не чыніць оргіяў, не займацца пералюбствам, не красці, не паклёпнічаць, не забіваць, не рабіць аніякай шкоды.

Падобны закон існуе і ў *бактрыянаў*, якія яшчэ называюцца рахманы або востраўцы. Дзеля добрапрыстойнасці і дзеля выканання запаветаў продкаў бактрыяны не ядуць мяса, не п'юць віна, не ўчыняюць



Стварэнне Кірылам і Мяфодзіем славянскай азбукі (Радзівілаўскі летапіс. Арк. 13, мал. 2).

оргіяў, не дазваляюць злых учынкаў, але жывуць з верай і Божым страхам у сэрцы.

Зусім іншыя звычаі ў суседніх з імі *індыйцаў*. Яны – забойцы, брыдкасловы, сярдзітыя звыш усякай меры. У аддаленых закутках іх зямлі – ядуць людзей, забіваюць падарожнікаў, харчуюцца не раўнуючы як сабакі.

Жахлівыя законы ў *халдэяў* і *вавілянянаў*. Яны спяць з уласнымі маткамі, уступаюць у сувязь з пляменніцамі, забіваюць адзін аднаго.

Адметны закон у *гілій*. У іх – жанчыны аруць, узводзяць жытло, выконваюць мужчынскія працы. Але жанчыны маюць права кахацца столькі, колькі захочуць. Мужчыны ім не пярэчаць і не забараняюць, калі выпадкова ўбачаць гэта. Сярод іх ёсць вельмі адважныя жанчыны, якія ўмела палююць на дзікіх звяроў.

У *Брытаніі* некалькі мужчын могуць спаць з адной жанчынай і, наадварот, некалькі жанчын могуць задавальняць патрэбы цела з адным мужчынам. Чыняць беззаконні без дакараў і бесперастанку, нібы гэта і ёсць запаветы продкаў.

Амазонкі ўвогуле жывуць без мужчын. Нібы бясслоўныя жывёліны, яны адзін раз на год, бліжэй да восеньскіх святаў, пакідаюць сваю зямлю і ўступаюць у сувязь з навакольнымі мужчынамі. Амазонкі лічаць гэты час вялікімі святамі, урачыстымі днямі. Пасля таго як зацяжараць, яны ўцякаюць з тых месцаў. Калі наступае час родаў і на свет з'яўляецца хлопчык, амазонкі забіваюць яго. Калі нараджаецца дзяўчынка – старанна даглядаюць і выхоўваюць яе".

IX

Усе славянскія народы мелі агульную мову: славяне, што жылі на Дунаі, землі якіх захапілі венгры, і маравы, і чэхі, і ляхі, і паляне.

Спачатку кнігі былі перакладзеныя для мараваў. Гэтае пісьменства было названае славянскім.

Пасля таго як славяне прынялі хрышчэнне, іх князі Расціслаў, Святаполк і Коцэл накіравалі паслоў да цара Міхаіла са словамі:

– Зямля наша ахрышчаная, але няма ў нас Настаўніка. Трэба, каб ён прапаведаваў у нас, навучаў нас і тлумачыў нам святыя кнігі. Бо мы не разумеем ні грэчаскай, ні лацінскай моваў. Адны навучаюць нас так, іншыя – гэтак, а мы не ведаем кніг, не разумеем значэння і сэнсу напісанага. Дашліце нам настаўнікаў, якія разумеюць кніжныя словы і іх сутнасць.

Калі візантыйскі цар пачуў гэтую просьбу, ён паклікаў філосафаў і перадаў ім словы славянскіх князёў.

Філосафы адказалі:

– У Салуні ёсць гаспадар, імя якога Леў. Ён мае двух сыноў, а яны добра разумеюць славянскую мову і ўжо вельмі знаныя філосафы.

Цар выслухаў параду мудрацоў і накіраваў у Салунь да Льва ганцоў, якія перадалі ваяводу Льву царскі загад:

– Як найхутчэй прышлі да нас тваіх сыноў – Мяфодзія і Канстанціна.

Леў неадкладна выканаў распараджэнне цара і адправіў да яго сваіх сыноў.

Мяфодзій і Канстанцін прыйшлі да цара.

Цар звярнуўся да іх:

– Вось Славянская зямля просіць, каб я прыслаў ім настаўнікаў. Трэба перакласці і растлумачыць ім святыя кнігі. Яны надта прагнуць ведаць Божае Слова.

Угаварыў цар Мяфодзія і Канстанціна і накіраваў у Славянскую зямлю да Расціслава, Святаполка і Коцэла.

Прыйшлі браты ў Славянскую зямлю і прыступілі да працы. Яны склалі славянскую азбуку, а неўзабаве пераклалі Апостал і Евангелле.

Славяне былі надзвычай усцешаныя, калі пачулі велічнае Божае Слова на ўласнай мове.

Пасля Мяфодзій і Канстанцін пераклалі Псалтыр, Актоіх і іншыя кнігі.

Але знайшліся і такія, што пачалі ганіць славянскія кнігі, кажучы:

– Аніякі народ не варты мець уласнае пісьменства, апрача яўрэяў, грэкаў і лацінянаў. Бо надпіс Пілата на крыжы Госпада зроблены толькі на трох мовах – яўрэйскай, грэчаскай і лацінскай.

Калі папа рымскі дачуўся пра нападкі на славянскія кнігі, ён гнеўна асудзіў невукаў і зазначыў:

– Няхай споўняцца словы Святога Пісання, дзе сказана: "Няхай усе народы шануюць Бога!" І ў іншым месцы: "Няхай усе народы ўсхваляюць веліч Госпада, бо Святы Дух даў ім здольнасць маўлення!"

Потым папа рымскі яшчэ дадаў:

– Калі нехта будзе зневажаць славянскія кнігі, ён будзе адлучаны ад Царквы да таго часу, пакуль не выправіцца. Зневажальнікі славянскага пісьменства – гэта ваўкі, а не авечкі. Іх належыць распазнаваць паводле злых учынкаў і асцерагацца іх. Вы, дзеці, прыслухайцеся да Божай навукі і не адкідвайце царкоўныя загады, якія даў вам настаўнік ваш Мяфодзій.

Потым Канстанцін вярнуўся назад і накіраваўся вучыць балгарскі народ.

Мяфодзій застаўся ў Маравіі. Праз нейкі час князь Коцэл паставіў Мяфодзія епіскапам у Панноніі, на кафедры святога апостала Андроніка – аднаго з 70 вучняў святога апостала Паўла.

Мяфодзій пасадзіў двух святароў – добрых пісараў – і пераклаў усе кнігі цалкам з грэчаскай на славянскую мову. Ён ажыццявіў тытанічную працу за шэсць месяцаў, пачаў у сакавіку, а скончыў 26 кастрычніка.

Гэтак Мяфодзій справай сваёй годна ўшанаваў Госпада.

Пераклаў **Іван САВЕРЧАНКА.**

Галіна ЗЕНАВА

ЭВАЛЮЦЫЯ ЖАНРУ АПАВЯДАННЯ Ў ПРАЦЭСЕ МАСТАЦКАГА АСЭНСАВАННЯ РЭЧАІСНАСЦІ КАНЦА XX ст.

Эвалюцыя жанру беларускага апавядання, як і іншых жанраў літаратуры, – заканамерны працэс, ён залежыць і ад гістарычнага шляху Беларусі, і ад сучасных рознанакіраваных тэндэнцый грамадскага развіцця. «Катэгорыя літаратурнага жанру – катэгорыя гістарычная, – адзначаў расійскі літаратуразнаўца Дзмітрый Ліхачоў. – Рэч не толькі ў тым, што адны жанры прыходзяць на змену другім і ніводны з іх не з'яўляецца для літаратуры "вечным", – рэч яшчэ і ў тым, што змяняюцца самі прынцыпы вылучэння асобных жанраў, змяняюцца тыпы і характар жанраў, іх функцыі ў тую ці іншую эпоху»[1].

Сёння "малы" жанр нясе вялікую ідэйна-эстэтычную нагрузку, сугучную запатрабаванням часу, з ім звязаны напружаныя пошукі новых прыёмаў і прынцыпаў спазнання свету і чалавека. Актывізацыю апавядання нярэдка звязваюць з паваротнымі момантамі гісторыі. Аднак рэзка выяўленая "паваротнасць" эпохі – гэта не адзіная жыццядайная глеба для развіцця апавядання. Расійскі даследчык Э. Шубін справядліва звязваў росквіт апавядання з "перыядамі глыбокіх духоўных зрухаў у грамадскай свядомасці, з перыядамі ідэйнай мітусні і пакутлівых пошукаў адказу на вострыя сацыяльныя пытанні"[2]. У часы духоўнага абнаўлення, калі ўсё знаходзіцца ў руху і шматлікія грамадска-гістарычныя, ідэйна-маральныя з'явы жыцця не атрымліваюць яшчэ закончанага развіцця, калі аўтару цяжка знайсці канцэпцыю і герояў для рамана ці аповесці, ён выхоплівае з жыцця цікавыя моманты і робіць іх прадметам адлюстравання ў апавяданні. Добра вядомае выказванне Вісарыёна Бялінскага: "Калі ёсць ідэі часу, то ёсць і формы часу"[3]. У гісторыі не толькі беларускай, але і сусветнай літаратуры пастаянна адбываецца змена лідэрства жанраў, якая завяршаецца ўсталяваннем панавання якога-небудзь аднаго з іх. Прычын нераўнамернага развіцця апавядання, акрамя зменлівых ідэалагічных патрабаванняў часу, шмат: "На большую ці меншую інтэнсіўнасць развіцця навелістыкі і яе стылёвую і ўнутрыжанравую дыферэнцыяцыю ўздзейнічае не толькі грамадская атмасфера, але і іншыя фактары – гістарычны вопыт літаратуры, папярэднія поспехі жанру, стаўленне чытачоў і крытыкі, уздзеянне асобных буйных талентаў на літаратурны працэс"[4].

Беларускае апавяданне, перажыўшы даволі значны перыяд заняпаду (ад пасляваеннага часу да другой паловы 1950-х гг.), паступова пачало назапашваць значныя мастацкія каштоўнасці, якія вырашылі кірункі і галоўныя тэндэнцыі ў развіцці гэтага жанру. Некаторыя апавядальнікі старэйшага і сярэдняга пакалення разумелі неабходнасць перамен і шмат зрабілі для таго, каб сцвердзіць агульначалавечыя каштоўнасці ў літаратуры, рыхтуючы тым самым глебу для духоўна-культурнага адраджэння нацыі.

1960-я гады – плённы перыяд развіцця "малой" прозы. У гэты час літаратурнае пакаленне "шасцідзесятнікаў" свядома стварыла беларускае культурнае асяроддзе, што пашырыла пакаленне пісьменнікаў-"сямідзесятнікаў", ці, як яго яшчэ называюць, "філалагічнае пакаленне", якому былі ўласцівыя адметнасць мастацкага выяўлення, неардынарнасць мыслення, аналітычны падыход да рэчаіснасці, свежасць і арыгінальнасць ідэй. У 60 – 70-я гг. XX ст. апавядальнікі адлюстроўвалі змены, што адбываліся ў жыцці і духоўным абліччы сучасніка, часцей абапіраліся на асабіста перажытае і добра зведанае на ўласным вопыце.

На сумежжы 1970 – 1980-х гг. "малая" проза, як і ўся падцэнзурная літаратура, перажывала неспрыяльны час, адбывалася спрашчэнне сацыяльных і маральных калізій, у апавяданні панавалі стэрэатыпы, прымітывізм і схематызм. У артыкуле "Куды ідзе апавяданне?" Серафім Андраюк адзначаў, што апавяданне "за рэдкімі выключэннямі пакідае ўражанне аднастайнасці, унутранай скаванасці. Яму не хапае фантазіі, акрыленасці"[5]. Крытык заўважыў, што такі мабільны і чулы да перамен у жыцці жанр дзесьці спыніўся ў руху, і супынак гэты задужа зацягнуўся. Назіралася тэматычная абмежаванасць, засілле светапоглядных і мастацкіх стэрэатыпаў. Прыватныя падзеі ў жыцці чалавека, яго радасці і беды, надзеі і расчараванні выглядалі зусім дробнымі, бо так іх падавалі некаторыя апавядальнікі.

Другую палову 1980-х і першую палову 1990-х гг. можна назваць эпохай нацыянальна-культурнага адраджэння. Пасля 1985 г., калі ў СССР пачалася перабудова, адбыліся істотныя, лёсавызначальныя змены ў грамадстве, апавяданне стала сапраўдным барометрам сучаснасці, узрасла яго роля ў літаратурным жыцці, склаліся спрыяльныя ўмовы для творчасці кожнага таленавітага пісьменніка як рэалістычнага, так і мадэрнісцкага кірунку. Пісьменнікі па-новаму пачалі разумець ролю і месца літаратуры ў духоўным жыцці народа і тыя актуальныя задачы, якія пастаўлены перад ёй у сувязі з нацыянальным адраджэннем. Менавіта ў гэты перыяд на вышыню актыўнай маральнай сілы ў Беларусі ўзнялася сама пісьменніцкая праца як адзін з самых дзейсных сродкаў захавання беларускай ментальнасці. Нараджалася беларускасць, што звярталася ўжо абліччам да Боскага.

У беларускую літаратуру прыйшло чарговае пакаленне маладых літаратараў, на чыю творчасць вельмі паўплывалі таленты Якуба Коласа, Максіма Гарэцкага, Янкі Брыля, Вячаслава Адамчыка, Івана Пташнікава, Барыса Сачанкі, Міхася Стральцова. З'явіўся тэрмін «беларуская літаратура "новай хвалі"». Такія празаікі, як Уладзімір Арлоў, Алесь Наварыч, Андрэй Федарэнка, Галіна Багданава, Лявон Неўдах, Уладзімір Сцяпан, Уладзімір Клімовіч, Сяргей Кавалёў, Уладзімір Ягоўдзік, Ірына Жарнасек, Хрысціна Лялько ў пачатку 1990-х гг. мелі адну-дзве кніжкі прозы. Пад уплывам сусветнай, заходнееўрапейскай літаратуры напісалі творы Алесь Асташонак, Адам Глобус, Алег Мінкін, Барыс Пятровіч. "Малая" проза "новай хвалі" друкавалася ў 1980-я гг. у перыёдыцы і асобных выданнях: "Маладыя галасы", "Тутэйшыя", "Жнівеньскі праспект", "Блакітны ліхтар", "Мілавіца", "Ксэракс беларускі", "Літаратура" і інш. Шмат кніг прозы маладых аўтараў з'явілася ў «Бібліятэцы часопіса "Маладосць"»: "Ноч пацалункаў незалежнасці" Алеся Наварыча, "Гісторыя хваробы" Андрэя Федарэнкі, "Папяровыя замкі" Галіны Багданавай, "Самнасам" Уладзіміра Сцяпана, "Міражы ценяў" Анатоля Казлова, "Горкі зефір" Уладзіміра Міхно, "Вартавыя" Ягора Конева, "Вялікдзень" Міколы Куляша, "Праро-



Галіна Мікалаеўна Зенава *– даследчык літаратуры. Кандыдат філалагічных навук. Закончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1979) і аспірантуру пры ім (1981). Старшы навуковы супрацоўнік Цэнтра сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Рэдагавала і была адказнай за выпуск навукова-рэфератыўных і тэматычных зборнікаў па праблемах развіцця гуманітарных навук у краіне. Аўтар шэрагу публікацый па сучаснай беларускай літаратуры і культуры.*

тва" Стаха Дзедзіча, "Сабака без ашыйніка" Барыса Лагоды, "Бачу сонца" Пётры Сямінскага і іншыя.

Ля вытокаў літаратуры "новай хвалі" знаходзіліся сябры суполкі "Тутэйшыя" (1987 – 1992), пафасам дзейнасці якой стала адраджэнская ідэя. Сваёй задачай сябры суполкі "Тутэйшыя" лічылі адраджэнне роднай мовы, вывучэнне беларускай гісторыі, захаванне фальклору, ахову помнікаў культуры. У 1993 г. узнікла суполка "Таварыства вольных літаратараў", сябры якой арганізавалі выдавецтва "Полацкае ляда" і выпуск часопіса "Калосьсе". У творах сяброў ТВЛ адчуваецца схільнасць да жанру антыутопіі, фантасмагорыі, эстэтыкі абсурду, сцвярджаецца бессэнсоўнасць жыцця, выпадковасць у гісторыі. Наступны этап літаратурнай эвалюцыі звязаны з творчай суполкай "Бум-Бам- Літ"*, якая арганізавалася ў 1995 г. "Бумбамлітаўцы ахвотна пераносяць на беларускую глебу постмадэрнісцкія ідэі, формы, прыёмы. Перайманне вядомых узораў (а то і адкрытае запазычанне ў іншых) не лічыцца чымсьці непрыстойным, літаратурным крыміналам, а наадварот, адным з шляхоў уваходжання ў свет мастацкай творчасці, што адпавядае постмадэрнісцкай практыцы"[6].

З сярэдзіны 1980-х гг. маладыя пісьменнікі прапагандавалі ***ідэю нацыянальнага адраджэння*** праз ***еўрапеізацыю*** беларускай літаратуры. Напачатку, мяркуючы па тагачасных творах, еўрапейскасць асацыіравалася ў моладзі з эстэцкай культурай (літаратурай): "Маладзёжная еўрапеізацыя матэрыялізавалася ў кавалерыйскай атацы на замежныя жанрава-стылёвыя формы. Гэта было жаданне адразу сягнуць у авангард (на перадавую)"[7]. Пісьменнікі новай генерацыі захапляліся Мікалаем Бярдзяевым, Хорхе Луісам Борхесам, іншымі рускімі і заходнімі філосафамі, выкарыстоўвалі фантастычныя, містычныя матывы ў творчасці, як, напрыклад, Барыс Пятровіч у кнігах "Сон між пачвар" і "Фрэскі", Алег Мінкін у кнізе "Праўдзівая гісторыя Краіны Хлудаў", Уладзімір Клімовіч у зборніку апавяданняў "Лаліта і кактус", Вітаўт Чаропка ў творы "Перамога ценю".

У пачатку ХХ ст. рускі філосаф Васіль Розанаў у "Апакаліпсісе нашага часу" сцвярджаў: "Глыбокі падмурак усяго, што цяпер адбываецца, заключаецца ў тым, што ў еўрапейскім (у тым ліку і рускім) чалавецтве ўтварыліся каласальныя пустоты ад былога хрысціянства; і ў гэтыя пустоты правальваецца ўсё: троны, класы, саслоўі, багацце. Усе ўзрушаны, усе гінуць, усё гіне. Але ўсё гэта правальваецца ў пустату душы, якая страціла старажытны змест"[8]. Словы В. Розанава не страцілі актуальнасці і сёння. Пісьменнікаў хвалюе бездухоўнасць чалавека, яго разгубленасць перад лёсам і абставінамі, калі трацяць вартасць трывалыя чалавечыя каштоўнасці.

Апавядальнікі "новай хвалі", для якіх было не характэрна пачуццё віны і адказнасці за ранейшае, пачалі выяўляць і парадзіраваць асноўныя штампы літаратуры сацыялістычнага рэалізму, выказваць пратэст супраць абсурднасці "сацыялістычнага эксперыменту", крытыкаваць савецкі лад жыцця. У творах "Чалавек з гармонікам" Уладзіслава Рубанава, "Багамаз" Хрысціны Лялько, "Саколка" Ірыны Жарнасек, "Узвіжанне" Уладзіміра Бутрамеева, "Хутар" Алеся Кажадуба пашыраюцца веды пра мінуўшчыну, развенчваюцца многія сацыяльныя міфы савецкай эпохі. Маладыя празаікі наблізілі час шматграннага развіцця "малой" прозы. Стала магчымым гаварыць пра духоўна-псіхалагічную напоўненасць характараў галоўных герояў, пра ідэйна-эстэтычную і мастацкую значнасць сучасных апавяданняў. Да цудоўных твораў "Гуртавое" Янкі Брыля, "Гусі мае, лебедзі…" Паўла Місько, "Дзень перад святам" Анатоля Кудраўца, "Кароль Нябожа" Вячаслава Адамчыка, "Падгалая" Барыса Сачанкі, "Міш" Алеся Жука, што сталі ўжо класікай, далучыліся апавяданні "Бляха" Андрэя Федарэнкі, "Рабкова ноч" Алеся Наварыча, "Ператварэнне" Алеся Асташонка, "Дзень нараджэння" Анатоля Казлова, "Свеціцца лісце" Уладзіслава Рубанава, "Скерца для перабітых пальцаў" Галіны Багданавай.

Пакаленне "новай хвалі", якое прыйшло ў беларускую літаратуру ў другой палове 1980-х і ў 1990-я гг. з жаданнем пісаць па-новаму, неяк адысці ад традыцыйных прыёмаў пісьма, умоўна можна падзяліць на дзве групы. У першую ўваходзяць творцы пераважна традыцыйна-рэалістычнай манеры пісьма і веры ў здольнасць рэалізму да творчай трансфармацыі – гэта У. Арлоў, А. Федарэнка, А. Наварыч, І. Жарнасек, Х. Лялько, Я. Конеў, Г. Багданава, П. Васючэнка, А. Кажадуб, У. Ягоўдзік і іншыя. Неабходна адзначыць прыкметы "традыцыйнай" рэалістычнай літаратуры, якія ў кожнага апавядальніка выявіліся па-рознаму: паказ жыцця "ў формах самога жыцця", сацыяльнасць, маралізатарства, тэндэнцыйнасць, публіцыстычнасць. Да другой групы можна аднесці празаікаў, у чыёй творчасці пераважае эксперымент з формай і зместам, ужываюцца здабыткі паэтыкі мадэрнізму і постмадэрнізму: Б. Пятровіч, А. Глобус, А. Мінкін, В. Чаропка, А. Асташонак, А. Казлоў, У. Клімовіч. У прозе апавядальнікаў-наватараў значна большую вагу набываюць медытатыўна-роздумныя, філасофскія формы і спосабы рэалізацыі аўтарскіх задумак, цікавых тэмаў. Такіх твораў-даследаванняў патрабуе сам час. Наяўнасць мадэрнісцкіх павеваў у беларускіх пісьменнікаў прызнае літаратуразнаўца Уладзімір Гніламёдаў і адзначае: "Раней мы як бы нават ганарыліся тым, што ў нас не было ні сімвалізму, ні дэкадэнцтва, ні футурызму, ці якіх іншых мадэрнісцкіх ухілаў, што шлях нашай літаратуры быў надзіва здаровы і артадаксальны. Узнікненне і станаўленне мадэрнізму як ідэйна-мастацкай плыні абумоўлена патрэбамі больш глыбокага адлюстравання чалавечай суб'ектыўнасці, імкненнем да творчай свабоды і самарэалізацыі"[9].

* У часопісе "Роднае слова" надрукаваныя артыкулы Аксаны Бязлепкінай «Маладзёжны літаратурны рух у Беларусі напрыканцы ХХ стагоддзя: Таварыства "Тутэйшыя"» (2005, № 2), "Таварыства вольных літаратараў" (2005, № 4) і «Творчы рух "Бум-Бам-Літ"» (2005, № 12). – *Заўвага рэд.*

Празаікі "новай хвалі" задумваюцца над сэнсам жыцця перад тварам смерці, над тым, у імя чаго жыве чалавек на свеце, чаго ён варты і ці ёсць мяжа чалавечым магчымасцям. У творах яны адмаўляюцца ад тых абставін і ўмоў, якія пазбаўляюць чалавека індывідуальных прыкмет у жыцці, пачуццях, паводзінах, сцвярджаюць, што стандарт і бездухоўнасць – з аднаго кораня. Некаторым маладым празаікам традыцыйна-рэалістычная манера пісьма здаецца занадта кансерватыўнай, і яны пазбягаюць працаваць у жанры рэалістычнага апавядання, якое трымаецца на традыцыйнай увазе да простага чалавечага жыцця, на эпічнай грунтоўнасці, падрабязных апісаннях. Пісьменнікі імкнуцца мець арыгінальны пункт гледжання на свет і ствараюць беларускую прозу з элементамі мадэрнізму ці постмадэрнізму. Шырокія філасофскія абагульненні дасягаюцца за кошт увядзення такімі празаікамі, як Б. Пятровіч, А. Казлоў, П. Васючэнка, А. Асташонак, У. Клімовіч і некаторымі іншымі, вобразаў-сімвалаў, мастацтва падтэксту і ўскладненай кампазіцыі, адмысловых прычынна-выніковых суадносін розных этапаў жыцця герояў – гэта дазволіла ўнесці элемент наватарства ў тое ўстойлівае, традыцыйнае, што належала апавяданню папярэдніх перыядаў.

Апавядальнікі "новай хвалі" аспрэчваюць распаўсюджанае меркаванне, што сучасная рэчаіснасць дае пісьменніку ў гатовым і закончаным выглядзе матэрыял для твора. Яны сцвярджаюць, што простай суаднесенасці літаратуры з жыццём недастаткова, каб гаварыць пра належны ўзровень мастацкага спазнання і адлюстравання свету.

На мяжы тысячагоддзяў не толькі абвастраюцца грамадскія працэсы, парушаюцца эвалюцыйныя сувязі, чалавечыя адносіны, але пачынае змяняцца і сам характар беларускай літаратуры. Праз вобраз сучасніка апавяданне празаікаў "новай хвалі" ў той ці іншай меры перадае непаўторнасць і складанасць сённяшняга часу, дае магчымасць прасачыць агульныя тэндэнцыі ў развіцці грамадства і асобы. Выразнай становіцца тэндэнцыя да дэмакратызацыі героя, пазбаўленне ад манументальнасці ў яго абмалёўцы. Пісьменнікі акцэнтуюць увагу на росце самасвядомасці чалавека і нацыі ўвогуле. Сучасныя жыццёвыя абставіны і праблемы змянілі тып героя і яго вызначальныя духоўныя параметры. Агульным для герояў у сучасным апавяданні з'яўляецца тое, што яны трапілі пад уздзеянне анамалій нашага сённяшняга жыцця, такіх як маральнае разлажэнне, атупенне, абыякавасць. Праз сваё асабістае пісьменніцкае бачанне свету раскрываюць маладыя празаікі, якія прытрымліваюцца традыцыйна-рэалістычнага кірунку, усю складанасць характару чалавека, зрэдку яго "збяднеласць" у нязвыклых жыццёвых абставінах сённяшняга дня. Сярод асноўных персанажаў апавяданняў няма перадавікоў вытворчасці, кіраўнікоў гаспадарак, затое з'явіліся прадпрымальнікі, гандляры, злодзеі, махляры, путаны, наркаманы, бамжы і г. д. Калі героі літаратуры сацыялістычнага рэалізму ўвасаблялі высокае станоўчае сацыяльнае аблічча, былі своеасаблівым ідэйна-маральным эталонам паводзінаў, мелі актыўную жыццёвую пазіцыю, то сучасныя літаратурныя героі пераважна нічога не ўвасабляюць, яны проста выжываюць у складаных умовах. Адчуваецца недахоп твораў, дзе пісьменнікі разважалі б пра грамадзянскі абавязак перад сваім народам, пра маральную адказнасць перад нашчадкамі, узнімалі пытанні агульначалавечага значэння.

Эвалюцыя апавядання на шляху асваення новай рэчаіснасці ў сучаснай беларускай літаратуры заключаецца ў станаўленні галоўных кірункаў развіцця "малой" прозы "новай хвалі". Зварот да "малога" жанру стаў свайго роду супрацьпастаўленнем сучаснай прозы прозе папярэдняга перыяду засілля палітызаванай, ідэалагізаванай літаратуры. Тэматычная, сюжэтная і кампазіцыйная разнастайнасць у пастаноўцы надзённых праблем дасягаецца шляхам трансфармацыі, а часта і дэфармацыі звыклай формы апавядання. Актыўна выкарыстоўваецца вопыт літаратуры Захаду.

Адыход ад традыцыйнага кірунку развіцця беларускай літаратуры можна разглядаць як даніну ўвагі сучасным літаратурным плыням, звязаным з абвостранай навацыяй формы, і як імкненне выпрабаваць свае сілы па-за межамі магістральнага шляху айчынных нацыянальных традыцый. Напрыклад, **Ігар Сідарук**, чыя творчасць не ўпісваецца ў звыклыя стандарты сучаснай літаратуры, выдаў у серыі "Проза пераходнага перыяду" кнігу апавяданняў "Квадратная варона". Непадабенства і адметнасць твораў гэтага пісьменніка ў надзвычай вялікай у іх канцэнтрацыі болю. "Апавяданні Сідарука на сённяшні дзень ледзь не лепшы ўзор экзістэнцыяльнай прозы, прозы, якая незалежна ад абранай тэмы, будуецца на такіх паняццях, як жыццё і смерць, свабода і выбар, лёс і наканаванасць"[10]. Апавяданне "Пяць хлябоў з Дабравесця" Ігара Сідарука не толькі назваю падобна да апавядання "Пяць лыжак заціркі" Змітрака Бядулі. Па-майстэрску аб'яднаўшы два вядомыя сюжэты – фальклорны і бядулеўскі, – апавядальнік стварыў неверагодную гісторыю пра тое, як маці накарміла паміраючых з голаду дзяцей сэрцам бацькі. У пісьменніка вельмі змрочнае нават для сённяшняга часу светаадчуванне. Забойствы, труны, нябожчыкі – тыповы антураж яго твораў. Калі чытаеш апавяданні І. Сідарука, ствараецца ўражанне, што безвыходнасць, галеча, гора і голад ніколі не пакідалі беларусаў, а змрочнасць фіналаў твораў сведчыць, што пісьменнік верыць у асуджанасць нашага існавання на Зямлі. Выкарыстоўвае празаік і біблейскія сюжэты. Так, у апавяданні "Цвікі былі добрыя" вяскоўцы ў адчаі шукаюць збавення, дзеля гэтага ўкрыжоўваюць чалавека і марна чакаюць яго ўваскрасення. Разам з тым у апавяданнях "Цвікі былі добрыя" і "Табе што – болей трэба?" пісьменнік не толькі асуджае сквапнасць, абыякавасць і адмежаванасць ад чужога лёсу, але і паказвае, як спрадвечная беларуская куркулістасць можа супрацьстаяць складанасцям жыцця. Таму "куркулістасць" як спосаб ратавання – гэта, безумоўна, новы паварот у гутарцы пра самазахаванне нацыі.

Жанравае наватарства стала прыкметай творчасці празаікаў "новай хвалі". Асваенне маладымі пісьменнікамі новай рэчаіснасці з непазбежнасцю прывяло і да ўзнікнення жанравых мадыфікацый у беларускай "малой" прозе, і да асаблівасцяў сюжэту, кампазіцыі, вобразнасці, мовы, інтанацыі, рытму. Вялікая колькасць навел, лірычных мініяцюр, эцюдаў, замалёвак, эсэ, фрагментаў, трыпціхаў, настрояў, абразкоў, зацемак і г. д. з'явілася ў апошнія дзесяцігоддзі. Дастаткова ўзгадаць абразкі "Суцяшальніца", "Крыўда" А. Казлова, настроі "Фарбы душы", "Смутак надзеі" А. Асташонка, апавяданне-быль "Сякера" М. Куляша, апавяданне-містыфікацыю "Сон пра чырвонае золата" Л. Рублеўскай, "Паганскія экспрэсіі" Г. Багданавай, апавяданні-эсэ С. Дубаўца, нізку эратычных абразкоў А. Глобуса, кароткія антыутопіі А. Мінкіна, трыпціх "Месца пад сонцам" У. Міхно, апа-

вяданне-містэрыю "Світанак над вежамі" С. Дзедзіча і іншыя. Мадэрнізацыя традыцыйнага апавядання садзейнічае жанрава-стылёваму ўзбагачэнню нацыянальнай літаратуры. У апавяданнях "новай хвалі" дастаткова часта перакрыжоўваюцца рэальнасць і фантасмагорыя, дакументалістыка і абсурдныя парадоксы, сон і ява, лагічныя і містычныя думкі. Сучаснымі навелістамі вядуцца пошукі ў галіне засваення паэтыкі мадэрнізму і постмадэрнізму, больш смела ажыццяўляецца прарыў у памежныя з літаратурай сферы: філасофію, псіхалогію, гісторыю, мастацтва, палітыку. Такі мастацкі сінтэз вядзе да разнастайнасці стыляў і творчых арыентацый. Мы можам з поўным правам назваць літаратуру гэтага перыяду, у тым ліку і "малую" прозу, інтэлектуальнай, аналітычнай, філасофскай. У апавяданні заўсёды можна знайсці як традыцыйнае, так і наватарскае. Традыцыйнымі лічацца малы аб'ём, сканцэнтраванасць на адным аспекце, адзінства дзеяння, абмежаванае кола персанажаў. Наватарскімі ўяўляюцца пошукі новых сюжэтаў, формаў, сродкаў раскрыцця зместу, узаемадзеянне розных жанраў. У выніку эвалюцыі ўсё выразней выяўляецца скіраванасць "малой" прозы на эксперымент, формы навелістыкі робяцца больш лапідарнымі. Параўнальна нядаўна ў замежнай літаратуры распаўсюдзіўся арыгінальны род літаратурных твораў – "мікрапроза", або, як яшчэ кажуць, "раптоўная проза", ці яшчэ – "short-short". Пачынальнікам гэтай плыні лічыцца выкладчык адной з амерыканскіх навучальных устаноў Джэром Стэрн. Маленькія, сціснутыя празаічныя ўрыўкі памерам не больш за 250 слоў, як правіла, могуць несці не толькі прывабліві сюжэт, але і прытчавы змест. Прыкладам беларускай "мікрапрозы" можна лічыць цыкл "Дух возера" **Юрыя Станкевіча**, у які ўвайшлі апавяданні "Энергія зоркі", «Далёкае радыё "Люксембург"», "Візіт месіі". Пісьменнік робіць філасофскія высновы, якія надаюць мастацкую вагу творам, але філасофскі характар такой літаратуры не самамэта, а сродак спасціжэння свету і чалавека. Можна сцвярджаць, што і надалей перспектывы літаратурнага развіцця будуць не ў апошнюю чаргу звязаныя з мікрапрозай.

Жанравай асаблівасцю беларускага апавядання "новай хвалі" з'яўляецца павышэнне ўзроўню публіцыстычнасці – адкрытае выражэнне ўсяго набалелага, што сканцэнтравалася ў душы пісьменнікаў. Гэта можна растлумачыць патрабаваннем жыцця, агідай да "літаратуршчыны", да розных сурагатаў мастацтва сацыялістычнага рэалізму. Таму так інтэнсіўна ідзе расчыстка першакрыніц жыццёвай праўды, абнаўленне саміх першапачатковых формаў мастацкага апавядання. Добра пазначаная мяжа, якая аддзяляла мастацкую прозу ад прозы дакументальнай, зрабілася больш невыразнай і хісткай, што выклікала супярэчлівыя крытычныя водгукі. Некаторыя крытыкі прарочаць хуткі канец белетрыстычных жанраў, іх поўнае выцясненне новымі, якія ўзніклі на дакументальнай глебе. Яны сцвярджаюць, што ў сучаснай літаратуры адзіны шлях – у кірунку да непрыдуманага факта. Іншым, наадварот, здаецца, што факт паводзіць сябе па-захопніцку, урываючыся ў галіну мастацкай творчасці, што адбываецца нашэсце "нон-фікшн" – "дзённікавай прозы", "непрыдуманай літаратуры", "фрагментарнай прозы". Сам тэрмін "нон-фікшн" стаў абазначаць усю "літаратуру факта": дакументальную прозу, занатоўкі, зробленыя ў дарозе, дзённікі, эсэ, прытчы і г. д. Наступ літаратуры "нон-фікшн" на Беларусі заўважыла Людміла Рублеўская: "Дзённікавыя запісы класікаў і не зусім класікаў, жывых і памерлых, прапаноўваюцца беларускаму чытачу ў апошні час гэтак часта і гэтак настойліва, што ўзнікае падазрэнне пра існаванне нейкай агульнай гістарычнай патрэбы ў публічнай споведзі. Але ўсе з'явы выклікаюцца тымі альбо іншымі аб'ектыўнымі прычынамі. Публічныя споведзі апелююць да чалавечай цікаўнасці"[11]. Літаратура "нон-фікшн", якую падрабязна аналізуе Л. Рублеўская, з'яўляецца суб'ектываванай непрыдуманай прозай, у цэнтры якой – аўтар.

Фрагментарная проза вельмі сугучная сённяшняму дню, таму празаікі-пачаткоўцы аддаюць ёй перавагу. Звяртаюцца да яе і вядомыя літаратары. Дастаткова прыгадаць творы "Зацемкі з левай кішэні" Леаніда Галубовіча, "Нататкі сумесніка: З дзённіка літаратара" Алеся Асташонка, "Дыярыушы" Ганны Матусевіч, "Занатоўкі эгаіста" Адама Глобуса, "Дзённік прыватнага чалавека. 1989 – 1998" Сяргея Дубаўца, абразкі "Адчуць сябе чалавекам" Зіновія Прыгодзіча, "Парадоксы быцця" Віктара Супрунчука, "Нашых дзён крыгаход" Ірыны Жарнасек і іншыя. Фрагментарная проза складаецца з асобных, традыцыйных элементаў: эпізодаў "з жыцця народа" і творчай інтэлігенцыі, пейзажных замалёвак, дарожных нататак, уражанняў ад прачытанага і ўбачанага ў сферы мастацтва, мовазнаўчых мініяцюр (асабліва актуальных менавіта для беларускай літаратуры) і, нарэшце, аўтарскіх сентэнцыяў. Колькасныя суадносіны пералічаных кампанентаў індывідуальныя для кожнага аўтара, таксама як і іх камбінацыі. Жанр нон-фікшн уяўляецца вельмі суб'ектыўным, у ім абавязкова павінен быць аўтар, які вызначае дыстанцыю паміж сабой і чытачом. Так, А. Глобус у "Занатоўках эгаіста" знаходзіцца ў апазіцыі да чытача, а Л. Галубовіч заўсёды судакранаецца з тым, пра што расказвае, аб'ектыўна ацэньвае свет і падзеі ў ім. Да фрагментарнай прозы пачалі звяртацца пісьменнікі, якія плённа працуюць у жанры традыцыйнага апавядання. У серыі замалёвак "Нашых дзён крыгаход" І. Жарнасек адыходзіць ад свайго вопыту інтэлектуальнай прозы. Замалёўкі – хутчэй публіцыстычныя развагі пісьменніцы пра сённяшняе жыццё і яго анамаліі. Яна знаходзіць прычыны хаосу, які, на яе думку, пануе ў грамадстве, у занядбанні боскіх запаведзяў. Асобна стаяць у фрагментарнай прозе запісы пра смерць і каханне, выяўляючы своеасаблівы погляд аўтараў на гэтыя тэмы, набліжаючы іх да разумення вечнасці: "*Сьмерць – адзінае, што ў цябе па-сапраўднаму ёсьць, але ты ня ведаеш, што гэта такое*", – сцвярджае Сяргей Дубавец[12]. У наш час літаратура нон-фікшн набывае свае рысы і аблічча.

Пашырэнне тэндэнцыі эсэізацыі прозы прааналізавала Вераніка Стральцова ў артыкуле "Ад хронікі да споведзі". Пытанне жанравай тыпалогіі твораў такога кшталту даследчыца лічыць адным з самых складаных, бо, апрача ўласна аўтабіяграфічнай літаратуры (мемуараў, дзённікаў, запісных кніжак, эпісталярнай спадчыны), ёсць шмат твораў, што існуюць на мяжы, за якой – эсэістыка, немастацкія жанры, лірычная проза з выразнай аўтабіяграфічнай асновай, а таксама вялікая колькасць стылізацый, дзе на першы план выходзіць асабовы аўтарскі пачатак. Такія жанры літаратуры асвойваюць памежныя сферы рэчаіснасці, таму тут могуць паядноўвацца элементы дакументальнасці, мастацкасці, навуковасці. Можна пагадзіцца з В. Стральцовай у тым, што сюжэту і персанажам, якія дзейнічаюць паводле пэўнай ролі, супрацьстаіць "аголены змест", які адпавядае натуральнаму руху жыцця. Пошук новых формаў

самаабгрунтавання можна прасачыць па аўтабіяграфічных творах "Мой радавод да пятага калена" Уладзіміра Арлова, "Зацемкі з левай кішэні" Леаніда Галубовіча, "Трынаццаць дзён з дзённіка" Анатоля Кудлатага.

Узмацненне публіцыстычнага пачатку ў традыцыйнай рэалістычнай "малой" прозе абумоўлена большай свабодай аўтарскага самавыяўлення, што стымулюе развіццё так званай спавядальнай прозы, жанру эсэ, раскрываючы іх значныя магчымасці ў прапагандзе ідэй гуманізму, маральнага ўдасканалення грамадства. Леанід Галубовіч тлумачыць пашырэнне публіцыстычнага пачатку ў "малой" прозе наступным чынам: *"Чалавек у наш урбаністычны, тэхналагічны час робіцца ўсё больш адзінокім, замкнёным у сабе і на сабе, ён пачынае пісаць розныя тэксты, спадзеючыся некаму адкрыцца ці быць адкрытым. Літаратура цяпер – перш за ўсё, душэўныя, а не духоўныя зносіны адзінокіх людзей у пяцімільярдным мурашніку чалавецтва. Гэта вяртанне да эпісталярнасці… Я пішу ўсім, няхай мне адгукнецца хоць нехта"*[13]. На думку Л. Галубовіча, усё гэта не датычыцца мастацкай літаратуры, дзе мастак спавядаецца не перад людзьмі, а перад самім сабою. У сапраўдным мастацкім творы адчуваецца імкненне аўтара дайсці да вытокаў з'явы, устанавіць прычынна-выніковую сувязь, існуе прынцыповасць аўтарскай пазіцыі. Калі зменіцца палітычная і эканамічная сітуацыя, зменшыцца і патрэба ў творах з пашыраным публіцыстычным пачаткам. Застанецца ж тое, што пры ўсіх абставінах будзе складаць сутнасць чалавечага жыцця – агульначалавечыя каштоўнасці. Ідэя універсальнасці дазволіла некаторым даследчыкам правобразам гіпатэтычнай універсальнай формы будучыні для літаратуры назваць эсэ. Падкрэсліваецца моцны ўплыў гэтага "звышжанру" на розныя тыпы мастацкага слова, эсэізм разглядаецца як агульнакультурны феномен XX ст. Прыкладам элегантнасці, вытанчанасці, інтэлігентнасці айчыннага слова можа быць кніга "Стомленасць Парыжам" Леаніда Дранько-Майсюка. Пісьменнік сцвярджае, што пісьмо яго эсэ пераможна адвольнае, а выдумка – асноўная дарадчыца. Ёсць у ім і філасофская заглыбленасць: *"Нашае стагоддзе задумвалася нястомным Госпадам як стагоддзе аскетычнай творчасці, як стагоддзе слова, а не слоў. Аднак намеры Божыя не спраўдзіліся – слова не перамагло словы, творчасць не ўзвысілася над рамяством, таму стагоддзе нашае ўдвая бяднейшае, чым папярэдняе. А наперадзе – стагоддзе суцэльнай мастацкай галечы, пара камп'ютэрных пачуццяў"*[14]. На той факт, што ўсё больш пісьменнікаў у 1980 – 1990-я гг. аддаюць перавагу лірычнай мініяцюры, звярнула ўвагу крытык Ганна Кісліцына. Яна лічыць, што ў першую чаргу гэта звязана з тымі патэнцыямі, якія ад самага пачатку былі закладзены ў жанр. Даследчыца вызначае лірычную мініяцюру як асобны жанр, а не жанравую форму апавядання. У складаны, пераходны перыяд, у час грамадска-палітычных пераўтварэнняў, узмацнення інтэлектуальнага пачатку ў мастацкай творчасці лірычная мініяцюра набывае асаблівую значнасць, бо яна праўдзіва і аператыўна рэагуе на падзеі сучаснасці. Выклікаюць цікавасць роздумы над рознымі з'явамі жыцця, мініяцюры з "жыцця народа", філалагічныя развагі пра стан літаратуры, замалёўкі прыроды, якія з'яўляюцца на старонках сучаснай перыёдыкі.

Сучасная навелістыка далёка адышла ад таго рубяжа, з якога яна пачынала пошукі. Сёння "малая" проза грунтуецца на значна больш шырокай разнастайнасці мастацкіх формаў, багацці індывідуальных падыходаў да чалавека, выпрацаваных таленавітымі і чуйнымі да жыцця апавядальнікамі. Пошукі ў галіне формы, выкліканыя імкненнем празаікаў "новай хвалі" наблізіць беларускую літаратуру да найлепшых узораў еўрапейскай прозы, заканамерныя, яны дазваляюць выявіць схаваныя магчымасці літаратуры. Калі форма працуе на змест, яна выглядае натуральна пры ўсёй сваёй экстравагантнасці, таму сучасныя літаратары знаходзяцца ў пошуку.

Апавяданне "новай хвалі" ідзе па шляху ўсё большага вызвалення ад схем і рэгламентацыі стыляў. Найбольш значныя змены ў тыпах і характары малых жанраў на мяжы стагоддзяў звязаны з выразна абвостранай цікавасцю пісьменнікаў да свабоднай кампазіцыі апавяданняў і да адкрытых формаў. Характэрнай тэндэнцыяй часу становіцца і тое, што можна было б вызначыць як узаемапранікненне жанраў. Сапраўднымі наватарамі ў жанры апавядання ў 1980 – 1990-я гг. выступілі А. Глобус, А. Асташонак, А. Казлоў, Б. Пятровіч, П. Васючэнка, В. Чаропка, У. Клімовіч. Калі ў А. Федарэнкі і А. Наварыча пераважаюць філасофска-псіхалагічныя апавяданні, то ў П. Васючэнкі, А. Асташонка, А. Глобуса, А. Казлова – алегарычна-казачныя эцюды альбо перакрыжаванне гэтых дзвюх апавядальных формаў. Кожны з пісьменнікаў імкнецца па-свойму ўдасканаліць жанравую прыроду апавядання, яго структуру і асобныя кампаненты. Яны пазбягаюць доўгіх апісанняў і ўсяго, што не вядзе да раскрыцця пастаўленай у творы мэты, усталёўваюць сваю незалежнасць ад побыту (апавяданні "Пакуль не сціхне дождж" В. Чаропкі, "І тады я памёр..." А. Казлова, "Чарга" А. Асташонка і іншыя). У канцы XX ст. традыцыйныя і наватарскія кірункі развіцця могуць спалучацца ў творчасці нават аднаго канкрэтнага пісьменніка альбо ў асобных творах "малой" прозы і заключаць у сабе магчымасць жанравага развіцця.

---

[1] **Лихачев, Д. С.** Поэтика древнерусской литературы / Д. С. Лихачев. – Л. : Наука, 1967. – С. 40.

[2] **Шубин, Э. А.** Жанр рассказа в литературном процессе / Э. А. Шубин // Русская литература. – 1965. – № 3. – С. 39.

[3] **Белинский, В. Г.** Полн. собр. соч.: в 4 т. / В. Г. Белинский. – М.-Л. : Наука, 1953 – 1956. – 1 т. – С. 276.

[4] **Огнев, А. В.** Современный русский рассказ : 50 – 80-е годы / А. В. Огнев. – Калинин, 1987. – С. 50.

[5] **Андраюк, С.** А жыццё – вышэй за ўсё : Выбранае : Літ.-крытычн. арт. / С. Андраюк. – Мінск : Маст. літ., 1992. – С. 142.

[6] **Коўтун, В.** Дух неаддзельны ад сумлення / В. Коўтун // Полымя. – 1997. – № 12. – С. 263.

[7] **Корань, Л.** Цукровы пеўнік / Л. Корань. – Мінск : Маст. літ., 1996. – С. 259.

[8] **Розанов, В.** Апокалипсис нашего времени / В. Розанов // Литературное обозрение. – 1990. – № 1. – С. 88.

[9] **Гніламёдаў, У. В.** Ці ёсць будучыня ў літаратуразнаўства? / У. Гніламёдаў // Гуманітарныя і сацыяльныя навукі на зыходзе XX ст. – Мінск : АНІГН НАН Беларусі, 1998. – С. 465.

[10] **Кісліцына, Г. М.** Апошні цвік / Г. М. Кісліцына // ЛіМ. – 2001. – 6 крас. – С. 6.

[11] **Рублевская, Л.** Самое главное и все остальное / Л. Рублевская // Неман. – 1998. – № 1. – С. 244.

[12] **Дубавец, С.** Дзённік прыватнага чалавека. 1989 – 1998 / С. Дубавец. – Мінск : БГАКЦ, 1998. – С. 71.

[13] **Галубовіч, Л.** Зацемкі зь левай кішэні / Л. Галубовіч. – Мінск : БГАКЦ, 1998. – С. 92.

[14] **Дранько-Майсюк, Л.** Гаспода / Л. Дранько-Майсюк. – Мінск : Маст. літ., 1998. – С. 314.

Звесткі для энцыклапедыі

КАЛІ ХАЛІМОН ЕЗДЗІЎ НА КАРАНАЦЫЮ?

БЫЛІЦА "ХАЛІМОН НА КАРАНАЦЫІ" ВІНЦЭНТА ДУНІНА-МАРЦІНКЕВІЧА

Ніхто з літаратуразнаўцаў не задумваўся адмыслова над пытаннем: калі адбываюцца падзеі, абмаляваныя ў слыннай быліцы "Халімон на каранацыі" Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча? На якім "каранаванні" быў герой Халімон Забалотны, *"старшына паважны"* з-пад Магілёва, са сваім калегам, гэткім самым валасным старшынёй Базылём Стахоўскім па мянушцы Шавалончык, які *"з Пінска вёў род свой"*?

Упершыню, наколькі мне вядома, храналогію каранацыйных падзей закрануў і паспрабаваў па-свойму разгледзець папулярызатар уласнага радаводу Уладзімір Ліпскі: «У жніўні 1826 года Сестранцэвіч паслаў Мацвея Ліпскага з дэлегацыяй у Маскву для ўдзелу ў каранацыі імператара Мікалая I. На такім пачэсным святе трэба было б прысутнічаць самому мітрапаліту, але яму ішоў дзевяноста пяты год, а жыць заставалася ўсяго чатыры месяцы. Вось ён і даручыў ганаровую місію свайму вучонаму сакратару Мацвею Ліпскаму.

Вывудзіўшы з гісторыі такі факт і ўважліва прачытаўшы "быліцу, расказ" Навума Прыгаворкі "Халімон на каранацыі", хочацца верыць, што і Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч быў "па блату" ўключаны ў каталіцкую дэлегацыю на каранаванне цара»[1].

Належыць пагадзіцца: прыклад знамянальны.

На жаль, факт фактам, але У. Ліпскі няўважліва ўчытаўся ў змест знакамітага твора В. Дуніна-Марцінкевіча, запеўныя радкі якога памятныя са школьнага часу. Вось пачатак першай песні "Дарога":

Як рыбак з уткай над прудам,
. . . . . .
Ў строп старшына ўпёр глаз;
Штосьці ён на вус матае,
Знаць, дзівы прыпамінае,
Вось начаў такі расказ:

"Унялась бура страшэнна,
Мінула граза ваенна,
Устаў цяжкі матак стон!
Спрыкрылася людзям драцца,
Ўзялісь з сабой цалавацца,
Француз дахаты галён!.."

Такія драматычныя, жыва намаляваныя жыццёвыя калізіі, хутчэй за ўсё, узнаўляліся пісьменнікам не па памяці як малюнкі далёкай пецярбургскай маладосці, а як рэчаіснасць сённяшняя, не астылая ў прыску гадоў.

Зусім іншага меркавання прытрымліваецца Уладзімір Ліпскі: «Яму па тым часе споўнілася васемнаццаць гадоў. Юнацкія ўражанні ад незвычайнай падзеі намоцна аселі ў памяці. І калі ён ужо амаль у пяцідзесяцігадовым узросце пачаў пісаць тую "быліцу", то з дакладнасцю відавочцы падрабязна апісаў і дарогу праз Магілёў, Смаленск, Барадзін, Вязьму, і саму Маскву...»[2].

Уладзіміру Ліпскаму як пісьменніку выдатна вядомая спецыфіка мастацкага "ўяўлення", "фантазіі", калі моцаю пісьменніцкага таленту быццам жывая паўстае далёкая мінуўшчына ці, наадварот, геніяльна прадказваецца будучыня. Не выключаючы дарэшты мажлівасць Вінцэнтавых вандровак у Маскву ў пару маладосці, належыць ведаць, што ў вершаванай быліцы пра каранацыю пераважаюць рэаліі другой паловы 1850-х гг. Вось некалькі з іх.

Удакладненне першае. Што гэта за *"бура страшэнна"*? Што за ліхалецце (*"граза ваенна"*) меў на ўвазе аўтар? Згодна з "адкрыццём" У. Ліпскага, калі вандраванне Халімона датаваць 1826 г. (каранацыя імператара Мікалая I), яно адразу "павісае", паколькі аніякай французскай навалы ў сярэдзіне 1820-х гг. царская Расія не перажывала. Найбліжэйшая па часе да Мікалаеўскай каранацыі вайна з французамі адносіцца да слыннага "барадзінскага" 1812 г.

Магчыма, пісьменнік Уладзімір Ліпскі стараўся ўважліва чытаць мастацкі твор Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, але як даследчык няўважліва паставіўся да прачытанага. Між тым у вершаваным творы знаходзім наўздзіў выразныя гістарычныя малюнкі. Працягнем папярэднюю цытату:

І апалчэнцы з крыжамі
Вялікімі грамадамі
Радзенькі брадуць к даму;
Адзін гасцінец з сабою,
Другі рад, што хоць з душою
Ў сваю верне старану.

А раненыя салдаты,
Хоць на кулях, да багаты!
У крыжах стальная грудзь!
Свае іх чэсна страчаюць,
Хлебам, соллю прынімаюць,
Дзяўчаты вянкі плятуць.

А што, калі насамрэч вандроўка на каранаванне выпала Марцінкевічу не ў 1826 г.? А пазней... Калі яна магла адбыцца? Наступнай, пасля Мікалаеўскай, якраз і была каранацыя ягонага сына Аляксандра II. Таго, што спачатку праславіўся як вызвольнік сялян, а потым блаславіў крывавага генерала Мураўёва-вешальніка, пасланага на нашыя землі з карнымі дывізіямі на "ўціхамірванне польскага бунту".

Удакладненне другое. Першы ж радок энцыклапедычнага артыкула, прысвечанага каранаванню менавіта Аляксандра II, расстаўляе ўсё на свае месцы: «Император Александр II короновался 26 августа 1856 г., особым манифестом раньше известив о сво-

Часопіс "Роднае слова" ў 2005 г. распачаў цыкл публікацый Язэпа Янушкевіча, прымеркаваных да 200-годдзя з дня нараджэння Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, якое будзе адзначацца сёлета ў лютым. Надрукаваныя артыкулы пра бацькоў пісьменніка (2005, № 5), яго брата (2005, № 9), дачку Камілу (2007, № 3), дзядоў (2007, № 5), першую жонку (2007, № 9), а таксама пра Люцінку (2005, № 11; 2006, №№ 2, 5), кнігі Беларускага Дудара і іх выдаўцоў (2006, № 8).

ем намерении не приступать к коронации, "пока не смолкнет гром брани"».

У святле царскага маніфеста (з энцыклапедычнай адсылкай на Поўны збор законаў Расійскай імперыі № 30401) па-новаму, больш выразна прачытваюцца цытаваныя ўжо вышэй радкі нашага паэта: *"Унялась бура страшэнна, / Мінула граза ваенна, / Устаў цяжкі матак стон!"*. Марцінкевіч-паэт выдатна ўзнавіў не толькі гістарычныя факты, але й пераказаў малюнкі бачанага й перажытага. "Пярун вайны" сціх пасля падпісання пагаднення, войскі распушчаны, і цяпер можна падумаць пра абяцанае год таму царскае каранаванне.

Удакладненне трэцяе. У Марцінкевічавай быліцы ўжыта слова *апалчэнцы* (дарэчы, у першакрыніцы, якой лічацца "замоцінскія спісы", падрыхтаваныя да выдання яшчэ напрыканцы 1920-х гг.[3], слова спачатку было напісана з вялікай літары). Дык вось, згодна з тагачаснымі паняццямі "Ополчение государственное" – у XIX ст. запас узброеных сілаў Расійскай імперыі, скліканых падчас небяспекі ад знешняга ворага, які складаўся па даўнім прынцыпе "да́точных людей" – адной з найбольш цяжкіх асабістых павіннасцяў; яе адбывалі выключна цяглыя людзі – гэта значыць, сяляне. І што дакладна вядома: у XIX ст. апалчэнне царызмам склікалася тройчы: у 1806 г. (да 612 тыс. апалчэнцаў); у напалеонаўскую вайну 1812 г. (удвая менш, 300 тыс.) і ў 1855 г. (да 240 тыс.).

Удакладненне чацвёртае, менш істотнае. Падчас каранацыі 1826 г. не запрашаліся прадстаўнікі з губерняў. Мажліва, капітальная "Энцыклапедыя Бракгаўза" тут недакладная, прамінула і не згадала пра запрашэнне. Гэтаксама як і пра тое, што ўжо ў 1856 г. на каранацыю Аляксандра II былі запрошаныя валасныя старшыны, а не толькі ў 1883 г.

Кожнаму пісьменніку пры напісанні любога твора пажадана годна ставіцца да факталогіі. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч як паэт у быліцы яе не парушыў.

І напрыканцы зазначу наступнае. Не жадаючы збівацца ад каранацыйнай тэмы, вымушаны, аднак, зрабіць яшчэ адно ўдакладненне. Уладзімір Ліпскі, выправіўшы святара Ліпскага з маладым Вінцэнтам на каранаванне, працягвае: "Біскуп Мацвей Ліпскі неўзабаве пасля паездкі ў Маскву на каранацыю ўзначаліў Мінскую каталіцкую кансісторыю. І пасля смерці мітрапаліта Сестранцэвіча ён застаўся вернай жыццёвай апорай для Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, падтрымліваў яго да канца сваіх дзён. Гэты вывад пацвярджаецца фактамі з біяграфіі пісьменніка".

Не ведаю, якія факты гэтым разам "вывудзіў" пісьменнік, бо аніводнага аўтографа, які праліваў бы святло на ўзаемадачыненні Мацей Ліпскі – Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, у 20-аркушнай (больш як на 300 старонак) кнізе не прыводзіцца. Дазволю сабе падаць выяўлены ў тым самым архіве, у якім натхнёна працаваў старанны даследчык уласнага радаводу, наступны дакумент (у перакладзе з польскай мовы):

Ягонай Эксцэленцыі
Біскупу Менскай дыяцэзіі
Кавалеру Мацею Ліпскаму
Выконваючага абавязкі перакладчыка
Вінцэнта сына Яна Марцінкевіча

Просьба

Патрэбна мне службовая копія Калегіяльнага ўказа сёлетняга года выдадзенага дня 15 сакавіка зместам пра адмову мне месца перакладчыка ў кансісторыі...

Таму наважваюся прасіць Яснавяльможнага пастыра пра выдачу мне вышэйназванага ўказа. Года 1834 лістапада 23 дня Менск[4].

Патрэбны дакумент (за № 459) просьбіту выдалі, але я яго не бачыў. Таму пра дакладны змест разважаць не стану. Аднак сцвярджаць пра сардэчныя адносіны Марцінкевіча з Мацеем Ліпскім не стаў бы з простай жыццёвай прычыны: як выяўляецца, кансісторскаму перакладчыку Марцінкевічу не былі дарэшты сплочаны належныя грошы за яго працу. Вось як гучала заведзеная ў 1837 г. судовая справа: *"По жалобе Викентия Марцинкевича на Епископа Липского за удаление его от должности и не уплату денег за переводы"*.

Пагадзіцеся, загаловак досыць красамоўны!

Нарэшце, у раздзеле кнігі "Я" пад назваю "Пінскія ўюны" У. Ліпскі канстатаваў: «Сучасны даследчык жыццяпісу Дуніна-Марцінкевіча, нястомны шукальнік тайнаў Язэп Янушкевіч у прадмове да твораў пачынальніка новай беларускай літаратуры здзіўляецца: «Адкуль з'явілася ў пісьменніка дасканалае веданне Масквы, каб так падрабязна і дакладна намаляваць воблік тагачаснага горада ў быліцы "Халімон на каранацыі"? Адкуль драматург ведаў пінскую гаворку і чаму менавіта на ёй напісаў свой лепшы твор – камедыю "Пінская шляхта"»?

І не без гонару падсумаваў: "На першае пытанне я выказаў сваю версію. Цяпер справа гісторыкаў удакладніць яе, праверыць. Дапускаю, што Вінцэнт мог і не ездзіць у Маскву на каранацыю цара, а яму пра гэта расказаў, падрабязна і ўзрушана, яго таленавіты апякун [стыль! – **Я. Я.**] біскуп Мацвей Ліпскі"[5].

Якой памылковай атрымалася аргументацыя – мы ўжо давялі.

У чым належыць пагадзіцца з У. Ліпскім – дык з наступнай сентэнцыяй: "У любым выпадку свет на гэту таямніцу праліты".

Сапраўды, аматарскі пошук пісьменнікам уласных радаводных шляхоў справакаваў на больш грунтоўную праверку павярхоўных фантазій, дазволіўшы ўдакладніць, на якую ўсё ж каранацыю ездзіў Халімон Забалотны.

---

[1] **Ліпскі, У.** Я : Праўдзівы аповяд пра твой і мой радавод / У. Ліпскі. – Мінск : Беларусь, 1998. – С. 81 – 82.

[2] **Тамсама.** С. 82.

[3] Гл.: **Кісялёў, Г. В.** Спасцігаючы Дуніна-Марцінкевіча : Спроба навуковай сістэматызацыі дакументаў і матэрыялаў / Г. В. Кісялёў. – Мінск : Універсітэцкае, 1988. – С. 18 – 20.

[4] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 1781. – Воп. 24. – Адз. зах. 761. – Арк. 2.


[5] **Ліпскі, У.** Я : Праўдзівы аповяд пра твой і мой радавод. С. 83.

Язэп ЯНУШКЕВІЧ.

Уладзімір СОДАЛЬ

ФОТАЗДЫМАК НА ВЯКІ

З ГІСТОРЫІ АДНАГО ЗДЫМКА ВІНЦЭНТА ДУНІНА-МАРЦІНКЕВІЧА



Фатаграфічная спадчына Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча невялікая, калі не сказаць зусім невялікая. Да нас дайшло ўсяго два фотаздымкі* з выявай беларускага песняра. На адным з іх В. Дунін-Марцінкевіч зняты ў фатаграфічным павільёне-майстэрні пры разьбяным століку-аднаножцы. Гэты здымак даўно стаў хрэстаматыйным. Ён вандруе з выдання ў выданне, усе мы яго ведаем, зрокава памятаем, але наўрад ці калі прыглядаліся пільна. А між тым варта затрымаць на ім позірк – і ўзнікне шэраг самых нечаканых пытанняў. Калі здымаўся пісьменнік, з якой нагоды? Вядома, што сфатаграфавацца ў той час было не так ужо проста: і каштавала дорага, і працэс фатаграфавання быў марудны. Фатаграфаванне тады лічылася тонкім мастацтвам. Ад фатографа патрабавалася вялікае майстэрства. Таму здымаліся людзі рэдка, звычайна ў гонар якой-небудзь урачыстасці ці з нейкай нагоды.

Мы бачым Марцінкевіча ў тыповым для таго часу фатаграфічным павільёне. Зняты на поўны рост. Сядзіць на якімсь зэдлі ці стылізаваным крэсле. Сядзіць у годнай позе. Спакойны, засяроджаны. Адкрыты добры твар. На пісьменніку па-хатняму расхінуты кунтуш. Адна яго рука на калене. Другая на стальнічцы з разьбянай ножкай.

Самая цікавая дэталь на здымку – паперы (ці, можа, нават стос папераў), якія В. Дунін-Марцінкевіч дэманстратыўна трымае ў левай руцэ: маўляў, я ёсць пісьменнік і гэта сведчу, гэтым ганаруся. Дэманстратыўнасць гэтая, думаецца, не паказная. Яна нібы выклік, сугучны са строфамі верша "Хіба я стары?"

Ваш суд мне не страшны, хай злосна скавыча
У будцы сабака, увагі на пса не звярну я.
Як раіць пясняр Сыракомля, пішу я
Цяпер, як заўсёды, на мове мужычай.

Калі меркаваць па знешнасці, адбітай на здымку, В. Дуніну-Марцінкевічу можна даць гадоў сорак-сорак пяць. Ва ўсякім разе не больш за пяцьдзесят. Можна меркаваць, што здымак зроблены дзесьці ў пачатку ці ў сярэдзіне пяцідзесятых гадоў. Гэта была для В. Дуніна-Марцінкевіча пара творчых парыванняў і пошукаў. Жыццё яго яшчэ нічым асабліва не было азмрочана. Яго моцна захапіў тэатр. На мінскай сцэне прайшла аперэта "Рэкруцкі жыдоўскі набор", пастаноўка якой нават была засведчана ў афіцыйным друкаваным органе "Минские губернские ведомости".

У 1852 г. яму ўдалося паставіць на мінскай сцэне оперу "Сялянка". Тады ж, мабыць, В. Дунін-Марцінкевіч, акрылены поспехам, і сфатаграфаваўся. Можна меркаваць, што ў руках яго ці тэкст оперы "Сялянка", ці яе партытура.

Захавалася і калектыўнае фота тэатральнага гуртка В. Дуніна-Марцінкевіча. На ім мы бачым пісьменніка ў першым радзе, у цэнтры, побач з дачкой Камілай. Драматург у чорным гарнітуры, але ўсё ў той самай, што і на першым здымку, клятчастай камізэльцы, пры тым самым гальштуку, які гэтак жа крыху збіўся набок, як і на першым фота. Праз плячо ў яго перакінуты той самы раменьчык, на якім, магчыма, пісьменнік насіў гадзіннік ці кісет. Гэта наводзіць на думку, што абодва здымкі зроблены прыблізна ў адзін час. У пазнейшую пару В. Дуніну-Марцінкевічу было не да фатаграфавання. У 1859 г. ён перажывае вялікія ўзрушэнні ў сувязі з забаронай "Пана Тадэвуша" на беларускай мове; у 1861 г. за ім, як за палітычна ненадзейным, пачынаецца паліцэйскае віжаванне. Затым паўстанне 1863 г., арышт, астрог. Пасля астрогу зноў паліцэйскі нагляд – на гэты раз пажыццёвы. Дарэчы, у 1863 г. была арыштавана і зняволена ў мінскі астрог і пісьменнікава дачка Каміла. У тым самым 1863 г. яе выслалі ў Салікамск. Вярнулася на радзіму яна толькі ў 1880 г.

Як жа захаваўся партрэтны здымак В. Дуніна-Марцінкевіча? Як ён дайшоў да нас? Яшчэ пры жыцці пісьменніка многія яго матэрыялы – рукапісы, фотаздымкі – трапілі да вядомага збіральніка помнікаў беларускага прыгожага пісьменства Аляксандра Ельскага. Быў у яго зборах, як сведчыць Браніслаў Эпімах-Шыпіла, і адзін здымак В. Дуніна-Марцінкевіча. На ім, між іншым, меўся такі надпіс: *"Сябрам на цярністай дарозе ў пілігрымстве жыцця, у довад братэрства ахвяруе Навум"***. З гэтага здымка Б. Эпімах-Шыпіла ў 1893 г. зрабіў для сваёй "Хрэстаматыі" копію. Вельмі магчыма, што адсюль Марцінкевічаў здымак і распаўсюдзіўся. Ва ўсякім разе сёння гэтага здымка ў "Хрэстаматыі" Б. Эпімаха-Шыпілы няма. Пэўна, у 1910 г., калі адзначалася 25-годдзе з дня смерці пісьменніка, здымак быў узяты для публікацыі. На жаль, такой публікацыі ў беларускіх выданнях той пары мы нідзе не знаходзім, але ёсць шмат слядоў, якія сведчаць, што партрэт

* На трэцім здымку, змешчаным у газеце "Наша Ніва" (1910, 25 лістапада), магчыма, адлюстравана іншая асоба. – *Заўвага рэд.*

** Навум Прыгаворка – псеўданім В. Дуніна-Марцінкевіча. – *Заўвага рэд.*



Уладзімір Ілліч Содаль *– літаратурны краязнаўца. Закончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А. М. Горкага (1963). З 1969 да 2000 г. працаваў рэдактарам навукова-папулярных і навучальных праграм Беларускага тэлебачання, у тым ліку – тэлечасопіса "Роднае слова". Аўтар шматлікіх кніг пра Францішка Багушэвіча, а таксама альбомаў "Францішак Бенядзікт Багушэвіч. Жыццё і творчасць" (1986) і "Вінцэнт Якуб Дунін-Марцінкевіч. Жыццё і творчасць" (1997). Укладальнік зборнікаў твораў Ф. Багушэвіча "Мая дудка" (1987), "Каму дудка паслушна" (1990), "Францішак Багушэвіч" (разам з Я. Янушкевічам; 1991), аўтар навучальных дыяфільмаў пра Ф. Багушэвіча, В. Дуніна-Марцінкевіча, К. Каліноўскага.*

гэты хадзіў па руках супрацоўнікаў рэдакцыі "Нашай Нівы". У 1910 г. газета змясціла ў 48-м нумары перамалёўку мастачкі А. Пятровай з агульнавядомага сёння здымка. У тым самым 1910 годзе выдавецкая суполка "Загляне сонца і ў наша ваконца" ў серыі "Беларускія песняры" выдала кніжку вершаваных аповесцяў В. Дуніна-Марцінкевіча "Шчароўскія дажынкі".

Як сведчыў сістэматызаваны каталог колішняй Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна (цяпер – Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь), гэтая кніжка пісьменніка была выдадзена з партрэтам. Аднак, як ні дзіўна, ні ў адным з сямі наяўных у Ленінскай бібліятэцы экземпляраў другога (1910 года) выдання "Шчароўскіх дажынак" партрэта В. Дуніна-Марцінкевіча не аказалася. Ніякіх прыкмет нават, што ён там быў. Але і не верыць сістэматызаванаму каталогу Ленінскай бібліятэкі не выпадае. Картка, якая нам паведаміла, што Марцінкевічаў партрэт быў змешчаны ў "Шчароўскіх дажынках", – старая, даваенная, друкаваная яшчэ лацінкаю. Ды і некаторым з нашых даследчыкаў, прыкладам Сцяпану Майхровічу, з яго слоў, даводзілася на свае вочы бачыць у гэтым выданні пісьменнікаў партрэт. Але дзе ж ён?

У 1910 г. было падвойнае выданне "Шчароўскіх дажынак" – таннае, у папяровай вокладцы, і даражэйшае – у пераплёце, на белай паперы, у маляўнічай вокладцы з беларускімі ўзорамі. Менавіта ў дарагім выданні і быў змешчаны партрэт. Але гэта не самая ранняя публікацыя. Як сведчыць Сцяпан Александровіч у кнізе "Пуцявіны роднага слова", у 1906 г. выдавецкая суполка "Загляне сонца і ў наша ваконца" распачала выпуск беларускіх паштовак з пейзажамі і партрэтамі беларускіх пісьменнікаў. Адна з іх прысвячалася Марцінкевічу.

Першая спроба апублікаваць Марцінкевічаў здымак была яшчэ ў 1889 г. І меўся гэта зрабіць прыхільнік таленту пісьменніка вядомы этнограф і фальклярыст Мітрафан Доўнар-Запольскі. Вось як пра гэта сказана ў перапісцы начальніка Галоўнага упраўлення па справах друку з віленскім генерал-губернатарам аб магчымасці апублікавання біяграфіі і твораў В. Дуніна-Марцінкевіча ў "Календаре Северо-Западного края" ад 12 – 31 жніўня 1889 года: «Выдавец "Календаря Северо-Западного края" падаў на папярэдні цэнзурны разгляд у ліку іншых артыкулаў, маючых увайсці ў склад календара, біяграфію В. Дуніна-Марцінкевіча з партрэтам яго і яшчэ не выдадзеныя творы пад загалоўкам "Пінская шляхта". Фарс-вадэвіль на пінскай гаворцы»…

Начальнік упраўлення па справах друку пытаўся ў віленскага генерал-губернатара, ці можна апублікаваць названыя вышэй матэрыялы. Адказ, як і трэба было чакаць, быў суровы: "Забараніць!"

З тае пары міне яшчэ не адно дзесяцігоддзе, пакуль матэрыялы, падрыхтаваныя да друку М. Доўнарам-Запольскім, убачаць свет і будзе апублікавана Марцінкевічава фота, лёс якога вельмі нагадвае лёс самога пісьменніка і яго твораў.

Можа, хто спытаецца, чаму да нас дайшло гэтак мала фотаздымкаў з выявай Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча? А рэч у тым, што фотасправа ў Марцінкевічавы часы ў Менску толькі наладжвалася і тэхналогія яе была досыць складаная. Каб, скажам, зрабіць адзін фотанегатыў, трэба было сядзець перад фотакамерай нерухома, нават вокам не міргнуць, не менш як паўгадзіны. От чаму Дунін-Марцінкевіч не мог нават гальштук свой паправіць, хоць, пэўна, адчуваў, што той збіўся ў яго набок. Гэта раз. Другое. Усе тагачасныя фотамайстэрні былі пад паліцэйскім ці жандарскім наглядам.

Фатаграфічная майстэрня пана Прушынскага, у якой зроблены гістарычны фотаздымак В. Дуніна-Марцінкевіча, месцілася калісь на Францішканскай вуліцы. Няцяжка ўявіць, як рыхтаваўся наш Дудар Беларускі да той здымкі. Вельмі добра гэта ўявіў Генадзь Кісялёў у артыкуле "Імгненне і вечнасць". Найперш папярэдне ўсё абгаварыў з маэстрам Прушынскім: як і што апранаць. Было дамоўлена: апране клятчастую камізэльку, павяжа гальштук-караватку… Усе гэтыя падрабязнасці, нават дыхтоўныя, добра наваксаваныя боты, суконныя штаны навыпуск, зафіксуе для гісторыі аб'ектыў фотакамеры пана Прушынскага. Гэты здымак некаторыя даследчыкі, прынамсі той самы Генадзь Кісялёў, называюць здымкам-сімвалам, сімвалам далучэння да перадавых ідэй сваёй эпохі.

Шмат хто датуе згаданы Марцінкевічаў здымак 1863 годам. Аднак – пра гэта ўжо згадвалася – ці ў 1863 годзе Марцінкевічу было да фатаграфавання?! Але ж нехта скажа: на Марцінкевічу паўстанцкая чамарка! Ну і што. Так, чамарка – сімвал паўстанцкага духу. Мяркуецца, Марцінкевічу яе прапанаваў маэстра Антон Прушынскі. Меў ён яе пры сваёй фотамайстэрні. Мабыць, і не адну. Між іншым, на гуртавым здымку, які мы называем тэатральным гуртком В. Дуніна-Марцінкевіча, шмат хто ў такіх чамарках, у якой зняўся і наш Беларускі Дудар. Не ішоў жа ён у 1863 г. да Прушынскага ў майстэрню ў паўстанцкай чамарцы праз усе вуліцы!

Шмат разоў славуты Марцінкевічаў здымак узнаўляўся па рэпрадукцыях Я. Карскага і Ю. Галомбека. Арыгінал здымка лічыўся страчаным. Але аднойчы адбыўся цуд: нечакана ў фондах Дзяржаўнага музея БССР – цяпер гэта Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі – знайшоўся арыгінал славутага гістарычнага здымка. Знаёмства з ім дало магчымасць нашым даследчыкам удакладніць шмат якія тэхналагічныя дэталі. Прынамсі, пад папяровай наклейкай на адвароце было расчытана прозвішча аўтара здымка. Яно яшчэ раз пацвердзіла, што аўтар – фатограф Антон Прушынскі з Мінска-Літоўскага.

Аляксандр БЯРОЗКА

БЯЗМЕРНАЯ ШЧЫРАСЦЬ ПІСЬМЕННІКА: МІФ ЦІ ПРАЎДА?

З ГІСТОРЫІ ЖАНРУ ЛІТАРАТУРНАЙ СПОВЕДЗІ

Тэрмін "споведзь" (лац. *confessiones*), што даў назву літаратурнаму жанру, быў запазычаны з царкоўнай тэрміналогіі, дзе ён азначаў два дзеянні, якія складалі ў сукупнасці адно з хрысціянскіх таемстваў: па-першае, пакаянне чалавека перад Богам, прызнанне сваёй спрадвечнай грахоўнасці і, па-другое, удзячнасць грэшніка Богу, які наставіў яго на ісцінны шлях.

Таемства споведзі бярэ пачатак ад святога Іаана Хрысціцеля: ён прапаведаваў *хрышчэнне пакаяння для адпушчэння грахоў*. Сэнс гэтага таемства, паводле царкоўнай традыцыі, зводзіцца да наступнага: вернік у прысутнасці святара адкрывае свае грахі Богу і праз яго атрымлівае прабачэнне ад Ісуса Хрыста. У выніку Гасподзь уз'ядноўвае таго, хто пакаяўся, з Царквой.

Захоўваючы цесную сувязь са споведдзю царкоўнай, якая праяўлялася перш за ўсё ў цэнтральнай устаноўцы – шчырасці, споведзь як літаратурны жанр нельга атаясамліваць з гэтым таемствам. Справа ў тым, што ўсё, аб чым гаворыцца на царкоўнай споведзі, далей за сцены храма не распаўсюджваецца, паколькі святар, адзіны прысутны пры гэтым таемстве, абавязаны захоўваць усё сказанае грэшнікам як безумоўную тайну. Пісьменнік, які звярнуўся да жанру споведзі, не можа разлічваць на захаванне сваіх грахоў у таямніцы, паколькі кожны мастацкі твор адрасаваны шырокаму колу чытачоў. Таму неабходна дакладна размяжоўваць споведзь як царкоўнае таемства і споведзь як літаратурны жанр.

Жанр споведзі прайшоў працяглы шлях эвалюцыі, зведаў уздзеянне самых разнастайных плыняў і кірункаў, кожны з якіх прыўносіў нешта новае, узбагачаючы структуру жанру.

Для фарміравання жанру споведзі ключавое значэнне мелі два жанры антычнай літаратуры – навяртанне і салілоквіум.

Жанр навяртання, які атрымаў шырокае распаўсюджанне ў I – II стст. і быў прадстаўлены ў антычнай літаратуры творамі Іларыя з Пуацье і Кіпрыяна з Карфагена, "бярэ свой пачатак ад звычаю публічнага пакаяння грэшнікаў, што існаваў у суполках першых хрысціян. Слёзы раскаяння моцна ўздзейнічалі на слухачоў і часта рабіліся крыніцай новага рэлігійнага ўздыму" [2, с. 507]. Споведзь запазычвае з гэтага жанру характэрную для яго дзвюхчасткавую кампазіцыю. У першай частцы навяртання аўтары распавядалі пра сваё грэшнае жыццё, а ў другой – пра знаёмства са Святым Пісаннем, цудадзейны ўплыў гэтай кнігі. Заканчваліся падобныя творы абавязковым навяртаннем язычнікаў у хрысціянства.

Жанр салілоквіума развіваўся ў арбіце меніпеі – жанру антычнай літаратуры, які ўзнік прыблізна ў III ст. да н. э. і зрабіў вялікі ўплыў на старахрысціянскую і візантыйскую літаратуры. У аснове жанру салілоквіума «ляжыць адкрыццё ўнутранага чалавека – "сябе самога", даступнага не пасіўнаму саманазіранню, а толькі актыўнаму дыялагічнаму падыходу да сябе самога, – падыходу, які разбурае наіўную цэласнасць уяўленняў пра сябе, што ляжыць у аснове лірычнага, эпічнага і трагічнага вобраза чалавека» [1, с. 203]. Споведзь пераймае і ўключае ў сваю мастацкую сістэму падобны актыўны дыялагічны падыход да сябе.

Акрамя таго, на фарміраванне жанру споведзі паўплывала і практыка складання судовых прамоў, якая мела мэту апраўдаць абвінавачанага ў вачах суддзяў і гледачоў.

Заснавальнікам споведзі як літаратурнага жанру з'яўляецца **Аўгусцін Аўрэлій**, чыю ролю ў распрацоўцы спавядальнага канона пераацаніць немагчыма. У **"Споведзі"** на прыкладзе ўласнага жыцця Аўгусцін паказвае ўвесь працэс ператварэння язычніка ў хрысціяніна, перадаючы ў найдрабнейшых дэталях усе хістанні, сумненні і перажыванні, якія суправаджалі яго на гэтым шляху. Распрацаваная аўтарам жанравая форма трывала ўвайшла ў мастацкі ўжытак на ўсе наступныя часы, а папулярнасць твора выклікала з'яўленне шэрагу новых спавядальных тэкстаў.

Выключнай любоўю да хрысціянства пранізана **"Споведзь" св. Патрыка**, альбо **Патрыкія Ірландскага**, якая была створана ў V ст. Яго твор працягвае лінію Аўгусціна па стварэнні споведзяў, напісаных глыбокімі вернікамі, якія ўсведамлялі вялікасць Бога і грэшную прыроду чалавека. Такім чынам, у эпоху Сярэднявечча да жанру споведзі звярталіся выключна царкоўныя дзеячы, што было абумоўлена асноўнай мэтай падобных твораў – спрыяць распаўсюджванню хрысціянскай веры, схіліць да яе нявернікаў, а таксама ўмацаваць у веры тых, хто ўжо навярнуўся.

Поруч з тэкстамі Аўгусціна, Патрыка Ірландскага ў эпоху Сярэднявечча ствараюцца споведзі, якія пачынаюць іншую лінію шчырасці ў сусветнай літаратуры. Пры напісанні гэтых твораў аўтары вырашаюць прынцыпова іншыя мэты, чым заснавальнік жанру Аўгусцін. Жанр споведзі трансфармуецца, паколькі змяняецца характар адносінаў аўтара да самога сябе. Калі Аўгусцін выкарыстоўваў споведзь для суду над сабою, то ў дадзеным выпадку гэты жанр выступаў як сродак самаапраўдання, узвышэння сваёй асобы ў вачах чытачоў. Вытокі такой разнавіднасці шчырасці, напэўна, неабходна шукаць у творчасці сафіста **Ліванія**. У першую чаргу мы маем на ўвазе яго прамову "Жыццё, альбо Аб маім лёсе", якая напоўнена пяшчотаю аўтара да самога сябе. Найбольш яркае адлюстраванне дадзены від шчырасці атрымаў у споведзі **П'ера Абеляра**, якая была створана паміж 1132 і 1136-м гг. "Гісторыя маіх няшчасцяў" П. Абеляра распачынае новую старонку ў развіцці жанру споведзі. Аўтар выступае ў ролі настаўніка, які падзеямі ўласнага жыцця, змешчанымі ў кнізе,

жадае выклікаць спачуванне да сябе з боку чытачоў і такім чынам вярнуць былую славу.

Новым крокам у развіцці жанру ў перыяд позняга Сярэднявечча з'явілася "Споведзь" **Архіпіі-та Кёльнскага**, якая ўяўляе з сябе першую спробу рэалізацыі жанру споведзі ў вершаванай форме. Твор А. Кёльнскага – аднаго з самых вядомых вандроўных манахаў – цалкам увасабляе асаблівасці светапогляду і лірыкі вагантаў. "Споведзь" – гэта пародыя на класічныя тэксты дадзенага жанру. Выкарыстоўваючы гэтую жанравую форму, аўтар усхваляе каштоўнасць вольнага, разгульнага жыцця, нястомных любоўных уцех.

У гэты самы час **Франчэска Петрарка** стварыў дыялагічную споведзь "Secretum" (на рускую мову перакладзена Раманам Хладоўскім як "Споведзь"), якая прадэманстравала новыя магчымасці ў развіцці жанру. У творы аўтар не так каецца ў грахах, як стварае тыпізаваны літаратурны вобраз "новага чалавека", творцы ўласнага жыцця і лёсу, які ўпершыню здабыў права на шчасце і свабоду. Твор Ф. Петраркі засведчыў рысы адыходу споведзі як літаратурнага жанру ад генетычна падобнай споведзі як царкоўнага таемства.

Працэс секулярызацыі жанру літаратурнай споведзі ў поўнай меры адлюстраваўся ў творчасці **Жана-Жака Русо**, "Споведзь" якога разам з творамі Аўгусціна і Льва Талстога лічацца вяршыннымі тэкстамі дадзенага жанру. Французскі асветнік істотна трансфармуе адну з асноўных установак жанру споведзі. Упершыню ў якасці адрасата для аўтара выступае не фігура Бога, якому ён каецца ў сваіх грахах, а канкрэтны, рэальны чалавек – чытач, здольны імгненна рэагаваць на ўчынкі аўтара. "Споведзь" Ж.-Ж. Русо адыграла выключна важную ролю для папулярызацыі жанру ў сусветнай літаратуры. Менавіта гэты твор выступіў у якасці своеасаблівага зерня, якое трапіла на рускую глебу і дало там буйныя ўсходы ў выглядзе спавядальных твораў. Пад непасрэдным уплывам "Споведзі" Ж.-Ж. Русо ў XVIII ст. да дадзенага жанру звярнуліся **Дзяніс Фанвізін** ("Шчырае прызнанне...") і **Мікалай Карамзін** ("Мая споведзь"), адаптуючы яго да нацыянальных умоў. У такім новым выглядзе споведзь дазваляла вырашаць цэнтральную праблему асветніцкай літаратуры – праблему выхавання.

Асаблівага росквіту жанр споведзі дасягнуў у літаратуры рамантызму. Дадзены жанр у поўнай меры адпавядаў галоўнай адметнай рысе гэтага кірунку ў сусветным мастацтве – падкрэсленай цікавасці да індывідуальнага, асабістага пачатку ў чалавеку. У гэты час з'яўляюцца споведзі **Альфрэда дэ Мюсэ** ("Споведзь сына стагоддзя"), **Міхаіла Лермантава** ("Споведзь") і іншых аўтараў.

Выключнае месца ў распрацоўцы спавядальнага канона належыць **Льву Талстому**, які змяніў сам падыход да разумення жанру. Калі папярэднікі ўспрымалі споведзь як пакаянны, праўдзівы расказ пра сваё жыццё, дык у талстоўскім разуменні – гэта шчырае выкладанне асабістых поглядаў і ідэй.

Не менш актыўна жанр споведзі развіваўся і ў наступныя часы. Значны ўнёсак у скарбніцу спавядальных твораў сусветнай літаратуры зрабілі **Поль Верлен** ("Споведзь"), **Оскар Уайльд** ("Турэмная споведзь"), **Томас Дэ Квінсі** ("Споведзь англічаніна, які ўжываў опіўм"), **Аляксандр Герцэн** ("Былое і думы"), **Міхаіл Бакунін** ("Споведзь"), **Мікалай Агароў** ("Мая споведзь") і іншыя.



Аляксандр Фёдаравіч Бярозка *– даследчык літаратуры. Закончыў Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны (2004). Цяпер – аспірант кафедры рускай і сусветнай літаратуры гэтай навучальнай установы.*

На Беларусі жанр споведзі плённа развіваецца з 80 – 90-х гг. XX ст., калі краіна, набыўшы самастойнасць у выніку распаду СССР, была ахоплена хваляй нацыянальна-духоўнага адраджэння. Спавядальныя творы спрыялі вырашэнню галоўнага запатрабавання часу – абуджэнню нацыянальнай свядомасці. Праз уважлівае ўгляданне ў глыбіні душы аднаго чалавека (аўтара) яны давалі магчымасць прадэманстраваць унутранае багацце, значнасць, своеасаблівасць цэлага народа. У гэты час убачылі свет споведзі **Сяргея Грахоўскага** і **Ларысы Геніюш**, якія не толькі ўяўляюць з сябе шчыры расказ аўтараў пра сваё жыццё, але і знаёмяць чытачоў з адной з трагічных старонак айчыннай гісторыі – жахамі сталінскіх лагераў.

У 2002 г. да жанру споведзі звярнуўся **Васіль Быкаў**, каб перад смерцю ("Доўгая дарога дадому" – апошняя прыжыццёвая кніга пісьменніка), як таго і патрабуюць законы абранага жанру, папрасіўшы ва ўсіх прабачэння, сумленна распавесці пра сябе і свой час.

Споведзь – адзін з вечных жанраў сусветнай літаратуры. Творы з такім жанравым абазначэннем прыцягваюць і будуць прыцягваць да сябе ўвагу з боку чытача, таму што цікавасць да іх закладзена ў самой прыродзе чалавека. Споведзь – гэта абавязкова нейкая таямніца, нешта забароненае, недасягальнае для чужога слухача, а прыхільнасць да таямнічага стала неад'емнай часткаю чалавека, якая выявілася ўжо ў першага яго прадстаўніка – Адама. Спавядальныя тэксты, пры ўмове іх належнай якасці, літаральна асуджаны на поспех. Чытач гатовы шмат што аддаць, каб даведацца пра што-небудзь незвычайнае, таямнічае, праўдзівае (апошняе, праўда, выконваецца далёка не заўсёды) з жыцця іншага чалавека, а тым больш пісьменніка. І споведзь дае яму такую магчымасць, паколькі яе чытанне нагадвае падглядванне за публічным чалавекам у замочную шчыліну. Ці не пра гэта думаў М. Лермантаў, калі пісаў: "Гісторыя душы чалавечай, хоць бы самай нікчэмнай душы, ці не цікавейшая і не карыснейшая за гісторыю цэлага народа... " [4, с. 74].

Разам з тым было б няслушным меркаванне, што споведзь – выключна забаўляльны літаратурны жанр. Пра такія творы вельмі дакладна сказаў амерыканскі пісьменнік Генры Тора: "Кнігі трэба было б чытаць гэтаксама павольна, як яны пісаліся". За кожнай споведдзю хаваецца трагедыя паглынутага крызісам чалавека, які знаходзіцца ў жыццёвым тупіку і таму выкарыстоўвае апошні, надзвычай няўдзячны сродак для дасягнення ўнутранай гармоніі – спробу разабрацца ў сабе на старонках мастацкага твора.

Калі параўнаць жыццёвыя шляхі пісьменнікаў, што ў розныя гады звярталіся да жанру споведзі, то можна адшукаць цікавую заканамернасць. Жыццё кожнага з іх адпавядае наступнай схеме: высокае грамадскае становішча, слава, поспех – крызіс, кардынальная змена свядомасці, светаўспрымання; разлад з самім сабой; разуменне таго, што ўсё папярэдняе жыццё было бессэнсоўным, што ў ім штосьці было не так; немагчымасць такога існавання ў далейшым – звяртанне да жанру споведзі як спроба па-новаму зірнуць на жыццё, пачаць жыць па-хрысціянску, пабожаму і такім чынам вынішчыць усё фальшывае, бесчалавечнае ў сабе.

На падставе прычын, якія выклікаюць жыццёвы крызіс і служаць галоўным матывам звароту таго ці іншага пісьменніка да жанру споведзі, умоўна можна вылучыць асноўныя разнавіднасці дадзенага жанру:

– рэлігійная споведзь (Аўгусцін, Патрык і інш.);

– турэмная (лагерная) споведзь (О. Уайльд, М. Бакунін, Л. Геніюш, С. Грахоўскі і інш.);

– споведзь смяротна хворага чалавека (Дз. Фанвізін, В. Быкаў і інш.);

– споведзь глыбока адзінокага аўтара, якога не разумее грамадства (М. Гогаль, Л. Талстой і інш.).

Пяру Аляксея Талстога належаць словы, якія ў поўнай меры перадаюць тую ступень цяжкасці, з якой даводзіцца сутыкацца аўтару споведзі: "Няма нічога непрыемней, чым казаць пра самога сябе" [5, с. 573]. У сувязі з гэтым узнікае пытанне, якое адыгрывае ключавую ролю ў паэтыцы дадзенага жанру: ці магчыма праўдзівая споведзь, ці здольны аўтар аб'ектыўна раскрыць свой унутраны свет? На гэтае пытанне наўрад ці знойдзецца адназначны адказ. З аднаго боку, ніхто не ведае аўтара лепш, чым ён сам; нікому не дадзены шанец пранікнуць у таямніцы пісьменніцкай душы, акрамя яго самога. З другога боку, чалавек – гэта заўсёды тайна, прычым не толькі для іншых, але і для самога сябе. "Наша веданне саміх сябе... унікальнае менавіта ў тым, у чым яно неперадавальнае...", – адзначыў Б. Дубін [3, с. 109]. Пісьменнік ніколі не адлюструе ў споведзі ўсяго таго, што ён ведае пра сябе. Таму, верагодна, немажліва аб'ектыўна, праўдзіва перадаць унутраны свет жывога канкрэтнага чалавека. Толькі выдуманы літаратурны персанаж, надзелены пісьменнікам тонка прыкмечанымі як у сябе, так і ў іншых людзей рысамі, здольны ў якой-небудзь ступені пазнаёміць чытача з тайнамі чалавечай прыроды. Амерыканскі драматург і празаік Торнтан Уайлдэр з гэтай нагоды сказаў: «Калі б каралева Елізавета, ці Фрыдрых Вялікі, ці Эрнэст Хемінгуэй прачыталі свае біяграфіі, яны з палёгкай усклікнулі б: "О, мая тайна пакуль не раскрыта!" Але калі б Наташа Растова прачытала "Вайну і мір", яна закрычала б, закрыўшы твар рукамі: "Як ён даведаўся?! Як ён даведаўся?!"» [6, с. 27].

Спіс літаратуры

1. **Бахтин, М.** Проблемы поэтики Достоевского / М. Бахтин. – М., 1972.

2. **Григорьева, Н.** О поэтике "Исповеди" / Н. Григорьева // Блаженный Августин. Исповедь. – М.,1992.

3. **Дубин, Б.** Как сделано литературное "я" / Б. Дубін // Иностранная литература. – 2000. – № 4.

4. **Лермонтов, М.** Собрание сочинений: В 4 т. / М. Лермонтов. – М., 1985. – Т. 4.

5. **Толстой, А.** Полное собрание сочинений. Т. 13 / А. Толстой. – М., 1949.

6. **Ялом, И.** Экзистенциальная психотерапия / И. Ялом. – М., 2000.

Артыкул рэкамендаваны да друку кафедрай беларускай літаратуры Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Францыска Скарыны.

КАЛЯНДАР ПАМЯТНЫХ ДАТАЎ І ЮБІЛЕЙНЫХ ДЗЁН на 2008 год

САКАВІК

1 сакавіка – 90 гадоў з дня выхаду ў свет грамадска-палітычнай і літаратурнай газеты "Дзянніца". Выдавалася па-беларуску ў Петраградзе і Маскве да 24 лютага 1919 г.

70 гадоў з дня нараджэння Юрыя Сергіенкі, жывапісца

2 сакавіка – 90 гадоў з дня нараджэння Алеся Бачылы (1918 – 1983), паэта, драматурга, заслужанага дзеяча культуры БССР

4 сакавіка – 100 гадоў з дня нараджэння Янкі Шарахоўскага (1908 – 1973), празаіка, крытыка, літаратуразнаўцы

70 гадоў з дня нараджэння Леаніда Трушко, акцёра, народнага артыста Беларусі

50 гадоў з дня нараджэння Лявона Баршчэўскага, перакладчыка, літаратуразнаўцы, паэта

5 сакавіка – 110 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Шахрая (1898 – 1979), оперна рэжысёра і спевака, заслужанага артыста БССР, заслужанага дзеяча мастацтваў Кіргізіі

6 сакавіка – 125 гадоў з дня нараджэння Івана Бялькевіча (1883 – 1960), мовазнаўцы

60 гадоў з дня нараджэння Ганны Мезенкі, мовазнаўцы

7 сакавіка – 70 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Чарняўскага, археолага, пісьменніка

8 сакавіка – Дзень жанчын

90 гадоў з дня нараджэння Міколы Ткачова (1918 – 1979), празаіка

9 сакавіка – 125 гадоў з дня нараджэння Францішка Аляхновіча (псеўд. Ю. Монвід; 1883 – 1944), драматурга і тэатральнага дзеяча, публіцыста, паэта, празаіка

10 сакавіка – 75 гадоў з дня нараджэння Серафіма Андраюка, крытыка і літаратуразнаўцы

70 гадоў з дня нараджэння Рыгора Кірдзея, мастака манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, жывапісца

Заканчэнне на с. 43.

Галіна КУРЫЛЕНКА

УНІКАЛЬНАЯ ФОРМА САМАВЫЯЎЛЕННЯ

ЭЛЕМЕНТЫ СПОВЕДЗІ Ў ТВОРАХ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ



Галіна Мікалаеўна Курыленка *– даследчык літаратуры. Закончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1985). Цяпер – старшы выкладчык кафедры тэорыі і гісторыі культуры Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка.*

Любы духоўна ці душэўна значны кантакт паміж людзьмі, заснаваны на імкненні да ўзаемаразумення, прадугледжвае ўнутры сябе сэнсавую сітуацыю споведзі – спавядальнага стану асобы як неабходнай умовы самараскрыцця чалавека чалавеку.

Семантыка паняцця "споведзь" даволі шырокая. Па-першае, гэтым словам абазначаецца царкоўна-рэлігійны рытуал (таямніца) пакаяння. Па-другое, частка такога рытуальнага дзеяння – вуснае прызнанне ўласных грахоў перад духоўнікам, па-трэцяе, споведзь – гэта "шчырае і поўнае ўсведамленне, тлумачэнне перакананняў сваіх думак і спраў" (У. Даль).

Разам з тым пра споведзь можна казаць як пра адметны, самастойны літаратурны жанр, класічныя ўзоры якога прадстаўлены ў еўрапейскай літаратуры "Споведзямі" Аўрэлія Аўгусціна, Жана-Жака Русо, Льва Талстога.

На сёння назапашаны значны пласт літаратуры, звязанай з гістарычным і філасофскім даследаваннем праблемы споведзі. Наяўнасць тэкстаў свецкага спавядальнага літаратурнага жанру патрабуе асабліва разгляду феномена споведзі як мастацкага твора, пераважна аўтабіяграфічнага, хоць нярэдка аповед вядзецца і ад імя прыдуманага героя.

Багата літаратуразнаўчых прац прысвечана аналізу такіх матываў, напрыклад, у творчасці найбуйнейшых рускіх пісьменнікаў XIX – XX стст.: Аляксандра Пушкіна, Міхаіла Лермантава, Льва Талстога, Мікалая Бярдзяева і інш.

Асаблівае значэнне мае тэма споведзі і ў беларускім духоўным вопыце. Яе развіццё на нацыянальнай глебе абумоўлена неабходнасцю пошукаў адказаў на самыя важныя жыццёвыя пытанні.

У фальклоры здаўна выкарыстоўваецца прыём "споведзі наадварот", споведзі-антыжанру як праявы народнага смехавога канона. У адной з казак са збору знакамітага этнографа Аляксандра Сержпутоўскага распавядаецца пра пана, што выйграў у карты новы маёнтак, паехаў аглядаць яго і застаўся на тры месяцы. За гэты час у яго ўласнай гаспадарцы адбылося шмат бедаў. Аканом пасылае да пана мужыка, каб той пра ўсё расказаў. Паміж панам і мужыком адбываецца гутарка ў форме дыялогу. Мужык пачынае сваю іранічную споведзь з малой, а заканчвае вялікай бядой [4]. Падобны прыём пазней выкарыстаў Леанід Уцёсаў у вядомай песеньцы.

Паэму Ф. Багушэвіча "Кепска будзе" Мікола Арочка назваў "гісторыяй чалавечых блуканняў па пакутах" [2, с. 3]. Сапраўды, твор напісаны ад імя селяніна, які распавядае пра сваё пакалечанае жыццё. Як сцвярджае даследчык, «...форму такога апавядання – споведзі – паэту падказвала, відавочна, спецыфіка працы "мужыцкага адваката", само жыццё» [2, с. 33]. І хоць паэма насычана цёмнымі, змрочнымі фарбамі, навеянымі пісьменніку штодзённым роздумам пра незайздроснае становішча беларускага сялянства, у гісторыі ўсіх няшчасцяў Аліндаркі ляжыць камічная калізія, таму ў ягоным маналогу ўвесь час прысутнічае "смех скрозь слёзы":

Як я толькі нарадзіўся –
Бацька сказаў: "Кепска будзе!"
Ну дык жа ж не памыліўся:
Здзекавалісь Бог і людзі.

Характэрная трагікамічная сітуацыя адбылася і з-за збуцвелага межавога слупка, за які, аручы палоску, зачапіўся плугам герой другой вершаванай былі-споведзі Ф. Багушэвіча "У астрозе".

На пачатку XX ст. у літаратуры ўзнікла патрэба ў большай аб'ектывізацыі, узнаўленні рэальных карцін жыцця, а таксама ў значна большай лірызацыі эпічнага пачатку. Павысілася і тэндэнцыя да раскрыцця аўтарамі ў творах свайго непасрэднага "я".

Форму невялікай лірычнай аўтарскай споведзі перад Богам, людзьмі, родным краем маюць шматлікія вершы **Янкі Купалы**. Верш "Мая малітва" змяшчае ў сабе і рысы хрысціянскай традыцыі, і звароты аўтара (як і ў славутым маналогу-плачы Ярослаўны) да сонца, да зор, да ветру, да неба, да зямлі – да ўсяго таго, што ўключаецца ў паняцце макракосму, без чаго немагчыма само існаванне чалавека як мікракосму. Верш Я. Купалы "Перад будучыняй" – гэта таксама аўтарская споведзь-маналог, горкі і трывожны пісьменніцкі роздум пра лёс Беларусі і пра беларускі народ. А вось верш "Творчасць" **Пімена Панчанкі**, на думку вышэйзгаданага М. Арочкі, – гэта ўжо і суд, і споведзь адначасова: «чаргова-нелітасцівы суд над уласным (ды і агульным) плёнам ("Прыгожа, дасціпна… і ўсё ж мішура…"). І споведзь перад імем нашай усеагульнай любові – Іванам Дамінікавічам» [3, с. 6].

У самых розных праявах жанрава-стылёвая спецыфіка споведзі прысутнічае і ў прозе. Так, **Кузьма Чорны** ў рамане "Млечны шлях" выкарыстоўвае элементы вербальнай споведзі сваіх герояў "…у хвіліны пошукаў ратунку" [5, с. 213]. Пад адным да-

хам воляй лёсу сабраліся абсалютна розныя людзі – нядаўнія ворагі. Аб'яднаныя яны хіба што адным – жаданнем ацалець, выжыць. На кароткі час яны мусяць узяць перамір'е. І дапамагае ім у гэтым менавіта споведзь кожнага з іх – адзін перад другім і перад самім сабой адначасова, бо "адкрытая душа і даступная кожнаму" [5, с. 208].

Спавядальным характарам вылучаецца кніга "Пішу, як жыву" **Янкі Брыля**, дзе пісьменнік праз нязначныя, здавалася б, будзённыя сітуацыі ідзе да абагульненняў, што ахопліваюць розныя сферы жыцця. А "сапраўднае мастацтва заўсёды абагульняе" – так лічыў Алесь Адамовіч [1, с. 9].

Ідэйна-мастацкае падабенства заяўлена ўжо ў саміх назвах твораў **Сяргея Грахоўскага** і **Ларысы Геніюш** – "Споведзь". У аснове абедзвюх кніг ляжыць факт беспадстаўнага абвінавачання, зняволення, нечалавечых здзекаў і ўмоваў існавання ў лагеры. І С. Грахоўскі, і Л. Геніюш выпакутавалі сваё права на споведзь, кожны з іх прайшоў уласны шлях выпрабаванняў, стратаў, нягодаў. Але дадзеныя споведзі нельга назваць пакаяннямі. Гэта, хутчэй, інвектыва – споведзь-абвінавачанне сістэмы, часу, людзей... І яшчэ – споведзь-папярэджанне чалавецтва аб страшэннай пагрозе. Варта адзначыць, што і С. Грахоўскі, і Л. Геніюш аналізуюць уласныя перажыванні ў кантэксце часу, эпохі, у якой адбывалася іх маральнае сталенне. І, апроч таго, споведзь тут – не толькі літаратурны жанр, а і свайго роду ход мыслення, што спрыяе пераадоленню літаратурнасці як фармальнай прыкметы.

Такім чынам, пачынаючы са "споведзі" Аўрэлія Аўгусціна ў еўрапейскай, у тым ліку і ў беларускай, літаратуры ўзнікае шмат твораў, якія маюць выразна акрэсленыя рысы жанру споведзі. Гэтая унікальная форма самавыяўлення не толькі дапамагае зразумець сэнс рэлігійнай таямніцы, але і прымушае задумацца пра крытэрыі "праўдзівасці" чалавечага быцця.

Спіс літаратуры

1. **Адамовіч, А.** Беларускі раман / А. Адамовіч. – Мінск : Маст. літ., 1961.

2. **Арочка, М.** Беларуская савецкая паэма / М. Арочка. – Мінск : Маст. літ., 1979.

3. **Арочка, М.** Саюз часу і майстэрства / М. Арочка. – Мінск : Маст. літ., 1981.

4. **Сержпутоўскі, А.** Казкі і апавяданні беларускага Палесся / А. Сержпутоўскі. – Мінск : Беларусь, 1965.

5. **Чорны, К.** Выбраныя творы / К. Чорны. – Мінск : Беллітфонд, 2000.

Ганарар за публікацыю гэтага артыкула аўтар ахвяруе на развіццё часопіса "Роднае слова".

Лабараторыя паэта

ГУКАПІСНАЯ ФАКТУРА ВЕРШАЎ ЕЎДАКІІ ЛОСЬ

Агульныя гістарычна-сацыяльныя працэсы абумовілі сінхроннасць развіцця беларускай і рускай літаратуры ў сярэдзіне 1950 – канцы 1960-х гг. XX з'езд партыі, "адліга" спрыялі станаўленню дэмакратычных прынцыпаў жыцця, а разам з тым развіццю паэзіі. У рускай паэзіі з'яўляюцца "шасцідзесятнікі", а ў беларускай так званае філалагічнае пакаленне. Загучалі імёны Андрэя Вазнясенскага, Віктара Сасноры, Петруся Макаля, Анатоля Вярцінскага, Алеся Наўроцкага і многіх іншых паэтаў. Новае пакаленне ў літаратуры актыўна абнаўляла паэтыку і стыль пісьма. У беларускай паэзіі крытыкі называюць толькі аднаго творцу, што застаўся па-за межамі ўсеагульных паэтычных эксперыментаў, – Еўдакію Лось.

Навацыі ў паэзіі былі ў той час захапленнем вельмі распаўсюджаным, але яны не прыжыліся ў яе творчасці. Заснаваная на класічных памерах, ненадуманых тэмах і вобразах, яе паэзія вабіць шчырасцю і асаблівым, жаночым поглядам на свет. Задачай артыкула з'яўляецца разгляд фанічнага ўзроўню вершаў паэткі, вылучэнне ўжывальных гукапісных канструкцый, выяўленне асаблівасцяў валодання фанічнымі элементамі, а таксама аналіз перадачы гукапісу пры перакладзе вершаў на рускую мову.

Адразу трэба ўдакладніць, што ёсць гукапіс і якім чынам ён аналізуецца ў мастацкім творы. **Фоніка**, альбо **гукапіс**, – паўтор гукаў, які выконвае ў паэзіі арганізацыйную функцыю. Паўторы гукаў ёсць у кожным тэксце. Гэта абумоўлена тым, што колькасць гукаў і літар у мове абмежаваная, але ў прозе, якая існуе ў гарызантальным плане, гукапіс не выконвае такой моцнай арганізацыйнай ролі, як у паэзіі. Таму на матэрыяле паэзіі больш прыдатна разглядаць гэты мастацкі сродак. Так, паэтычны гукапіс складаецца з наступных элементаў: асанансы, алітэрацыі, іншыя паўторы гукаў, рыфма, паўторы слоў, сінтаксічны паралелізм. У вершы гукапіс разглядаецца як па гарызанталі, так і па вертыкалі. Натуральна, у прозе сфера ўплыву гукапісу на тэкст звужаецца.

Існуе шэраг класіфікацый гукапісных элементаў (В. Брыка, А. Гербстмана, М. Чаркіча, С. Ганчарэнкі і інш.). Пры параўнанні гукапісных структур арыгінальных і перакладных тэкстаў удалай падаецца класіфікацыя, што ўлічвае свядомасць ужывання гукапісных элементаў і іх семантызаванасць. Кіруючыся гэтымі паказнікамі, мы вылучылі **простыя гукавыя паўторы**, **ускладненыя гукавыя паўторы** і **складаныя гукавыя паўторы**. Ніжэйпададзеныя тэрміны будуць заменены на скарачэнні ПГП, УГП і СГП.

ПГП – часта неўсвядомленыя паўторы. Да гэтай групы можна аднесці алітэрацыі, асанансы, гукаперайманні, арнаментальны і лінейны гукапіс (тэрміны запазычаны з пералічаных класіфікацый). Напрыклад: "Паг***н***а***л***і ў во-

се**н**ь з**л**ую" (Р. Барадулін. "Курлы-курлы...") [н-л-н-л]-арнамент. Да УГП належаць такія фанічныя элементы, якія надзяляюцца пэўнай семантыкай у кантэксце (сімвалічны гукапіс, сэнсавая скрэпа). Напрыклад, у кантэксце "***Грэў*** на сонцы свае ***абгарэлыя*** рукі" (П. Панчанка. "Кожны з нас прыпасае Радзімы куток...") паўтор [гр-г-р] набывае значэнне 'агонь, пажар, цяпло'. СГП – гэта свядомая праца над гукавым абліччам верша. СГП прадстаўлены ў творах каламбурамі, паранамазіяй, гульнёй слоў. Напрыклад: "Адсякае далоні / ***Клянам*** / Лістабой / А ***калі нам*** / З табой..." (Р. Барадулін. "Бяроза з лістком гаварыла"). На наш погляд, УГП адрозніваюцца ад СГП тым, што УГП рэалізуюцца на ўзроўні гука, літары, а СГП – на ўзроўні марфемы, слова.

Чаму менавіта такая сістэма падаецца нам больш прыдатнай для працы з перакладамі? Справа ў тым, што вылучаны гукапісны элемент дакладна класіфікаваць досыць цяжка, гэта звязана з неадназначнасцю трактоўкі гукапісу. Класіфікацыя элементаў – інакшая задача, чым тыя, якія мы паставілі перад сабой. Вылучаючы гукапаўтор, згодна з нашай класіфікацыяй мы можам сказаць пра долю наўмыснасці пры яго стварэнні і яго семантыцы, тым самым прагназаваць перадачу фанічнага элемента пры перакладзе. Ужо тэарэтычна можна меркаваць пра тое, што ПГП будуць змяняцца ў перакладзе ў большых працэнтных суадносінах, чым УГП і СГП. Перакладчык зверне ўвагу на больш выяўныя элементы, усё астатняе будзе спрашчацца. Фоніка будуецца на тым узроўні мовы, які з'яўляецца найбольш залежным, і таму перадача фанічных элементаў – дастаткова цяжкая задача для перакладчыка.

Важным з'яўляецца пытанне методыкі вылучэння фанічных элементаў. Уявім, што перад намі верш. Як мы казалі, верш арганізаваны па вертыкалі і гарызанталі. Нумаруем радкі, бо гэта з'яўляецца "адрасам" пэўнай гукапіснай канструкцыі. У беларускай мове мы звяртаем увагу на ўсе галосныя гукі ў радку, але пры перакладзе на рускую мову асанансы слабеюць, бо ў рускай мове існуе рэдукцыя. І таму ў рускіх перакладах трэба ўлічваць толькі націскныя склады. Калі разглядаем фанічныя элементы, што складаюцца з зычных, нашай задачай становіцца вылучэнне паўтораў, якія яднаюць радок. Трэба ўлічваць і вертыкальныя гукавыя суадносіны. Пры аналізе мы не звяртаем увагі на рыфму, сінтаксічны паралелізм, адным словам, на ўсё тое, што будуецца на паўторах слоў і іх формаў. У паўторах могуць удзельнічаць варыянты гукаў па глухасці-звонкасці. Гэтая методыка можа выкарыстоўвацца пры аналізе фонікі верша. Пры падмацаванні наступных разважанняў прыкладамі пасля кожнага з іх у круглых дужках знаходзіцца нумар, па якім можна дазнацца назоў верша ў спісе, што змешчаны напрыканцы артыкула.

У вершах Е. Лось (прааналізавана 180 радкоў) выкарыстаныя 50 ПГП, 12 УГП, 8 СГП. Сярод ПГП найбольш распаўсюджаным элементам (43 прыклады) з'яўляюцца разнастайныя спалучэнні зычных (арнамент, падзел гукапісам радка на падрадкоўі, ужыванне некалькіх элементаў, неўладкаваныя паўторы). 7 разоў выкарыстоўваецца гукаперайманне, 4 – алітэрацыя на адзін гук. Звернемся да кожнага з названых сродкаў гукапісу.

Арнаментальны гукапіс складаецца з 2 альбо больш элементаў, якія чаргуюцца ў строгай паслядоўнасці, утвараючы пэўны гукавы малюнак. Напрыклад: "1 *Чаромха любіць халадок*" [х-л'-х-л], "6 *Ад ранку белае кіпенне*" [нк-к'-н] (1), "5 *Там ярына бяжыць на ўзгоркі*" [р-н-н-р], "6 *Як лес, наўкола там сады*" [кл'с-клс] (2), "1 *Там патаемныя зоркі сінелі*" [т-м-т-м] (6).

Часам гукапіс аб'ядноўвае не цэлы радок, а яго часткі, кожнае падрадкоўе мае свой гукапісны малюнак. Напрыклад: "11 *Сэрцам імкнуся да хіленькіх кладак* [с-м-м-с / дл'к'-клд]" (6), "9 *Сніцца бясконца мне: рукі, як крылле*" [с'н'-ц-с-н-ц / р-к'-к-кр] (7).

У радку могуць спалучацца некалькі фанічных канструкцый так, як гэта адбываецца ў прыкладах: "17-18 *Я іду па імшаніку золкім – / Гукаю, гукаю!*" (8) – гукаперайманне ўжыта разам з арнаментам [м-к-м-к]. "9 *Ён будзе ў скрыпучай партупеі*"(9) – спалучэнне гукаперайманя і сэнсавай скрэпы. У радку "4 *Сілы спрабуючы перад адлётам*" (6) пераплятаюцца арнаменты [л-пр-пр-л] і [с-с-т-т].

Неўладкаваныя паўторы гукаў прадстаўленыя спалучэннем зычных з перастаноўкай элементаў, напрыклад: "2 *Цёзкі-бярозкі шапталі за плотам*" [птл-плт] (6), "22 *Пакута сэрца раніць, як суччо*" (9) [срц-рцс]. Аднолькавыя гукі могуць паўтарацца ў радку без пэўнай паслядоўнасці: "1 *Паўночны чэзлы лес ды поўня*" (10) [п-н-ч-н-ч-п-н'], "21 *А вернасць гартаваная не гіне*" (9) [в-н-г-в-н-н'-г'-н'].

Гукаперайманне – адзін з найпрасцейшых прыёмаў фонікі, які заключаецца ў перадачы моўнымі сродкамі гукаў прыроды, прадметаў. У паэзіі Е. Лось выкарыстоўваюцца традыцыйныя гукаперайманні грукату землятрусу: "8 ***р**ассёк земля**т**русу кл**і**н*" (5); шоргату галін, травы: "19-20 *Я праход**ж**у **ш**ып**ш**ыннікам колкім – / **Ш**укаю, **ш**укаю...*" (8); звону: "1 *Над **З**вонню – **з**вон, ля **З**воні – **с**інь*" (11); грому: "2 *Г**р**амамі х**р**ышчаны не **р**аз*" (12); гудзення, посвісту завірухі: "1 *Г**у**дзе мя**ц**еліца **с**івая*" (2). Цікавым і арыгінальным з'яўляецца перайманне гукаў хады па гразкай дарозе: "3 *Што ўжо размо**кла**, **хл**юпае дарога*" (4). Цяжкасць для перакладчыка ўяўляюць гукаперайманальныя словы накшталт "дыхае, гудзіць, хлюпае", часта фанетычна тоесныя эквіваленты адсутнічаюць нават у блізкароднасных мовах, таму пры перакладзе губляецца гукаперайманне.

Алітэрацый на адзін гук ужываецца няшмат. Верш "П е р а в а л" цалкам алітэраваны на гук [р], які набывае ў кантэксце сімвалічнае значэнне. Часцей алітэрацыя аб'ядноўвае радок, напрыклад: "4 *Ужо ка**н**авы по**ў**н**ы**я **н**аліты*" (4), "11 *І крыху со**н**ца **н**ебнае скарбо**н**кі*" (4), "7 *І ў дураслівы**х** **х**алада**х**" (1).

У паэзіі Е. Лось выкарыстоўваюцца спалучэнні слоў, сінтаксічная і семантычная злучанасць якіх падкрэсліваецца іх гукавым падабенствам. Прыклады падобнай гукавой скрэпы прадстаўлены ў радках: "10 ***Павеву ветру** не чутно*" (2), "6 *Баяўся **непрадбача-***

най** бяды*" (9), "9 ***Сосны выносныя** будуць ламацца ад снегу*" (3), "15 *Вясёлымі ў **блакіце галубамі" (4), "8 *А пад **дубам / Густачубым***"(13), "4 ***Ператвараецца ў райскі***" (1).

Частае ўжыванне ў паэзіі пэўнага аўтара УГП і СГП сведчыць пра высокі ўзровень валодання словам, пра метафарычнасць мыслення. Паэзія Е. Лось не імкнецца да гукапіснай насычанасці, але паэтка ўдала выкарыстоўвае фанічны ўзровень для падкрэслівання некаторых вобразаў. А часам і ў фанічным плане робіць цікавыя адкрыцці: "1 *Снежань-свежань / браце мой*" (14), "*Ён, дожджык, кап ды кап... / О каб ты, каб*" (4), «5 *"У Леплі злеплен!" – ганарыцца*» (12), "4 *Мая старонка Старына*" (2), "3 *Тры рабіны – на рубіны*" (13).

На рускай мове паэзія Е. Лось загучала дзякуючы намаганням перакладчыкаў С. Кузняцовай (3, 4, 5, 6, 8, 9, 10, 15), У. Жукава, А. Пракоф'ева (12), І. Васілеўскага (2, 11), І. Бурсава і Р. Дабрацовай (1). Моўны ўзровень, на якім будуецца мастацкі прыём гукапісу, залежыць ад лексічнага, сінтаксічнага, словаўтваральнага ўзроўняў. Фанічная канструкцыя можа быць перакладзена на рускую мову ў тым выпадку, калі яна з'яўляецца носьбітам выразнай эстэтычнай альбо дадатковай семантычнай інфармацыі. У гэтым разе канструкцыя трапляе ў поле зроку перакладчыка і можа быць пераўвасоблена на іншай мове. ПГП могуць перадавацца праз фанетычна тоесныя эквіваленты альбо праз іншую лексіку мовы перакладу пры ўмове значнасці гукапаўтору. Прыклад перадачы ПГП пры дапамозе фанетычна тоеснай лексікі: "2 *Грамамі хрышчаны не раз* – Крещенный много раз грозой" (12), "4 *Клён – на лісце* – Клён – на листья" (13), "*Ён будзе ў скрыпучай партупеі* – Заявится в скрипучей портупее" (9).

Але часцей за ўсё ПГП пры перакладзе змяняюцца. У такіх выпадках фанічная канструкцыя можа быць узмоцненай і аслабленай. Напрыклад: "10 *Пад белай цёпла вам парошай* – Под лепестковою порошей" [п-б-л-пл-п] / [п-п-п] (1); "6 *Як лес, наўкола там сады* – Там, как леса, стоят сады" [л-с-л-с] / [л-с-с-с] (13); "6 *Махрыстая красуня-чараўніца* – Мохнатая красуня-чаровница" [р-с-р-с-н-р-н] / [р-с-н-р-н] (15). Пры адсутнасці арыгінальнай фанічнай канструкцыі ўзнікае перакладчыцкі гукапіс: "4 *І бэзам – быццам напаказ* – В сирени тонущей весной" (12) [б-б-п] / [н-н-н]. Задачай перакладчыка не з'яўляецца дакладная перадача ПГП, але важна захаваць у перакладзе колькасць ПГП, каб у параўнанні з арыгіналам пераклад не здаваўся збедненым.

УГП і СГП – асаблівы элемент вершаў, таму іх знікненне альбо замена на ПГП змяняюць стыль паэта. Часта менавіта гэтыя віды гукапаўтораў робяць немагчымым пераклад тэкстаў. З 20 падобных элементаў у перакладах вершаў Е. Лось захаваны толькі 9, астатнія замененыя на ПГП. Пераклад названых канструкцый патрабуе фанетычна тоесных эквівалентаў. Прыклады захавання УГП і СГП у перакладах: "15 *Вясёлымі ў блакіце галубамі* – В лазури голубями голубыми" (4), "*Баяўся непрадбачанай бяды* – Боялся повстречаться сам с бедой" (9), "*Над Звонню – звон, ля Звоні – сінь* – Над Звонью – звон, над Звонью – синь" (11). Прыклады замены арыгінальных УГП і СГП: "*Павеву ветру не чутно* – Ты не расслышишь голос свой" (2), "*Баяўся непрадбачанай бяды* – Боялся повстречаться сам с бедой" (9), "*Сосны выносныя будуць ламацца ад снегу* – Сосны высокие будут ломаться от снега" (3).

Падводзячы нашы разважанні да лагічнай высновы, трэба сказаць, што фоніка ў вершах Е. Лось не з'яўляецца асноўным элементам працы над формай верша, таму колькасць ПГП значна большая за УГП і СГП. Пераважна выкарыстоўваецца гарызантальны гукапіс. У творах паэткі ўжыты наступныя віды ПГП: гукаперайманні, алітэрацыя на адзін гук, арнаментальны гукапіс, падзел гукапісам радка на два падрадкоўі, неўладкаванае ўжыванне падобных гукаў. ПГП пры перакладзе на рускую мову часта змяняюцца, перакладчык пры працы з ПГП імкнецца да захавання іх колькасці для таго, каб тэкст перакладу быў насычаны імі ў той самай ступені, як і тэкст-арыгінал. У вершах Е. Лось ужыты выдатныя ўскладненыя і складаныя гукапаўторы. Яе стыль вызначаецца гарманічным ужываннем кожнага з элементаў паэзіі. Гэтая стылёвая асаблівасць адчуваецца і ў перакладах, зробленых самой паэткай. Дзякуючы ёй па-беларуску загучалі вершы Джорджа Байрана, Саламеі Нерыс, Лесі Украінкі, Расула Гамзатава, Бэлы Ахмадулінай, Пятра Табурокава.

Спіс вершаў, прааналізаваных у артыкуле:

1) "Чаромха любіць халадок..."; 2) "У мяцеліцу"; 3) "Скора канец лістападавага разбегу..."; 4) "А дождж кап ды кап..."; 5) "Перавал"; 6) "Там патаемныя зоркі сінелі..."; 7) "Чайка"; 8) "Палачанка"; 9) "Партызанка"; 10) "Яснавокія мальвы"; 11) "Звонь"; 12) "Лепель"; 13) "Пасадзіла тры рабіны"; 14) "Снежань-свежань"; 15) "У садзе спіць чорнавалосы бог...".

Спіс літаратуры

1. **Лось, Е.** Выбраныя творы: У 2 т. / Е. Лось. – Мінск : Маст. літ., 1979.

2. **Лось, Е.** Зеленая светлица / Е. Лось. – М. : Сов. писатель, 1968.

3. **Лось, Е.** Стихи / Е. Лось. – М. : Сов. писатель, 1973.

4. **Кожинов, В.** Как пишут стихи / В. Кожинов. – М. : Алгоритм, 2001.

5. **Эткинд, Е.** Проза о стихах / Е. Эткинд. – СПб. : Знание, 2001.

6. **БДАМЛМ.** – Ф. 141. – Воп. 1. – Адз. зах. 39.

7. **Тамсама.**

8. **Тамсама.**

Карына КАСАТАЯ,
аспірант Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка.

Паэтычны кругабег



Імя паэта, празаіка і публіцыста Навума Гальпяровіча (нарадзіўся 14 студзеня 1948 г. у Полацку) добра знаёмае беларускім чытачам, а яшчэ лепей – радыёслухачам, бо пісьменнік ужо шмат гадоў працуе на радыё, дзе прайшоў шлях ад журналіста да галоўнага дырэктара радыёстанцыі "Беларусь".

Сёння на творчым рахунку Н. Гальпяровіча – паэтычныя зборнікі "Брама" (1990), "Востраў душы" (1995), "Струна" (1997), "Святло ў акне" (2002), "Голас і рэха" (2005), кніга прозы "Шляхі і вяртанні" (2005), кніга прозы і паэзіі "Гэта ўсё для цябе" (2006).

У "Родным слове" друкаваліся артыкулы «"Калі адчуе сэрца радасць…": Лірычны герой Навума Гальпяровіча"» Алены Яскевіч (2000, № 11), «"Беларускай душы матыў": Патрыятычная лірыка Навума Гальпяровіча» Міколы Шабовіча (2005, № 11), а таксама вершы паэта: "Лістапад – гэта месяц такі..." (1994, № 11), "Чытаючы Скарыну", "Нам слёзы сёння выстудзіць зіма...", "Балада пра званочак", "Паўсталі храмы там, дзе быў нябыт...", "Купальскай летняй ночкай памаўчым…", "Я аддаю надзеі, як даўгі...", "Нашто, карціна на сцяне...", "Таемныя, быццам планеты…", "Сон" (2000, № 11), "Хваляваннем душа напоўніцца...", "Вей замружу, і ўбачыцца вечар...", "Жабрачку бачыў: у метро хадзіла...", "Далягляд адзінокі, сцюдзёны і сіні...", "Дазволь пагрэцца ля тваёй шчакі...", "Сафія, Полацк – родны край", "Захавай маю мову, чарговы наш век..." (2005, № 11), "А мне не верыцца, не верыцца...", "Гэта ўсё для цябе – гэты горад і дзень...", "Апошняе каханне – бы восеньскі туман...", "Ты хочаш свята? Свята навакол..." (2006, № 6). Дык пажадаем шаноўнаму юбіляру, каб свята не пакідала яго!

60

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ

"ТРЭБА ЖЫЦЬ ПА-ЗА ЎЗРОСТАМ…"

* * *

Як звычайна і проста,
Нібы дыхаць ці піць:
Трэба жыць па-за ўзростам,
Дзень наступны любіць.

І кахаць утрапёна,
І адхланяў шукаць,
Са слязою салёнай
Ля магіл пастаяць.

І адчуць як выснову,
Як натхнення прыліў,
Вернасць роднаму слову,
Вернасць роднай зямлі.

* * *

Мне падарожжы наталяюць розум...
І дома ўспамінаю зноў і зноў,
Як качаны сівелі ад марозу
Ў гародчыку маіх гаспадароў.

Як піў я квас, халодны і нягоркі,
Што мне здаваўся маладым віном.
І слухаў нетаропкую гаворку
За гаманкой бяседай за сталом.

Як я, расчулены і вінаваты.
Што болей тут не выпадае быць,
Глядзеў на незнаёмыя мне хаты.
Якія сэрцам здолеў палюбіць.

Дарога ўранні слалася абрусам,
Плылі паважна сосны за акном.
І адкрываўся родны, беларускі,
Адзіны мой ажно да скону дом.

* * *

Пажар рабін палае зноў,
Нібы трывога.
Як ад усіх прыгожых слоў
Перасцярога.
Мне болей скажуць вецер, сад,
Рака і поле.
Дразды ў абуджаных лясах.
Начная поўня.
Мне скажуць мудрыя дзяды
Сваім маўчаннем.
Кастроў асенніх горкі дым
І зорак ззянне.
І помнікаў суровы сум.
Сюды яшчэ раз
Свае я думкі прынясу,
Спакой і веру.
Ісці з ахапкам слоў здалёк
Сюды не трэба.
Тут Сцяг. Тут Сонца. Васілёк.
Радзіма. Неба.

* * *

Намалюй мяне, мастак,
У вясновым белым садзе,
І ў прымружаным паглядзе
Адшукай надзеі знак.

Намалюй бацькоўскі дом,
Мамы ўсмешку дарагую,
Ўсё, што ў сэрцы берагу я,
Што агортвае цяплом.

Прымацую на сцяне,
Буду ціха любавацца
Гэтай мастакоўскай працай,
Што жыццё прадоўжыць мне.

Алена ВАЛЬЧУК

ПЕРАСЯГНУЎШЫ ЎСХОДНІ ПОЛЮС

БЕЛАРУСКАЯ ПРАСТОРА ДРАМЫ "ВЯЛІКІ КНЯЗЬ МАСКОЎСКІ І ПЕРАСЛЕДАВАНЫ ІМПЕРАТАР" ЛОПЭ ДЭ ВЭГІ

Напісаная ў 1617 г. драма "Вялікі князь Маскоўскі і перасьледаваны імператар" ("El gran duque de Moscovia y emperador perseguido") Лопэ дэ Вэгі – першы твор у іспанскай літаратуры, сюжэт якога заснаваны на гістарычных падзеях, што адбываліся ва Усходняй Еўропе на мяжы XVI – XVII стст., а прататыпамі галоўных герояў сталі рэальныя асобы, чыя дзейнасць уплывала на развіццё тагачасных падзей.

На той момант на фоне папулярызацыі і распаўсюджвання контррэфармацыйных ідэй адбываліся кансалідацыя і актыўнае ўзаемадзеянне Іспаніі і Рэчы Паспалітай у знешнепалітычнай сферы як найбольш уплывовых каталіцкіх дзяржаў, скіраваныя на тое, каб не толькі захаваць уплыў Касцёла ўнутры краін, але і пры спрыяльных умовах пашырыць яго на ўсходнеславянскія землі. Гэтаму ў немалой ступені садзейнічала барацьба за маскоўскі трон, якая разгарнулася паміж Дзімітрыем, падтрыманым польскай і вялікалітоўскай магнатэрыяй, і Барысам Гадуновым.

Што датычыць Іспаніі, то яе ўплыў на сітуацыю ў дадзеным рэгіёне ажыццяўляўся праз пасярэдніцтва езуітаў, чыя дзейнасць як у Рэчы Паспалітай, так і ў Масковіі мела не толькі палітычны, але і культурна-асветніцкі характар. У прыватнасці, з іх аповедаў і данясенняў еўрапейцы бралі неабходную інфармацыю пра ўсходнеславянскія падзеі, а таксама знаёміліся з побытам і норавамі мясцовага насельніцтва. Тое, што да гэтых матэрыялаў падчас працы над драмай звяртаўся Лопэ, пацвярджаюць і высновы, да якіх прыйшлі даследчыкі творчасці іспанскага драматурга. Так, Міхаіл Аляксееў, спасылаючыся на даследаванне Менэндэса і Пэлаё, зазначае, што "Лопэ дэ Вэга карыстаўся вусным аповедам пра асоб і падзеі ў Маскве якога-небудзь польскага езуіта ці іспанца, які вучыўся ў польскай калегіі"[1].

Акрамя таго, ён узгадвае выданне Антоніо Пасэвіна "Аповед пра выключнае, амаль цудоўнае заваяванне бацькоўскай імперыі, здзейсненае святлейшым юнаком Дзімітрыем, вялікім князем Маскоўскім, у 1605 годзе", якое выйшла з друку пад прозвішчам Барэцца Барэццы, а іспанскі пераклад гэтага твора, ажыццёўлены Хуанам Маскерай, пабачыў свет у Вальядалідзе ў 1606 г.

Прааналізаваўшы, наколькі падзеі, апісаныя Лопэ ў драме (аповед пра Дзімітрыя, яго знаходжанне ў манастыры, уцёкі ў Літву, сустрэча з Вішнявецкім, прыём у караля Рэчы Паспалітай), адпавядаюць звесткам, прыведзеным А. Пасэвіна, М. Аляксееў робіць выснову, што драматург "...карыстаўся менавіта выданнем Маскеры"[2].

На думку Мікалая Балашова, акрамя брашуры Пасэвіна – Маскеры 1605 – 1606 гг., драматург знаёміўся з іншым не менш вядомым творам Пасэвіна пра Русь – "Moscovia" ("Масковія"), упершыню выдадзеным у 1586 г., а таксама мог пра нешта даведацца са слоў палякаў, рускіх, украінцаў, якія траплялі ў Іспанію[3].

Магчыма, аўтар мог нешта пачуць і ад беларусаў, якія таксама дасягалі Паўднёвай Еўропы. Вядома, што ў гэты час у Іспаніі знаходзіўся Ян Караль Хадкевіч, які служыў пры двары караля Філіпа II і ў шэрагах іспанскага войска змагаўся на тэрыторыі Нідэрландаў[4]. Акрамя таго, у "Аповедзе пра выключнае, амаль цудоўнае заваяванне..." Маскера адзначае, што тут у маі 1606 г. знаходзіліся браты Марыны Мнішак[5].

Пяру А. Пасэвіна таксама належыць "Маскоўскае пасольства". Яно складаецца з данясення, у якім аўтар апавядае генералу ордэна езуітаў Клаўдыо Аквавіве пра вынікі пасольскай місіі пры двары маскоўскага князя, і нататак яго спадарожніка – езуіта Паола Кампані. Паводле Пасэвіна, твор Кампані заснаваны на паведамленнях пасланца Рэчы Паспалітай у Масковіі Кшыштафа Дзержка, які падзяліўся сваімі назіраннямі з езуітам, калі той, вяртаючыся ў Рым, спыняўся ў Полацку. Упершыню гэты твор быў надрукаваны ў невялікай колькасці экземпляраў у 1584 г. у "Штогадовіку", які выдаваўся езуіцкім ордэнам.

Дакумент выклікае цікавасць яшчэ і тым, што ў ім даецца апісанне беларускіх гарадоў, праз якія праходзіў шлях пасольства ў Маскву. Так, у адным з іх паведамляецца: "Дзісна – крэпасць у Белай Русі, адбудаваная пасля падзення Полацка каля 15 гадоў таму каля рэк Дзвіны і Дзісны, якая знаходзіцца ад Вільні прыкладна на пяць дзён шляху..."[6]. Абазначаючы тэрыторыі, дзе пражываюць беларусы пераважна праваслаўнага веравызнання, аўтар ужывае геаграфічную назву *Белая Русь*, а калі гаворка ідзе пра ўсё насельніцтва краю, то ўжываецца паняцце *літоўцы* як сведчанне пра дзяржаўную прыналежнасць. Гэты гістарычна-культурны матэрыял, атрыманы Лопэ з разнастайных крыніц, быў неабходны аўтару пры распрацоўцы сюжэта драмы, яе мастацка-вобразнай сістэмы, пры напісанні тых яе частак, дзеянне ў якіх разгортваецца на беларускіх і на польскіх землях Рэчы Паспалітай.

У другім акце "Вялікага князя Маскоўскага" Дзімітрый, якому ўдалося пазбегнуць перасьледаванняў наймітаў-забойцаў цара Барыса, пакутліва перажываючы смерць настаўніка Ламбэрта, вырашае пакінуць жорсткі свет і знайсці абарону і душэўнае супакаенне ў манаскім жыцці. Пра непахіснасць гэтага намеру сведчаць словы Дзімітрыя, звернутыя да вернага паплечніка Руфіна ў адказ на яго пытанне-сумненне:

Rufino. *¿Qué dices?*
Demetrio. *Que determino*
tomar un hábito aquí
y, con disfrazado nombre,
vivir, Rufino, como hombre,
que para morir nací[7].

(Руфіна: Што ты гаворыш? / Дзімітрый: Што вырашыў / пастрыгчыся ў манахі тут / і, змяніўшы імя, / жыць, Руфіна, як чалавек, / які нараджаецца, каб памерці. – падрадковы пераклад А. Вальчук).

Адгукнуўшыся на жаданне царэвіча, Руфіна знаходзіць кляштар недзе на памежжы Масковіі і Рэчы Паспалітай, якое Лопэ акрэслівае як "Усходні полюс" і куды трапляюць героі драмы. Аўтар п'есы пакідае па-за межамі твора праблему духоўнага выбару Дзімітрыя, прычыны, што паўплывалі на яго пераход з праваслаўя ў каталіцтва. Думаецца, такі падыход, калі аўтар зыходзіць з таго, што дэ-факта гэтая падзея ўжо адбылася, дазволіў яму арганічна ўпісаць постаць рускага царэвіча ў атмасферу каталіцкага кляштара, дзе ён пад новым імем айца Бернардына пакорліва мяце памяшканні, а на нараканні свайго паплечніка коратка адказвае: "Мяці і маўчы" ("Barra y calle"). Значна большую ўвагу ў дадзеным выпадку драматург аддаў таму, каб паказаць, наколькі важную ролю ў фарміраванні манарха новага рэнесансавага тыпу адыгрывае праца, што істотна паўплывала на далейшы ход развіцця падзей у драме.

Пасля таго як, аб'язджаючы па звычаі продкаў свае ўладанні, цар Барыс наведваецца ў кляштар, дзе сустракае жывога Дзімітрыя, узнікае рэальная пагроза яго жыццю. Каб уратавацца ад інтрыг маскоўскага ўладара, які намаўляе прыёра атруціць царэвіча, Дзімітрый разам з Руфіна бягуць у Рэч Паспалітую, дзе, наняўшыся на працу да беларускага селяніна Беларда (пад гэтым імем у драме вывеў сябе Лопэ), бяруць удзел у жніве. Аўтар уводзіць галоўнага героя ў народны асяродак для таго, каб ён, пераадольваючы цяжкасці, загартоўваў характар, навучыўся ўласнымі рукамі здабываць хлеб надзённы. Прапанаваны іспанскім драматургам падыход да выхавання манаршай асобы вельмі нагадвае дзядзькаванне – стары звычай беларускай шляхты аддаваць дзяцей у сялянскія сем'і, дзе нашчадкі знатных родаў спасцігалі простую мудрасць быцця.

Акрамя таго, Дзімітрыю і Руфіна давялося папрацаваць кухцікамі ў сандамірскага ваяводы графа Палацінскага (Юрыя Мнішка), і толькі сустрэча з прыгажуняй Маргарытай (заходнееўрапейскі эквівалент імені Марына), каханне да якой адразу ўспыхнула ў сэрцы царэвіча, вымусіла яго раскрыць таямніцу свайго паходжання. Неабходна адзначыць, што Лопэ ўдалося даволі дакладна ўзнавіць у вобразе гераіні рысы характару рэальнай Марыны Мнішак, перад якой дзякуючы пачуццям Дзімітрыя адкрывалася перспектыва ўзняцца на маскоўскі трон. Так, з размовы Маргарыты і яе спадарожніцы Лісэны вынікае, што яшчэ зусім нядаўна дачка сандамірскага ваяводы ставілася да царэвіча як да абарванца і шэльмы (roto, truhán), але пасля таго, як ён паабяцаў ажаніцца з ёю ў выпадку ўдалага паходу на Масковію, адносіны змяніліся на цалкам супрацьлеглыя.

Падтрымліваючы жаданне Дзімітрыя вярнуць сабе трон, граф Палацінскі звяртаецца па дапамогу да караля Рэчы Паспалітай Жыгімонта. Аднак кіраўнік дзяржавы спачатку з недаверам паставіўся да сцвярджэння сандамірскага ваяводы пра "цудоўнае выратаванне" царэвіча, але пераканальныя аргументы графа, які спаслаўся на меркаванне сведкаў, што здолелі апазнаць Дзімітрыя, а таксама размова з ім самім выклікалі прыхільнасць у манарха да "пераследаванага імператара". У вобразе Жыгімонта Лопэ ўвасобіў найлепшыя рысы хрысціянскага манарха, які не толькі дапамагае вярнуць уладу сапраўднаму спадчыннiку (на той час у Заходняй Еўропе былі пераканаыя, што Дзімітрыю насамрэч удалося ўратавацца), але і дбае пра пашырэнне заходняй традыцыі хрысціянства на ўсходнеславянскія землі. Так, выпраўляючы царэвіча ў паход, кароль звяртаючыся да Усявышняга, прамаўляе:

Dios, Demetrio valeroso,
te restituya en tu imperio[8].

(Жыгімонт: Гасподзь, мужны Дзімітрый / цябе верне ў тваю імперыю.)

Распрацаваная іспанскім драматургам канцэпцыя развіцця падзей значна адрознівалася ад той, якую пазней прапанаваў у драме "Барыс Гадуноў" Аляксандр Пушкін. Абапіраючыся на звесткі, прыведзеныя Мікалаем Карамзіным, рускі аўтар падкрэслівае, што Дзімітрый – самазванец, які пад уплывам езуітаў, а таксама імкнучыся атрымаць падтрымку караля Рэчы Паспалітай і магнатэрыі, абяцае распаўсюдзіць каталіцкую веру ў Масковіі. У размове з айцом Чэрнікоўскім ён заяўляе:

Нет, мой отец, не будет затрудненья;
Я знаю дух народа моего;
В нем набожность не знает исступленья:
Ему священ пример царя его.
Всегда, к тому ж, терпимость равнодушна.
Ручаюсь я, что прежде двух годов
Весь мой народ, вся северная церковь
Признают власть наместника Петра[9].

Пры такім падыходзе прэтэнзіі Самазванца на маскоўскі трон, паводле А. Пушкіна, грунтуюцца, з аднаго боку, на незадаволенасці народа царом Барысам, а з другога – на змове пэўнай часткі баяр. Пры гэтым вобразу Жыгімонта ў "Барысе Гадунове", у адрозненне ад драмы Лопэ, аддаецца непараўнальна малая ўвага: у размове з Шуйскім баярын Пушкін узгадвае, што Вішнявецкі вазіў Дзімітрыя на прыём да Жыгімонта.

Зусім іншае месца займае постаць манарха Рэчы Паспалітай у творы іспанскага драматурга. Адзнача-



Алена Валер'еўна Вальчук *– даследчык літаратуры. Малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі. Закончыла Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А. Пушкіна (1999), аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы (2002). Займаецца вывучэннем беларускай літаратуры XIX – пачатку XX ст. у кантэксце літаратурных узаемасувязяў.*

ючы вялікі ўнёсак Жыгімонта ў перамогу над Барысам, удзячны Дзімітрый прапануе сваю дапамогу ў змаганні з Карлам, які захапіў уладу ў Швецыі, але высакародны кароль адмаўляе яму ў гэтым, пераконваючы царэвіча, што цяпер яго інтарэсы павінны быць звязаныя з Масковіяй, на чым і заканчваецца п'еса.

Аднак усходнеславянская тэматыка настолькі захапіла Лопэ, што да яе ён зноў вярнуўся ў драме "El Rey sin reino" ("Кароль без каралеўства"), прысвечанай падзеям венгерскай смуты XV ст.

З часам драма "Вялікі князь Маскоўскі і пераследаваны імператар" набыла такую папулярнасць у Іспаніі, што пачалі ўзнікаць творы, напісаныя паводле яе матываў, сярод якіх варта адзначыць п'есу Луіса дэ Бельмонтэ Бермудэса, Аўгусціна Марэта і Антоніо Марцінеса дэ Менэсэса "Пераследаваны гасудар" ("El Príncipe perseguido").

Лопэ дэ Вэга, звярнуўшыся ў драме да падзей ва ўсходнеславянскім рэгіёне на мяжы XVI – XVII стст. і адлюстраваўшы ролю Рэчы Паспалітай у іх разгортванні, здолеў не толькі стварыць яскравыя, запамінальныя вобразы гістарычных асоб, але і выявіць своеасаблівы заходнееўрапейскі падыход да асэнсавання тагачасных рэалій.

---

[1] **Алексеев, М.** Из истории испанско-русских литературных отношений XVI – начала XIX в. / М. Алексеев // Русская культура и романский мир. – Л. : Наука, 1985. – С. 13.

[2] **Тамсама.** С. 14.

[3] Гл.: **Балашов, Н.** Испанская классическая драма / Н. Балашов // Сравнительный подход и систематизация изучения испанской драмы позднего Возрождения – XVII в. – М. : Наука, 1975. – С. 121 – 122.

[4] Гл.: **Чаропка, В.** Уладары Вялікага княства / В. Чаропка. – Мінск : Беларусь, 2002. – С. 241.

[5] Гл.: **Балашов, Н.** Испанская классическая драма. С. 121 – 122.

[6] **Поссевино, А.** Московское посольство / А. Поссевино // Исторические сочинения о России // http://www.krotov.info/acts/16/possevino/190.html.

[7] **Lope de Vega.** El gran duque de Moscovia y emperador perseguido // http://www.cervantesvirtual.com/servlet/SirveObras/12035078617818273876213/index.htm.

[8] **Тамсама.**

[9] **Пушкин, А.** Полное собрание сочинений : В 10 т. / А. Пушкин. – Л. : Наука, 1978. – С. 232. Т. 5.

На скрыжаванні культур

Мікола ТРУС

ПАМЯТНАЕ ГАСЦЯВАННЕ Ў СЛАВАЦКІМ МЯСТЭЧКУ СВЯТЫ ЮР

Святы Юр (у сацыялістычныя антырэлігійныя часы горад называўся *Юр пры Браціславе*) знаходзіцца ля падножжа Малых Карпат. У 30-я гг. XX ст. гэты невялікі населены пункт, слаўны сваім вінаградніцтвам і рамесніцтвам, налічваў больш за 700 гадоў свайго існавання. Першы чыгуначны маршрут у гісторыі краю звязаў у XIX ст. Браціславу менавіта са Святым Юрам.

Ваколіцы мястэчка здаўна былі адметныя сваімі кліматычнымі ўмовамі. Тут застыла ў часе унікальная прыродная рэзервацыя – *Шур (Šúr)*, самая вялікая ў сярэдняй Еўропе, спадчынніца разложыстых балотаў, якія ў мінулым займалі тэрыторыю паміж сучаснымі Браціславай і Модрай. Гэта сапраўдны кландайк для батанікаў і заолагаў, бо тамтэйшы лес з яго багатым раслінным і жывёльным светам захаваў рысы трапічнага пралесу. Сёння гэта нацыянальны прыродны запаведнік.

Агляд мястэчка дэлегацыяй савецкіх журналістаў і пісьменнікаў у 1935 г. ніяк не мог прайсці міма мясцовых дастапомнасцяў: фарнага касцёла Святога Юра XIII ст. (адкуль і назва мястэчка), слаўнага сваімі рос-



Дэлегацыя савецкіх пісьменнікаў і журналістаў у Святым Юры. Янка Купала – у цэнтры групы, за Ганнай Караваевай. 16 кастрычніка 1935 г.

Здымак з фондаў Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы. Публікуецца ўпершыню.

пісамі і каменным рэнесансавым алтаром, кляштара і палфіцкага касцёла (ад імя фундатара Палфі) пачатку XVII ст. На гары над Святым Юрам сівой пасмай застылі рэшткі старадаўняга замка Белы камень XIII ст. У мястэчку захавалася шмат тыповых вінаградніцкіх дамоў са старымі піўніцамі, дзе здаўна падтрымліваліся традыцыі вырабу якаснага славацкага віна.

Расповед пра візіт дэлегацыі савецкіх пісьменнікаў і журналістаў у Славакію з удзелам беларускага паэта Янкі Купалы Мікола Трус распачаў летась у красавіцкім нумары "Роднага слова". Былі надрукаваны артыкулы "Янка Купала ў Славакіі. Пачатак знаёмства" (2007, № 4) і "Браціслава вітае ганаровых гасцей" (2007, № 10).

Мікола Валянцінавіч Трус *– літаратуразнаўца. Кандыдат філалагічных навук (2000), дацэнт (2001). Закончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1993), аспірантуру пры гэтай установе (1996). У 1998 – 2000 гг. – дырэктар Літаратурнага музея Максіма Багдановіча. З 1996 г. працуе ў БДУ (з 2006 г. – на кафедры замежнай літаратуры). Займаецца параўнальным літаратуразнаўствам, даследуе гісторыю літаратур і культур славянскіх народаў, беларускую літаратуру ў агульнаславянскім кантэксце, праблемы ўдасканалення навучальнага працэсу пры выкладанні літаратуразнаўчых дысцыплін у сярэдніх школах і ВНУ. Аўтар некалькіх навучальных дапаможнікаў, дзесяткаў артыкулаў у айчынных і замежных навуковых выданнях.*



Гісторыя Святога Юра звязана з шэрагам адметных імёнаў у культуры Славакіі. Менавіта тут нарадзіўся і пахаваны каля касцёла Ян Гергат (Ján Hergott, 1817 – 1873), паплечнік славацкіх будзіцеляў Людавіта Штура і Ёзафа Міласлава Гурбана. Святаюрскі перыяд жыцця і творчай дзейнасці можна прасачыць у біяграфіях шэрагу пісьменнікаў XX ст. У іх пераліку – Францішак Гечка (František Nečko), Марыя Янчава (Mária Jančová), Ян Грушоўскі (Ján Hrušovský), Люда Зубек (Ľudo Zúbek) і інш.

У 30-я гг. XX ст. таксама пісалася свая літаратурная старонка краю, бо сярод тых людзей, якія прымалі дэлегацыю творчай эліты Савецкага Саюза, быў тады даволі малады пісьменнік-камуніст, а потым шырокавядомы ў пасляваеннай Чэхаславакіі народны мастак Петар Ілямніцкі (Peter Jilemnický, 1901 – 1949). Са Святым Юрам звязана яго выкладчыцкая дзейнасць 1936 – 1939 гг. Пасля вайны ў мястэчку ў яго доме быў створаны мемарыяльны музей, адзін з першых літаратурных музеяў Славакіі. З гэтай культурна-асветнай установай у свой час падтрымліваў шчыльныя сувязі, вёў перапіску музей Янкі Купалы ў Мінску. У пачатку 90-х гг. XX ст. са зменай палітычнай сітуацыі ў краіне святаюрская памятка гэтага пісьменніка і палітычнага дзеяча была зачынена.

Варта адзначыць, што з іменем П. Ілямніцкага звязваецца другі ў гісторыі культурных стасункаў пераклад твораў славацкай літаратуры на беларускую мову. Першым вопытам, як вядома, было беларускамоўнае пераўвасабленне апавядання Светазара Гурбана-Ваянскага "Юдава поле". Твор быў надрукаваны ў "Нашай Ніве" ў 1909 г., падпісаны крыптанімам *М. Б.* Яго творчае перастварэнне прыпісваецца Максіму Багдановічу.

Часопіс "Маладняк" (1931, № 4) змясціў пераклад аповесці Пятра Ілямніцкага "Падвей", падпісаны крыптанімам *Р. М.* Гэта, па сутнасці, адзіны вядомы на сёння факт славацка-беларускага ўзаемаперакладу міжваеннага перыяду.

Цікавыя сведчанні пра гасцяванне савецкай дэлегацыі ў гэтым мястэчку восенню 1935 г. можна і сёння прачытаць у "Памятнай кнізе горада Святы Юр", што зберагаецца ў архіве горада Модры. Гэта сапраўдная хроніка новага часу, якая выдатна захавала даўнія традыцыі жыццяпісу невялікага, але слаўнага гарадка вінаградараў і рамеснікаў. У 30-я гг. XX ст. у ёй, як і раней, занатоўваліся асноўныя падзеі жыцця горада: якімі былі кліматычныя ўмовы для гаспадарання ў тым ці іншым годзе, што з сельскагаспадарчых культур урадзіла, які быў кошт асноўнай агародніцкай прадукцыі, якім быў вінаград, колькі і якіх дамоў было пастаўлена, колькі нарадзілася і памерла людзей, якія ганаровыя госці наведалі горад і інш.

Пра гэтую падзею муніцыпальны хроніст Юрай Павэлэк запісаў наступнае: *"Дня 16 кастр.[ычніка] меў Св.[яты] Юр ганаровы візіт: савецкіх журналістаў і пісьменнікаў, якія завіталі ў нашу рэспубліку. Іх подпісы ў гэтай кнізе на стар.[онцы] 35 увекавечаны. Ад горада іх вітаў уладны камісар Антон Лёвенштайн. На прывітальнае слова адказаў старшыня дэлегацыі пісьменнік Аляксей Талстой. У іх гонар даваў горад банкет у гасцініцы Франц.[іска] Ліярскага (каля евангел.[ісцкага] касцёла). Госці паглядзелі між іншым піўніцу ў палфіцкім касцёле"*.

Як адзначалася ў рэпартажах славацкіх журналістаў, у Святым Юры гасцям вельмі спадабалася. Цыганскі музычны збор зайграў некалькі славацкіх песняў, і яны настолькі кранулі прысутных, што члены дэлегацыі жартам выказвалі жаданне застацца ў гэтым горадзе. *"А што хвалілі святаюрскае віно,* – пісалася ў газетах, – *гэта само па сабе зразумела"*.

Найбольшым поспехам у гасцей карысталася песня "Tancuj, tancuj, vykrúcaj". Расчулены Міхаіл Кальцоў звярнуўся да першай скрыпкі цыганскай суполкі з про-



Святы Юр. Агульны выгляд. 1900-я гг.




Святы Юр, 16.10.1935 г. Янка Купала – другі злева.
За сталом: **першы злева – гаспадар вінаградніка, другі – Міхаіл Кальцоў, трэці – Петар Ілямніцкі.**
З фондаў Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы.

сьбай перапісаць ноты. Пажылы захавальнік народнай культуры адказаў на тое: *"Ой, вяльможны пан, калі ж я ўмею толькі іграць, а не ўмею ноты пісаць"*. Кальцоў паўтарыў просьбу аднаму са славацкіх калег па пяры. Адказ таксама не ўсцешыў просьбіта: *"Гэй, сябра Кальцоў, я не ўмею ані граць, ані ноты пісаць"*. Урэшце дамовіліся, што славакі дашлюць у Савецкі Саюз грамафонную пласцінку з гэтай песняй.

Вельмі маляўніча і эмацыянальна-ўзрушана перадала свае ўражанні ад гэтага гасцявання і народнай музыкі пісьменніца Ганна Караваева: *"Ніколі не забуду сельскі аркестр у мястэчку Святы Юр, не забуду першую скрыпку, шчуплага вялікагаловага чалавека, – ён і дырыжор, які іграў з такой непадробнай і палкай страсцю, што нават безнадзейна глухі мог бы лёгка ўявіць, што гэта была за музыка!.. Я не забуду гэтай асенняй вясковай бяседы з вялікімі гронкамі зялёнага і сіняга вінаграду, вырванымі разам з лазой, – вінаград замяняў тут кветкі"*.

Асабліва запомніўся "місіянерам міру" каларытны з выгляду гаспадар вінаградніка. Сфатаграфавацца з ім савецкія госці палічылі за абавязковую кропку святаюрскага візіту. На адным з гэтых здымкаў у вясёлай, нязмушанай абстаноўцы зняты і Янка Купала.



Аўтографы дэлегацыі савецкіх журналістаў і пісьменнікаў у Памятнай кнізе места Святы Юр.
Публікуецца ўпершыню.

Ганна Караваева ў сваіх дарожных дзённіках зафіксавала эпізод знаёмства з гэтым гасцінным славакам, гаспадаром вінаградніка, – кідкім, запамінальным на выгляд: «*Потым падышоў пажылы мужчына, худы і стройны, як юнак. На ім быў шыракаполы войлачны капялюш і беласнежная кашуля, на якую звісалі доўгія запарожскія вусы. Ён падаў мне карычневую жылістую руку з рэўматычнымі, скурчанымі пальцамі і глухім басам сказаў: "Мір-мір…". Потым, па-старэчы расчуліўшыся, усхліпнуў і паказаў рукой тры разы ўроўніцу з сабой, а затым рука яго правяла ў паветры "лесвічку" – ён безумоўна хацеў сказаць, што ў яго вялікая сям'я: трое дарослых і куча дзяцей. Ён яшчэ расказваў пра нешта, але так хутка і блытана, што нават падобныя да нашых чэшскія словы разабраць было немагчыма. "Мір!" – сказаў ён, нарэшце, перавёўшы дых. "Ано, ано! (Так, так!)" – сказала я па-чэшску. Ён усміхнуўся і, раптам, узрушана ўзняў калматыя сівыя бровы, з сілай паціснуў маю руку*».

Трэба адзначыць, што госці з СССР не мелі на мэце падаваць у сваіх справаздачных матэрыялах, адрасаваных савецкаму чытачу, пастаральныя замалёўкі славацкага вясковага жыцця. У допісах-уражаннях яны паўсюдна расстаўлялі ідэалагічна вывераныя акцэнты. Так, Сяргей Траццякоў у артыкуле "Краіна-перакрыжаванне" зазначыў, што варта было *"патрапіць у славацкія вёскі, як стала відавочнай на фоне вінаграднай раскошы і садавіннай пышнасці вялікая вясковая ўбогасць. Склепы вінаробаў у Святым Юры захоўвалі бочкі дарагога старога віна, а міма падвалаў па вясковай шасіраванай вуліцы беглі ў школу кепска апранутыя дзеці, і тры чвэрці з іх былі босыя"*.

Зрэшты, у чарговы раз, але ўжо мімаволі, павесяліў усіх прысутных у славацкім мястэчку Аляксей Талстой. Пісьменнік меў падрыхтаваны матэрыял пра падарожжа па Чэхаславакіі і прасіў, каб яму дапамаглі тэрмінова адаслаць яго ў Ленінград паветранай поштай. Наконт таго, што ўладкаваць справу такім чынам немагчыма, гаспадары жартавалі: *"Паветра ў нас дастаткова, але няма яшчэ самалётаў, каб прызямляліся ў Святым Юры"*. Таму допіс пісьменніка, да ўзаемнага паразумення, быў адпраўлены звычайнай поштай.

Спіс літаратуры

1. **Кенька, М.** Мастацкі пераклад са славацкай мовы на беларускую / М. Кенька // Slovensko-bieloruské jazykové, literárne a kultúrne vzťahy: Zborník príspevkov z medzinárodného vedeckého seminára, 20.-21. Septembra 2000 // Acta facultatis philosophicae universitatis prešoviensis: Literárnovedný zborník, 15. – Prešov: Filozofická fakulta Prešovskej univerzity. – 2003. – S. 45 – 50.

2. **Караваева, А.** В стране гуситов. Дорожные дневники / А. Караваева // Мол. гвардия. – 1936. – № 9. – С. 30 – 53.

3. **Третьяков, С.** Страна-перекресток / С. Третьяков // Огонёк. – 1936. – № 21. – С. 8 – 10.

4. Pamätná kniha mesta Svätý Jur. Obecná kronika. Diel I. Od 1.januára 1934 do 31.decembra 1946.

5. **Uhrin Pavol.** Literárny sprevodca po Slovensku. – Bratislava: Šport, vydavateľstvo SV ČSTV, 1966.

Вікторыя ТРУЦЬКО

АСАБЛІВАСЦІ АНАЛІЗУ АПАВЯДАННЯ “МЭРЫ КЭТ” МІКОЛЫ ЛУПСЯКОВА

VII клас

Твор Міколы Лупсякова “Мэры Кэт” прапануецца сямікласнікам у тэматычным раздзеле “Дзіўнае і захапляльнае ў звычайным, штодзённым”. Перад намі разгортваюцца падзеі, здавалася б, не вельмі значныя ў грамадскім маштабе. Падлеткавыя ўзаемаадносіны, што развіваюцца дастаткова звычайна, могуць падацца сучаснаму сямікласніку не дужа цікавым аб’ектам для сур’ёзных разваг. Сам герой “Мэры Кэт” Антон Бубноў у сваім унутраным маналогу, які завяршае аповед, выказвае такую думку: *“Нічога як быццам не адбылося асаблівага...”*.

Гэта загадкавае “як быццам”!

Такія словы можна ўзяць эпіграфам да тэматычнага ўрока, а папярэдне прапанаваць вучням у працэсе чытання твора (дома) прадоўжыць думку (у пісьмовай форме, на асобным лісце паперы). Удакладнім: па-першае, прыведзеная фраза павінна застацца на перыяд “да прачытання” “бязадраснай”, гэта значыць, настаўнік не паведамляе, дзе яна знаходзіцца ў тэксце і хто яе “аўтар”; па-другое, вучні мусяць працягнуць гэтую думку не словамі героя. Яны павінны зрабіць сваю выснову, стараючыся адлюстраваць пры гэтым ідэю “Мэры Кэт”, ідэю аўтара апавядання. Праверыць такое папераджальнае дамашняе заданне варта ў канцы тэматычнага ўрока, што дае настаўніку магчымасць убачыць, наколькі вучні адчулі, зразумелі сэнс і маштабнасць падзей апавядання, падзей быццам бы нязначных.

Магчымы разнастайныя варыянты праверкі гэтага задання. Напрыклад, можна дазволіць вучням на працягу 1-2 хвілін адкарэктаваць складзены дома тэкст. Або іншы варыянт: прапанаваць адзін з менш удалых адказаў для абмеркавання (не называючы яго аўтара). У другім выпадку, акрамя фарміравання навыкаў канструявання вуснага тэксту, вучні патрэніруюцца ва ўменні ствараць дыскусійнае маўленне, што паспрыяе развіццю камунікацыйных навыкаў.

Таксама магчымы варыянтныя формы самога задання. Пэўны тэкст дамашняга адказу лепей абмежаваць некалькімі сказамі (трыма-чатырма). А пры праверцы можна папрасіць прадоўжыць фразу некалькімі словамі. Неабходнасць мінімізаваць думку-тэкст навучыць не толькі пашыраць, але і звужаць тэкставую прастору, выказваць думку лаканічна, падбіраць сінанімічныя моўныя сродкі.

Вернемся да тэксту. Такім чынам, перад намі разгортваюцца падзеі, на першы погляд, не зусім значныя, што не мяняюць, здавалася б, нічые лёсы. Нам не даводзіцца сачыць за інтрыгай у самым экспрэсіўным значэнні гэтага слова, суперажываць героям, якія трапілі ў трагічныя пераломы часу. Падзеі, пра якія мы даведваемся, маглі б адбывацца дзе заўгодна, у любым іншым камерным вымярэнні. Камерным не толькі таму, што месца дзеяння абмяжоўваецца адной вёскай, дзе ўсе адзін аднаго ведаюць. Вучні павінны ўсвядоміць, што рэальнае дзеянне адбываецца ў яшчэ больш вузкай прасторы – у чалавечай душы. Дзеянне, або рух сюжэта, – гэта працэс руху душы звычайнага вясковага падлетка ад радасці адзіноты да радасці яднання. Можна было б сказаць – кахання, але гэтае слова ў тэксце нам не сустракаецца. І ў працэсе аповеду мы зразумеем, чаму. Бо яднанне, усведамленне супольнасці ў разуменні Міколы Лупсякова – больш, чым каханне.

Аднак нельга сцвярджаць, што героі, паглыбленыя ў свае перажыванні, абсалютна адарваныя ад рэальнасці, ад рэальнага часу. Так, у вёскі, дзе яны жывуць, няма назвы. Антон – звычайны падлетак. У яго ёсць дом, бацька і маці, якія працуюць, займаюцца гаспадаркай. У іх няма імёнаў, і здаецца, што яны не з’яўляюцца рэальнымі героямі твора, а толькі апасродкавана інфармуюць пра Антона або пра Эму (напрыклад, калі бацька гаворыць маці: *“Аграном гэты новы – талковы чалавек. Зямлю ён любіць і ведае”*). Аднак ёсць адна прыкмета, рэальная прыкмета, якая гаворыць нам пра тое, што дзеянне ўсё ж далучана да пэўнага часу. Антон пытаецца ў Янкі: *“А калі бацька яе, аграном гэты самы, раззлуецца ды нашым бацькам працадні не запіша – тады што?”*. Нашы сямікласнікі наўрад ці ведаюць, што гэта такое. Неабходна растлумачыць ім незразумелыя факты твора, каб звязаць аповед і рэальны час. Гэта важна і таму, што час – нашы карані, наша гісторыя.

Эвалюцыя ўнутранага “я” Антона Бубнова

Пры выяўленні “руху душы” героя апавядання мы заўважаем разгорнутую гаму пачуццяў, якія не заўсёды адназначныя. Вось Антон раззлаваўся: Эма вельмі добра адказала на пытанне настаўніцы. Тут ён – назіральнік. І з першай да чацвёртай часткі Антон “назірае” і стараецца аналізаваць свае пачуцці. Потым – мы павінны гэта прасачыць – (з чацвёртай да сёмай часткі) душэўныя перажыванні, што ўзнікаюць пад уплывам знешніх стымулаў (паводзіны Эмы), фарміруюць гатоўнасць хлопчыка да ўчынкаў і суправаджаюць іх. Яго эмоцыі можна падзяліць на чатыры групы: 1) станоўчыя эмоцыі як рэакцыя на адмоўныя дзеянні ці з’явы; 2) станоўчыя эмоцыі як рэакцыя на станоўчыя дзеянні; 3) адмоўныя эмоцыі як рэакцыя на станоўчыя з’явы; 4) адмоўныя эмоцыі як рэакцыя на адмоўныя дзеянні.

Можна прапанаваць вучням скласці спіс эмоцый, якімі ахоплены герой на працягу аповеду, і прааналізаваць іх.

Да ***першай*** групы, напрыклад, належаць радасць з-за ўдала прыдуманай пагрозы (1 ч.), задавальненне ад адзіноты (2 ч.), радасць ад таго, што на твары дзяўчынкі разгубленасць і крыўда (3 ч.), лёгкасць і ве-



Вікторыя Вячаславаўна Труцько *– даследчык мовы. Кандыдат філалагічных навук (2002). Закончыла Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка (1996), аспірантуру пры гэтай навучальнай установе (1999). Цяпер – дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі мовы БДПУ імя М. Танка. Даследуе праблемы мовы мастацкіх твораў, а таксама пытанні міжмоўнага ўзаемадзеяння і камунікацыі. У якасці групавога метадыста кіруе педагагічнай (моўнай) практыкай студэнтаў.*

сялосць ад “перамогі” раўнадушшам (3 ч.), радасць ад надзеі ўбачыць зноў разгубленасць на яе твары (6 ч.).

Да ***трэцяй*** групы адносяцца злосць на аднакласніка, які ў парыве сяброўскіх пачуццяў забыў пра хваробу Антона (1 ч.), злосць з-за ўдалага адказу Эмы Пшанічнай настаўніцы (1 ч.), крыўда з-за дастойнага адказу Эмы на пагрозу (1 ч.), жаданне ненавідзець яе за гэта (1 ч.), злосць з-за ўсведамлення сімпатыі да дзяўчынкі (1 ч.), жаль да сябе (2 ч.), варожасць у адносінах да Эмы як рэакцыя на яе прывабнасць (2 ч.), пагарда да дзяўчынкі (3 ч.).

З ***чацвёртай*** групы мы назавём толькі страх перад выкрыццём (Антон баяўся, што яго “выкрыюць” як аўтара запіскі; 1 ч.), незадавальненне сабой / дакоры сумлення (2 ч.).

Затое ***другая*** група – гэта і надзея (поспехі на лёдзе; 5, 6 ч.), і прымірэнне, спакой (яднанне з прыродай; 5 ч.), і гордасць ад поспеху (7 ч.), і радасць, сапраўдная радасць (7 ч.).

Кожнае пачуццё названа сваім іменем, і таму мы лёгка можам прасачыць эвалюцыю перажыванняў героя.

Можна назваць яшчэ адну – пераходную – групу. З дапамогай няпэўных займеннікаў і характэрных прыметнікаў аўтар паказвае пераходныя пачуцці і эмоцыі, якія авалодваюць героем, калі ён уступае ў сферу новых пачуццяў і адносінаў. Напрыклад: *“...**нейкая** сіла цягнула мяне...”*. Або: *“...я ўсё больш адчуваў **незразумелую** для сябе трывогу. **Нешта** новае, хвалюючае падступалася да мяне”*.

Нават на першы погляд прасочваецца відавочная заканамернасць. Першая і трэцяя групы супярэчлівых, “статычных” і ў большасці выпадкаў штучных эмоцый апярэджваюць сапраўдную душэўную “перабудову”, і ў канцы аповеду – мы бачым – у душы хлопчыка пануюць ужо яркія цэльныя пачуцці, што сведчаць пра пазітыўнае сталенне.

Як бачым, з 1-й да 4-й часткі Антон – “назіральнік”. Яго эмоцыі статычныя, “перавернутыя” (радасць ад кепскага ўчынку, злосць ад таго, што нехта лепшы), яны цягнуць яго ўніз, у свет адзіноты, жалю да сябе.

З пачатку 5-й часткі да 6-й ідзе нарастанне эмоцый, штуршком для якіх стала карціна канца 4-й часткі апавядання, карціна аднаго марознага вечара позняй восені: Эма Пшанічная катаецца на каньках. А перад гэтым на эмацыйным фоне (у душы галоўнага героя) “зацішша”, падкрэсленае фразай: *“Я **спакойна** сяджу за сталом...”* Антону нікуды не хочацца ісці. А з другой часткі мы ведаем, як прывык Антон да сваёй адзіноты, яна яму прыемная (*Мне **прыемна** вось так сядзець...*).

І вось ён убачыў “прыгожую, зграбную, дужую” Эму, якая ўпэўнена насілася па лёдзе. І з гэтага часу адбываецца пералом у душэўнай “нерухомасці” хлопчыка: *“...і тут я ўтарапеў...”*. Яго эмоцыі робяцца крыніцай руху, і рух гэты правільны. Змены, якія адбываюцца з Антонам, прымушаюць яго адчуць радасць жыцця. Хоць пачынаецца ўсё не вельмі весела. Рэакцыя на поспех Эмы – расчараванне, зайздрасць, але ўжо не злосць, не такая адназначная злосць, як у 1-й частцы.

Расчараванне: *...дарэмна я радаваўся сваёй перамозе над ёй.*

Зайздрасць: *...на зайздрасць мне і ўсім. Зайздрасць не давала мне спакою.*

На гэтым моманце можна спыніць увагу вучняў. Кожны з іх і, напэўна, неаднойчы задаваў сабе пытанне: чаму ён (яна) гэта ўмее, можа, а я не магу? Аднак наўрад ці кожны быў настолькі шчыры з сабой і сумленна называў зайздрасцю тое пачуццё, якое авалодвала ім. У гэтым выпадку мы чуем маўленне або “чытаем” думкі не хлопчыка-падлетка, які ўсяго толькі “назірае” свае сумненні, а дарослага чалавека. Ён аналізуе пачуцці ўжо з пазіцыі жыццёвага вопыту, бо ведае, як яны называюцца. Мяркуем, што настаўніку было б вельмі прадуктыўна выяўляць у працэсе працы з тэкстам паралель “герой апавядання і вы, яго равеснікі”, каб сямікласнікі набывалі не толькі веды і ўменні ў адносінах да працы з літаратурным творам, але і навыкі самааналізу, каб у іх ужо фарміравалася пачуццё адказнасці за свой унутраны, здавалася б, нябачны свет.

Трывога: *...я ўсё больш адчуваў незразумелую для сябе трывогу. Нешта новае, хвалюючае падступалася да мяне.*

Злосць і радасць, радасць: *Я злаваўся на яе і чамусьці радаваўся гэтай сваёй злосці. Радасць запаўняла мяне ўсё больш і больш.*

Сум: *Мне робіцца сумна: дарэмна я ўсё... Першы дзень я быў нос павесіў. ...думаў, што я самы нешчаслівы на свеце чалавек.*

Весялосць (надзея): *Я весялею... ...тым весялейшы я рабіўся.*

Прымірэнне, спакой: *Мне добра. ...Мне добра вось так, аднаму... Мне добра, прыемна, здаецца мне, што я чую лепей. Мне пачынае падабацца мая адзінота...*

Але вучні павінны зразумець: гэта ўжо не адзінота ў доме, за сталом, не статычнае яднанне – мары, думкі, гэта адзінота ў яднанні з прыродай, яднанні дзейсным, пераходны стан, наступны крок за якім – яднанне з чалавекам.

І вось ён, новы віток – да чалавека! Пералом! У свядомасці ўзнікаюць вобразы людзей: школа, настаўнікі, Эма: *“І такое тады ўсё добрае ўспамінаецца”*.

Гордасць: *А вось і навучыўся, – не без гонару кажу я...*

І зноў радасць: *Нейкая новая радасць запаўняла мяне. Дзень пачаў здавацца прыгажэйшым. Нібы мяне закружыла ў радаснай прыгажосці жыцця.*

Назва апавядання і пытанне пра галоўнага героя

Адным з важных момантаў аналізу твора з’яўляецца адказ на пытанне, якое неабходна паставіць перад вучнямі: хто галоўны герой твора М. Луп-

сякова? Прачытаўшы апавяданне, яны напэўна адкажуць, што ў цэнтры аповеду падлетак, школьнік – Антон Бубноў. Але тады ўзнікае другое пытанне: чаму ж твор называецца "Мэры Кэт", па імені дзяўчынкі, чыё месца ў сюжэце абмяжоўваецца трыма кароткімі сустрэчамі з галоўным героем? Пры адной, першай, сустрэчы яны абмяняліся запіскамі, пры другой – зварот разгубленай і пакрыўджанай Эмы да Антона застаўся без адказу, і толькі трэцяя сустрэча закончылася дыялогам (з дзевяці рэплік). Сямікласнікі павінны зразумець, што Антонаў душэўны свет заставаўся статычным, пакуль у ім не з'явілася дзяўчынка, Эма Пшанічная. Хвалі эмоцый, абуджаныя яе прысутнасцю ў душы Антона, прымусілі яго здзяйсняць учынкі, на якія ён спачатку не быў здольны, правільней сказаць, да якіх ён спачатку не быў гатовы. У канцы аповеду мы бачым яго ўжо іншым пад уплывам Эмы, хоць і загаварыў ён з ёй толькі ў апошняй частцы апавядання.

Што такое "душэўная лянота"?

Мы гаворым пра тое, што Антон вельмі змяніўся пасля сустрэчы з Эмай, аднак для ўсведамлення ступені і характару зменаў, што адбыліся з нашым героем, неабходна ўспомніць яго ў пачатку твора. Што прапануе нам аўтар? Аповед вядзецца ад асобы галоўнага героя, і таму мы не бачым яго партрэта, нават ніводнай рысы знешняга аблічча. (Сямікласнікам, несумненна, будзе цікава паспрабаваць апісаць знешнасць галоўнага героя ў пачатку і ў канцы аповеду.)

Пра некаторыя свае звычкі і схільнасці Антон расказвае нам сам. Напрыклад, пра тое, што прывык да адзіноты, што любіць прыроду, любуецца яе прыгажосцю і марыць. Вельмі многае высвятляюць дыялог з сябрам Янкам і першыя моманты апавядання. Аказваецца, Антону ўласціва адна хвароба (мы гаворым зусім не пра тое, што ён дрэнна чуе): ён пакутуе ад душэўнай лянoты, ён гатовы бачыць свет чужымі вачыма, напрыклад, вачыма Янкі, і напачатку не стараецца пераасэнсаваць гатовыя стэрэатыпы. У дыялогу сяброў нас цікавіць не толькі інфармацыя пра доўгую касу Эмы.

Дыялогі, пабудаваныя аўтарам, могуць быць узорам перадачы двух відаў інфармацыі – яўнай і прыхаванай. Той, якая заключана ў лексічным значэнні слоў, і той, якая дазваляе нам убачыць герояў лепш, чым яны маглі б самі расказаць пра сябе. У дыялогах М. Лупсякова нават і яўная інфармацыя пададзена аўтарам так, каб чытач мог зрабіць самастойную выснову. Напрыклад, для стварэння вобраза Эмы нам важна ведаць, што кнігі з'яўляюцца галоўным набыткам і каштоўнасцю яе сям'і, што яе бацька "талковы чалавек", што "зямлю ён любіць і ведае". Усё гэта апасродкавана фарміруе вобраз дзяўчынкі.

Для пісьменніка прыярытэтныя і важныя менавіта такія партрэты. Як можна заўважыць, апісанню знешнасці аддаецца вельмі мала ўвагі. Доўгая каса Эмы, яе круглы твар, чырвоныя шчокі падкрэсліваюць яркасць, неардынарнасць гэтага вобраза ў вачах Антона.

Дыялог Антона з Янкам дазваляе чытачу не толькі даведацца пра новенькую, але яшчэ больш зразумець характар галоўнага героя. Першая рэпліка Янкі: *"Ведаеш, а ў нас у класе навічок. Дзяўчынка, аграномава дачка. Задавака – ого, брат!"* Слова сказана. Ёсць характарыстыка. Яшчэ не ўбачыўшы Эму, Антон прымае як дакладны факт інфармацыю пра яе ці, правільней, зробленую кімсьці – не ім самім! – выснову.

І крыху пазней Антон глядзіць на Эму і думае: *"Як жа ёй, задавацы гэтакай, паказаць..."* Антон выкарыстоўвае тую выснову, якую ўжо зрабіў за яго сябар, але лянуецца мысліць самастойна.

"А калі пойдзе [скардзіцца], *– упэўнена сказаў Янка, – прыгрозім! Так і скажам: пойдзеш да дырэктара, дык тады лепей і ў клас не заходзь"*. А вось урывак запіскі, якую Антон напісаў Эме: *"... калі ты будзеш выскачкай і калі пачнеш скардзіцца на нас настаўнікам, дык мы ўтворым над табою суд разбойнікаў..."*. Калі апусціць фантастычны элемент пра суд разбойнікаў, то запіска поўнасцю паўтарае пагрозу, якую мы чуем з вуснаў Янкі. Зноў жа адчуваецца несамастойнасць у думках галоўнага героя.

У тэксце сямікласнікі могуць знайсці іншыя доказы гэтага. Першае рашэнне (*"У яе сваё жыццё, у мяне – сваё!"*) Антон прымае пад уплывам стэрэатыпа: калі чалавек у нечым лепшы, не такі, як усе, значыць, ён "задаецца", хоча вылучыцца. І толькі другое яго рашэнне (навучыцца катацца на каньках) можна лічыць першым самастойным крокам. Ён здолеў перамагчы жаль да сябе, перамагчы навязаную сабе самім злосць, здолеў убачыць магчымасць стаць лепшым.

Сямікласнікі ў канцы ўрока абавязкова павінны адказаць, пра што гаворыць Антон у заключным маналогу. Як растлумачыць сэнс вылучаных і намі, і ім самім слоў: *"Калі і як такое са мною здарылася – я і сам сказаць не магу. Але ж здарылася! За доўгія месяцы ўпартай* ***вучобы і працы****!"*?

Радасць папраўкі,
або Матывы хваробы і адзіноты ў апавяданні

Аналізуючы тэкст, мы павінны звярнуць увагу на адну асаблівасць структуры апавядання. Скразной лініяй праходзяць праз гісторыю хлопчыка, перасякаюцца, пераплятаюцца, звязваючы разам усе элементы аповеду, матывы хваробы (у літаральным і пазней у пераносным сэнсе) і адзіноты. І гэта робіць апавяданне больш глыбокім. Незаўважна і паступова ўводзіць нас аўтар у свет героя. *"Ты мне не шапчы, – раззлаваўся я, – я* ***дрэнна чую****"*, – крыўдзіцца Антон на сябра. Нібыта звычайная сітуацыя, нічога дзіўнага: шэпт хто заўгодна можа не пачуць. У той самай 1-й частцы аўтар аднаўляе матыў "дрэнна чую": *"Добра было б і мне перабрацца, але ж адтуль усяго не пачуеш"*, – зайздросціць Антон Янку, які сядзіць на апошняй парце. Такі старанны вучань, ні слова не хоча прапусціць? Дзіўна для звычайнага падлетка. У другой частцы Антон тлумачыць гэтае дзівацтва: *"...калі я быў яшчэ зусім малы, я прастудзіўся і захварэў на вушы. ...з таго часу* ***я пачаў крыху недачуваць****. ...як я тады мучыўся! Я ўнурыўся ў самога сябе... прывык* ***сядзець адзін****. У школе спачуваюць мне. І вучні, і настаўнікі добра разумеюць, што мне цяжка. ...І раптам мне стала шкада сябе"*. Гэта самая яркая характарыстыка Антона да сустрэчы з Эмай. Як вынік хваробы – паблажлівыя адносіны да самога сябе. Спачуванне з боку іншых Антон прымае як належнае. Таму ён прывык адчуваць сябе "асаблівым". Магчыма, у гэтым заключаецца яшчэ адна прычына злосці на Эму: яго "асаблівасць" згасла побач з яе паспяховасцю, жыццялюбствам, адкрытасцю.

У гэтым унутраным маналогу Антона пераплятаюцца матывы хваробы і адзіноты. Адзіноты статыч-

най, бяздзейнай: *"...прывык **сядзець** адзін"*. У 5-й частцы, пасля таго як Антон выйшаў на лёд, аўтар зноў уключае ў тэкст матыў адзіноты: *"Я **адзін**. ...Цемень, вецер, лёд ды я. **Адзін адным**. ...Мне добра вось так, аднаму, успамінаць пра яе"*. Аднак (мы вышэй ужо казалі пра гэта) ці тая гэта адзінота, што раней? "Цемень, вецер, лёд ды я". Гэта ўжо чацвёра персанажаў! Дзе ж тое паглыбленне ў сябе, пра якое расказваў нам Антон? Гэтага няма. Няма адзіноты, ёсць яднанне з прыродай, і гэта ўжо не толькі мары і думкі, гэта яднанне дзейснае, пераходны стан, наступны крок за якім – яднанне з чалавекам. І побач узнікае роднасны матыў: *"Мне добра, прыемна, і здаецца мне, што я **чую** лепей"*. Напрыклад, як "лёд спявае пад... нагамі".

І вось апошняя частка – сустрэча Антона і Эмы: *"Антон, а ты **чуеш**, як гудзе лёд пад нашымі нагамі?"* – "***Чую**, Эма, толькі вельмі невыразна". – "А як цяпер на шляху аўтамашына гудзе – **чуеш**?" – "Не, гэтага не **чую**, Эма"*. І нарэшце – заключны ўнутраны маналог Антона: *"...Я **чую**... Я **чую**, як шуміць вецер, як размаўляюць вясною ручаі, як крычаць кнігаўкі... Я **чую** шэпт першых лісцяў, гарачы, добразычлівы шэпт аб тым, што вось як прыгожа вакол... Нічога як быццам не адбылося асаблівага, і раптам усё ўварвалася ў вушы"*.

Такім чынам, ад *"дрэнна чую"* праз *"чую лепей"* адбываецца рух да ўпэўненага *"я чую"*. У гэтым выпадку паказана не казачная папраўка. Аўтар адлюстроўвае працэс сталення: падлетак з цяжкасцю, але пазбаўляецца ад сваіх пераканняў, ад такіх страшных хваробаў, як жаль да сябе, любоў да адзіноты, ад "перавернутых" штучных пачуццяў і эмоцый, як прыходзіць ён да ўмення прымаць рашэнні, да пазнання шчасця адзінства, яднання з прыродай і чалавекам. Лёгкая глухата з'яўляецца сімвалам-прывідам магчымага ўваходжання ў жыццё без руху наперад, у жыццё з дэвізам "я як усе!". Гэты сімвал поўнасцю суадносіцца з ідыяматычным выразам "быў глухі да..." – да чужых пакутаў, да нечай просьбы і г. д. Антон пазбегнуў такога небяспечнага павароту.

Аптымістычны канец апавядання пацвярджае паварот у іншы бок.

Лірызм аповеду

З першых радкоў апавядання мы трапляем у свет школьных будняў Антона Бубнова, яго складаных узаемаадносінаў з новенькай і з самім сабой, сваім унутраным "я". І раптам бачым, што ён, гэты хлопчык, не такі звычайны, як здаецца на першы погляд. Перад намі паўстае казачны свет падлетка, улюбёнага ў прыроду. І расказвае пісьменнік пра гэты казачны свет таксама чароўна. Сямікласнікам у кантэксце такога кірунку працы цікава будзе даведацца, што М. Лупсякоў вельмі любіў прыроду, рэдка пісаў свае творы за сталом, найчасцей працаваў на свежым паветры, у парку ці скверы, або лежачы на стозе сена ў вёсцы Папаратнае на Жлобіншчыне, дзе быў яго родны дом і дзе ён летам гасцяваў у сваіх старэнькіх бацькоў.

Аўтар расказвае нам пра адметны персанаж твора – прыроду. Аднак пачынае расказваць не ён, а яго герой. Аўтар настойвае на гэтым пры дапамозе асаблівых слоў ці выразаў. Так, у пачатку аповеду мы бачым вачамі Антона: *"І вось заходжу ў клас. ...Усе чакаюць настаўніка. За вокнамі светлая, ясная раніца. Далёка на небасхіле палымнее ўсход, школьны сад падступаецца да самых нашых вокан"*. Ужыванне займенніка *нашых* сведчыць пра бачанне хлопчыка. Менавіта яму аўтар прыпісвае яркае ўвасабленне – "да самых ***нашых*** вокан". Ці ўласцівы такі лірызм падлетку? Аўтар сцвярджае, што гэта так, і адпаведна паказвае свайго героя.

Прырода суправаджае падлетка ў яго складаных душэўных перажываннях, не проста суправаджае – суперажывае і дапамагае раскрыць яго яшчэ кволы ўнутраны свет, напоўнены сумненнямі і супярэчнасцямі. *"Пачынае вечарэць. Вецер, дождж, за вокнамі хістаецца рэдкае голле дрэў... Я сяджу, незадаволены самім сабой і ўсімі. Сумленне точыць мяне"*.

У чацвёртай частцы мы ўчытваемся ў цудоўнае лірычнае апісанне прыроды і разумеем, што гэта выдатная па мастацкіх якасцях антытэза, супрацьпастаўленне рэальнага статычнага жыцця хлопчыка і парывістых душэўных рухаў, якія супадаюць з рухамі чароўнага навакольнага свету: *"А зіма! А першы снег! А іней на дрэвах і лёд на рацэ! І конь, запрэжаны ў сані, што **імчыцца** некуды далёка па дарозе!*

*Я **сяджу дома** пасля школы і чытаю кнігу. На дварэ першы сняжок і першы дужы марозік. **Ісці нікуды не хочацца**"*.

Нават калі не разглядаць ролю прыроды як элемента структуры апавядання, усё роўна застаецца глыбокі лірызм аповеду, які ствараецца апісаннямі прыроды і ўнутранымі маналогамі галоўнага героя. Чаго, напрыклад, вартыя метафарызаваныя пералічэнні яркіх прыкметаў пэўнай пары года – прыкметаў дзейных, не статычных! Напрыклад, *"**апранаюцца** ў зеляніну хмызнякі..."* У гэтым падрабязным апісанні разнастайных прыродных з'яў усяго дзесяць прыметнікаў. Затое 26 дзеясловаў, большасць якіх (24) з'яўляюцца дзеясловамі дзеяння, і толькі 2 – дзеясловамі стану. Кожная часцінка прыроды паказана ў дзеянні: *ломіцца* лёд, *растае* снег, *бягуць* ручайкі, *спяваюць* жаўрукі, трава *паднялася* ў пояс і г. д. Захапленне падлетка і аўтара паказана з дапамогай яркіх градацый на ўзроўні слоў, словазлучэнняў, сказаў.

Эфект лірычнасці ствараюць таксама дзеясловы цяперашняга часу незакончанага трывання, якія ўяўляюць так званы цяперашні пастаянны ва ўспамінах хлопчыка: 1. *"Некуды **кліча**, **вабіць** цябе жыццё, і ўздымаюцца грудзі ад глыбокага дыхання"*; або 2. *"Я **хаджу** па ляску. Мне трэба зрэзаць вудзільна. З нажом складанчыкам у руцэ я **падыходжу** да бярозкі, доўга **аглядаю** яе. **Іду** сабе далей. Да наступнай бярозкі"*. На прыкладзе трэцяга і чацвёртага сказаў другой часткі мы бачым, як аўтар рэалізуе прыём умаўчання, уласцівы зноў-такі ў большай ступені лірычнай форме. Што паміж "*аглядаю яе*" і "*іду сабе далей*"? Можа, немагчымасць прычыніць зло казачнаму свету прыроды?

Такая высокая ступень выразнасці, насычанасці рытарычнымі прыёмамі, экспрэсіўнасць уласцівыя звычайна вершаваным тэкстам. Лірычнае адступленне ў 4-й частцы апавядання стварае ўражанне самастойнага твора з такой ідэяй: *"Кожная пара года па-свойму прывабная, прыгожая"*. Аднак гэта толькі знешняя ідэя. Галоўная думка аўтара, як нам здаецца, у тым, каб паказаць: прырода і чалавек непадзельныя. Апісанне казачнага свету вясны, лета, зімы ўсякі раз працягваецца апісаннем прыходу чалавека ў гэты свет: вясна – і "*можна рабіць дудкі*", лета – *"...хаджу па ляску. Мне трэба зрэзаць вудзільна"*, зіма – і *"конь, запрэжаны ў сані...*

імчыцца некуды далёка па дарозе". Аднак Антону яшчэ давядзецца дасягнуць сапраўднага адзінства з прыродай, і гэтае апісанне нібы вызначае перспектыву апавядання, рыхтуе нас і героя да наступных падзей.

Урывак цікавы і важны яшчэ і тым, што галасы аўтара і падлетка зліваюцца і таму нераспазнавальныя. Хто так захоплена ўлюбёны ў прыроду – пісьменнік ці яго герой? Няма падрабязных указанняў на гэта. Але ж аўтар вельмі дакладны ў выбары моўных сродкаў, што абавязкова неабходна падкрэсліць і даказаць у працэсе аналізу тэксту. Ён уважліва падбірае словы, імкнучыся быць сумленным. Гэтае імкненне вядзе да размежавання або змешвання дзвюх ліній – лініі аўтара і лініі героя.

Вось, напрыклад, у канцы апавядання Антон імкнецца апісаць свой душэўны стан: *"Я чую, як... размаўляюць **вясною** ручаі"*. Дзеянне апавядання заканчваецца зімовым днём. Магчыма, што апошнія радкі напісаны героем з надыходам вясны, аднак тады сам кампанент *вясною* здаецца лішнім. Для чаго тады называнне, калі ўсе апісаныя падзеі не выклікаюць сумнення ў адпаведным часе? Відаць, аўтар хоча паказаць: гэты стан душэўнай радасці падлетка, радасці яднання з самім сабой, з прыродай, з роднаснай душой застаўся з ім назаўсёды. І тады мы разумеем: гэтыя словы належаць не таму Антону, які хадзіў глядзець, як старэйшыя школьнікі вучацца танцаваць, а пасталеламу герою праз многа гадоў пасля апісаных падзей. А можа, аўтару? І такіх выпадкаў змешвання ліній аўтара / героя ў апавяданні сустракаецца нямала.

У творы ёсць шмат момантаў, дзе мы чуем маўленне або "чытаем" думкі не хлопчыка-падлетка, які ўсяго толькі перажывае, часам нібыта "назірае" свае сумненні, а дарослага чалавека, які аналізуе тыя, ранейшыя, пачуцці ўжо з пазіцыі жыццёвага вопыту. Гэты дарослы называе свае эмоцыі, бо ўжо ведае, як яны называюцца.

Вучням неабходна знайсці такія прыклады змешвання. Важна, каб яны ўмелі адрозніваць лінію аўтара ад лініі героя і выяўляць адзіную агульную лінію.

Спіс літаратуры

Ветошкин, А. Подтекст как выразительное средство языка : Автореф. дис. … канд. филол. наук : 10. 02. 04 / А. Ветошкин; Мордов. гос. пед. ин-т им. М. Е. Евгеньева. – М., 2001.

Горленко, Ф. Экспрессивно-семантические связи слов в художественном тексте : Дис. … канд. филол. наук : 10. 02. 01 / Ф. Горленко. – М., 1986.

Суран, Т. Языковая личность автора и персонажа художественной прозы : Автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.02.01 / Т. Суран; Одес. гос. ун-т им. И. Н. Мечникова. – Одесса, 1994.

Тимофеев, Л. О системности в изучении литературного творчества / Л. Тимофеев // Художественное творчество : Вопросы комплексного изучения / АН СССР. Отв. ред. Б. Мейлах. – Л. : Наука, 1982.

Турцев, Д. Смыслоформирующий аспект образно-ассоциативных компонентов художественного текста : Автореф. дис. … канд. филол. наук: 10. 02. 04 / Д. Турцев; МГЛУ. – М., 2001.

Артыкул рэкамендаваны да друку кафедрай тэорыі і гісторыі мовы БДПУ імя Максіма Танка.

КАЛЯНДАР ПАМЯТНЫХ ДАТАЎ І ЮБІЛЕЙНЫХ ДЗЁН на 2008 год

САКАВІК

Заканчэнне. Пачатак на с. 28.

11 сакавіка – 105 гадоў з дня нараджэння Тодара Кляшторнага (1903 – 1937), паэта, перакладчыка

12 сакавіка – 90 гадоў з дня нараджэння Эдуарда Валасевіча (1918 – 1997), паэта-байкапісца, драматурга

13 сакавіка – 85 гадоў з дня нараджэння Георгія Валкавыцкага, журналіста, публіцыста, паэта, мемуарыста. Жыве ў Польшчы

14 сакавіка – 70 гадоў з дня нараджэння Мікалая Цішачкіна (1938 – 1993), акцёра, заслужанага артыста Беларусі

15 сакавіка – 140 гадоў з дня нараджэння Яўгена Лявіцкага (1868 – 1942), крытыка, гісторыка літаратуры, даследчыка рускага і беларускага фальклору

100 гадоў з дня нараджэння Юліі Фляйто (1908 – ?), актрысы

70 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Дзямарына, графіка

70 гадоў з дня нараджэння Галіны Малажай (1938 – 2006), мовазнаўцы, літаратуразнаўцы, педагога

16 сакавіка – 110 гадоў з дня нараджэння Марка Шнейдэрмана (1898 – 1981), дырыжора, кампазітара, педагога, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі

17 сакавіка – 110 гадоў з дня нараджэння Ізі Харыка (1898 – 1937), беларуска-, руска- і ідышамоўнага паэта

80 гадоў з дня нараджэння Ігара Кісялёва (1928 – 1994), мовазнаўцы

75 гадоў з дня нараджэння Леаніда Смялкоўскага (1933 – 1995), дамрыста, дырыжора, кампазітара, заслужанага артыста Беларусі

18 сакавіка – 90 гадоў з дня нараджэння Паўлюка Пранузы (1918 – 2007), паэта, перакладчыка

75 гадоў з дня нараджэння Алены Яновіч, мовазнаўцы

21 сакавіка – 60 гадоў з дня нараджэння Леаніда Якубовіча (1948 – 1970), паэта

23 сакавіка – 70 гадоў з дня нараджэння Фамы Варанецкага, акцёра, педагога, заслужанага артыста Беларусі

60 гадоў з дня нараджэння Генадзя Пашкова, паэта, публіцыста, перакладчыка

24 сакавіка – 100 гадоў з дня нараджэння Аляксея Глебава (1908 – 1968), скульптара, народнага мастака Беларусі

75 гадоў з дня нараджэння Канстанціна Лосева, беларускага і расійскага спевака, заслужанага артыста Беларусі

25 сакавіка – 95 гадоў з дня нараджэння Любові Цімашковай (1913 – 1978), літаратуразнаўцы, крытыка

80 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Мехава (сапр. Няхамкін), празаіка

26 сакавіка – 70 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Маскоўскіх (1938 – 2002), жывапісца

27 сакавіка – 85 гадоў з дня нараджэння Алеся Рылько (1923 – 1967), празаіка, драматурга, публіцыста

28 сакавіка – 125 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Керзіна (1883 – 1979), скульптара, педагога, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі

70 гадоў з дня нараджэння Святланы Каробкінай, паэткі

70 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Раговіча, харавога дырыжора, фальклярыста, педагога

Паводле картатэкі БДАМЛМ.

Мікалай НАВУМЧЫК

ТВОР “НЯМОГЛЫ БАЦЬКА” УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

АБАГУЛЬНЯЛЬНЫ ЎРОК У ФОРМЕ ТЭСТА Ў VI класе

Інструкцыя да выканання. Выберыце ў кожным пытанні адзін правільны адказ і злучыце лічбы, якія ў дужках, на картцы адказаў. Калі правільна выканаеце заданне, у вас атрымаецца выява аднаго з герояў твора.


Поспехаў вам, сябры!

Картка адказаў

прозвішча_____

клас_____

імя_____



Адзнака за тэст_____

1. Уладзімір Караткевіч – гэта пісьменнік:
1) польскі (76-77-92);
2) украінскі (78-90-93);
3) беларускі (94-73-72);
4) рускі (90-87-89);
5) руска-беларускі (78-81-86).

2. Знакамітымі беларускімі пісьменнікамі-казачнікамі з’яўляюцца:
1) Аляксандр Пушкін, Максім Багдановіч (67-56-59);
2) Уладзімір Дубоўка, Васіль Вітка (94-95-105);
3) Кандрат Крапіва, Джані Радары (34-39-41);
4) Карней Чукоўскі, Шарль Перо (45-49-55);
5) Сяргей Міхалкоў, Пётр Яршоў (44-47-52).

3. Народная казка – гэта:
1) твор, у якім расказваецца пра важныя падзеі народнага жыцця, выяўляюцца глыбокія перажыванні аўтара і яго герояў (65-66-67-68);
2) фальклорнае фантастычнае апавяданне, якое выдаецца за верагоднае і адпаведна ўспрымаецца, хоць яно і не пацверджана якімі-небудзь матэрыяламі (60-63-66-69);
3) жанр вуснай народнай творчасці, звычайна празаічны аповед фантастычнага або сацыяльна-побытавага зместу з шырокім выкарыстаннем вымыслу (67-65-58-48);
4) празаічны твор вялікай формы (49-52-54-59);
5) паданне, народжанае фантазіяй, якое ў фантастычнай форме абагульнена адлюстроўвае жыццё прыроды і людзей (67-66-70-73).

4. “Нямоглы бацька” ў жанравых адносінах – гэта:
1) народная казка (5-8-9-10);
2) легенда (81-83-85-97);
3) літаратурная казка (100-101-84-88);
4) паданне (82-84-88-100);
5) апавяданне (101-103-104-106).

5. Калісьці ў людзей быў дрэнны звычай:
1) вучыць бацькоў араць і сеяць (23-24-27-28);
2) аберагаць старых бацькоў да смерці (19-21-22-23);
3) не карміць старых бацькоў (17-16-12-13);
4) біць сваіх бацькоў (18-23-24-26);
5) трымаць бацькоў у каморцы (17-19-22-27).

6. Дзікія людзі жылі паводле адзінага закону:
1) карысці (28-44-46-51);
2) ўзаемадапамогі (10-13-16-20);
3) сябелюбства (9-11-16-19);
4) нянавісці (8-9-12-25);
5) міласэрнасці і любові (10-12-15-27).

7. Больш за ўсіх у вёсцы трымаўся за закон:
1) Васіль (64-65-66);
2) Віктар (63-64-66);
3) Максім (65-68-69);
4) Гнат (105-98-94);
5) Пятро (105-67-88).

8. Пятро адвёз свайго бацьку:
1) у суседнюю вёску (49-51-53-61);
2) у глухі лес (61-62-70-83);
3) да сваякоў (51-53-55-59);
4) у чыстае поле (50-52-55-63);
5) на высокую гару (49-52-57-60).

9. Пятро схаваў бацьку, калі яго прынёс на плячах дадому:
1) у хляве (39-41-43-47);
2) у склепе (40-41-42-44);
3) у суседзяў (83-85-87-90);
4) на гарышчы (34-33-32-31);
5) у каморы (73-79-78-72).

10. Нямоглы бацька Пятра ўратаваў аднавяскоўцаў ад галоднай смерці:

1) успомніўшы, дзе закапана жыта (42-43-46-55);
2) параіўшы зняць салому са страхі і абмалаціць (83-89-85-102);
3) падказаўшы, як можна ўкрасці салому ў суседзяў (43-45-50-59);
4) па справядлівасці падзяліўшы паміж усімі зерне, якое было (42-43-48-57);
5) даўшы ім зерня са сваіх прыпасаў (82-88-84-101).

11. Каб пазбавіцца Велікана, бацька Пятра параіў:
1) нацкаваць на яго сабак (11-12-18-22);
2) усім аднавяскоўцам разам напасці на страшыдлу (9-11-15-25);
3) каб яму ігралі, спявалі і танцавалі ўдзень (101-102-103-104);
4) каб яму кожны дзень насілі смачную ежу (9-10-11-19);
5) каб сіроты плакалі ля асіны (72-55-41-36).

12. На думку Пятра, людзям жылося цяжка, таму што:
1) яны былі хітрыя, не хацелі працаваць (48-50-51-62);
2) баяліся ўсяго (49-50-52-57);
3) была неўрадлівая зямля, частыя засухі (49-52-53-56);
4) "жылі сілай, а розум забівалі", знішчалі "ўчора" і не мелі права на "заўтра" (27-10-7-21);
5) пастаянна ваявалі з усімі суседзямі (26-12-17-21).

13. "Самым большым гадам" у творы з'яўляецца:
1) Максім (50-52-54-55);
2) Пятро (49-50-56-61);
3) Гнат (14-15-19-18);
4) Велікан (48-50-54-62);
5) бацька Пятра (49-52-57-64).

14. Стары закон быў пераможаны дзякуючы:
1) слёзам сірот (27-28-29-30);
2) настойлівасці сялян у барацьбе са старым (26-27-30-32);
3) смеласці Пятра і розуму (мудрасці) яго бацькі (28-29-33-38);
4) парадзе жыхароў суседняй вёскі (25-27-29-31);
5) знаходлівасці Гната (27-28-32-37).

15. Сутнасць закону, паводле якога жылі дзікія людзі, заключаецца ў яго:
1) грубасці, чэрствасці ў адносінах да дзяцей і састарэлых (11-13-16-20);
2) абыякавасці ў адносінах да бедных аднавяскоўцаў (8-9-12-19);
3) абавязковай дапамозе адзін аднаму ў цяжкую хвіліну (3-9-11-22);
4) клопаце пра чалавека (14-16-19-23);
5) жорсткасці, бесчалавечнасці, неразумнасці (17-18-23-28).

16. Пятро забірае бацьку з лесу, таму што:
1) баіцца асуджэння радні (15-17-18);
2) не хоча парушаць векавых традыцый (11-15-17);
3) не ведае, як жыць не прыстасаванаму да жыцця (42-43-45);
4) шчыры, выхаваны, разважлівы, добры, высакародны, любіць бацьку, паважае яго (42-49-50);
5) бацька паправіўся і мог зноў працаваць (41-43-47).

17. Паводле закону, старых, нямоглых бацькоў трэба было:
1) адправіць на адпачынак у санаторый (45-46-47-48);
2) адвесці ў глухі лес (46-53-59-51);
3) аддаць у Дом састарэлых (44-45-47-49);
4) прымусіць працаваць (43-44-46-48);
5) зачыніць на год у хляве (39-40-42-47).

18. Таго, хто парушаў закон:
1) выганялі з вёскі (15-18-21);
2) саджалі ў турму (18-19-20);
3) абсвістваліі (36-37-38);
4) забівалі (48-60-52);
5) асуджалі на галодную смерць (39-40-43).

19. Гнат больш за ўсіх трымаўся за дзікі закон, таму што:
1) быў самы багаты, а гэта давала яму права кіраваць грамадою (51-52-50-45);
2) быў самы адукаваны і ўсё пра ўсіх ведаў (21-22-24-26);
3) быў важаком грамады (20-21-24-26);
4) быў самы старэйшы ў вёсцы (19-21-24-27);
5) быў самы хітры, меў з закону вялікую выгаду (18-19-22-27).

20. Спагада, паважлівасць да суседзяў, якія нападалі на вёску, дзе адбываецца дзеянне, у Пятра выяўляецца ў тым, што ён:
1) частуе іх хлебам (37-38-39-41);
2) моліцца за іх (36-39-41-42);
3) дзеліцца сакрэтам, дзе ўзяць зерне на сяўбу (73-66-64-65);
4) расказвае пра прычыну голаду (39-40-41-44);
5) вылечвае параненых (37-38-41-47).

21. Гнат у творы:
1) шчыры, сумленны, працавіты (70-71-72-73);



Мікалай Іванавіч Навумчык *– дырэктар УА "Дзяржаўны раённы агульнаадукацыйны ліцэй" г. Маларыты. Бакалаўр педагагічных навук. Закончыў Пінскае педагагічнае вучылішча імя А. С. Пушкіна (1992), Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А. С. Пушкіна (1997). Выступае ў друку з метадычнымі матэрыяламі. Аўтар (разам з П. Міхайлавым і С. Фацеевай) дапаможніка "Тэсты для тэматычнага кантролю па беларускай мове: 4 – 5 класы" (2003). Дэлегат II з'езда настаўнікаў Рэспублікі Беларусь.*

2) справядлівы, спагадлівы, мудры (69-70-71-74);
3) добры, выхаваны, ведае ўсяму меру (66-67-68-69);
4) баламуціць людзей, сквапны, "самы большы гад" (97-75-67-66);
5) клапоціцца пра ўсіх; думае, як "здабыць" вяскоўцам хлеб (62-64-65-69).

22. Гната ў канцы твора:
1) затапталі нагамі (59-61-62);
2) пакаралі бізунамі (58-60-62);
3) партрэт павесілі на Дошку гонару (59-61-63);
4) прызначылі мудрацом племені (60-61-62);
5) выгналі ў пушчу (64-57-47).

23. Пятро забраў бацьку з лесу:
1) на наступную ноч (96-107-100-97);
2) праз тыдзень (74-75-77-79);
3) праз месяц (73-74-77-82);
4) праз год (71-72-76-81);
5) зусім не стаў забіраць (72-73-75-79).

24. Пятро, каб абхітрыць Гната і забраць з лесу бацьку:
1) пераставіў указальнікі дарог (57-63-65-67);
2) перанёс будан у іншае месца (58-62-63-64);
3) назбіраў аленевых касцей і пакідаў іх у будан (88-82-68-61);
4) папрасіў суседзяў, каб нікому не расказвалі, што для бацькі зрабіў зямлянку непадалёк ад вёскі (63-65-66-71);
5) адвёз бацьку да знаёмых у горад (61-62-66-72).

25. Аднавяскоўцы, калі даведаліся, што Пятро "жыве бацькавым розумам" і не адвёз бацьку ў пушчу:
1) асудзілі ўчынак Пятра (25-29-32-39);
2) выгналі абодвух з вёскі (11-15-19-25);
3) пакланіліся Пятру і бацьку да долу (36-37-32-27);
4) выбралі аднагалосна Пятра старастам вёскі (10-19-22-30);
5) пачалі з павагаю ставіцца да кожнага састарэлага чалавека (9-15-22-30).

26. Дзеянне ў творы адбываецца:
1) "так даўно, што Месяц толькі-толькі яшчэ з'явіўся на нашым небе" (73-56-47);
2) сто гадоў таму (77-78-80);
3) тысячу гадоў таму (76-77-79);
4) у будучыні (79-80-82);
5) у трыдзевятым царстве (21-30-45).

27. Пісьменнік у творы ўздымае праблемы:
1) Айчыны і служэння ёй (35-36-37-38);
2) шанавання вопыту і мудрасці старэйшых, удзячнасці і міласэрнасці да састарэлых людзей* (33-39-45-44);
3) Радзімы, здрады (34-35-36-37);
4) павагі да старэйшага пакалення, любові да дзяцей (35-37-39-40);
5) мастака і мастацтва (34-37-39-41).

28. Галоўнае ў казцы "Нямоглы бацька":
1) развенчванне старога закону (38-39-42);
2) апраўданне Гната (67-68-69);
3) асуджэнне Пятра (70-71-72);
4) паказ жыцця людзей у мінулым (19-20-21);
5) высмейванне старога ладу жыцця (67-69-71).


29. Твор вучыць:
1) берагчы прыроду (52-54-57-65);
2) любіць тое месца, дзе нарадзіўся (53-54-55-69);
3) помніць, з якога ты роду-племені (52-53-56-62);
4) паважаць сваіх бацькоў, клапаціцца пра іх у старасці (95-74-96-97);
5) што трэба жыць сваім розумам (34-39-29-33).

30. Аўтар у казцы сцвярджае, што найважнейшым з усіх чалавечых законаў з'яўляецца закон:
1) сябелюбства (2-9-15023);
2) дапамогі адзін аднаму (11-14-19-25);
3) сумлення (13-8-9-14);
4) узаемадапамогі (21-29-33-39);
5) спагады (5-9-11-18).

31. Уладзімір Караткевіч у казцы "Нямоглы бацька":
1) высмейвае адмоўныя рысы характару беларусаў (25-27-36-43);
2) асэнсоўвае лёс народа і прыгажосць характару беларусаў (27-22-21-17);
3) паказвае, як трэба ставіцца да любых з'яў у жыцці грамадства (11-14-22-32);
4) сцвярджае думку аб праве чалавека на годную (дастойную) старасць (5-8-14-22);
5) пераконвае, што галоўнае ў жыцці – гэта ўменне жыць згодна з законам (9-13-16-22).

Правільныя адказы

1. – 3	7. – 4	13. – 3	19. – 1	25. – 3
2. – 2	8. – 2	14. – 3	20. – 3	26. – 1
3. – 3	9. – 5	15. – 5	21. – 4	27. – 2
4. – 3	10. – 2	16. – 4	22. – 5	28. – 1
5. – 3	11. – 5	17. – 2	23. – 1	29. – 4
6. – 1	12. – 4	18. – 4	24. – 3	30. – 3
				31. – 2



* Паводле Галіны Снітко.

З гісторыі назвы

Валянціна ЛЕМЦЮГОВА

ЧАМУ ТЫ БЕЛАЯ, БЕЛАЯ РУСЬ?

На зямлі Беларусі, як і ва ўсім славянскім свеце, шмат "белых" тапонімаў – назваў рэк, азёраў, крыніц, балот, лясоў, паселішчаў. Белая каларыстыка выразна праявілася як у сваім прыродным выражэнні, так і ў сімвалічным. *Белымі* завуцца балоты, парослыя белай пушыцай, белым мохам, падвеем, нізкім беразняком, лугі, на якіх расце дзікая дзяцеліна з дробнымі белымі кветкамі, бярозавыя гаі і пясчаныя пагоркі.

Асабліва багаты беларускі край на "белыя" рэкі, азёры, крыніцы. Толькі ў кнізе "Блакітны скарб Беларусі" (Мінск, 2007) значыцца 43 возеры *Белае*, 4 ракі *Белая* і мноства назваў з асновай *Бел-* тыпу *Беліца, Белічанка, Беларэч, Белка, Белянок*. Звычайна іх паходжанне тлумачыцца наяўнасцю белай вады, у якой растваряюцца берагавыя крэйдавыя адклады, а таксама якаснымі паказчыкамі вады ў вадаёмах з пясчаным дном (светлая, празрыстая, чыстая). Але сярод "*белых*" часам сустракаюцца рэкі і азёры з іншымі прыроднымі характарыстыкамі: з топкім тваністым дном, з балоцістымі берагамі. У такіх выпадках у якасці матывацыі мог быць выкарыстаны і колер прыбярэжнай або падводнай расліннасці.

Несумненна, меў рацыю і Вадзім Ніканаў [1], калі яшчэ ў 70-я гг. мінулага стагоддзя выказаў думку, што не ўсе *Белыя* рачныя і азёрныя аб'екты атрымалі свае назвы за прыродную афарбоўку вады, частка з іх магла быць матываваная сімвалічным значэннем "свяшчэнны". Сваё далейшае развіццё культавая ідэя атрымала ў працах Вольгі Карпенкі [2]. На яе погляд, рэлігійны змест "белых" тапонімаў мае пад сабою рэальны грунт. Паколькі праславянскае **belъ* этымалагічна супастаўляецца са стараіндыйскім *bhalam, bhala* 'бляск', *bhati* 'свяціць, блішчаць' [3], то сімвалічнае значэнне святасці магло развіцца пад уплывам менавіта першаснага этымалагічнага значэння. Невыпадкова яшчэ на самых ранніх этапах зараджэння рэлігіі багам прысвойваўся эпітэт *светлы, бліскучы*. Напрыклад, *светлым, бліскучым* называўся Бог Сонца і Святла *Апалон*. Белы колер быў абавязковым у атрыбутыцы такіх паганскіх багоў, як *Белабог, Дажбог, Ярыла*. У дахрысціянскую пару рэчкам, азёрам, крыніцам славяне пакланяліся як багам, прыпісвалі ім незвычайныя лекавыя якасці. Многія водныя аб'екты служылі месцам правядзення свяшчэнных абрадаў, рытуалаў. Нават пасля прыняцця хрысціянства, нягледзячы на забарону царквы, паганскія традыцыі працягвалі жыць у свядомасці народа. Асабліва ўшаноўваліся крыніцы. У беларусаў культ свяшчэнных крыніц у перажыткавых формах захаваўся да гэтага часу, з паганскіх свяцілішчаў яны пераўвасобіліся ў хрысціянскія прошчы. Таму зусім натуральна, што ў іх назвах знаходзіла адлюстраванне не толькі прыродная каларыстыка, але і культавая сімволіка (*Белая крыніца, Святая крыніца*).

Апрача рэк, азёраў, крыніц, у славянскім тапаніміконе нямала "белых" паселішчаў. Летапісы ў розны час (пачынаючы з IX ст.) упамінаюць назвы славянскіх гарадоў з першым кампанентам *Бел-: Бѣлгородъ* на рацэ Ірпень пад Кіевам (980 г.), *Бѣлгород* у Разанскай зямлі (1208 г.), *Бѣлгородъ* – у Цвярской зямлі (1375 г.), *Белгарад Днястроўскі* на тэрыторыі Украіны (910 г.), *Бело-град* – сведка гераічных падзей, апісаных у "Слове пра паход Ігаравы" (XII ст.). Некалькі назваў лакалізаваныя ў заходнеславянскім і паўднёваславянскім арэалах: *Београд (Биоград, Белград)* у Сербіі (X ст.), *Belohrad* у Чэхіі (XIII ст.), *Biograd* у Харватыі. Паходжанне гэтых назваў зводзіцца да праславянскага **belъgordъ*. Другі кампанент *-gord* у перыяд станаўлення "белых" назваў гарадоў (сярэднія вякі) абазначаў 'умацаванае паселішча; крэпасць'. Адносна сэнсу першага кампанента даследчыкі ўсё яшчэ не маюць адзінай думкі. Паводле П. Скока [4], прыкмета *белы* ўзятая ад вады, паколькі ўсе славянскія паселішчы з такімі назвамі размешчаны на берагах рэчак і азёраў. А. Трубачоў [5] разглядае семантыку прыметніка *белы* ў сувязі з агульнаеўразійскай сімволікай частак свету – "*белы*" = "*заходні*". У. Нярознак [6] аддае перавагу матывацыі ў фальклорным духу: *белы* – 'надзвычай прыгожы, цудоўны'. Аўтар першай версіі тлумачыць паходжанне назваў вельмі агульна. Вядома, што для будаўніцтва любога старажытнага горада (асабліва ўмацаванага) звычайна выбіралася месца каля воднага аб'екта або ў сутоках рэк. Другая версія мае патрэбу ў дадатковай аргументацыі, а менавіта з якога боку і кім гэтыя гарады ўспрымаліся як заходнія.

Самай верагоднай выглядае версія Вячаслава Іванова. Яго разважанні зводзяцца да наступнага. "Паколькі для сярэднявечча (асабліва еўрапейскага) значнасць горада заключалася перш за ўсё ў наяўнасці ў ім функцыянальна істотнага сабора, славянскія назвы тыпу ўсх.-слав. *Белгарад*, паўд.-слав. *Белград, Београд*, з аднаго боку, і тапонімы тыпу ўсх.-слав. *Бела(я) Царква* аказваюцца па сутнасці тоеснымі па першапачатковай функцыі" [7]. Выходзіць, што эпітэт *белы* прысвойваўся тым гарадам, у якіх быў галоўны (карэнны) сабор або галоў-



Валянціна Пятроўна Лемцюгова *– мовазнаўца. Доктар філалагічных навук, прафесар. Закончыла Беларускі дзяржаўны універсітэт (1958). Галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі, старшыня Рэспубліканскай тапанімічнай камісіі пры НАН Беларусі. Аўтар больш як 200 навуковых прац, у тым ліку буйных калектыўных даследаванняў: «Слоўнік мовы "Нашай нівы" (1906 – 1915)» (у 5 т.; т. 1 – 2003, т. 2 – 2007); манаграфія «Мова "Нашай Нівы": Варыянтнасць. Сінанімія» (2005); нарматыўны даведнік "Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь" (у 6 кн.; Мінская вобласць – 2003, Гродзенская вобласць – 2004, Гомельская вобласць – 2006, Магілёўская вобласць – 2007); "Нацыянальны атлас Беларусі" (2002); "Słowiańska onomastyka" (т. 1 – 2002, т. 2 – 2003).*

ная (вялікая) царква. Ёсць звесткі, што ў г. *Біла Церква* (Украіна) у старажытнасці сапраўды дзейнічаў вялікі храм, рэшткі якога захаваліся да нашых дзён [8]. Такім чынам, у дастасаванні да горада эпітэт *белы* ўвасабляў вярхоўную царкоўную ўладу, вышэйшы рэлігійны статус. Вытокі такога сімвалічнага выкарыстання эпітэта *белы*, паводле Вяч. Іванова, сваімі каранямі сыходзяць у дахрысціянскую эпоху. Доказам гэтага яму служыць рымская легенда пра возера, звязанае са свяшчэнным горным лесам *Alba* (*Белая*). Адгалоскі гэтай легенды выяўлены не толькі ў кельцкай і італійскай традыцыях, а і ў індаіранскай, што, на яго думку, сведчыць пра яе агульнаіндаеўрапейскае паходжанне. У сваю чаргу легенда выяўляе сувязь з агульнаіндаеўрапейскім паданнем пра возера, у якім схаваны прамяністы скарб і з якога выцякаюць усе рэкі свету. Вяч. Іваноў акцэнтуе ўвагу на тым, што легенды пра цудадзейнае паходжанне азёраў асабліва шырокую вядомасць набылі ў беларускім і прылеглых да яго арэалах, як правіла, яны (гэтыя легенды) вельмі архаічныя.

Безумоўна, значэнне святасці нельга пераносіць на ўсе без выключэння "белыя" тапонімы. У беларускім тапаніміконе ёсць назвы паселішчаў, якія ўзніклі на аснове гідронімаў: вёска *Белая* ва Ушацкім раёне Віцебскай вобласці размешчана каля возера *Белае*. Такога ж паходжання і назва вёскі *Белая* ў Жыткавіцкім раёне Гомельскай вобласці і інш. Нярэдка на паселішчы пераносяцца прыкметы і назвы суседніх ці сумежных з імі прыродных аб'ектаў: *Беламошша, Белыя Балоты*. Апрача таго, сімвалічны сэнс прыметніка *белы* не з'яўляецца ўстойлівым, ён мяняецца ў залежнасці ад зменаў у культурным, гістарычным і эканамічным жыцці народаў. У XVI – XVII стст. на беларускіх землях з'явіліся назвы *Белы Двор, Белы Дворак, Белае Сяльцо, Белы Засценак. Белымі* ў гэты перыяд называліся паселішчы на землях "белага духавенства" (у адрозненне ад "чорнага", да якога належалі пастрыжаныя ў манахі), на землях, вызваленых ад падаткаў, а таксама на землях панскіх (у польскай мове XVI ст. *biały dom* – гэта 'дом, дзе сядзеў сам пан').

Белы колер суправаджае нас (беларусаў) праз усё жыццё. Нават край наш здавён завецца *Белай Руссю*. А чаму? Гэтае пытанне хвалюе многіх даследчыкаў. У кнізе "Імя тваё Белая Русь" (укладанне Генадзя Сагановіча) сабраны публікацыі 20 аўтараў розных пакаленняў, якія спрабавалі праясніць гістарычны лёс наймення *Белая Русь*, разгадаць скрыты ў ім сэнс. Аднак апошняя кропка пакуль не пастаўлена. Ужо пасля выхаду згаданай кнігі з'явіліся даследаванні Алеся Белага, Алега Латышонка, Аляксандра Рогалева, Кастуся Тарасава, Генадзя Цыхуна, у якіх паведамляецца шмат невядомых дагэтуль фактаў, прапануюцца новыя версіі паходжання назвы. "Akta Albaruthenica" (2007) змясціла на сваіх старонках артыкул Ніны Баршчэўскай [9], у якім даецца агляд 10 навуковых прац, выдадзеных у розны час за мяжой – Янкі Станкевіча, Янкі Запрудніка, Вацлава Ластоўскага і іншых. Усе аўтары і даследчыкі звяртаюць увагу галоўным чынам на тое, калі і адкуль завітала ў наш край назва *Белая Русь* і які сэнс у ёй хаваецца.

На аснове паказанняў друкаваных і рукапісных крыніц у большасці з іх склалася ўражанне, што гэтая назва, перш чым прыстаць да нашага краю, доўга вандравала па ўсходнеславянскіх прасторах. У розныя часы *Белай Руссю* іменаваліся такія землі, як Пскоўска-Наўгародская, Смаленская, Полацка-Віцебская, Ноўгарад-Северская, Кіеўская, Галіцка-Валынская, Масковія (Маскоўская Русь). І толькі з XVI – XVII стст. яна пачынае больш канкрэтна прывязвацца да ўсходняй і паўночна-ўсходняй Беларусі (раёны беларускага Падзвіння і Падняпроўя).

У афіцыйных крыніцах за першае ўпамінанне пра *Белую Русь* дастасоўна да беларускіх земляў прыняты канец XIV ст., калі польскі летапісец Ян з Чарнкова, апавядаючы пра канфлікт паміж Кейстутам і яго пляменнікам Ягайлам, пад 1382 годам назваў Полацк крэпасцю Белай Русі. Аднак не ўсе даследчыкі прызналі праўдзівай гэтую дату. Паводле У. Ламанскага [10], *Белая Русь* у дачыненні да беларускіх земляў вядомая значна раней – у канцы або ў сярэдзіне XIII ст., яна даўнейшая за час праўлення Альгерда і нават Гедыміна. Пад гэтым іменем разумелася калі не ўся сучасная Беларусь, то пэўная яе частка. Дз. Анучын [11] быў перакананы, што *Белая Русь* прыйшла на Літву не з усходу, а з захаду і ўпершыню яе засведчылі германскія хронікі ў XIII ст. У замежнай беларусістыцы склалася агульнае ўяўленне, што *Белая Русь* знаходзіцца недзе на ўсход і поўнач ад тэрыторыі лівонскіх мечаносцаў і што самая ранняя яе лакалізацыя звязана з крывіцкімі (беларускімі) землямі паўночнай Беларусі [12].

Пасля таго як амерыканскі вучоны Марвін Колкер апублікаваў у 1979 г. трактат "Апісанне земляў" (Descriptiones terrarum) у часопісе "Specutum" ("Люстра") [13], стала відавочным, што на захадзе пра *Белую Русь (Alba Ruscia)* ведалі ўжо ў сярэдзіне XIII ст. (паміж 1255 – 1260 гг.) і што размяшчалася яна недзе ў раёне Прыбалтыкі. Апошнім часам вучоныя занятыя пошукам месца лакалізацыі гэтай тэрыторыі, дыскусія асвятляецца ў працы А. Латышонка [14]. Беларускі даследчык старажытнасцяў В. Чамярыцкі лічыць, што *Белай Руссю* аўтар трактата называе суседнюю з Прыбалтыкай Заходнюю Русь (сучасная ўсходняя або цэнтральная Беларусь) [15].

Цяпер мы ведаем, што *Белай Руссю* наша Бацькаўшчына называлася з сярэдзіны XIII ст. У папулярызацыі назвы асноўную ролю адыгралі не самі беларусы, а іх заходнія суседзі, перш за ўсё палякі і немцы. Беларусы яе ўзгадвалі досыць рэдка. Нават літоўскі вялікі князь тытулаваў сябе "государём русским", а не беларускім. А гэта таму, што з XIII ст. беларускія землі ўсё ж часцей называліся Літвою, Літоўскай Руссю, а беларусы ліцвінамі. Сёння пад Літвой разумеецца толькі колішняя Жамойць, а сапраўдныя ліцвіны завуцца беларусамі. На думку польскага лінгвіста Аляксандра Брукнера, гісторыя Беларусі старэйшая і слаўнейшая за гісторыю Маларусі і Вялікарусі, але яна схаваная пад назвай *Літва* [16]. Кастусь Тарасаў зусім справядліва заўважыў, што "XIII стагоддзе ніяк не пачатак Чорнай і Белай Русі, а адзін з часоў іх старажытнасці" [17].

А што магла азначаць назва *Белая Русь* у той ранні перыяд? Адказ на гэтае пытанне даўно шукаюць многія лінгвісты і гісторыкі. Яшчэ ў XVII ст. Сымон Старавольскі спрабаваў звязаць значэнне эпітэта *Белая* з колерам снежнага покрыва. Пасля з'явілася шмат іншых версій. Самая папулярная з іх (каляровa-этнаграфічная) тлумачыць сэнс назвы *Белая Русь* тым, што большасць жыхароў нашага краю ў мінулым былі бландзінамі і насілі світкі, кажухі, шапкі-магеркі і іншую апратку светлых колераў. Гэтае меркаванне падзялялі і такія навуковыя аўтарытэты, як Адам Кіркор і Яўхім Карскі [18], аднак шырокай падтрымкі гэтая версія не знайшла. Вельмі крытычна паставіўся да яе вядомы лінгвіст Аляксандр Патабня [19]. На яго думку, эпітэт *Белая* мае палітычны сэнс 'вольная, незалежная', нешта такое, што ёсць і ў выразах *белае месца* 'незанятае месца', *белы цар* 'свабодны, незалежны цар'. Міхаіл Драгаманаў, Мітрафан Доўнар-Запольскі, Мацей Любаўскі і іншыя [20] выказваліся больш канкрэтна: пад *Белай Руссю* яны разумелі зямлю, няскораную татарамі, у процілегласць Русі Маскоўскай, якая стагоддзямі пакутавала ад татара-мангольскага прыгнёту.

Група даследчыкаў, сярод якіх Алег Трубачоў, Рута Агеева, Аляксандр Рогалеў, Вітальд Маньчак, Ігар Грэкаў [21], трымаецца погляду, што семантыка эпітэта *Белая* склалася пад уплывам сістэмы цюркскай каляровай сімволікі, засвоенай славянамі ад усходніх народаў (найверагодней праз пасрэдніцтва татараў). Па гэтай сістэме *белы = заходні*. А. Рогалеў пры гэтым не супраць і таго азначэння, якое даў эпітэту *Белая* В. Тацішчаў. У артыкуле "Ля вытокаў Белай Русі" ён піша: «Найменне *Белая Русь* на ўсходнеславянскай тэрыторыі першапачаткова мела, хутчэй за ўсё, значэнне 'цэнтральная, галоўная, самая значная зямля, палітычны цэнтр'».

Паводле Рыгора Ільінскага [22], *Белая Русь* узнікла на аснове назваў гарадоў *Бельскіх (Бельск, Беласток, Бела, Белавеж)*, лакалізаваных на тэрыторыі яцвягаў. Гэта значыць, на ўзор *Чырвонай Русі*, утворанай па назве горада *Чэрвен*.

У працах некаторых даследчыкаў выразна абазначылася тэндэнцыя да пошукаў матывацыі назвы *Белая Русь* у рэлігійнай сферы. Так, Вацлаў Ластоўскі [23] суадносіў яе азначальны кампанент *Белая* з іменем паганскага бога *Белабога*. Паводле пісьменніка Кастуся Тарасава [24], *Белая Русь* – гэта Русь хрышчоная, большая частка насельніцтва якой вызнае хрысціянскую веру ў адрозненне ад *Чорнай Русі*, дзе надоўга ўсталявалася паганства. Магчымую абумоўленасць каляровых тапонімаў рэлігійнымі фактарамі не выключае і Вяч. Іваноў.

Як бачым, версій шмат, і ўсе яны розныя. Некаторыя з іх у поўным сэнсе слова "аджылі" свой век, некаторыя тлумачаць назву *Белая Русь* на аснове значэнняў, якія развіліся пазней, чым узнікла сама назва, і таму могуць быць лёгка аспрэчаны. Але крытычная ацэнка папярэдніх версій не з'яўляецца мэтай дадзенага артыкула. У ім робіцца спроба дайсці да вытокаў сімволікі белага колеру і спрагназаваць магчымыя матывавальныя значэнні.

Несумненна, Вячаслаў Іваноў слушна заўважыў, што першы (каляровы) кампанент назвы *Беларусь* можа мець дахрысціянскія (паганскія) індаеўрапейскія вытокі [25]. У эпоху паганскіх рэлігійных вераванняў чалавек пакланяўся не толькі Богу, але і культавым (абагаўлёным) прыродным аб'ектам, такім, як сонца, вада, камень. Археолаг Леанід Побаль [26] у працэсе аналізу мастацкіх асаблівасцяў крыжа Еўфрасінні Полацкай выявіў, што, апрача раннехрысціянскіх, на ім захаваліся і індаеўрапейскія культава-міфалагічныя сімвалы. Адным з іх аказаўся сімвал, які абазначае культ Сонца, Святла, Жыцця. У пару паганства славяне пакланяліся яму як аднаму з найгалоўнейшых міфалагічных культаў. Паводле Алены Хмелянок, «...ва ўсходнеславянскай міфалогіі назіраюцца дзве формы сонечнага культу. З аднаго боку, можна казаць пра культ "*сонечнасці*" ці "*белага святла*" (выдзелена намі. – ***В. Л.***), цяпла як крыніцы жыцця раслін, што, несумненна, паказвае на бога, які то памірае, то нараджаецца, і першапачаткова быў звязаны з Дажбогам, якога потым у нейкай ступені замяніў Ярыла. З іншага боку – культ самога сонечнага святіла, якое здзяйсняе свой штодзённы шлях вакол зямлі па падземным свеце на конях ці птушках, што адзначаецца ў міфалогіі розных народаў» [27]. Ад культа "белага святла" бяруць свой пачатак тэрміны *белы дзень, белы свет* і сімвалічнае выкарыстанне апраткі белага колеру ў славянскіх багоў Дажбога, Белабога, Ярылы. Белы колер асацыіраваўся са святлом, якое зыходзіла ад сонца ў перыяд найбольш моцнага яго ззяння (у поўдзень). Паўдзённае святло ўспрымалася яшчэ і як бела-залатое.

З прыходам хрысціянства царква забараніла вернікам пакланяцца паганскім багам і культавым абагаўлёным аб'ектам прыроды, прынамсі сонцу і вадзе. Аднак і культ Сонца, і культ Вады так глыбока ўкараніліся ў свядомасці народа, што беззваротна пакончыць з імі ніяк не ўдавалася. І царква мусіла дастасоўваць паганскую сімволіку да новых умоў і паняццяў. У хрысціянізаванай сімволіцы зноў дамінуе белы колер. Эпітэт *белы* цяпер суправаджае хрысціянскіх святых і анёлаў. Дастаткова прыгадаць традыцыйныя выявы святога Георгія ў белым адзенні і на белым кані. Па-ранейшаму ўшаноўваецца Сонца, пра што нагадваюць залацістыя аздобы храмаў і адзення багоў, святых і царкоўных служкаў. Да сонца і багоў прыраўноўваюцца князі. А. Хмелянок прыводзіць прыклад з даследавання Ба-

рыса Рыбакова, калі нейкі князь з Прыдняпроўя называецца "Дажбогавым унукам" (Дажбог – паганскі бог Сонца). У гэтай мясцовасці вучоныя выявілі шмат міфаў пра нашчадкаў Сонца, першае з'яўленне якіх датуецца V ст. н. э. Далучыцца да боскага роду лічылася за вялікі гонар. Адным са спосабаў сакралізацыі ўладных асобаў было стварэнне легендаў пра іх свяшчэннае (боскае) паходжанне. Сакральны кіраўнік станавіўся вярхоўным святаром, надзяляўся неабмежаванай уладай і меў статус намесніка Бога на зямлі. Князёў з такімі шырокімі паўнамоцтвамі Неба і Зямлі прынята было называць *Вялікімі князямі*. Эпітэт *Вялікі* паводле сэнсу трактуецца гісторыкамі як сінонім эпітэта *Белы* [28]. Землі, падуладныя Вялікім князям, называліся *Белымі* або *Вялікімі*. Яшчэ ў XV – XVI стст. *Белая Русь* і *Вялікая Русь* былі сінонімамі. Відаць, каб займець такія назвы, неабходна было адпавядаць пэўным крытэрыям. Напрыклад, мець вышэйшы разрад буйнога тэрытарыяльна-палітычнага цэнтра, слаўнага, магутнага і духоўна развітага.

Белы колер – сімвал найвышэйшай боскай і княскай улады – знаходзіў адлюстраванне і ў геральдыцы старажытных княстваў: узброены рыцар на белым кані размяшчаўся ў чырвоным полі. Гербы з такой сімволікай, таксама як і пазнейшы дзяржаўны герб ВКЛ, называліся "Пагоня". Выкарыстанне славянамі колераў у якасці сімвалаў вельмі пераклікаецца з індаеўрапейскай іерархічнай сімволікай колераў, у адпаведнасці з якой белы колер сімвалізуе найвышэйшы боскі пачатак і вышэйшы сацыяльны (жрэчаскі) ранг, чырвоны колер – наступны па значнасці (воінскі) ранг, сіні або блакітны – яшчэ больш нізкія рангі.

Цяжка пагадзіцца з думкай, што адна і тая ж назва доўга вандравала па розных землях, пакуль урэшце не знайшла сабе сталае месца. Больш верагодна, што назвы кожнай тэрытарыяльна-палітычнай вобласці ўзнікалі самастойна ва ўмовах змагання за гегемонію, за першынства, перавагу ў сіле і папулярнасці, за лепшае сваё адлюстраванне ў назвах. Імя *Белая Русь* было для іх прэстыжным тытулам і своеасаблівай рэлігійнай і палітычнай візітоўкай. Адным з асноўных прэтэндэнтаў на такое імя было старажытнае Полацкае княства, якое ў 1044 – 1101 гг. дасягнула найвышэйшага росквіту, а ў яго сталіцы Полацку, па сведчанні летапісца (907 г.), "седяху велиции князи…" [29]. Няма сумнення, што *Белая Русь* як назва першай крывіцкай дзяржавы з'явілася на гістарычнай арэне значна раней, чым сведчаць хронікі, якія дайшлі да нас. Яна і дала імя нашай Бацькаўшчыне – імя старадаўняе, светлае і святое.

Спіс літаратуры

1. **Никонов, В. А.** Краткий топонимический словарь / В.А. Никонов. – М., 1966. – С. 48.

2. **Карпенко, О. П.** Літописне Білобережжя / О. П. Карпенко // Давньоруська ономастична спадщина в східнослов'янських мовах. – Київ : Наукова думка, 1986. – С. 40 – 51.

3. **Этимологический словарь славянских языков** : Праславянский фонд / Под. ред. О. Н. Трубачёва. – М., 1974 – 1982. – Вып. 1 – 9.

4. **Skok, P.** Etimologijski rječnik hrvatskog ili srpskog jezika / P. Skok. – Zagreb, 1971 – 1975.

5. **Трубачёв, О. Н.** Ранние славянские топонимы – свидетели миграции славян / О. Н. Трубачёв // Вопросы языкознания. 1974. – № 6. – С. 57.

6. **Нерознак, В. П.** Названия древнерусских городов / В. П. Нерознак. – М., 1983.

7. **Иванов, Вяч.** Цветовая символика в географических названиях в свете данных топонимии (К названию Белоруссии) / Вяч. Иванов // Імя тваё Белая Русь // укл. Г. Сагановіч. – Мінск : Полымя, 1991. – С. 120.

8. **Никонов, В. А.** Краткий топонимичекий словарь. С. 47.

9. **Баршчэўская, Н.** Уплыў суседніх народаў на зьмену дзяржаўнага назову Беларусі ў ацэнцы беларускіх вучоных у дыяспары / Н. Баршчэўская // Akta Albaruthenica. – Warszawa, 2007. – № 6.

10. **Ламанский, В.** "Белая Русь" / В. Ламанский // Імя тваё… С. 15.

11. **Анучин, Д.** К вопросу о белорусской территории / Д. Анучин // Імя тваё... С. 31.

12. **Баршчэўская, Н.** Уплыў суседніх народаў на зьмену дзяржаўнага назову Беларусі... С. 62.

13. Трактат з'яўляецца уступам да Дублінскага рукапісу, выяўленага амерыканскім вучоным М. Колкерам. Апублікаваны ў часопісе "Спадчына" (1993, № 6). Пераклад з лацінскай мовы ажыццявіў А. Жлутка. Каментары і пасляслоўе напісаў В. Чамярыцкі. Рукапіс захоўваецца ў бібліятэцы Англійскага універсітэта ў г. Дубліне (Ірландыя).

14. **Łatyszonek, O.** Od Rusinów białych do białorusinów / O. Łatyszonek. – Białystok, 2006. – С. 25 – 33.

15. **"Апісанне земляў"** (з Дублінскага рукапісу XIII ст.). Пасляслоўе і каментары В. Чамярыцкага // Спадчына. – 1993. – № 6. – С. 67 – 68.

16. **Bruckner A.** Z niwy białoruskiej. – Kraków, 1918, c. 3.

17. **Тарасаў, К.** Памяць пра легенды / К. Тарасаў. – Мінск : Полымя, 1994. – Выд. 2, дап. – С. 47.

18. **Киркор, А. К.** Белорусское Полесье / А. К. Киркор // Живописная Россия, 1, т. 3, часть 2. – СПб. – М., 1882. Рэпрынт: Минск, 1989. – С. 249; **Карский, Е.** Белоруссы. Введение к изучению языка и народной словесности / Е. Карский. – Вильна, 1904. – С. 114 – 118; **Карскі, Я.** Беларусы / Я. Карскі. – Мінск, 2001. – С. 106; **Карский, Е.** Белая Русь / Е. Карский // Імя тваё... С. 27 – 30.

19. **Потебня, А. А.** Белая Русь / А. А. Потебня // Імя тваё... С. 25 – 27.

20. **Łatyszononek, O.** Od Rusinów białych do białorusinów... С. 18.

21. **Трубачёв, О. Н.** Ранние славянские этнонимы...; **Трубачоў, А.** Не ад белай адзежы і светлых вачэй / А. Трубачоў // Беларуская мінуўшчына. – 1993. – № 1. – С. 8; **Агеева, Р. А.** Страны и народы: происхождение названий / Р. А. Агеева. – М., 1990. – С. 146, 150; **Рогалеў, А.** Ля вытокаў Белай Русі / А. Рогалеў // Імя тваё... С. 151; **Рогалев, А.** Белая Русь и белорусы (В поисках истоков) / А. Рогалев. – Гомель, 1994. – С. 82 – 93; **Mańczak, W.** Biała, Czarna i Czerwona Ruś / W. Mańczak // International journal of slavic Linguistics and Poetics, vol. 19, 1975. – S. 35 – 39. Спасылка зроблена па кнізе А. Латышонка, с. 18 – 19 (гл. пад № 14).

22. **Ильинский, Г.** К вопросу о происхождении названия "Белая Русь" / Г. Ильинский // Імя тваё... С. 35 – 40.

23. **Сулімірскі, Ю.** (псеўданім Вацлава Ластоўскага). Аб назовах "Крывія" і "Беларусь" / Ю. Сулімірскі // Крывіч. – № 10. – Каўнас, 1925. – С. 36 – 46.

24. **Тарасаў, К.** Русь Літоўская / К. Тарасаў // Імя тваё... С. 108 – 111.

25. **Иванов, Вяч.** Цветовая символика… / Вяч. Иванов // Імя тваё... С. 121.

26. **Побаль, Л.** Індаеўрапейскія і раннехрысціянскія сімвалы на крыжы Еўфрасінні Полацкай / Л. Побаль // Наш край. – № 2. – Мінск : Бел. навука, 2002. – С. 17.

27. **Хамянок, А.** Культ сонца ў славянскай і беларускай міфалогіі / А. Хамянок // Наша слова. – 2007. – 3 студз. – С. 4.

28. **Юхо, Я.** Пра назву "Беларусь" / Я. Юхо // Імя тваё... С. 94 – 95; **Соловьев, А.** Великая, Малая и Белая Русь / А. Соловьев // Імя тваё… С. 58 – 59.

29. **Штыхаў, Г. В.** Полацкае княства / Г. В. Штыхаў // Беларус. энцыкл.: у 18 т. – Мінск: БелЭн, 2001. – Т. 12. – С. 455.

НЕАСВОЕНЫЯ СЛОВЫ НЯМЕЦКАГА ПАХОДЖАННЯ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЕ

Калі даследуеш мову сучаснай беларускай мастацкай прозы, заўважаеш, што яна мае шмат запазычанняў з розных моў. Звычайна такія словы прайшлі ўсе ступені адаптацыі ў беларускай мове, а некаторыя з іх, асабліва калі гэта даўнія запазычанні, не ўспрымаюцца як іншамоўныя лексемы. Запазычанні зафіксаваны ў слоўніках іншамоўных слоў, тлумачальных і іншых слоўніках. Але ў творах мастацкай літаратуры ўжываюцца і словы, якія з'яўляюцца чужароднымі для беларускай мовы, асабліва калі яны перадаюцца ў іншамоўным напісанні. Такія словы называюцца *ўкрапваннямі* ці *варварызмамі* (грэч. *barbarismos* 'той, што ўрываецца'). Спосаб увядзення варварызмаў у іншамоўным напісанні называецца трансплантацыяй, а ў беларускамоўным – транслітарацыяй [3, с. 18 – 19].

У адрозненне ад варварызмаў англійскага паходжання, якія прыходзяць у беларускую мову пераважна пісьмовым шляхам і праз адукацыйны працэс, неасвоеныя словы з нямецкай мовы часцей запазычваюцца вусным шляхам. Яны не знайшлі шырокага ўжывання ў творах маладых пісьменнікаў, а найбольш яскрава адлюстраваныя ў прозе аўтараў старэйшага пакалення ў мастацкіх творах, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны.

Часта ўжываюцца ў метамове мастацкіх твораў словы і кароткія фразы, якія чулі пісьменнікі і героі іх твораў ад немцаў у гады акупацыі або некалі вывучылі ў школе. У складзе такіх адзінак-варварызмаў, зафіксаваных у сучаснай прозе, можна выдзеліць лексіка-семантычную групу слоў этыкету. Напрыклад: ***біттэ*** (ням. *bitte* 'калі ласка'): *– Куды б яго тут? – азіраючы бліндаж, запытаў Ванін. – Во давай на шмуткі. Садзіся, фрыц!* ***Біттэ!*** (В. Быкаў. Праклятая вышыня); ***гут*** (ням. *gut* 'добры, харошы'): *–* ***Гут?*** *– успомніў Пятрок знаёмае яшчэ з той вайны нямецкае слова і ўзрадаваўся* (В. Быкаў. Знак бяды); ***гут абенд*** (ням. *guten Abend* 'добры вечар'): *– О, тут і фрыцы! – радасна здзіўляецца хлопец, згледзеўшы немца. –* ***Гут абенд****, фрыц!* (В. Быкаў. Праклятая вышыня); ***данке*** (ням. *danke* 'дзякуй'): *Фашыст Грот такі ветлівы, што бясконца, на кожным кроку:* ***данке, данке, данке*** (І. Шамякін. Сэрца на далоні).

Значнае месца ў творах ваеннай тэматыкі займаюць словы, якія з'яўляюцца нямецкімі выкрыкамі, камандамі. Каб дакладна перадаць моўную сітуацыю, у большасці мастацкіх твораў гэтыя адзінкі чужой мовы падаюцца ў беларускамоўным графічным афармленні – транслітарацыі: ***ніхт шысэн*** (ням. *nicht schiessen* 'не страляць'): *–* ***Ніхт шысэн, ніхт шысэн!*** *– чужак з пераляку ўпаў пад ногі Кужэльнаму і загаласіў* (М. Дубоўскі. У кожнага – свая вайна); ***яволь*** (ням. *jawohl* ваен. 'так точна'): *Сусед таўхнуў яго* [Рыбака] *локцем у бок. –* ***Яволь****, а не ёсць. Прывыкаць нада* (В. Быкаў. Сотнікаў); ***мах цу*** (ням. *mach zu!* 'зачыні!'): *Гэта* [адчуванне ўласнай годнасці] *пачулася мне ў абражаным выкрыку адной з іх* [жанчын] *на турыста, на жываце ў якога вісеў фотаапарат у незашпіленым футарале: "****Мах цу!****"* (Я. Брыль. Вячэрні звон); ***рэхтс ран*** (ням. *rechts* 'правы'): *–* ***Рэхтс ран!*** *Направа! – крычыць ён* [вахман]*, і мы сыходзім з бруку на пясок* (Я. Брыль. Ты мой найлепшы друг); ***форвэрт*** (ням. *vorwärts* 'наперад'): *–* ***Форвэрт!*** *– аўтаматы, адразу два, паказалі на дарогу, да каня* (І. Пташнікаў. Найдорф).

Той факт, што такія варварызмы трапілі ў беларускую мову вусным шляхам, абумоўлівае іх варыянтнасць у прозе: ***хальт / гальт*** (ням. *halt!* 'стой!', 'ні з месца!'): *–* ***Хальт!*** *Цурук! Боль у плячы адпусціла, не засцілае вачэй. Немец стаіць каля склепа, наставіў на мяне аўтамат* (А. Адамовіч. Хатынская аповесць); *–* ***Гальт!*** *– закрычаў фельдфебель. Ён грозна паглядзеў на сваю пяцёрку і тыцнуў пальцам на француза Лекашэ* (Я. Брыль. Ты мой найлепшы друг); ***хэндэ хох / хэндэ гок*** (ням. *Hände hoch!* 'рукі ўгору!'): *– Гэта ж ты толькі наладзіўся прысесці, а я з-за кустоў табе:* ***хэндэ хох*** (В. Казько. Хроніка дзетдомаўскага сада); *–* ***Хэндэ гок!*** *– скамандаваў адзін з іх* [чырвонаармейцаў]. *Той, з мангольскімі вачыма* (І. Мележ. Мінскі напрамак).

Даволі пашыраныя сітуацыйна ўжывальныя *майн гот*, *капут* у вусным маўленні беларусаў, як у якасці зваротка, так і выклічніка, у творах мастацкай літаратуры сустракаюцца ў адзінкавых прыкладах. Гэтыя іншамоўныя словы, выяўляючы канкрэтнае значэнне толькі ў шырокім кантэксце, полісемічныя. Часцей за ўсё яны выступаюць у якасці эмацыянальнага выклічніка, які выяўляе дыфузнае значэнне, бо як эмацыянальная адзінка можа перадаваць і адмоўныя адносіны да фактаў рэчаіснасці – гнеў, пратэст, незадавальненне, іронію, спалох і іншае, і станоўчыя – захапленне, задаволенасць. Напрыклад: ***майн гот*** (ням. *mein Gott!* 'божа мой!'): *Калі вучань дрэнна адказваў урок, яна* [Фаіна Тодараўна] *уздыхала і шаптала: "Якая дзікасць! Індыйскія джунглі... О* ***майн гот!****"* (А. Чарнышэвіч. Світанне); ***капут*** (ням. *kaputt* 'разбіты, зламаны'): *"Не, хлусіш, шчанюк! Гітлеру* ***капут****! Табе* ***капут****!" – сказаў я і выцягнуў з кабуры пісталет* (І. Шамякін. Снежныя зімы); *Цяпер мы ўжо прыйшлі, і Пшэрва будзе цалкам* ***капут*** (Я. Брыль. Ты мой найлепшы друг). Слова *капут* даволі часта выкарыстоўваецца ў мове мастацкай літаратуры і зафіксавана ў "Тлумачальным слоўніку беларускай мовы" [4, т. 2, с. 633], але яго ўжыванне абмежавана толькі размоўнай сферай. У пададзеным вышэй першым прыкладзе імператыўны выклічнік, ужыты ў ролі выказніка, служыць для выражэння эмацыянальнага стану абурэння моўцы-персанажа. У большасці выпадкаў ужывання эмацыянальныя выклічнікі "становяцца выгукамі" [6, с. 596].

Звычайна аўтары ўжываюць варварызмы, каб адлюстраваць каларыт жыцця замежных краін. Пісьменнік выкарыстоўвае словы, уласцівыя носьбітам іншай мовы для абазначэння рэалій іх жыцця. Гэта могуць

быць словы-ўстаўкі ў мове персанажаў і маўленчай плыні аўтара для стварэння сітуацыйнай дакладнасці, дакументальнасці: ***аўсвайс*** (ням. *Ausweis* ‘пасведчанне, пропуск’): *Бязбровы, уважліва разглядаючы, пакруціў яе* [Ніны] ***аўсвайс****, паклаў у кішэню* (І. Мележ. Мінскі напрамак). Лексема *аўсвайс* ужываецца таксама з прыметамі граматычнага асваення (у форме множнага ліку): *Мы ж такія недысцыплінаваныя, ніяк не хочам зразумець, чаго яны* [карнікі] *ад нас дабіваюцца, такія мы крыклівыя, супраціўляемся, не жадаем верыць у* ***аўсвайсы****, у праверку дакументаў, у звычайнасць і неабходнасць таго, што адбываецца* (А. Адамовіч. Хатынская аповесць); ***Дойчланд*** (ням. *Deutschland* ‘Германія’): *Дык у тым* ***Дойчландзе*** *мяне так прыхапіла: якое там вандраванне па Гарцы, замест казкі – пярун, паводка і гэтак далей* (А. Сямёнава. О’кей!); ***ніхт*** (ням. *nicht* ‘не’): *Тады за Грэчку ўступіўся Тыталь. – Дайце, гер лейтэнант, яго мне. Мне патрэбны людзі. Работы – філь, а людзей –* ***ніхт*** (І. Мележ. Мінскі напрамак); ***фаерабенд*** (ням. *Feierabend* ‘канец рабочага дня’): *А людзі яшчэ ўсё працавалі ці больш прыкідваліся, што робяць нешта, і непакоіліся, як гэта сёння так зацягнуўся “****фаерабэнд****” – канец рабочага дня* (Я. Брыль. Ты мой найлепшы друг); ***швах*** (ням. *schwach* ‘слабы, бяссільны’): *І без яе* [Панцялееўны] *застрашлівага крыку было зразумела, што справы* ***швах*** (У. Арлоў. Ордэн Белай Мышы). Лексема *швах* зафіксавана ў ТСБМ [4, т. 5, с. 363], дзе адзначана, што яе ўжыванне абмежавана толькі размоўным стылем. Можна сказаць, знаходзіцца за рамкамі літаратурнай мовы, што з’яўляецца адзнакай не поўнасцю асвоенай іншамоўнай адзінкі; ***гебітскамісар*** (ням. *Gebietskomissar* ‘камісар вобласці’): *Я даў слова* ***гебітскамісару****, што электрастанцыя будзе даваць святло* (Б. Мікуліч. Цяжкая гадзіна); ***цэльт*** (ням. *Zelt* ‘палатка’): *Пасля некалькіх галодных ды халодных сутак у лагерных “****цэльтах****”, вялікіх брызентавых палатках, з горада Старгарда нас, чалавек паўсотні, вывезлі ў маёнтак Фалькенвальдэ* (Я. Брыль. Пішу як жыву). Аўтары часта тлумачаць, расшыфроўваюць паняцце, а сам варварызм бяруць у двукоссе, прычым словы падаюцца ў адпаведных адаптаваных формах (напрыклад, у множным ліку ці склонавай форме), калі моўная адзінка мае прыметы граматычнага і марфалагічнага асваення; ***энэргіш*** (ням. *energisch* ‘энергічны’): *Дала* [гаспадыня] *паперы, канверт з маркай, самапіску і запрасіла да кухоннага стала. Не адкладаючы, “****энэргіш****”, як любіла часта паўтараць* (Я. Брыль. Пішу як жыву).

Частка іншамоўных неасвоеных слоў у мастацкім кантэксце выяўляе выразную тэндэнцыю да марфалагічнага асваення. Некаторыя назоўнікі набываюць граматычнае значэнне роду і ліку (*аўсвайс – аўсвайсы, зацягнуўся фаерабенд, у лагерных цэльтах*), якія выражаюцца фармальнымі паказчыкамі ці сінтаксічна. Частка моўных адзінак у выніку змены сінтаксічнай функцыі лексікалізуецца, змяняе семантыку ці нават пераходзіць у разрад слоў, якія не маюць намінатыўнага значэння. Названыя асаблівасці сведчаць пра жывы працэс, своеасаблівы рух у асваенні выкарыстаных мастакамі слова чужародных элементаў, якія праз частотнае ўжыванне ў іншых, новых, творах або пашырэнне ў вусным маўленні чытачоў маюць перспектыву быць уключанымі ў разрад асвоеных запазычаных слоў літаратурнай мовы.

Асаблівасці чужаземных звычаяў, побыту людзей, іх нораваў выразна праяўляюцца ў найменнях гістарычных рэалій, назвах вуліц, устаноў і інш. Выкарыстаныя ў метамове беларускіх мастацкіх твораў, такія адзінкі служаць яскравым сродкам стварэння мясцовага каларыту, дэталізацыі месца падзей, стварэння зрокавых вобразаў, якія нясуць адпаведную псіхалагічную нагрузку ў апісанні і ўспрыманні карцін жыцця персанажаў, якія спазнаюць, адкрываюць для сябе навакольны свет. Гэтыя неасвоеныя іншамоўныя лексемы ўжываюцца ў мастацкай прозе як адзінкі, што выконваюць намінатыўную і спазнавальную функцыі, з якімі спалучаюцца эстэтычная і эмацыянальная. Бо ў працэсе камунікацыі (пісьмовага і вуснага маўлення) важная не толькі думка, але і эмоцыі, пачуцці, настрой, воля і г. д. і аўтара (адрасанта), і чытача (адрасата). Напрыклад: ***Deutsche Reichsbahn*** (ням. ‘Германская дзяржаўная чыгунка’): *Я скажу аб гэтым у другім месцы, а тут дабаўлю толькі, што “інертны” і “бязвольны” мясцовы чалавек пусціў пад адхон 11 128 саставаў з надпісам “****Deutsche Reichsbahn****”* (У. Караткевіч. Зямля пад белымі крыламі); ***Ларэляй*** (ням. *Lorelei* ‘русалка ў народнай легендзе’): *Яна* [Наташа] *любіла светлае віно, і ў вясковай крамцы мы неспадзявана адкрылі пакаштаваную неяк у Вільні “****Ларэляй****” з яе халаднаватавытанчаным букетам* (У. Арлоў. Краявід з ментолавым пахам). Некаторыя вядомыя назвы ўжываюцца як у іншамоўным, так і ў беларускамоўным напісанні: ***Unter den Linden / Унтэр дэн Ліндэн*** (назва вуліцы ў Берліне, якую можна перакласці як “Пад ліпамі”): *Вылез на* ***Unter den Linden*** *– і, канечне ж, адразу ўбачыў тое, што не мог не ўбачыць: скрыначкі лісічак на парапеце каля супермаркету!* (А. Федарэнка. З кошыкам, або Гісторыя ненапісанай аповесці); *Адтуль ужо Берлін відаць – Брандэнбургскія вароты.* ***Унтэр дэн Ліндэн*** *і асабістая канцылярыя Гітлера, – усміхаючыся вачыма, нечакана ўдакладніў Быстроў* (І. Мележ. Мінскі напрамак); ***Uhrwald*** (ням. *Uhrwald* ‘дрымучы, некрануты лес’): *Немцы ў першую акупацыю знішчылі чвэрць апошняга “****Uhrwald’y****” ў Еўропе* (У. Караткевіч. Зямля пад белымі крыламі). У дадзеным прыкладзе аўтарам зроблена спроба граматычнага асваення лексемы. Варварызм *Uhrwald* атрымаў прыметы назоўніка мужчынскага роду другога скланення.

У пераліку асноўных асаблівасцяў неасвоеных іншамоўных слоў моваznаўцамі падкрэсліваецца “адсутнасць сувязі гэтых адзінак з літаратурнай мовай, яны заўсёды знаходзяцца за рамкамі беларускай літаратурнай мовы” [2, с. 30]. Таму зразумела, што ў кантэксце мастацкага твора такія словы заўсёды нясуць эмацыянальна-экспрэсіўную нагрузку, выступаюць вобразным сродкам.

Стылістычна зніжаныя словы таксама выкарыстоўваюцца аўтарамі твораў сучаснай беларускай літаратуры. Нямецкія прастамоўныя і лаянкавыя словы адносяцца ў мове-этымоне да ненарматыўнай лексікі. Трапляючы ў беларускую мову ў якасці варварызмаў, яны надаюць асаблівую экспрэсію і эмацыяналь-

насць мове твора. Напрыклад: ***доннэрветар*** (ням. *Donnerwetter* ‘наганяй; шумная сварка’): *Фельдфебель Элер, дзябёлы вусач, загадчык лагернага склада вопраткі і абутку, стаяў перад глухою брамкай у казарменным плоце і лаяўся. – О **доннэрветар**! – трубіў ён. – Дык гэта ж, мае апосталы, свінства!* (Я. Брыль. Ты мой найлепшы друг); ***думкопф*** (ням. *Dummkopf* ‘дурань’): *Я так многа чуў пра гэтага старога, якога самі немцы са злосцю звалі “**думкопф**”, а нашы жыцькаўцы проста – Наін* (Я. Сіпакоў. Усе мы з хат); ***швайн*** (ням. *Schwein* ‘свіння’): *Жанчына закрычала і папаўзла, а потым пабегла да лазні. – **Швайн**! – штурхнуў мяне аўтаматам немец* (А. Адамовіч. Хатынская аповесць); ***фэрфлюхтэр*** (ням. *verflucht* ‘пракляты, акаянны, агідны’): *– Вэк, **фэрфлюхтэр**... Кароткім ударам локця ён* [фельдфебель] *адпіхнуў Петрака ад каровы, выхапіў з яго рук вяроўчыну* (В. Быкаў. Знак бяды).

Часта гэтыя адзінкі ўжываюцца ў якасці сродкаў моўнай характарыстыкі персанажаў з ярка выражанай адмоўнай ацэнкай. Большасць выбраных з празаічных твораў моўных адзінак гэтай групы – эмацыянальна-экспрэсіўныя назвы асобы паводле фізічных і духоўных асаблівасцяў. Матывацыя ўжывання гэтых слоў звязана з суб’ектыўнай ацэнкай моўцаў, якія ў выніку выступаюць персанажамі са знакам “мінус”. Словы, ужытыя імі ў эмацыянальна-афектыўным стане, выклікаюць агіду ў чытача. Праз такія словы самі моўцы выкрываюць сваю ўнутраную нікчэмнасць, бесчалавечнасць і становяцца антыгероямі. Па сутнасці, адбываецца гуманізацыя чытача, які пры знаёмстве з мастацкім творам вучыцца бачыць станоўчае і адмоўнае, бо “чытач – складовая частка мастацтва” [7, с. 275].

Мова, на якой пішацца твор мастацкай літаратуры, як развітая цэласная сістэма, безумоўна, мае дастаткова поўны набор знакаў для рэалізацыі як намінатыўна-камунікатыўнай функцыі, так і эстэтычнай, і экспрэсіўнай і без выкарыстання чужародных элементаў, якімі з’яўляюцца варварызмы. Але замацаваная за імі роля своеасаблівых “каларытных інкрустацый пры апісанні нацыянальных характараў, звычаяў, перадачы індывідуальна-маўленчай манеры персанажа” [1, с. 614] пацвярджаецца і прыведзенымі вышэй прыкладамі з беларускай мастацкай прозы. Кожная спроба перакладу такіх украпванняў у метамове аўтара ці ў выказваннях яго герояў прывядзе да разбурэння адпаведнай эмацыянальнай плыні апавядання пры ўмове, калі гэтыя неасвоеныя іншамоўныя адзінкі не гульня слоў, а своеасаблівыя знаходкі іх удалай спалучальнасці, якая стварае натуральны фон, карціну месца, дзе адбываюцца апісаныя падзеі, стварае дакументальны, рэальны і яскравы вобраз.

Спіс літаратуры

1. **Беларуская мова :** Энцыклапедыя. – Мінск : БелЭн, 1994.
2. **Бурак, Л.** Сучасная беларуская мова / Л. Бурак. – Мінск : Выш. шк., 1985.
3. **Даўгулевіч, Н.** Фанетычная адаптацыя запазычанняў з англійскай мовы ў сучаснай беларускай мове : Дыс. ... канд. філал. навук / Н. Даўгулевіч. – Мінск, 2003.
4. **Тлумачальны слоўнік беларускай мовы :** У 5 т. – Мінск : БелСЭ, 1977 – 1984.
5. **Большой немецко-русский словарь :** В 3 т. / Сост. Е. Лепинк, Н. Страхова, Н. Филичева и др. – М. : Рус. яз., 1997.
6. **Виноградов, В.** Русский язык. Грамматическое учение о слове / В. Виноградов. – М. : Высш. шк., 1972.
7. **Толстой, А.** Полное собрание сочинений : В 15 т. / А. Толстой. – М., 1952. – Т. 13.

Дзмітрый КАНАНЕНКА,
аспірант кафедры беларускага мовазнаўства
Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А. С. Пушкіна.

Артыкул рэкамендаваны да друку кафедрай беларускага мовазнаўства Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А. С. Пушкіна.

Свет моў і святло мовы

СТРАКАТАЯ ЛІНГВІСТЫЧНАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

“І скарб твой лепшы – слова, звычай...” – гэта афарызм Якуба Коласа пра родную мову. Любіў ён гэтую тэму і часта звяртаўся да яе. Вось яшчэ некалькі яго моўных афарызмаў.

Такіх прыкладаў нямала,
Калі і слова дае гарт.

Не гаварыў, а сек языкам!..

Ёсць мова, зразумелая для ўсіх, і ёсць мова, даступная для нямногіх...

...Слова скажа ці сказ,
Як у сценку ўлепіць.

Мы павінны мець мову прыгожую, гучную, простую, але гнуткую і выразную.

Без фактаў словы – гніль пустая.

Скажаш слова не такое –
Быць бядзе.

І тут – гу! гу! і там – гу! гу!
І нічога разабраць не магу.

Але ж спрэчка – не сварка, і дружбы не разбіла...

Залатыя словы,
Хоць сказаць не новы.

Кожны наватвор і запазычанне толькі тады атрымаюць распаўсюджанне, калі яны будуць адпавядаць духу мовы, яе фразеалагічнаму складу.

“Стракатая лінгвістычная энцыклапедыя” друкуецца з 2006 г. Пра цікавыя факты з гісторыі беларускай ды іншых моў можна прачытаць у № 11 за 2006 г., у №№ 1, 3, 5, 7, 10 за 2007 г.

Нанатэхналогіі. Слова гэтае апошнім часам вельмі часта згадваецца ў газетах, тэлеперадачах, размовах вучоных. Загадкавая тут яго першая частка: *нана-*. Паходзіць яно з грэчаскай мовы, дзе *nánnos* значыць ‘карлік’. У спецыяльных мовах (фізіка-матэматычных) яно набыло значэнне вельмі канкрэтнае – адна мільярдная доля адзінкі (гл. табліцу).

Кратнасць і дольнасць	Найменне элементаў
$1\,000\,000\,000\,000 = 10^{12}$	тэра-
$1\,000\,000\,000 = 10^{9}$	гіга-
$1\,000\,000 = 10^{6}$	мега-
$1\,000 = 10^{3}$	кіла-
$100 = 10^{2}$	гекта-
$10 = 10^{1}$	дэка-
$0{,}1 = 10^{-1}$	дэцы-
$0{,}01 = 10^{-2}$	санты-
$0{,}001 = 10^{-3}$	мілі-
$0{,}000\,001 = 10^{-6}$	мікра-
$0{,}000\,000\,001 = 10^{-9}$	**нана-**
$0{,}000\,000\,000\,001 = 10^{-12}$	піка-

Нанатэхналогіі, такім чынам, – гэта тэхналогіі, у межах якіх чалавек працуе з найдрабнюткімі, “карлікавымі” частачкамі матэрыі – малекуламі і атамамі. Нанатэхналогіі абяцаюць новыя, незвычайныя дасягненні сучаснай навукі і тэхнікі, але пра іх раскажа вам ужо фізік-нанатэхнолаг.

Мяў-мяў-мова. Увесь жывы свет абменьваецца інфармацыяй. Значыць, і ўсе жывёлы “размаўляюць”. І паміж сабой, і са сваімі гаспадарамі. Да гэтай тэмы мы яшчэ не раз звернемся. А цяпер – некалькі слоў пра “кашэчую мову”. Назіральныя людзі склалі нават адпаведны “слоўнік”. Вось некалькі радкоў з яго. Калі коцік кажа:

– *мр-мр-мр-мр-мр* – гэта значыць: ‘вы прыйшлі, і я шчаслівы’;

– *ммммннггг* – ‘я разумею, зараз атрымаю што-небудзь смачнае’;

– *м-р-р-н-а-а-а-о-о-у-у* – ‘хачу яшчэ (яды, ласкі, гульні са мной)’;

– *м-і-а-а-а-э-о-у* (з націскам на *у*) – ‘што здарылася?’;

– *оэ-оэ-оэ-оэ* – ‘мне гэта агідна!’;

– *пффффт* – ‘ой, як страшна!’;

– *ха* – лаянкавае “слоўка”.

Спіс гэты далёкі ад вычарпальнасці, але збіранне кашэчых выразаў кожны можа працягнуць сам.

Падтакнуць. Тлумачальны слоўнік сцвярджае, што значэнне згоды можна выказаць і словам “паддакнуць”. Але гэта не зусім так. Першы дзеяслоў – уласна беларускі (з коранем *так*), другі – русізм (з коранем *да*). *Падтакваць*, г. зн. ‘выражаць падтрымку і згоду’, можна, паўтараючы не толькі *так... так*, але і *ну... ну*, *ага... ага*, *але... але*, *во... во*, *праўда... праўда*, *канешне.. канешне*, *правільна... правільна* і іншыя беларускія словы згоды, але не *да... да*. Невыпадкова, што ў газетным тэксце з’явілася двукоссе: *І вось загучаў веснавы капеж. Яму “паддаквае” дождж.* Да дзеяслова *падтакнуць – падтакваць* у беларускай мове ёсць і варыянт *патакнуць – патакваць* (але няма, зразумела, “падакнуць”). Міхась Лынькоў напісаў: *Афіцэр слухаў, патакваў*. А ў Янкі Брыля чытаем і такое: *...Ён пабліскваў з цянёчку хітрымі вачыма і часта патакваў расказчыку: “ага!”, “а як жа!..”*

Асцярожна: слова! Колькі разоў на дзень людзі раздражнёна кідаюць: *настрою няма, усё з рук валіцца, вочы мае цябе не бачылі б, у горла не лезе, ногі не трымаюць, злосці не хапае, галава кругам ідзе, рукі чэшуцца, у пячонках сядзіць* і пад. У кожным з такіх выпадкаў, ды яшчэ шматкроць паўтораных, закладзена праграма, якую наша падсвядомасць успрымае як загад да дзеяння. Жартаў, метафар, іншасказанняў яна не разумее, і таму такія думкі-словы раней ці пазней могуць здзейсніцца. Медыкі лічаць, што ў гэтым – адна з прычын алергіі і іншых захворванняў. Такія фразы, як кроплі камень, точаць нас знутры, і мы самі праграмуем свой дрэнны фізічны і псіхічны стан. Дык ці не лепей думаць і гаварыць станоўчымі катэгорыямі? Яны ж таксама ўрэшце стануць яваю – здароўем, ураўнаважанасцю, добрым настроем, добразычлівасцю! Перайначыўшы вядомыя паэтычныя радкі, скажам сабе: “І трэба ж нам умець прадбачыць, як слова наша адгукнецца!”.

О’кей! – Усё ў парадку! Гэты выраз зразумелы сёння ва ўсім свеце. Ён лічыцца самым распаўсюджаным “прадуктам” ЗША, нават у параўнанні з джынсамі, кока-колай або джазам. Загадка паходжання абрэвіятуры О.К. дзесяцігоддзямі хвалявала лінгвістаў і спарадзіла мноства версій. Многія мовы “падазраваліся” ў тым, што менавіта яны былі крыніцай гэтага спалучэння. Меркавалі, што абрэвіятура О.К. – грэчаскага паходжання (грэц. *ola kala* – усё добра), або лацінскага (лац. *omnia correcta*), або фінскага (фін. *oikea* – правільна), або французскага (у мове маракоў *aux quails* – да прычала!), або нямецкага (скарачэнне ў тэкстах ваенных загадаў ад *Oberkommando* – галоўнае камандаванне), або індзейскага (пачутае амерыканскім героем вайны з Мексікай Эндру Джэксанам з вуснаў індзейскіх воінаў – *okeh*). Але амерыканскі даследчык Ален Уолкер Рыд адшукаў такі довад. У размоўным стылі О.К. адпавядае *oll correct* (г. зн. скажонае англійскае *all correct*). Якраз у такой форме О.К. было ўжыта ў газеце “Морнінг пост” ужо ў 1839 г. (23 сакавіка). Гэта версія і лічыцца афіцыйнай. У другім выданні Оксфардскага слоўніка англійскай мовы ёсць артыкул, дзе гаворыцца: «О.К., размоўнае. Узнікла ў ЗША. Ад “oll correct”, жартаўлівага варыянта або размоўнай формы ад “all correct”». Цяпер з гісторыяй О.К. усё о’кей!

Арнольд МІХНЕВІЧ,
доктар філалагічных навук.

Ганарар за публікацыю аўтар ахвяруе на развіццё часопіса.

Вольга ЗЕЛЯНКО

ЛІНГВАКУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ ПАДЫХОД ДА НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

У артыкуле разглядаецца адзін з напрамкаў сучаснай лінгвадыдактыкі – лінгвакультуралагічны падыход, звязаны з навучаннем мове ў кантэксце культуры народа – яе носьбіта. У сувязі з тым, што ў сучаснай метадычнай літаратуры сустракаюцца розныя назвы адзначанага падыходу, аўтар абгрунтоўвае мэтазгоднасць ужывання тэрміна "лінгвакультуралагічны падыход". З гэтай мэтай акрэсліваецца сутнасць лінгвакультуралогіі як навукі, што ўзнікла на стыку лінгвістыкі і культуралогіі і даследуе праявы культуры народа, адлюстраваныя ў мове. Артыкул раскрывае ідэі лінгвакультуралагічнага падыходу да навучання мовам, выказаныя Й. Л. Вайсгербера у манаграфіі "Родная мова і фарміраванне духу"; апісвае структуру культуразнаўчай кампетэнцыі, распрацаваную сучаснымі расійскімі педагогамі. Указваюцца напрамкі і сродкі рэалізацыі лінгвакультуралагічнага падыходу да навучання беларускай мове ў агульнаадукацыйных установах Рэспублікі Беларусь.

Навучанне беларускай мове заснавана на спалучэнні сістэмна-функцыянальнага, камунікатыўна-дзейнаснага і лінгвакультуралагічнага падыходаў. Традыцыйнымі ў лінгваметодыцы з'яўляюцца сістэмна-функцыянальны і камунікатыўна-дзейнасны падыходы. Першы забяспечвае засваенне сістэмы моўных адзінак рознага ўзроўню, заканамернасцей і правіл іх функцыянавання, норм літаратурнай мовы. Другі спрыяе фарміраванню камунікатыўнай культуры, авалоданню разнастайнымі відамі маўленчай дзейнасці.

Новым напрамкам развіцця сучаснай методыкі навучання беларускай мове з'яўляецца лінгвакультуралагічны падыход, які, як адзначаецца ў адукацыйным стандарце, звязаны з усведамленнем мовы як сродку спасціжэння нацыянальнай і сусветнай культур, як феномена, у якім знайшлі адбітак праяўленні культуры. У даследаваннях, прысвечаных узаемадзеянню мовы і культуры, мову часта называюць люстэркам культуры. Гэта тлумачыцца тым, што ў мове адлюстраваны навакольны свет, а культура – яго неад'емная частка. Разам з тым мова выступае як складнік культуры, прычым такі, без якога немагчыма ўся яе "сума". На гэты факт, у прыватнасці, звярнуў увагу выдатны рускі вучоны Р. О. Вінакур: ён разглядаў канкрэтную мову як "адзін з прадуктаў духоўнай творчасці пэўнага культурна-гістарычнага калектыву" [1, с. 211] і адводзіў ёй галоўнае месца ў шэрагу кампанентаў, што складаюць структуру нацыянальнай культуры (пісьменства, навука, мастацтва, дзяржава, права, мараль), паколькі мова з'яўляецца ўмовай любога культурнага ўтварэння. Таму, вывучаючы мову, чалавек, "хоча ён гэтага ці не, абавязкова становіцца даследчыкам той культуры, да прадуктаў якой належыць выбраная ім мова" [1, с. 211].

Увядзенне лінгвакультуралагічнага падыходу ў вучэбную практыку тлумачыцца заканамерным працэсам змены парадыгмаў адукацыі. Сёння "ведавацэнтрычная" парадыгма, накіраваная на засваенне школьнікамі пэўнай сумы стандартызаваных ведаў, замяшчаецца культуралагічнай парадыгмай, якая прадугледжвае інтэграцыю асобы вучня ў нацыянальную і сусветную культуру. Гэтая з'ява выклікана сучаснай сацыякультурнай сітуацыяй, калі адукаванасць атаясамліваецца не толькі з інфармаванасцю і кваліфікаванасцю ў сваёй справе, але і са здольнасцю "жыць паводле норм і прынцыпаў культуры свайго часу" [2, с. 455]. У лінгваметадычным кантэксце культуралагічны падыход да навучання звязаны з далучэннем вучняў да культуры народа, адлюстраванай і замацаванай у мове.

Для раскрыцця зместу і шляхоў рэалізацыі лінгвакультуралагічнага падыходу пры навучанні мове неабходна найперш акрэсліць сутнасць лінгвакультуралогіі як навукі. Узнікненне тэрміна "лінгвакультуралогія" ў 90-я гг. XX ст. звязана з даследаваннямі фразеалагічнай школы пад кіраўніцтвам В. М. Тэліі і работай В. В. Вараб'ёва "Культуралагічная парадыгма рускай мовы". Лінгвакультуралогія як навука ўяўляе сабой "памежную зону" на стыку мовазнаўства і культуралогіі. З'яўляючыся прадуктам антрапацэнтрычнай парадыгмы ў лінгвістыцы, лінгвакультуралогія даследуе тыя праявы культуры народа, якія адлюстраваліся ў мове: "аналізуецца чалавек у мове і мова ў чалавеку" [3, с. 6]. Аб'ект лінгвакультуралогіі ўяўляе сабой "даследаванне ўзаемадзеяння мовы, якая ёсць транслятар культурнай інфармацыі, і культуры – гістарычнай памяці народа" [4, с. 11]. Такім чынам, фундаментальныя праблемы лінгвакультуралогіі сканцэнтраваны ў цэнтральнай трыядзе гэтай галіны ведаў – "чалавек (нацыянальная асоба) – мова – культура (сістэма матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей)" [5, с. 99]. Сёння даследчыкі выдзяляюць 10 прадметаў даследавання лінгвакультуралогіі:

1) беззэквівалентная лексіка і лакуны (прадмет апісання ў лінгвакраіназнаўстве);
2) міфалагізаваныя моўныя адзінкі, абрадава-рытуальныя формы культуры, легенды, звычаі, павер'і;
3) парэміялагічны фонд мовы;
4) сімвалы, стэрэатыпы, эталоны, рытуалы;
5) вобразы;
6) стылістычны ўклад розных моў;
7) маўленчыя паводзіны;
8) узаемадзеянне рэлігіі і мовы;
9) галіна маўленчага этыкету [4, с. 12];
10) тэкст як адзінка культуры.

Лінгвакультуралагічны падыход толькі ўкараняецца ў практыку навучання мовам. Гэты тэрмін пакуль не замацаваўся ў метадычнай літаратуры, сустракаюцца розныя назвы адзначанага падыходу: лінгвакультуралагічны, культуралагічны, лінгвакраіназнаўчы, куль-



Вольга Уладзіміраўна Зелянко *– педагог. Закончыла Мінскае педагагічнае вучылішча № 2 (1992), Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка (1997). Працавала настаўнікам пачатковых класаў у СШ № 46 г. Мінска, настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў педагагічным каледжы Установы адукацыі "Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт", ва Установе адукацыі "Мінскі дзяржаўны абласны ліцэй", намеснікам дырэктара па вучэбнай рабоце СШ № 144 г. Мінска. Аспірант Нацыянальнага інстытута адукацыі.*

туразнаўчы, этнакультурны, этнафілалагічны, сацыякультурны і інш.

На нашу думку, тэрмін "культуралагічны падыход" (Т. Ф. Новікава і іншыя) мэтазгодна ўжываць не ў дачыненні да выкладання асобнага вучэбнага прадмета, а ў адносінах да ўсяго адукацыйнага працэсу, паколькі аб'ём адпаведнага паняцця дастаткова шырокі: гэта "сукупнасць метадалагічных прыёмаў, якія забяспечваюць аналіз любой сферы сацыяльнага і псіхічнага жыцця (у тым ліку сферы адукацыі і педагогікі) праз прызму сістэмаўтваральных культуралагічных паняццяў, такіх, як культура, культурныя ўзоры, нормы і каштоўнасці, уклад і лад жыцця, культурная дзейнасць і інтарэсы і г. д." [6, с. 65]. Пры гэтым паняційны апарат культуралогіі не з'яўляецца прадметам вывучэння ў курсе мовы. Аддаць перавагу тэрміну "лінгвакультуралагічны падыход" у выкладанні мовы нас вымушае таксама істотная розніца ў аб'ектах даследавання культуралогіі і лінгвакультуралогіі: першая імкнецца да сістэмнага разумення свету культуры і ўяўляе сабой сінтэз некалькіх навук, якія вывучаюць культуру, у той час як другая дае "апісанне фактаў мовы і культуры ў іх узаемадзеянні і ўзаемасувязі" [5, с. 98].

У 70-я гг. XX ст. расійскімі мовазнаўцамі Я. М. Верашчагіным і В. Р. Кастамаравым быў прапанаваны тэрмін "лінгвакраіназнаўства" ў сувязі з вывучэннем рускай мовы як замежнай. Сутнасць лінгвакраіназнаўчага падыходу – у азнаямленні школьнікаў з культурай краіны той мовы, якая вывучаецца, а таксама фарміраванні "здольнасці здабываць з адзінак мовы краіназнаўчую інфармацыю і карыстацца ёю, дасягаючы паўнавартаснай камунікацыі" [7, с. 140]. У выкладанні замежнай мовы спасціжэнне стэрэатыпаў паводзін і рэалій, характэрных для пэўнага народа, адбываецца з мэтай "уваходжання" ў чужую культуру і пераадолення магчымага культуразнаўчага шоку. Калі ж мець на ўвазе выкладанне роднай мовы, то тэрмін "лінгвакраіназнаўчы падыход" недастаткова дакладна раскрывае аспект навучання мове ў кантэксце культуры народа – яе носьбіта, паколькі частка тэрміна *-краіназнаўчы* ў пэўнай ступені абмяжоўвае матэрыял, які падлягае засваенню, знаёмствам з геаграфічным становішчам, прыроднымі ўмовамі, дзяржаўным ладам краіны. Падобныя звесткі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі Рэспублікі Беларусь вучням прапануюцца на ўроках геаграфіі, гісторыі, курса "Чалавек. Грамадства. Дзяржава". У сувязі з гэтым акцэнтаванне ўвагі на краіназнаўчым аспекце абмяжоўвае магчымасці новага падыходу ў выкладанні роднай мовы.

Сёння ў расійскай лінгваметодыцы паступова замацоўваецца ўжыванне тэрміна "культуразнаўчы падыход" (А. А. Быстрова, В. А. Даманскі, С. І. Львова, Л. І. Новікава і іншыя), які, на нашу думку, не ў поўнай меры адлюстроўвае сутнасць новай з'явы, паколькі другая частка тэрміна – *-знаўчы* (*-ведческий*) – засяроджвае ўвагу на прапанаваных для засваення ведах. Пры гэтым за рамкамі намінацыі застаецца практычная дзейнасць вучняў – авалоданне ўменнямі карыстацца атрыманымі ведамі ў працэсе маўленчых зносін.

На карысць тэрміна "лінгвакультуралагічны падыход" (у параўнанні з назвамі "этнакультурны", "этнафілалагічны", "сацыякультурны"), мяркуем, гаворыць і той факт, што задачы і аб'ект вывучэння лінгвакультуралогіі больш дакладна адлюстроўваюць сутнасць новага падыходу, чым праблематыка этна- і сацыялінгвістыкі: "калі этналінгвістыка аперыруе пераважна гістарычна значнымі звесткамі і імкнецца ў сучасным матэрыяле знайсці гістарычныя факты таго ці іншага этнасу, а сацыялінгвістыка разглядае выключна матэрыял сённяшняга дня, то лінгвакультуралогія даследуе і гістарычныя, і сучасныя моўныя факты праз прызму духоўнай культуры" [3, с. 11].

Такім чынам, лічым абгрунтаваным ужыванне ў нарматыўных дакументах (праект канцэпцыі моўнай адукацыі, адукацыйныя стандарты па беларускай і рускай мовах у Рэспубліцы Беларусь, вучэбныя праграмы) тэрміна "лінгвакультуралагічны падыход".

Ідэі лінгвакультуралагічнага падыходу да навучання мовам не з'яўляюцца прадуктам выключна сучаснага жыцця. Яны распрацоўваліся асобнымі айчыннымі і замежнымі вучонымі-мовазнаўцамі, метадыстамі і настаўнікамі ў мінулым.

Вялікую цікавасць выклікае манаграфія "Родная мова і фарміраванне духу" (1929) заснавальніка еўрапейскай этналінгвістыкі Йохана Лео Вайсгербера, канцэпцыя якога ўяўляе сабой развіццё трох ідэй пачынальніка параўнальнага мовазнаўства Вільгельма фон Гумбальта:

- мова – гэта дзейсная сіла;
- мова заключае ў сабе пэўны светапогляд;
- мова мае ўнутраную форму.

Мэту выкладання мовы Вайсгербер бачыў у "пабудове моўнага светаразумення ў дзіцяці" [8, с. 158], а стрыжнем выкладання мовы, з якім звязаны асобныя аспекты (пастаноўка вымаўлення, навучанне арфаграфіі, граматыцы, адточванне стылю), лічыў зместавы бок мовы, удакладняючы, што выкладанне мовы "павінна перш за ўсё праясняць і культываваць у дзіцяці паняцці і мысліцельныя формы, закладзеныя ў мове" [8, с. 160]. Акцэнтуючы ўвагу на важнасці даследавання "слоўніка народа", які з'яўляецца вынікам паняційнай перапрацоўкі ім свайго вопыту, Вайсгербер сцвярджаў, што спасціжэнне лексікі вядзе да разумення паняційнага свету народа.

Калі вывучэнне замежнай мовы Вайсгербер расцэньваў пераважна як "сродак пранікнення ў чужы духоўны свет" [8, с. 162], то ў выкладанні роднай мовы вучоны

бачыў дзве функцыі: 1) праз пасрэдніцтва роднай мовы павінен адкрыцца шлях да багацця культуры свайго народа; 2) "мова павінна ў першую чаргу ажыць унутры чалавека як самае выдатнае тварэнне культуры, даць яму аснову для ўсяго яго мыслення і паводзін" [8, с. 162].

У сучаснай расійскай лінгваметодыцы (А. А. Быстрова, В. І. Капінос, С. І. Львова) назіраецца спроба вызначыць мэты навучання, яго змест, узроўні ведаў, уменняў і навыкаў праз фарміраванне ў вучняў пэўнага набору кампетэнцый: лінгвістычнай (мовазнаўчай), моўнай, камунікатыўнай і культуразнаўчай. Культуразнаўчая (этнакультуразнаўчая) кампетэнцыя, якую называюць таксама нацыянальна-культурным узроўнем валодання мовай, прадугледжвае "асэнсаванне мовы як формы выражэння нацыянальнай культуры, узаемасувязі мовы і гісторыі народа, нацыянальна-культурнай спецыфікі рускай мовы і рускіх маўленчых паводзін, фарміраванне моўнай карціны свету, авалоданне нацыянальна маркіраванымі адзінкамі мовы, рускім маўленчым этыкетам, культурай міжнацыянальных зносін" [9, с. 28 – 29]. У структуру культуразнаўчай кампетэнцыі метадысты ўключаюць веды, а таксама вучэбна-моўныя і прыватнамаўленчыя ўменні. На ўзроўні ведаў фарміраванне культуразнаўчай кампетэнцыі прадугледжвае авалоданне лінгвакультуралагічнымі паняццямі, адзінкамі мовы з нацыянальна-культурным кампанентам значэння, звесткамі пра сацыяльна-культурныя стэрэатыпы маўленчых паводзін; на ўзроўні ўменняў – развіццё здольнасці аналізаваць адзінкі з нацыянальна-культурным кампанентам значэння, адэкватна ўжываць нацыянальна маркіраваныя адзінкі мовы, стэрэатыпы маўленчых паводзін [9, с. 35].

Лічым, што ўключэнне ў кола ведаў, якія фарміруюць названую кампетэнцыю, лінгвакультуралагічных паняццяў (да іх адносяцца, напрыклад, культурная канатацыя, лакуна, лінгвакультурэма, лінгвакультурнае поле, логаэпістэма, міфалагема, унутраная форма слова і інш.) ускладніць працу настаўніка, паколькі гэта патрабуе ад яго спецыяльнай падрыхтоўкі, а ад вучняў – засваення дадатковага аб'ёму культуразнаўчай інфармацыі.

У метадычнай літаратуры прапануюцца два напрамкі ў рэалізацыі лінгвакультуралагічнага падыходу:

1) навучанне мове ў кантэксце нацыянальнай культуры, што прадугледжвае ўключэнне ў змест прадмета "Беларуская мова"

- выказванняў пра родную мову, якія належаць выдатным стваральнікам айчыннай культуры;
- тэкстаў з нацыянальна-культурным кампанентам;
- нацыянальна маркіраваных адзінак мовы;
- стэрэатыпаў маўленчых паводзін;
- канцэптаў духоўнай культуры беларускага народа і г. д.;

2) спазнанне нацыянальнай культуры ў дыялогу і ва ўзаемадзеянні з культурай іншых народаў, што звязана з

- асэнсаваннем асаблівасцей беларускай мовы на фоне яе супастаўлення з іншымі мовамі;
- выяўленнем агульных рыс у беларускай і іншых (блізкароднасных і неблізкароднасных) мовах.

У навучанні беларускай мове складваецца трэці напрамак – арганізацыя ў сістэме дапрофільнай падрыхтоўкі і профільнага навучання

- факультатыўных заняткаў (V – VIII класы);
- курсаў на выбар (IX – XII класы) **культуразнаўчага** зместу.

Такім чынам, асноўная мэта лінгвакультуралагічнага падыходу пры навучанні беларускай мове – далучэнне школьнікаў да каштоўнасцей айчыннай і сусветнай культур, якія знайшлі адбітак у мове, культуралагічнае развіццё асобы вучня на аснове ўзаемадзеяння мовы (маўлення) і культуры. Ужыванне ў нарматыўных дакументах (праекце канцэпцыі моўнай адукацыі, адукацыйных стандартах па беларускай і рускай мовах, вучэбных праграмах) тэрміна "лінгвакультуралагічны падыход" тлумачыцца сувяззю адпаведнага лінгвадыдактычнага напрамку з праблематыкай лінгвакультуралогіі – навукі, што вывучае факты ўзаемадзеяння мовы і культуры народа – яе носьбіта.

Спроба тэарэтычнай распрацоўкі асобных ідэй лінгвакультуралагічнага падыходу да навучання мовам была зроблена Й. Л. Вайсгербера у манаграфіі "Родная мова і фарміраванне духу" (1929). У сучаснай расійскай лінгваметодыцы спасціжэнне праз мову светапогляду народа, яго гісторыі і культуры атаясамліваецца з фарміраваннем у вучняў культуразнаўчай кампетэнцыі, заяўленай адукацыйнымі стандартамі Расійскай Федэрацыі.

У рэалізацыі лінгвакультуралагічнага падыходу ў агульнаадукацыйных установах Рэспублікі Беларусь можна выдзеліць тры напрамкі: 1) навучанне беларускай мове ў кантэксце нацыянальнай культуры; 2) дыялог культур; 3) развіццёвыя (агульнакультурныя) курсы ў сістэме дапрофільнай падрыхтоўкі і профільнага навучання.

Спіс літаратуры

1. **Винокур, Г. О.** О задачах истории языка / Г. О. Винокур // Избранные работы по русскому языку. – М., 1959. – С. 207 – 226.

2. **Межуев, В. М.** Культура и образование / В. М. Межуев // Наука и образование на пороге III тысячелетия : материалы Междунар. конгресса, Минск, 3-6 окт. 2001 г. / НАН Беларуси, М-во образования Респ. Беларусь [и др.]; редкол.: А. П. Войтович [и др.]. – Минск, 2001. – С. 455 – 462.

3. **Маслова, В. А.** Лингвокультурология : учеб. пособие для студ. высш. учеб. заведений / В. А. Маслова. – М. : Изд. центр "Академия", 2001. – 208 с.

4. **Маслова, В. А.** Введение в лингвокультурологию : учеб. пособие / В. А. Маслова. – М. : Наследие, 1997. – 207 с.

5. **Воробьев, В. В.** О статусе лингвокультурологии / В. В. Воробьев // Материалы IX Конгресса МАПРЯЛ, Братислава, 1999 / Редкол.: Ю. Е. Прохоров [и др.]. – М., 1999. – С. 96 – 117.

6. **Крылова, Н. Б.** Культурология образования / Н. Б. Крылова. – М. : Народное образование, 2000. – 272 с.

7. **Азимов, Э. Г.** Словарь методических терминов (теория и практика преподавания языков) / Э. Г. Азимов, А. Н. Щукин. – СПб. : Златоуст, 1999. – 472 с.

8. **Вайсгербер, Й. Л.** Родной язык и формирование духа / Й. Л. Вайсгербер. – 2-е изд. – М. : Едиториал УРСС, 2004. – 232 с.

9. **Обучение русскому языку в школе :** учеб. пособие для студентов пед. вузов / Е. А. Быстрова [и др.]; под ред. Е. А. Быстровой. – М. : Дрофа, 2004. – 240 с.

Артыкул рэкамендаваны да друку загадчыкам лабараторыі моўнай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі кандыдатам філалагічных навук дацэнтам Ганнай Валочкай.

Віншуем!

ПЕДАГОГ, НАВУКОВЕЦ, АСОБА

ДА 80-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ АНАТОЛЯ БАРДОВІЧА

З першага нашага знаёмства мяне па-добраму ўразілі яго сціпласць, дабрыня, спагадлівасць, пастаянная гатоўнасць дапамагчы, падтрымаць, падказаць – здавалася б, тыповыя, вызначальныя рысы ледзь не кожнага беларуса. Аднак у Анатоля Майсеевіча Бардовіча гэтыя якасці праяўляюцца своеасабліва. Глядзіш на яго – і верыш, адчуваеш: яны абсалютна шчырыя, сапраўдныя, натуральныя, ідуць ад душы, ад самага сэрца. Я ўдзячны лёсу, што ён паднёс мне такі падарунак: працаваць і быць побач з такім педагогам, навукоўцам, асобай.

Нарадзіўся Анатоль Бардовіч 3 студзеня 1928 г. у вёсцы Малыя Навасёлкі Дзяржынскага раёна ў сялянскай сям'і. Спаўна зведаў нялёгкія выпрабаванні таго часу: у 1935 г. уся сям'я (бацька, маці, трое сыноў) была выслана ў Комі АССР у якасці спецперасяленцаў. Там бацькі працавалі ў калгасе, а старэйшыя сыны – на лесапавале. Толькі ў 1947 г. вярнуліся на Беларусь і як неабгрунтавана рэпрэсіраваных іх рэабілітавалі.

Таму для Анатоля Бардовіча вучоба пачалася яшчэ ў Комі АССР, у школах Усцькуломскага раёна. Пасля заканчэння Сыктыўкарскага педвучылішча (1945) выкладаў рускую мову, працаваў завучам школы. Пасля вяртання на радзіму – студэнт Мінскага педінстытута імя А. М. Горкага (1947 – 1951), выкладчык Нясвіжскага педвучылішча (1951 – 1953), аспірант Мінскага педінстытута (1953 – 1956), старшы інспектар Міністэрства асветы (1956 – 1957) і Міністэрства сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі (1961 – 1965). Выкладаў рускую мову ў Балгарыі і Польшчы (1975 – 1977). Аднак ужо з 1957 г. і да выхаду на пенсію ў 2006 г. яго жыццё, актыўная і адметная педагагічная, навуковая і адміністрацыйная дзейнасць непарыўна звязаныя з БДПУ імя Максіма Танка (раней – педінстытут імя А. М. Горкага). Тут ён прайшоў шлях ад аспіранта да кандыдата філалагічных навук (1959), дэкана філалагічнага факультэта (1978 – 2001). У гэтай навучальнай установе ім напісана больш за 50 навуковых і метадычных артыкулаў, у сааўтарстве створаны першыя на Беларусі "Марфемны слоўнік беларускай мовы" (2-е выд. 1989), "Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы" (2000), "Школьны марфемны слоўнік беларускай мовы" (2005), "Школьны словаўтваральны слоўнік беларускай мовы" (2006), дапаможнікі для студэнтаў "Русский язык" (у 2 ч., 3-е выд. 1977), "Русский язык, ч. 1 – 2" (1979), "Современный русский язык. Синтаксис. Пунктуация" (1993) і інш. На працягу амаль 30 гадоў вучні Беларусі вывучалі рускую мову па падручніках, падрыхтаваных з удзелам Анатоля Бардовіча. Яны вытрымалі 27 выданняў (1965 – 1992), што ўжо само па сабе сведчыць пра іх якасць і запатрабаванасць! І яшчэ адна ўражвальная лічба: больш за 60 гадоў педагагічнай працы! Тым не менш, нават цяпер, на заслужаным адпачынку, Анатоль Бардовіч працуе на адукацыю: рэдагуе і перавыдае слоўнікі, дапаможнікі, пастаянна наведваецца ва універсітэт да калег і студэнтаў.



Павел МІХАЙЛАЎ,
кандыдат філалагічных навук.


Крытыка і бібліяграфія

ДОЎГАЧАКАНЫЯ ВЫДАННІ

Бардовіч А. М., **Мормыш Л. С.**, **Шакун Л. М.** Школьны марфемны слоўнік беларускай мовы. – Мінск: Аверсэв, 2005. 496 с. Тыраж 5100 экз.


Бардовіч А. М., **Круталевіч М. М.**, **Лукашанец А. А.** Школьны словаўтваральны слоўнік беларускай мовы / Пад. рэд. А. М. Бардовіча. – Мінск: Аверсэв, 2006. 512 с. Тыраж 5100 экз.

Ва ўмовах рэфармавання ўсёй адукацыйнай сферы Рэспублікі Беларусь асноўная задача ў галіне моўнай адукацыі – падрыхтоўка такой асобы, якая дасканала валодае літаратурнай формай нацыянальнай мовы і дзякуючы гэтаму сваім уласным прыкладам садзейнічае фарміраванню і замацаванню ў грамадстве высокай культуры маўлення, што з'яўляецца неад'емнай часткай і паказчыкам агульнай культуры чалавека. Паспяховае вырашэнне праблемы моўнай падрыхтоўкі магчымае толькі пры выкарыстанні найноўшых метадаў і прыёмаў навучання, а таксама новай метадычнай і навуковай літаратуры. Важнае месца ў гэтай справе належыць розным лексікаграфічным працам. Пытанні лексічнага складу мовы, ужывання слова, яго паходжання, на-



пісання, марфемнай структуры і ўтварэння заўсёды былі аб'ектам пільнай увагі з боку беларускіх філолагаў-мовазнаўцаў. Таму любая лексікаграфічная праца, падрыхтаваная для агульнаадукацыйнай школы, успрымаецца педагагічнай грамадскасцю і навучэнцамі заўсёды прыхільна. Да ліку такіх прац несумненна адносяцца "Школьны марфемны слоўнік беларускай мовы" (аўтары А. М. Бардовіч, Л. С. Мормыш, Л. М. Шакун. Мінск, 2005) і "Школьны словаўтваральны слоўнік беларускай мовы" (аўтары А. М. Бардовіч, М. М. Круталевіч, А. А. Лукашанец. Мінск, 2006). Названыя кнігі падрыхтаваны па ініцыятыве і пры непасрэдным удзеле прафесара Анатоля Бардовіча.

"Школьны марфемны слоўнік беларускай мовы" створаны на базе раней апублікаванага "Марфемнага слоўніка беларускай мовы" (1989) А. М. Бардовіча і Л. М. Шакуна і, натуральна, захоўвае ўсе асноўныя палажэнні і асаблівасці марфемнай характарыстыкі слоў свайго папярэдніка. Аднак у школьным слоўніку пазначаны не толькі матэрыяльна выражаныя гукамі (літарамі) марфемы, але і нулявыя марфемы – канчаткі і суфіксы. Слоўнік у алфавітнай паслядоўнасці змяшчае назоўнікі, прыметнікі, лічэбнікі, дзеясловы, прыслоўі, а ў некаторых выпадках, калі гэта неабходна для вызначэння марфемнага складу іншых слоў, і дзеепрыметнікі. Рэестр слоўніка налічвае амаль 40 000 лексічных адзінак, што не проста адлюстроўваюць марфемную структуру слова, але і даюць настаўніку і вучню выключна каштоўны матэрыял для высвятлення семантыкі слова, яго граматычнай характарыстыкі. Так, напрыклад, пасля кожнага слова-амоніма для разумення яго сэнсу ў дужках падаецца аднакаранёвае слова або падбіраецца сінонім, прыводзіцца лагічнае азначэнне, як у тлумачальных слоўніках, ці робіцца спасылка на пэўную часціну мовы: **ада-бр-а-ць** (*адбіраць*) і **а-дабр-а-ць** (*адобрыць*); **косн-ы** (*адсталы*) і **кос-н-ы** (*касцяны*); **лавач-к-а** (*невялікі магазін*) і **лав-ач-к-а** (*прыстасаванне для сядзення*); **ліп-к-а** (*назоўнік*) і **ліп-к-а** (*прыслоўе*). У тых выпадках, калі неабходна растлумачыць вылучэнне асобных марфем у складзе пэўнага слова, у дужках пасля спецыяльнай пометы падаецца іншае аднакаранёвае слова, падзеленае на марфемы: **аб-у-ць** (*параўн.* раз-у-ць). Калі ж літарны склад марфем выразна не адлюстроўвае структурныя элементы слова, то для дакладнага абазначэння яго марфемнага складу выкарыстоўваюцца квадратныя дужкі, якія паказваюць на зліццё гукаў на стыку марфем, а ў круглых дужках за словам гэтыя марфемы паказаны ў "адноўленым" выглядзе: **бра[ц-к]-і** (брат + ск + і). Да асобных слоў, у якіх адбыліся тыя ці іншыя гістарычныя змены ў марфемнай структуры, у дужках прыведзены рэканструяваныя марфемы або са спецыяльнай пометай пададзены кароткі гістарычны каментарый да слова: **а-пра-ну-ць** (а + прат + ну + ць); **празрыст-а** (*гіст.* пра + зр + ыст + а).



У **"Школьным словаўтваральным слоўніку беларускай мовы"** падаецца характарыстыка структуры вытворных слоў: ад асновы якога слова яно ўтварылася, што за словаўтваральны сродак далучаны да гэтай асновы, якія моўныя з'явы назіраюцца пры гэтым і якім спосабам слова ўтворана. У слоўніку з пункту гледжання словаўтварэння аналізуюцца вытворныя назоўнікі, прыметнікі, лічэбнікі, займеннікі, дзеясловы, прыслоўі, што адносяцца да агульнаўжывальнай лексікі беларускай мовы. Па сваёй будове гэта алфавітны словаўтваральны слоўнік, і таму асноўная адзінка ў ім – не гняздо аднакаранёвых слоў, а кожнае асобна ўтворанае слова і звязанае з ім словаўтваральнымі адносінамі ўтваральнае слова: **ад-святкава-(ць)** – *прыст., ад* **святкава-(ць)**; **да-сух-а** – *прыст.-суф., ад* **сух-і**. Менавіта ў гэтым якраз і заключаецца выключна дадатная рыса алфавітнага словаўтваральнага слоўніка. Як станоўчы факт неабходна адзначыць і тое, што аўтары распрацавалі падрабязную даведку для карыстальнікаў слоўніка, у якой пададзены асноўныя тэарэтычныя паняцці словаўтварэння (невытворныя і вытворныя словы, словаўтваральная пара, утворанае слова, утваральная аснова, словаўтваральны сродак, словаўтваральнае гняздо, спосабы словаўтварэння і інш.), указваюцца ўтваральныя асновы назоўнікаў, прыметнікаў і дзеясловаў, што ўтворaны спосабам нулявой суфіксацыі або асновакладання з нулявой суфіксацыяй. Несумненна карысным будзе для школьнай практыкі падрабязнае тлумачэнне сутнасці словаўтваральнага аналізу і яго ўзоры (вусны і пісьмовы).

Кваліфікавана падабраны аўтарамі і адрэдагаваны матэрыял, дакладна аформленыя слоўнікавыя артыкулы – усё гэта сведчыць пра тое, што "Школьны марфемны слоўнік беларускай мовы" і "Школьны словаўтваральны слоўнік беларускай мовы", створаныя на Беларусі ўпершыню, зоймуць належнае месца і ў багатым фондзе беларускай лексікаграфіі, і ў метадычнай навуцы, і ў паўсядзённай практыцы агульнаадукацыйнай школы. Асабліва яны карысныя і неабходныя ўсім навучэнцам пры падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання. Мы перакананы, што кожны карыстальнік гэтых выдатных грунтоўных даведнікаў скажа аўтарам "Вялікі дзякуй"!

Святлана ФАЦЕЕВА,
кандыдат філалагічных навук.

СЛОВА ПРА ГЕОРГІЯ ЮРЧАНКУ



Нарадзіўся Георгій Юрчанка 31 студзеня 1928 г. у вёсцы Кудрычы Мсціслаўскага раёна ў сялянскай сям'і. Закончыў Мсціслаўскую сярэднюю школу, Магілёўскі настаўніцкі інстытут (1951). Настаўнічаў у школах Дзятлаўскага і Воранаўскага раёнаў Гродзеншчыны. Працу ў школе малады настаўнік спалучаў з вучобай завочна ў Гродзенскім педагагічным інстытуце на філалагічным факультэце, які закончыў у 1959 г. Фарміраваннем сваім як філолага і пісьменніка Георгій Юрчанка абавязаны вельмі многім вядомаму крытыку і літаратуразнаўцу Якубу Усікаву, а таксама таленавітаму мовазнаўцу Пятру Юргелевічу, у якіх вучыўся, набіраўся вопыту і якія прадвызначылі, па словах самога Георгія Фёдаравіча, яго далейшы лёс журналіста, крытыка, публіцыста, мовазнаўца, выдавецкага работніка. Шматлікія замалёўкі і артыкулы Георгія Юрчанкі змяшчаліся ў газетах і часопісах, а ў 1986 г. выйшла яго кніга "На мсціслаўскай зямлі ўзгадаваны" пра жыццё і навуковую дзейнасць Паўла Кабекі – вучонага-фізіка, аднавяскоўца Г. Юрчанкі.

Вядомы Георгій Юрчанка і як літаратурны крытык. Ён апублікаваў шмат артыкулаў і рэцэнзій, у якіх даецца грунтоўны аналіз літаратурных твораў такіх беларускіх пісьменнікаў, як Міхась Скрыпка, Алесь Бажко, Міхась Даніленка, Васіль Гігевіч, Алесь Наўроцкі, Віктар Каваленка, Мікола Грынчык і іншых. Георгій Юрчанка першым адгукнуўся на з'яўленне аповесці Васіля Быкава "Жураўліны крык".

Яшчэ адна сфера дзейнасці юбіляра – пісьменніцкая. Найбольш ярка талент Георгія Юрчанкі праявіўся ў літаратурных пародыях і эпіграмах (кнігі "Вярхом на вожыку", 1968; "Немеладычныя мелодыі", 1974; "Парнаскія ўхабы", 1979; "У натхнёнай паграбеньцы", 1983; "Негабляваная пегасня", 1989; "Абаранкі пад хрэнам", 1994).

У зборніках – пародыі на беларускіх празаікаў, паэтаў, песеннікаў, драматургаў, крытыкаў. Пад абстрэл парадыста траплялі літаратурная поза, неглыбокае пранікненне ў сутнасць з'яў, непатрэбная ўскладненасць, захапленне словатворчасцю, празмернае злоўжыванне дыялектнымі словамі, драбнатэмнасць, мнагаслоўе, гладкапіс, маралізатарства і інш. Гумар сатырыка шчыры, добразычлівы, а падчас калючы і нават з'едлівы. Талент Юрчанкі-парадыста – ва ўменні выбраць патрэбнае ў неабсяжным моры літаратурных з'яў, ва ўменні дасягнуць камічнага эфекту. Усё гэта робіць кнігі пародый і эпіграм вясёлымі і цікавымі.

Апрача таго, Георгій Юрчанка займаецца зборам, вывучэннем і сістэматызацыяй дыялектнай лексікі гаворак роднай Мсціслаўшчыны. Ім выдадзены кнігі "Дыялектны слоўнік" (1966), "Народнае вытворнае слова" (у 3 т., 1981, 1983, 1985), "Сучаснае народнае слова: З гаворкі Мсціслаўшчыны: Слоўнік" (1988), "Сучасная народная лексіка: З гаворкі Мсціслаўшчыны" (у 3 т., 1993, 1996, 1998).

Георгій Юрчанка з'яўляецца таксама актыўным збіральнікам і сістэматызатарам беларускага фальклору. Так, ён выпусціў трохтомны фразеалагічны слоўнік (т. 1: "І коціцца і валіцца", 1972; т. 2: "І сячэ і паліць", 1974; т. 3: "Слова за слова", 1977), тлумачальны слоўнік прыказак "Крылатыя залацінкі Мсціслаўшчыны" (2001), кнігу "Народнае мудраслоўе" (2002). Многа рэцэнзій з'явілася на іх у беларускім і замежным друку.

Выпушчаныя Г. Юрчанкам слоўнікі і лексікаграфічныя і фразеалагічныя матэрыялы да іх аб'ядноўваюць звыш 100 тысяч моўных адзінак, гэтыя выданні высока ацэнены вядомымі спецыялістамі-мовазнаўцамі.

Нельга не спыніцца і на выдавецкай дзейнасці Г. Юрчанкі. З 1961 да 1988 г. месцам яго працы было выдавецтва "Навука і тэхніка", дзе ён загадваў рэдакцыяй літаратуры і мастацтва. За 25 гадоў праз рукі Георгія Фёдаравіча прайшло больш за 600 кніг, брашур, штогоднікаў, сярод іх – 30-томнае выданне беларускага фальклору, аб'яднанае назвай "Беларуская народная творчасць". Г. Юрчанка ўзнагароджаны медалём "Ветэран працы", значком "Выдатнік друку", ганаровымі граматамі.

Няўрымслівы і творча актыўны Георгій Юрчанка і цяпер, у свае восемдзесят. Працуе над новымі мастацкімі творамі, адгукаецца рэцэнзіямі на новыя мастацкія, фальклярыстычныя, мовазнаўчыя і краязнаўчыя працы, збірае і сістэматызуе дыялектны і фальклорны матэрыял, працягвае працаваць у галіне краязнаўства.

Мікалай КРЫЎКО,
вядучы навуковы супрацоўнік
Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі.

Таццяна СТАРАСЦЕНКА

Разгляд асаблівасцей функцыянальных стыляў беларускай мовы дапаможа паглыбіць веды вучняў, стварыць належныя ўмовы для напісання творчых прац, павысіць культуру вуснага і пісьмовага маўлення. Матэрыялы тэм, якія мы прапануем, могуць выкарыстоўвацца пры падрыхтоўцы факультатыўных заняткаў па стылістыцы беларускай мовы, а таксама пры выкананні тэставых заданняў. У кожнай тэме будзе падавацца не толькі тэарэтычны, але і практычны матэрыял, што дазволіць замацаваць набытыя веды. Магчыма несупадзенне некаторых стылістычных найменняў у матэрыялах нашых тэм і школьных падручнікаў. Гэта абумоўлена зваротам да навукова абгрунтаваных стылістычных даследаванняў, дзе размяжоўваюцца паняцці *мова* і *маўленне* і адпаведна – *стыль мовы* і *стыль маўлення*. У лінгвістычнай літаратуры вылучаюцца такія функцыянальныя стылі мовы, як афіцыйна-справавы, навуковы, публіцыстычны, мастацкі, гутарковы (размоўны). А да стыляў маўлення адносяць стыль рэкламы, стыль юрыдычнага дакумента, сяброўскага ліста і інш. Стыль мовы мае свае падстылі і жанры – канкрэтныя стылёва-маўленчыя разнавіднасці. Па сутнасці, кожны функцыянальны стыль уяўляе сабой незамкнёную сістэму моўных сродкаў, здольную ўключаць элементы іншых стыляў. Найбольш кансерватыўным у гэтых адносінах лічыцца афіцыйна-справавы стыль, з якога мы і пачнём разгляд функцыянальных стыляў.

АФІЦЫЙНА-СПРАВАВЫ СТЫЛЬ

ТЭМА 1

Афіцыйна-справавы стыль – гэта сістэма моўных сродкаў, якая выкарыстоўваецца ў заканадаўчай, юрыдычнай, дыпламатычнай сферах чалавечай дзейнасці. У залежнасці ад сферы выкарыстання афіцыйна-справавы стыль дзеліцца на падстылі: ***заканадаўчы***, які рэалізуецца ў тэкстах **законаў, канстытуцый, указаў, грамадзянскіх і крымінальных актаў**; ***дыпламатычны***, які ўжываецца ў тэкстах **камюніке, мемарандумаў, міжнародных дагавораў, пагадненняў**. Вылучаюць і такі падстыль афіцыйна-справавога стылю, як ***адміністрацыйна-канцылярскі***, які выкарыстоўваецца ў канцылярскай перапісцы, у адміністрацыйных актах, у самай рознай дакументацыі. Жанры гэтага падстылю – **заява, аб'ява, даверанасць, распіска, характарыстыка, справаздача, пратакол, аўтабіяграфія.**

Неабходна адрозніваць службовую аўтабіяграфію ад літаратурнай. Так, службовая аўтабіяграфія патрабуе дакладнасці ва ўжыванні моўных сродкаў. Аўтабіяграфія пішацца ад першай асобы, у ёй паведамляюцца год і месца нараджэння, важныя моманты жыццёвага шляху. Як вядома, у службовай аўтабіяграфіі не раскрываюцца рысы характару, схільнасці, любімыя заняткі, асабістае жыццё. Неабходна пазбягаць выразаў *люблю чытаць кнігі, займацца спортам, хадзіць у тэатр*. Можна пачаць аўтабіяграфію так:

Я, Засімовіч Святлана Пятроўна, нарадзілася 15 сакавіка 1980 года ў вёсцы Беліца Мінскага раёна Мінскай вобласці. Мой бацька, Пётр Іванавіч, працуе шафёрам у саўгасе, маці, Ірына Анатольеўна, – настаўніцай.

А вось як пачынае сваю літаратурную аўтабіяграфію Уладзімір Караткевіч: *Я нарадзіўся 26 лістапада 1930 года ў горадзе Оршы Віцебскай вобласці. Тады гэта быў маленькі гарадок. Зялёныя вуліцы, рэшткі валоў замчышча, гудкі далёкіх цягнікоў і блізкіх параходаў (чыгунка і аўтобусы яшчэ не забілі раку), дубовыя лясы на берагах і ліпы на вуліцах, недалёкія парогі. І, вядома, сотні крыніц па берагах і нашы песні. І перш за ўсё кнігі. Кніг у доме было мноства: і рэшткі дзедавай бібліятэкі, і кнігі бацькоў, і свае.* ("Дарога, якую прайшоў")

На лексічным узроўні для афіцыйна-справавога стылю характэрны адметныя тэматычныя групы. Гэта назвы асоб па іх функцыі ў афіцыйных зносінах: *сведка, абанент, адказчык, спажывец, арандатар, падрадчык, атрымальнік, усынавіцель;* назвы дакументаў: *заява, пратакол, службовае пісьмо, загад, інструкцыя;* канцылярызмы (лексіка-фразеалагічныя і сінтаксічныя адзінкі, якія ўзнаўляюцца ў афіцыйна-справавым стылі і абазначаюць распаўсюджаныя паняцці): *суправаджальны, безадкладна, ануляваць, наяўнасць, аднаразовая дапамога, вынесці на абмеркаванне, згодна з пастановай*. Апошнія тры прыклады – выразы сінтаксічнага ўзроўню. Сцісласць у выкладзе матэрыялу абумоўлівае выкарыстанне абрэвіятур: *Дзяржбуд, Мінфін*.

У афіцыйным стылі не дапускаецца ўжыванне эмацыянальных, суб'ектыўна ацэначных і гутарковых слоў. Напрыклад, у тэксце заявы нельга пісаць:

Паважаная Марыя Іванаўна! У сувязі з тым, што я на цэлы месяц з'язджаю адпачываць і мая кватэра будзе зачынена, то вельмі прашу Вас усю карэспандэнцыю, якая паступае на маё імя, пакідаць у паштовым аддзяленні. Зараней вельмі ўдзячны Вам.

Выразы *Паважаная Марыя Іванаўна, вельмі прашу Вас, зараней вельмі ўдзячны Вам* – стылістычныя памылкі ў тэксце афіцыйна-справавога стылю. Такія выразы дарэчы ў неафіцыйнай размове.

На марфалагічным узроўні ў афіцыйных тэкстах актыўна выкарыстоўваюцца іменныя часціны мовы. Найбольшай ужывальнасцю вылучаюцца аддзеяслоўныя назоўнікі з адмоўем і без яго: *стандартызацыя, узгадненне, устанаўленне, перанясенне, захоўванне, размеркаванне, невыртанне, непрымяненне*. Афіцыйнасць афарбоўкі справавой мовы падкрэсліваецца і ў тых выпадках, калі асоб жаночага полу абазначаюць паводле іх занятку, прафесіі назоўнікамі мужчынскага роду: *доктар Васільева, дырэктар Савіцкая*. Ужываюцца таксама дзеяслоўныя словазлучэнні (дзеяслоў + назоўнік) замест дзеясловаў: *кіраваць – ажыццяўляць кіраўніцтва, удзельнічаць – прымаць удзел, дапамагаць – аказваць дапамогу*. Афіцыйна-справавы стыль



Таццяна Яўгенаўна Старасценка *– мовазнаўца. Кандыдат філалагічных навук (2001). Закончыла Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А. М. Горкага (1993). Дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка. Даследуе пытанні стылістыкі беларускай мовы.*

вызначаецца пашыранасцю ў ім інфінітываў, часта ў спалучэнні са словамі *трэба, неабходна, забараняецца, абавязаны*.

У мове дакументаў выкарыстоўваюцца адыменныя прыназоўнікі: *у сувязі, у мэтах, у адпаведнасці*; састаўныя злучнікі: *у выніку таго што, для таго каб, нягледзячы на тое што, з прычыны таго што*.

Тэксты афіцыйна-справавога стылю маюць пэўныя адметнасці і ў галіне сінтаксісу. Для заканадаўчых дакументаў характэрны разнастайныя кампазіцыйныя канструкцыі, якія могуць складацца з раздзелаў, параграфаў, пунктаў, падпунктаў. Артыкулы падзяляюцца на часткі, вылучаныя пры дапамозе рубрыкацыі тэксту. Прычым гэта вылучэнне можа адбывацца арабскімі лічбамі, абзацам або працяжнікам у кожным абзацы. Звернемся да прыкладу рубрыкацыі заканадаўчага артыкула пры дапамозе абзаца:

Асноўнымі задачамі агульнаадукацыйных устаноў з'яўляюцца:

забеспячэнне атрымання вучнямі агульнай базавай і агульнай сярэдняй адукацыі ў адпаведнасці з адукацыйнымі стандартамі агульнай сярэдняй адукацыі;

фарміраванне ў вучняў навуковага светапогляду, духоўнай перакананасці, культуры паводзін, эстэтычнага густу;

замацаванне і захаванне фізічнага і псіхічнага здароўя вучняў, выхаванне беражлівых і адказных адносін да свайго здароўя і здароўя іншых грамадзян, фарміраванне гігіенічных навыкаў і здаровага ладу жыцця;

падрыхтоўка вучняў да ўсвядомленага прафесійнага самавызначэння, прадаўжэння адукацыі, працоўнай і грамадскай дзейнасці, сямейнага жыцця. ("Палажэнне аб агульнаадукацыйнай установе")

Як бачым з прыведзенага прыкладу, для пералічэння выкарыстаны аднародныя члены сказа *забеспячэнне, фарміраванне, замацаванне, захаванне* і іншыя, прычым кожная задача выносіцца ў асобны абзац.

Пры рубрыкацыі, апрача аднародных членаў сказа, могуць ужывацца інфінітыўныя канструкцыі:

Органам унутраных спраў у мэтах выканання ўскладзеных на іх задач у межах іх кампетэнцыі прадастаўляецца права:

ажыццяўляць аператыўна-вышуковую дзейнасць;

патрабаваць і атрымліваць ад арганізацый і грамадзян неабходныя звесткі і тлумачэнні, якія адносяцца да дзейнасці, што правяраецца, назначаць правядзенне інвентарызацый і праверак (рэвізій) фінансава-гаспадарчай дзейнасці, запатрабаваць і пры неабходнасці ва ўстаноўленым парадку канфіскоўваць дакументы, узоры сыравіны, паўфабрыкатаў і гатовай прадукцыі, апячатваць касы, памяшканні і месцы захоўвання дакументаў, грошай і таварна-матэрыяльных каштоўнасцей з вяртаннем ва ўстаноўленым парадку прычыненай шкоды;

заахвочваць грамадзян, якія паказалі сябе ў барацьбе са злачыннасцю і ахове грамадскага парадку. (Закон Рэспублікі Беларусь "Аб органах унутраных спраў Рэспублікі Беларусь")

У прыведзеным сказе актыўна выкарыстоўваюцца канструкцыі з інфінітывамі *ажыццяўляць, патрабаваць, атрымліваць, назначаць* і інш. Для гэтага сказа характэрна апорнае слова *права*, якое мае асноўную сэнсавую нагрузку, выступаючы своеасаблівым цэнтрам пералічэння.

У сувязі з пэўнай паслядоўнасцю і дакладнасцю развіцця думкі ў афіцыйных тэкстах ужываюцца складаныя сказы, у прыватнасці складаназалежныя:

Вучань, які навучаецца па індывідуальным вучэбным плане, лічыцца ў спісах вучняў агульнаадукацыйнай установы. У класным журнале ў графах аб наведванні вучнямі ўрокаў па вучэбных прадметах (прадмеце), якія ён вывучае самастойна, робіцца запіс – "навучаецца па індывідуальным вучэбным плане". ("Палажэнне аб агульнаадукацыйнай установе")

Сказы, ужытыя ў гэтым прыкладзе, складаназалежныя з даданымі азначальнымі часткамі.

Па ступені рэгламентацыі дакументы можна падзяліць на тры групы. Да першай адносяцца *пашпарт, дыплом, пасведчанне*, якія дакладна адпавядаюць прынятаму стандарту. У другую групу ўваходзяць такія дакументы, як *заява, квітанцыя, даверанасць, дагавор*. Яны не маюць строгай абавязковасці афармлення, як дакументы першай групы. Трэцяя група ўключае дакументы, у якіх моўныя сродкі і форма выкладу ў пэўнай ступені адвольныя. Напрыклад, такія дакументы, як *рэкамендацыя, характарыстыка, службовыя пісьмы партнёраў у вытворчасці*.

Афіцыйна-справавы стыль найбольш кансерватыўны сярод функцыянальных стыляў беларускай мовы. Гэта адносна замкнёная сістэма моўных сродкаў, якая абмяжоўваецца сферай афіцыйных зносін у грамадстве і выконвае функцыі паведамлення і ўздзеяння.

Тэарэтычная літаратура

Асновы культуры маўлення і стылістыкі / Пад рэд. У. В. Анічэнкі. – Мінск : Універсітэцкае, 1992. – С. 33 – 40.

Каўрус, А. А. Дакумент па-беларуску / А. А. Каўрус. – Мінск : Беларусь, 1994. – 160 с.

Каўрус, А. А. Стылістыка беларускай мовы / А. А. Каўрус. – Мінск : Нар. асвета, 1987. – С. 40 – 41.

Цікоцкі, М. Я. Стылістыка беларускай мовы / М. Я. Цікоцкі. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – С. 255 – 258.

Цікоцкі, М. Я. Стылістыка тэксту / М. Я. Цікоцкі. – Мінск : Бел. навука, 2002. – С. 178 – 183.

Юрэвіч, А. К. Стылістыка беларускай мовы / А. К. Юрэвіч. – Мінск : Выш. шк., 1992. – С. 98 – 101.

Стилистика и литературное редактирование / Под ред. проф. В. И. Максимова. – М. : Гардарики, 2004. – С. 82 – 98.

Стилистический энциклопедический словарь русского языка / Под ред. М. Н. Кожиной. – М. : Флинта : Наука, 2003. – С. 273 – 277.

ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАДАННІ

1. Выпішыце з прыведзеных словазлучэнняў канцылярызмы.

У мэтах забеспячэння, гарачы снег, адзначаны наступныя недахопы, любімыя мелодыі, рэальная рэчаіснасць, аказанне дапамогі, зацікаўленая размова, наглядныя факты, салодкі погляд, доўгачаканае спатканне, вывесці са складу, афармленне прыёму, аўтабіяграфія жыцця, змяніць сістэму аплаты кватэр, радасны боль, рознакаляровая восень, віртуальнае знаёмства, баланс інтарэсаў, служба харчавання, гуманітарная дапамога, на сённяшні дзень.

2. Выпраўце стылістычныя памылкі ў тэксце даверанасці.

Я, вучаніца 10 "А" класа Войцік Ірына, даверяю маёй найлепшай сяброўцы Максімовіч С. атрымаць мае грошы за жнівень месяц 2007 года.

3. Выпраўце лексічныя і стылістычныя памылкі ў тэксце характарыстыкі. Якімі яшчэ звесткамі можна яе дапоўніць?

Алена Сяргееўна Якімовіч на працягу ўсёй вучобы ў школе праявіла сябе здольнай і дысцыплінаванай вучаніцай. Асабліва ўдаваліся ёй дакладныя навукі, што пацвярджаецца актыўным удзелам Алены ва ўсіх алімпіядах па матэматыцы і фізіцы, на якіх яна часта перамагала, бо шмат працавала дадаткова і наведвала факультатывы, дзе таксама была адной з першых.

З аднакласнікамі ў Алены заўсёды складваліся добрыя адносіны. Належны адукаваны ўзровень, чуллівасць і шчырасць дазвалялі дзяўчыне хутка знаходзіць кантакт з аднакласнікамі і настаўнікамі. Яна ніколі не адмаўляла ў дапамозе.

4. Напішыце аб'яву пра вечарыну паэзіі, выкарыстоўваючы моўныя сродкі афіцыйнага стылю, і тэматычна такую ж аб'яву, але з пачуццём гумару.

5. У сваім артыкуле "Чары слова" Ян Скрыган прыводзіць прыклады сказаў мастацкага і публіцыстычнага стыляў з нематываваным ужываннем канцылярызмаў. Выпраўце стылістычныя памылкі ў гэтых сказах, запішыце свае варыянты, а пасля параўнайце з праўкамі Яна Скрыгана.

Ён перажываў, таму што сярод партызан доўга яму не было даверу. Яго правяралі доўга, ужывалі для гэтага розныя метады.

Многія з іх трымаюць намер паступіць у школу.

Жанчына павярнула на сцежку, відаць, мела намер прайсці нацянькі.

Калі немцам удасца хоць трошкі наблізіцца, адыход Мікалая стане зусім немагчымым.

"Знаёмцеся, наш сын", – прадставіў яго Сцяпан Раманавіч.

Праўкі Яна Скрыгана:

Ён перажываў, бо партызаны яму доўга не верылі... Яго правяралі ўсякімі спосабамі, як толькі маглі.

Многія з іх збіраюцца паступіць у школу.

Жанчына павярнула на сцежку, відаць, збіралася прайсці нацянькі.

Калі немцам удасца хоць трошкі наблізіцца, Мікалай аніяк не здолее (*або* не зможа) адступіць.

"Знаёмцеся, наш сын", – адрэкамендаваў яго Сцяпан Раманавіч.

6. Параўнайце і прааналізуйце два тэксты, у якіх ужыты канцылярызмы.

У паліклініцы.

– Здарова, Зойка, што ты тут робіш?

– Я – па пытанню зубоў.

Гэта не жартам: дзяўчына на кіруючай рабоце. (*Я. Брыль*)

Яўген Мітрафанавіч снедае. Жонка бядуе:

– У Эдзіка двойкі па матэматыцы і сачыненні. Позна ўвечары прыходзіць дамоў, бадзяецца недзе.

– Гм... Патрэбны захады.

– Якія ж?

– Скласці мерапрыемствы па ўзмацненні выхаваўчай работы ў сям'і.

Мар'я Пятроўна ўздыхае:

– У ванне цячэ.

– Значыць, патрэбны мерапрыемствы па рамонце, – кажа ён, пазвоньваючы лыжачкай у шклянцы.

– Ды проста тут: пакліч слесара.

Змоўчаў, выйшаў з кухні, апранае паліто. Незадаволена зірнуў на жонку:

– Гузік ледзь трымаецца. Калі ж прышыеш?

– А ты наконт гэтага, – усміхнулася яна, – яшчэ не склаў мерапрыемства?

Скасавурыўся, падаўся на вуліцу.

Сняжок рыпіць пад нагамі. Мароз, здаецца, падхоплівае пад пахі, нясе. Настрой паэтычны стварае зімачка-зіма.

Яўген Мітрафанавіч на момант прыпыніўся, крэкнуў. Цюкнула ў галаву: "Хораша вакол, а мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да зімы няма. Зараз жа вазьмуся...", і ён пакрочыў хутчэй.

У кабінеце на паўсцяны – папкі са справамі аб ахове прыроды. Дастаў з паліцы адну: "Як папярэдзіць забруджванне навакольнага асяроддзя". Пагартаў акуратна падшытыя і пранумараваныя паперы, зірнуў у акно. А над заводскай трубой матляецца вялізны чорны хвост... Паклаў на месца папку. Сеў за стол. У галаве ўжо роіліся мерапрыемствы. Засталося толькі запісаць па парадку: "Узняць пытанне... завастрыць... паставіць рубам..." На нейкую хвілю заплюшчыў вочы і ўявіў: робіцца ўсё – нібы па шчупаковым загадзе.

Пашкроб за вухам самапіскай і пачаў корпацца ў паперах. (*Р. Бохан*)

Пры аналізе мініяцюры Янкі Брыля неабходна адзначыць стылістычны кантраст у маўленні размоўцаў. Пытанне ўключае моўныя формы гутарковага стылю *(здарова, Зойка)*, а ў адказе нематывавана выкарыстаны канцылярызм *па пытанню*. Стылістычна апраўда-

Віншуем!

ШЧОДРАСЦЬ ЯЕ ДУШЫ

ДА ЮБІЛЕЮ КЛАРЫ ПАНЮЦІЧ



70

Нарадзілася Клара Макараўна Панюціч 16 студзеня 1938 г. у вёсцы Арэхаўна Ушацкага раёна ў настаўніцкай сям'і. Пасля заканчэння Арэхаўскай сямігодкі вучылася ў Полацкім педагагічным вучылішчы, потым – на гісторыка-філалагічным факультэце Мінскага педінстытута. Прага да глыбокага спазнання таямніц роднага слова прывяла студэнтку ў дыялекталагічны гурток. З тых даследаванняў пачалася ўдумлівая навуковая праца, якая захапляла і падчас настаўніцкай дзейнасці ў Пятровіцкай сярэдняй школе Смалявіцкага раёна, і падчас вучобы ў аспірантуры пры кафедры беларускага мовазнаўства Мінскага педінстытута. На аснове вывучэння народных гаворак Ушаччыны пад кіраўніцтвам прафесара Фёдара Міхайлавіча Янкоўскага была напісана і абаронена кандыдацкая дысертацыя. А ў 1976 г. выйшла манаграфія К. Панюціч "Лексіка народных гаворак".

У спісе публікацый Клары Панюціч – больш за 100 назваў: дапаможнікі, метадычныя выданні, навуковыя артыкулы, рэцэнзіі, праграмы. Яна – сааўтар шматлікіх дапаможнікаў для настаўнікаў і студэнтаў-філолагаў: "Практыкум па беларускай мове", "Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія", "Сучасная беларуская літаратурная мова: Лексікалогія, фанетыка, арфаграфія", "Курсавыя працы па беларуская мове" і інш. Удзельніца збору матэрыялаў для "Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак" (т. 1 – 5), Клара Макараўна і цяпер актыўна распрацоўвае кафедральную тэму "Лексіка беларускіх народных гаворак: Слоўнік гаворак Случчыны".

Намеснік дэкана па навуковай працы на факультэце, член Савета факультэта беларускай філалогіі і культуры і Спецыялізаванага савета па абароне кандыдацкіх дысертацый, член бюро Рэспубліканскага метадычнага аб'яднання выкладчыкаў лінгвістычных дысцыплін ВНУ – Клара Макараўна ўсюды паспявала. Многія настаўнікі-філолагі ведаюць К. Панюціч як адказную за выпуск факультэцкіх газет, нязменнага куратара, уважлівага і патрабавальнага метадыста. Пад яе кіраўніцтвам было напісана больш за чатыры дзесяткі студэнцкіх навуковых даследаванняў, якія атрымалі высокую ацэнку на рэспубліканскіх конкурсах.

Выкладчык высокай кваліфікацыі, К.М.Панюціч за сваю плённую педагагічную працу ўзнагароджана Ганаровай граматай Міністэрства асветы БССР, Граматай Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, а таксама Ганаровымі граматамі рэктарата і прафсаюзнай арганізацыі педагагічнага універсітэта.

У студзені Клара Макараўна адгорне яшчэ адну старонку свайго нястомнага жыцця. Няхай жа будзе яно па-вясноваму цёплым і сонечным!

Таццяна СТАРАСЦЕНКА.

ным будзе, напрыклад, такі адказ: *"Лячу зубы"*. У гумарэсцы Р. Бохана "Мерапрыемствы" выкарыстанне канцылярызмаў стварае адпаведны вобраз "чалавека пры пасадзе", які нават у размоўна-бытавым маўленні не забываецца на звыклыя для яго выразы *скласці мерапрыемствы па ўзмацненні выхаваўчай работы, патрэбны мерапрыемствы па рамонце* і інш. На іх фоне вылучаюцца размоўныя адзінкі *крэкнуў, цюкнула, пашкроб, корпацца*, ужытыя для ўзмацнення сатырычнага вобраза.

7. Прааналізуйце лексічныя, марфалагічныя і сінтаксічныя асаблівасці афіцыйна-справавога тэксту.

Артыкул 5. Права на адукацыю

Усе жыхары Рэспублікі Беларусь (уключаючы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі рэспублікі) маюць права на роўныя магчымасці доступу да нацыянальнай сістэмы адукацыі.

Права грамадзян на адукацыю забяспечваецца:

стварэннем умоў для атрымання агульнай і прафесіянальнай адукацыі з улікам нацыянальных традыцый, індывідуальных патрэбнасцей і здольнасцей;

развіццём дзяржаўных і іншых навучальных устаноў разнастайных відаў і формаў навучання;

бясплатным навучаннем у дзяржаўных базавых школах (у межах вызначанага тэрміну навучання), а таксама ў іншых дзяржаўных навучальных установах для асоб, якія вытрымалі конкурс і паспяхова выконваюць устаноўленыя патрабаванні да ўзроўню адукацыі, ці тых, хто карыстаецца прадугледжанымі заканадаўствам Рэспублікі Беларусь ільготамі. (*Закон Рэспублікі Беларусь "Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь"*)

Адказы на практычныя заданні будуць змешчаны ў № 2.

ПРЭМ'ЕРА РУБРЫКІ "КІРУНАК СКАЗАЎ"

Прапануем ўвазе чытача новую рубрыку, у якой на працягу года будуць друкавацца матэрыялы, прысвечаныя адметнасці беларускага сінтаксісу ў агульнаславянскім кантэксце.

Сяргей ВАЖНІК

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ СІНТАКСІЧНАЯ ІДЫЯМАТЫКА

Уласцівы кожнай мове свой уласны кірунак сказаў.
Кузьма Чорны.

Кожная мова мае ў сваім арсенале спецыфічныя, толькі ёй уласцівыя звароты, словаспалучэнні, мадэлі. Параўнаем, напрыклад, беларускія і рускія адметныя канструкцыі:

Памажы Божа! – Бог в помощь!; Бывайце здаровы! – До свидания!; матчына мова – родной язык; прагнаць першы голад – заморить червяка; ісці напярэймы – идти навстречу; як мае быць – как следует; бярэцца на мароз – начинает морозить; ісці ў свет за вачыма – идти в свет, куда глаза глядят; пайшоў як мыла з'еўшы – пошел несолоно хлебавши; прагаяць смагу – утолять жажду; як той казаў – так сказать; паліць у печы – топить печь; біць дровы – колоть дрова і інш.

Як бачым, такія канструкцыі нельга перакласці літаральна з адной мовы на другую. Трэба прыводзіць прамыя адпаведнікі ў розных мовах. У адваротным выпадку мова траціць нацыянальны каларыт і становіцца збедненай, бляклай і невыразнай. Ігнараванне ж гэтай умовы вядзе да калькавання, якое, у сваю чаргу, разбурае граматычную і вобразную сістэму мовы. Вось прыклады калькаваных беларускіх этыкетных формул: **З наступаючым!; *З надыходзячым!; *Як справы?; *Прыемнага апетыту!*

Такія адметныя нацыянальна маркіраваныя канструкцыі суадносяцца ў спецыяльнай літаратуры з паняццем **нацыянальнай сінтаксічнай ідыяматыкі**, якое ўведзена ў навуковы ўжытак А. Я. Міхневічам[1].

Аб'ём нацыянальнай сінтаксічнай ідыяматыкі (далей – НСІ).

НСІ ахоплівае:

1) свабодныя словаспалучэнні (параўн.: беларуск. *смяяцца з каго-небудзь* – руск. *смеяться над кем-либо* – польск. *śmiać się z kogoś* і *śmiać się do kogoś*);

2) фразеалогію ў шырокім разуменні:

2.1) фразеалагізмы і ўстойлівыя спалучэнні (*верзці грушы на вярбе; снегу на Каляды не дапросішся; як божы дзень*);

2.2) прыказкі, прымаўкі (*пераначуем – болей пачуем; ціхая свіння глыбака рые; знай каток свой куток; дурны законаў не чытае, ды свае мае*);

2.3) перыфразы (*краіна тысячы азёр; беларускае мора; нябесны ўладар; гоман векавога бору*);

2.4) крылатыя выразы, афарызмы (*А хто там ідзе?; Людзьмі звацца; Няма таго, што раньш было; Выбачайце, калі ласка*);

3) этыкетныя формулы (*Як маешся?; Сыць, Божа!; Смачна есці!; Дабрыдзень!*);

4) прэцэдэнтныя тэксты (анекдоты, песні, рэклама, творы мастацкай літаратуры, публіцыстыка) – тэксты, добра знаёмыя ўсім носьбітам пэўнай мовы, нацыянальна маркіраваныя і культурна значныя, звязаныя з трансляцыяй культуры таго ці іншага народа. Гэтая асаблівасць дазваляе носьбітам пэўных моў пастаянна звяртацца да прэцэдэнтных тэкстаў, выказванняў і імёнаў у працэсе камунікацыі. Вельмі часта яны замацаваны за пэўным культурна-гістарычным кантэкстам, які адразу ж узнаўляецца пры іх выкарыстанні;

5) выпадкі сацыякультурнай спалучальнасці, якія вельмі часта маюць безэквівалентны, неперакладальны характар, бо адлюстроўваюць спецыфіку сацыяльнага і культурнага жыцця таго ці іншага народа.

Так, вядомы польскі вучоны Вітольд Дарашэўскі[2] параўноўваў "літаральныя" польскія і рускія адпаведнікі *szary wilk* і *серый волк.* Аднак гэтыя словаспалучэнні ў паляка і рускага выклікаюць розны стылістычны эфект, розныя перажыванні, бо маюць за сабой розныя культурныя традыцыі. Семантыка рускага *серый волк* непарыўна звязана з кантэкстам, з культурным фонам рускіх народных казак, чаго нельга зазначыць у дачыненні да польскага "адпаведніка" *szary wilk.* Таму для паляка гэта ўсяго толькі назва драпежнай жывёлы.

Тое ж бачым і ў выпадку руск. *добрый молодец* (легендарны герой рускіх былін) і польск. *dobrzy chłopcy* (назва разбойнікаў у гуральскіх паданнях).

Прыгадаем таксама некаторыя польска-беларускія і беларуска-рускія паралелі.

У мове польскіх падлеткаў ёсць ласкавыя формы звароту хлопца да дзяўчыны і дзяўчыны да хлопца: *Żabka ty moja!; Robaczek ty mój!* У польскай мове гэтыя этыкетныя формулы маюць станоўчую канатацыю. Іх беларускія адпаведнікі (*Жабка ты мая!; Чарвячок ты мой!*) успрымаюцца як абразлівыя, пагардлівыя, бо ў нас няма адпаведнай сацыякультурнай традыцыі. Тое ж і з рускімі адпаведнікамі, нягледзячы на тое, што іс-

ную кантэкст рускай народнай казкі і вобраз *“царевны-лягушки”*.

Падобныя ласкавыя формы звароту ёсць і ў беларускай мове, напрыклад прыгожы вобразна-паэтычны зварот да дзяўчыны: *Журавінач-ка ты мая!* Яго літаральны рускі адпаведнік (*Клюквочка ты моя!*) успрымаецца “з кіслінкай” (са знакам “мінус”), бо за ім не прасочваецца пэўнага метафарычнага кантэксту.

Як бачым, НСІ найбольш выразна выяўляецца пры супастаўленні розных моў. Якраз праз супастаўляльны аналіз, накіраваны на знаходжанне як падабенстваў, так і адрозненняў (кантрастаў), выяўляецца адметнасць і непаўторнасць спосабаў і сродкаў выражэння думак, эмоцый і пачуццяў моўцы, бо *“ўласцівы кожнай мове свой уласны кірунак сказаў”* (К. Чорны). У гэтым плане адрозніваюцца нават такія блізкароднасныя мовы, як беларуская і руская, беларуская і польская, сінтаксічныя мадэлі якіх у значнай ступені супадаюць.

Апошнім часам дастаткова часта мы можам пачуць меркаванне адносна таго, што сінтаксіс беларускай і рускай моў – з’явы тоесныя. Нават студэнты, якія добра гавораць па-беларуску, не бачаць тут істотнай розніцы. Асабліва востра праблема адметнасці сінтаксісу беларускай мовы стаіць у актуальнай сітуацыі руска-беларускай інтэрферэнцыі. Калі чалавек, гаворачы па-беларуску, “моўна думае па-расійску” (К. Чорны), ужываючы ў асноўным калькаваныя канструкцыі тыпу *справа майстра баіцца*, то няма нічога дзіўнага ў такім меркаванні. Настаўніку ў сувязі з гэтым трэба дбаць сёння не толькі пра багаты лексічны запас нашых вучняў і студэнтаў, але і пра ўзбагачэнне іх сінтаксічнага арсеналу.

Калі ж нам бракуе адметнасці і непаўторнасці беларускага сінтаксісу ў паўсядзённым маўленні, трэба звяртацца да багатай на канструкцыі і інтанацыі народнай мовы – да багацця народна-паэтычнага сінтаксісу. Або да гісторыі – да моўнай практыкі 20 – 30-х гг. XX ст., бо лепшы спосаб узбагачэння мовы – гэта аднаўленне раней накопленых, а потым забытых ці страчаных багацця.



Сяргей Аляксандравіч Важнік *– мовазнаўца. Кандыдат філалагічных навук, дацэнт. Закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт (1996). З 1996 г. выкладае беларускую мову ў профільных (філалагічных) класах Ліцэя БДУ. Дацэнт кафедры сучаснай беларускай мовы, намеснік дэкана філалагічнага факультэта БДУ.*

Відавочна, у нашай мовы свой адметны граматычны склад, свае непаўторныя спосабы будаваць сказы. Гэта лепей адчуваюць Майстры Слова. Так, Ніл Гілевіч адзначыў аднойчы, што *“пагоду робіць сінтаксіс. Будова сказа. Цячэнне слоў. Музыка фразы. Тое, у чым дух мовы. Яе глыбінная сутнасць. Яе мысліцельная прырода”*.

У сваім адкрытым лісце да Кандрата Крапівы Максім Лужанін, змагаючыся за “беларускасць” беларускай мовы, пісаў: *“Мова – гоман векавога бору, злітны і адзіны, аднак кожнае слова, як і кожнае дрэва, мае свой голас і пошум, колер і смак, свой выгляд і лад. Тут заўсёды цёпла і ўцешна, ёсць на што глянуць, што паслухаць, сюды заўсёды горнецца сэрца. А вось у гай тэлеграфных слупоў – усе абструганыя, усе чыста роўныя, усе на адзін капыл, – у такі гай, выстраены ў некаторых слоўніках, не цягне: з іх не пачуеш мовы жывой, трапяткой, гістарычна асэнсаванай”*.

Такім чынам, калі мова – душа народа, то сінтаксіс – яго гімнавая песня ці паэзія “чыстае красы”, якую трэба навучыцца слухаць, разумець, пазнаваць сярод іншых, каб умець адрозніваць “векавы бор” ад “гаю тэлеграфных слупоў”.

---

[1] **Міхневіч, А. Я.** Сінтаксіс / А. Я. Міхневіч // Беларуская мова : Энцыклапедыя / пад рэд. А. Я. Міхневіча. – Мінск, 1994. – С. 486.

[2] **Doroszewski, W.** O idiomatyczności języków / W. Doroszewski // Doroszewski W. Język Myślenie. Działanie : Rosważania językoznawcy. – Warsawa, 1982. – S. 130 – 148.

Паслухаем мовазнаўцаў

ДЫК “У ЧЫМ СПРАВА”?

Няправільная стылістычная ацэнка ўстойлівых словазлучэнняў, выкарыстанне фразеалогіі, неўласцівай беларускай мове, выклікаюць грубыя стылістычныя памылкі. Характэрны прыклад прыводзіць для пацверджання гэтай думкі К. Чорны. У п’есе “Каля тэрасы”, якую ставіў у свой час Другі беларускі тэатр, была такая сцэна: бяжыць сялянка і крычыць: “У чым справа?” «Няўжо гэта крычыць сялянка? Не, гэта крычыць сам аўтар п’есы. Ён думаў: “В чем дело?” і пісаў: “У чым справа?” Дзе гэта аўтар чуў, каб сялянка гаварыла гэтак? Таму і чуецца тут фальш, таму і траціцца вобраз ці тып сялянкі!.. Сялянка пачула нейкую незвычайную гаворку, нейкі крык, убачыла незнаёмых людзей, устрывожылася, і замест “што гэта робіцца?” або “што там гэта?” крычыць “у чым справа?” Няхай бы ўжо, нечага, яна, каб вытрымаць стыль аўтара гэтае п’есы, крычала: “У чым справа? У мэтах рацыяналізацыі часу і адносна гэтага месца, безумоўна, немэтазгодна паднімаць тут гэтакі вэрхал”» (Узвышша. 1928. № 5. С. 179, 180).

Няправільны, штучны пераклад рускіх фразеалагізмаў на беларускую мову – нярэдкая з’ява, асабліва ў газетах. У адной карэспандэнцыі чытаем: *То і справа адчыняюцца дзверы бібліятэкі.* Аўтар пісаў па-беларуску, а думаў па-руску і пераклаў літаральна рускі выраз *то и дело* на беларускую мову, не ведаючы, што фразеалагізма *то і справа* ў беларускай мове няма. Каб захаваць сэнс выказвання, трэба было ўжыць адпаведнае слова-сінонім або спецыфічна беларускі фразеалагічны эквівалент, напрыклад: *бесперапынна* або *раз-пораз*.

Паводле дапаможніка Міхася Цікоцкага
“Стылістыка беларускай мовы” (Мінск, 1995, с. 96).

З вопыту настаўніка

Наталля ФІЛІМОНАВА

ПАДАРОЖЖА ПА КРАІНЕ ЛЕКСІКА

УРОК-ПАДАГУЛЬНЕННЕ (З ВЫКАРЫСТАННЕМ ЭЛЕМЕНТАЎ ГУЛЬНЁВАЙ ТЭХНАЛОГІІ). V клас

Мэты: выпрацоўваць у вучняў асэнсаваны падыход да выбару лексічных сродкаў і іх ужывання, абагульняць і замацоўваць веды па тэме "Лексіка"; развіваць уменне будаваць правільныя, дакладныя, поўныя адказы, садзейнічаць развіццю творчых здольнасцей вучняў; прывіваць любоў да беларускага слова, выхоўваць культуру маўлення.

Эпіграф:

Я гэта люблю падарожжа,
З якім і зраўняцца не можа
Вандроўка ў любыя Таўрыды –
У казачныя краявіды.

А гэта вандроўка праз сёлы,
Праз край мой шырокі, вясёлы,
Бясконцыя нівы, дубровы –
Ў маю беларускую мову.

У родную мову, якая
Усімі вясёлкамі ззяе,
Смалістымі пахне лясамі,
Жывымі звініць галасамі.

О, колькі яшчэ не адкрыта
Адценняў у ёй і блакіту,
Патрэбных народу, паэтам,
Каштоўнай руды, самацветаў!

Максім Танк.

ХОД УРОКА

I. Арганізацыйны момант.

II. Работа над тэмай урока.

• Уступнае слова настаўніка.

– Некалькі ўрокаў мы з вамі падарожнічалі па краіне Лексіка. Сёння завяршаем нашу вандроўку. З якімі ведамі пра гэтую краіну, з якімі ўражаннямі вы выйдзеце на канцавой станцыі нашага падарожжа, пакажа сённяшні ўрок.

Многія з вас, вандруючы па краявідах Лексікі, паспрабавалі сябе ў ролі журналістаў. І цяпер свой рэпартаж прадставіць першая група вучняў.

• 1-я група вучняў прадстаўляе рэпартаж пра мястэчка Дыялектнае.

Журналіст 1-ы. Мы шмат дзе былі. І як прыемна было чуць усюды беларускае слова. Усе разумелі нас, і мы ўсіх разумелі.

Журналіст 2-і. Але аднойчы мы трапілі на кірмаш у мястэчка Дыялектнае. А на тым кірмашы народу сабралася – мора. Мабыць, з усіх навакольных вёсак людзі паз'язджаліся.

Журналіст 1-ы. Падышлі мы да аднаго прылаўка, дзе гандлявалі ***венікамі***, і сталі сведкамі, як спрачаліся гандлярка і пакупнік.

Пакупнік 1-ы. *Пачым твае **карачуны**, гаспадыня?*

Гандлярка. *Ты што, з глузду з'ехаў? Якія гэта табе **карачуны**? Ці не бачыш, што тут **драпачы** адны ляжаць?*

Пакупнік 1-ы. *Што ты такое гаворыш? Пратры вочы. Я ж бачу, што гэта **карачуны**.*

Журналіст 2-і. А мы стаялі, пераглядаліся ды пацiскалі плячыма: пра што гэтыя людзі размову вядуць? Ці ў сваім яны розуме?

Журналіст 1-ы. ***Карачуны***, ***драпачы***… Мы ж на свае вочы бачым: ляжаць на прылаўку ***венікі***.

Пакупнік 2-і. *Колькі вашы **галякі** каштуюць?*

Гандлярка. *Ну ты паглядзі! Ці на гэтым кірмашы ўсе звар'яцелі? **Карачуны**, **галякі**… Я ж **дра-па-ча-мі** гандлюю.*

Журналіст 2-і. Мы зусім разгубіліся. Добра, падышоў малады чалавек інтэлігентнага выгляду, у акулярах. Разумны, відаць.

Вучоны. *Добры дзень, шаноўныя. Дарэмна спрачаецеся. Гаворыце вы пра адно і тое ж, толькі рознымі словамі, якія ўжываюцца ў гаворках людзей вашых вёсак. Па-навуковаму такія словы называюцца дыялектнымі.*

Гандлярка. *Дзякуй, чалавеча, што рассудзіў нас. А адкуль жа ты гэта ведаеш?*

Вучоны. *Я вучоны. Мовавед. Займаюся дыялекталогіяй. Гэта такі раздзел навукі аб мове, у якім вывучаюцца дыялектныя словы.*

• Пасля прадстаўлення першай групы вучняў настаўнік задае некалькі пытанняў:

– Чаму гандлярка і пакупнік не зразумелі адно аднаго?

– Якія ж словы называюцца дыялектнымі?

– У тэкстах якога стылю могуць выкарыстоўвацца дыялектныя словы?

• 2-я група вучняў прадстаўляе інтэрв'ю з жыхаром горада Прафесіянал.

Журналіст 1-ы. Мы знялі цікавы рэпартаж у горадзе, які мае незвычайную назву – Прафесіянал.

Журналіст 2-і. Нездарма ён так называецца. Там жывуць людзі розных прафесій. І кожны чалавек імкнецца дасягнуць найвышэйшага майстэрства ў пэўнай справе.

Журналіст 1-ы. А цяпер вашай увазе будзе прапанаваны запіс інтэрв'ю з чалавекам, які з'яўляецца прафесіяналам у такім відзе спорту, як футбол.

Журналіст 1-ы. *Добры дзень.*

Футбаліст. *Добры дзень.*

Журналіст 1-ы. *Толькі што скончыўся футбольны матч, у якім ваша каманда атрымала перамогу з лікам 3:1. Якія вашы адчуванні?*

Футбаліст. *Я вельмі задаволены.*



Наталля Васілеўна Філімонава *– настаўніца беларускай мовы і літаратуры гімназіі бізнесу і права № 51 г. Гомеля. Закончыла філалагічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны (2003) і аспірантуру пры ім. Пераможца раённага этапу абласнога конкурсу "Маладыя настаўнік года" (2007).*

Журналіст 2-і. *Скажыце, каму з ігракоў каманда абавязана перамогай?*

Футбаліст. *Усе стараліся і добра гулялі. Але наш* ***галкіпер*** *быў на вышыні. Ён прапусціў толькі адзін* ***гол****, нягледзячы на моцную атаку варотаў на працягу ўсёй гульні. Таксама хочацца адзначыць нашага* ***форварда****, які вельмі дакладна* ***пасаваў****. Дарэчы, ён забіў першы гол у вароты саперніка.*

Журналіст 2-і. *Ці быў падчас гульні такі момант, калі перад камандай узнікла пагроза паражэння?*

Футбаліст. *Мы былі амаль упэўнены ў перамозе, таму што сур'ёзна і адказна трэніраваліся, але давялося пахвалявацца падчас* ***пенальці****. У канцы другога* ***тайма****, нягледзячы на стомленасць абедзвюх каманд, мы адчулі моцны* ***прэсінг*** *з боку сапернікаў. Але мы вытрымалі ўсе цяжкасці і выйшлі пераможцамі.*

Журналіст 2-і. *Дзякуй. І віншуем вашу каманду з перамогай.*

Футбаліст. *Дзякуй.*

Журналіст 1-ы. *Шчасліва заставацца.*

Футбаліст. *Да пабачэння.*

• Настаўнік задае вучням некалькі пытанняў.

– Ці ўсе словы, сказаныя спартсменам, зразумелыя вам?

– Значэння якіх слоў вы не ведаеце?

– Чаму менавіта гэтыя словы вы не разумееце?

• Слова настаўніка аб правілах гульні.

Вы працуеце ў групах, аднак ацэньвацца будзе работа кожнага члена каманды, улічвацца актыўнасць кожнага з вас на працягу ўсяго ўрока. Каманды будуць атрымліваць заданні, якія патрабуюць самастойнай работы кожнага з вас, але агучвацца будзе толькі лепшы варыянт выканання. У канцы ўрока вы здасце аркушы, на якіх выконвалі пісьмовыя заданні. Пры выстаўленні адзнак за ўрок будзе ўлічвацца і ваша актыўнасць падчас гульні, і якасць выканання пісьмовых работ. Члены каманды-пераможцы атрымаюць адзнаку, вышэйшую на 1 бал.

• Складанне дыялога з выкарыстаннем прафесіяналізмаў.

Вучні кожнай каманды працуюць у парах. Настаўнік прапануе камандам скласці дыялог паміж людзьмі пэўнай прафесіі. Кожная пара атрымлівае картку з назвай прафесіі і апорнымі словамі.

Музыканты – сальфеджыо, ноты, скрыпка, смычок.

Мастакі – фарбы, фон, пейзаж, колер.

Лётчыкі – рэйс, пілот, прапелер, пасадачная паласа.

Медсёстры – шпрыц, таблеткі, тэмпература, градуснік.

Вучні працуюць 5 хвілін. Пасля гэтага на працягу 2 хвілін абмяркоўваюць вынікі работы кожнай пары. Вучні вырашаюць, чый дыялог лепшы. Рашаючае слова належыць капітану каманды. Потым зачытваюцца лепшыя, на думку вучняў, дыялогі.

Настаўнік ацэньвае работу вучняў і фіксуе на дошцы колькасць балаў, атрыманых кожнай камандай за гэтае заданне.

• 3-я група вучняў прадстаўляе рэпартаж пра горад Жаргонія.

Журналіст 1-ы. Паважаныя калегі, мы атрымалі задавальненне, слухаючы вашыя рэпартажы. Нам жа не пашанцавала: мы трапілі ў горад Жаргонія, дзе пачулі шмат непрыгожых і непрыемных слоў.

Журналіст 2-і. У жыхароў гэтага горада замест твараў – рэпы, рахі, рылы.

Журналіст 1-ы. Замест вачэй – бельмы, лупікі, зенкі.

Журналіст 2-і. А на месцы рота – хавала, хлябала, зяпа.

Журналіст 1-ы. Я згодна з выказваннем Віктара Краснея: "Ужыванне жарганізмаў, вульгарных слоў сведчыць пра нізкую культуру, таму неабходна пазбягаць іх выкарыстання".

Журналіст 2-і. Думка Леаніда Бурака сугучная з папярэдняй: "Ужыванне жаргоннай лексікі не ўзбагачае мову, а засмечвае яе".

• Настаўнік задае вучням пытанні.

– Ці лічыце вы неабходным выкарыстоўваць у сваім маўленні жаргонныя словы?

– Ці залежаць унутраныя якасці чалавека ад таго, якімі словамі ён карыстаецца пры размове з іншымі людзьмі? Чаму вы так думаеце?

• Работа па картках.

Настаўнік паведамляе, што некаторыя вучні, якія адправіліся ў экспедыцыю па краіне Лексіка, не паспелі вярнуцца. Аднак журналісты, што наведалі абласны цэнтр Антонім, даслалі канверты з вершамі беларускіх паэтаў.

Кожная каманда атрымлівае картку з вершам.

Заданне: прачытайце верш, адкажыце на пытанне: "Што аўтар дадзеных радкоў хацеў сказаць чытачам?" Пасля абмену думкамі вырашыце, хто з членаў каманды выразна прачытае верш і адкажа на пастаўленае пытанне. На абмеркаванне адводзіцца 3 хвіліны. Пры падвядзенні вынікаў улічваецца выразнасць чытання верша, дакладнасць і паўната адказу на пытанне.

Над намі словы ўладараць.
Мы чуем і гаворым іх.
Яны то здружаць, то пасвараць
Сяброў і ворагаў маіх.
Ад слова сэрца халадзее,
Праходзіць сон і забыццё,
Ад слова рушацца надзеі,
Ад слова свеціцца жыццё.
Ад слова вырастаюць крылы,

А ў сэрцы стукае любоў,
Ад слова прыбываюць сілы,
Дык не шкадуйце шчырых слоў!
Сяргей Грахоўскі. Словы.

Паўзіце, словы, ад мяне:
Халодныя,
Ілжывыя;
Паўзіце, слізкія,
Вы не патрэбны!
Не патрэбны!

Прыйдзіце, словы, да мяне:
Прачулыя,
Ласкавыя;
Прыйдзіце, шчырыя,
Вы так патрэбны!
Так патрэбны!

Прыйдзіце, словы:
Мужныя,
Надзейныя,
Праўдзівыя.
Вы так патрэбны!
Так патрэбны!
Сяргей Дзяргай. Словы.

Гэтай ісціне веру даўно,
І яна для мяне, як замова:
У людзей ёсць багацце адно –
Чалавечае, добрае слова.

Слова злое заўсёды было
Для варожасці першаасновай.
Свет скрозь цемру дзікунства вяло
Да святла толькі добрае слова.
Сяргей Законнікаў. Добрае слова.

Сярод слоў, як сярод лясоў,
Як сярод шумлівых дуброваў,
Заўважаю я зноў і зноў
Адзіноту пяшчотнага слова.
Слоў суровых узводзім муры,
Слоў калючых адточваем шпагі,
На пяшчотнае ж слова, сябры,
Не заўжды нам хапае адвагі.
Леанід Дайнека. “Сярод слоў, як сярод лясоў…”.

Пасля падвядзення вынікаў настаўнік задае пытанне ўсяму класу:

– Чаму менавіта гэтыя вершы даслалі нам карэспандэнты з горада Антонім?

• Конкурс капітанаў.

Капітанам даецца 4 карткі з вершамі, аналіз якіх адбываўся папярэдне, прапануецца знайсці ў вершах антонімы.

На заданне адводзіцца 4 хвіліны. Перамагае той, хто знойдзе большую колькасць антанімічных пар. Калі капітаны назавуць знойдзеныя імі пары, каманды маюць права па чарзе агучыць тую антанімічную пару, якая яшчэ не называлася.

• Гульня “Знайдзі пару”.

Уступнае слова вучня, які пабываў у горадзе Сінонім.

– Я пабываў у горадзе Сінонім. Там жывуць ветлівыя і гасцінныя, добрыя і шчырыя людзі. Усе яны розныя, але аб’ядноўвае іх цікавасць да гульні “Знайдзі пару”.

Вучань раздае ўсім удзельнікам гульні (кожнаму члену каманды) карткі, на кожнай з якіх запісана слова. Сабе ён пакідае карткі са словамі, сінанімічнымі да тых, што запісаны на раздадзеных картках.

Вучань, які праводзіць гульню, выцягвае па адной картцы і агучвае слова, запісанае на ёй. Кожнаму члену каманды трэба быць уважлівым і хутка зрэагаваць, назваўшы сваё слова, калі яно з’яўляецца сінонімам да толькі што пачутага.

Праца – работа	*Побач – блізка*
Пяшчотны – ласкавы	*Салдат – баец*
Вярнуць – аддаць	*Бяда – гора*
Аб’явіць – паведаміць	*Голасна – гучна*
Спакой – цішыня	*Лётчык – пілот*
Сяброўства – дружба	*Адзенне – вопратка*
Урач – доктар	*Кусок – кавалак*
Лянівец – гультай	*Смеласць – адвага*
Сумна – маркотна	*Выпадак – здарэнне*
Адзінока – самотна	*Прыгажуня – красуня*
Настойліва – упарта	*Размова – гаворка*
Назва – загаловак	*Школьнік – вучань*
Нямнога – мала	*Весела – радасна*
Тайна – сакрэт	*Поезд – цягнік*

• Рэпартаж пра населеныя пункты Адназначнае, Амонім, Мнагазначнае.

Рэпартаж запісаны на магнітафонную стужку, якую даслалі на ўрок вучні, што таксама не паспелі вярнуцца з падарожжа.

Рэпартаж перарываецца пытаннямі настаўніка і заданнямі.

Голас журналіста 1-га. Мы праязджалі гарады, пасёлкі. Аднойчы трапілі ў глухую вёсачку пад назвай Адназначнае. Не вельмі цікава там. Пачуеш слова, другое – бедна гаворыць народ.

Голас журналіста 2-га. І весялей нам стала на станцыі, па адзін бок ад якой размясціўся гарадок Амонім, а па другі – сяло Мнагазначнае.

Настаўнік. Чаму журналістам было сумна ў вёсцы Адназначнае і чаму яны павесялелі ў гарадку Амоніме і сяле Мнагазначным?

Голас журналіста 3-га. У горадзе Амоніме людзі вельмі падобныя знешне, але кожны з іх мае свае адметныя якасці.

Настаўнік. Чаму менавіта ў гэтым горадзе жывуць людзі, падобныя знешне, але розныя па сваіх унутраных якасцях?

Голас журналіста 1-га. Жыхары горада Амоніма вельмі любяць загадваць загадкі. І мы прапануем вам адгадаць некаторыя з іх.

• Адгадай загадку.

Вучням загадваюцца загадкі. Адгадкамі з’яўляюцца словы-амонімы. Трэба не толькі адгадаць загадкі, але і назваць значэнні слоў-амонімаў.

1. Адно жывёле будзе ежай
Зімой на ферме ці ў хляве.

Другая ў горадзе замежным
Спакойнай рэчкаю плыве.

2. Ён прыйшоў уночы,
Мне заплюшчыў вочы.
І на крылах бы панёс
У краіну ўсіх дзівос.
На паляначцы лясной
Паказаў мне ўлетку
І назваў сабой
Прыгажуню-кветку.

3. Слынная дама
У спорце адна,
Ходзіць па клетках
Заўсёды яна.
Лютай калісьці
Другая была.
З бітвы ў музеі
Даўно перайшла.

4. Цвіту ўсё лета я,
Жыву звычайна ў жыце.
Нашу хлапечае імя.
Як званць мяне, скажыце.

• **Дакажы: амонім ці мнагазначнае слова.**

Незалежна ад таго, якая каманда дала больш правільных адказаў пры выкананні папярэдняга задання, адгадкі-амонімы размяркоўваюцца наступным чынам: па адной адгадцы на кожную каманду. Вучні павінны даказаць, што гэтыя словы сапраўды з'яўляюцца амонімамі, а не мнагазначнымі словамі. Заданне выконваецца пісьмова. Прадстаўнікі каманд "абараняюць" свае адказы.

Голас журналіста 2-га. У сяле Мнагазначным жывуць людзі, якія вельмі любяць пераапранацца некалькі разоў на дзень.

Настаўнік. Чаму менавіта ў сяле Мнагазначным жывуць такія людзі?

Голас журналіста 3-га. Дасылаем вам верш "Хто як ідзе". А вы паспрабуйце вызначыць усе значэнні дзеяслова *ісці*.

ХТО ЯК ІДЗЕ

Падарожнік ідзе
(Шмат дарог ён прайшоў),
І ***машына ідзе***
З поўным кузавам дроў.
А ***дарога ідзе***
То праз лес, то праз поле.
На дарогу *ж* ***ідзе***
І ***гадзіна****, і болей.*
Турой *Костусь* ***ідзе***
(Шахматыст ён заўзяты),
Жыта ў колас ідзе *–*
Будуць скора зярняты.
Самалёт *жа* ***ідзе***
На ўзлёт ці пасадку.
Ну а ***дожджык ідзе****,*
Каб паліць нашу градку.
Фарба *ў краме* ***ідзе****:*
Фарбы просяць багата,
Прадаўцам жа ***ідзе***
Кожны месяц ***зарплата****.*
І ***размова ідзе***
Валянціна з Антонам.
Час *таксама* ***ідзе***
(Год праходзіць за годам).

• **Работа з эпіграфам.**

Настаўнік зачытвае эпіграф і задае пытанне:

– Чаму менавіта верш "Я гэта люблю падарожжа" Максіма Танка абраны ў якасці эпіграфа да сённяшняга ўрока?

III. Падвядзенне вынікаў урока.

Вучні дзеляцца сваімі ўражаннямі непасрэдна ад урока.

Падлічваюцца набраныя камандамі балы, выяўляецца каманда-пераможца.

Вучні здаюць аркушы з рабочымі запісамі. Адзнакі будуць названы на наступным уроку (умовы выстаўлення адзнак былі пракаменціраваны ў пачатку ўрока).

Моўныя самацветы

* * *

Гутаркі пра словы і словы… Госць просіць частаваць і частаваць яго беларускімі словамі, якія нават не назвы рэчаў, з'яў, а характарыстыкі іх. Нездарма атрымалі яны ў беларусістыцы назву гаваркіх.

Ён чуе слова, фразу.

– Як-як? Маладзіца?

І паўтарыў: *ма-ла-дзі-ца*. Спрабуе знайсці паралелі ў мовах, якія ведае. Параўноўвае ўспомненае з беларускім – з маладзіцаю.

Госць чуе слова *журавіна* (*журавінка*), адразу ж яго занатоўвае і разважае. Адразу і пытанне: *журавінавы* ці *журавінны*. Выказвае сваё меркаванне, просячы прабачыць і дараваць, калі тут не яго праўда: яму здаецца, што павінна быць *журавінавы*, а не "журавінны". Ці не гэтак? Толькі гэтак. Толькі журавінавы!

Знаходзім беларускія варыянты слова *журавель* – *жораў*, *жураў*, прыгадваем латышскае *гераб*…

– Што само слова ёсць творчасць, – падагульняе госць, – асабліва чуецца, бачыцца, адчуваецца, калі маеш справу з іншаю моваю, не сваёю роднаю… І беларуская мова ў гэтых адносінах – паэзія. У мове і проста. У мове і вельмі складаныя загадкі.

* * *

Добра вам: вашым рукапісам **зялёная** вуліца!

– А якую вуліцу даваць **"зялёным"** рукапісам?

* * *

– Венера!

– Што Венера?

– Не слова, а свята! Люблю, падабаецца. Люблю і слова. Люблю і зорку. Люблю і "Зорку Венеру". Нашу, Багдановічаву…

– А **Мілавіца**?

– Што гэта?

– Не ведаеш? Народная назва зоркі Венеры.

– Праўда? Хораша. Яно такое роднае і далікатнае.

(З кнігі Фёдара Янкоўскага "Само слова гаворыць".)

Дыдактычны матэрыял

Дзень беларускага пісьменства і друку, які штогод адзначаецца ў нашай краіне ў першую нядзелю верасня, сёлета пройдзе ў Барысаве. Па просьбе рэдакцыі часопіса "Роднае слова" барысаўскія педагогі – намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце дзіцячага сада-школы № 24 з эстэтычным ухілам ***Людміла Лапянок****, загадчык сектара раённага вучэбна-метадычнага кабінета аддзела адукацыі Барысаўскага райвыканкама* ***Святлана Макарава****, настаўнікі беларускай мовы і літаратуры* ***Наталля Галушка*** *(гімназія № 1),* ***Надзея Асіпенка*** *(СШ № 16),* ***Валянціна Мікулік*** *(СШ № 6),* ***Ніна Гаўрусева*** *(СШ № 12),* ***Алена Буланда*** *(ДСШ № 24) – падрыхтавалі грунтоўны дыдактычны матэрыял. Мяркуем, што многія выкладчыкі выкарыстаюць прапанаваныя тэксты на ўроках і пазнаёмяць вучняў з гісторыяй старажытнага беларускага горада.*

БАРЫСАЎ

I

1. Да якога стылю і тыпу маўлення адносяцца наступныя тэксты? Абгрунтуйце.


2. Зрабіце творчы пераказ аднаго з прапанаваных тэкстаў па самастойна складзеным плане.

1. Барысаўскі замак

У другой палове XIII – пачатку XIV стагоддзя адбыўся перанос Барысава з першапачатковага месца ў Стара-Барысаве на 4 км ніжэй па цячэнні ракі Бярэзіна. З гэтага часу пачынаецца гісторыя Барысаўскага замка, які існаваў у XIV – XVIII стагоддзях. Замак займаў плошчу каля 2 га, быў абкружаны высокім земляным валам з драўлянымі сценамі і вежамі, а таксама ровам, які жывіўся водамі Бярэзіны і Праллі. На выпадак аблогі замка існавала сістэма скрытага водазабеспячэння. Замак выконваў функцыю абарончай крэпасці. Захавалася апісанне замка маскоўскім дзякам Трыфанам Карабейнікам у студзені 1593 года: "Замок древян, невелик, под ним река Березина, с реку Одрев, да около пруд, а от города едучи к Менску, мост древяной, чрез реку, чрез пруд, в длину его сажен з 200".

Барысаўскі замак шмат разоў трапляў у асаду. У 1514 годзе гэта рабілі рускія войскі, аднак замак выстаяў. У 1535 годзе рускія войскі спалілі і знішчылі горад, спрабуючы захапіць замак. У часы вайны Расіі з Рэччу Паспалітай (1654 – 1667) замак усё ж такі быў узяты рускімі войскамі і спалены. Аднак ён меў стратэгічнае значэнне, таму па загадзе рускага цара быў адноўлены і добра ўмацаваны. У Барысаўскім замку стаяла 145 дамоў і жытніц, тут былі майстэрні, у якіх рамантавалі агнястрэльную зброю, у тым ліку і гарматы. Замак служыў добрым умацаваннем для рускай арміі ў яе барацьбе з ворагамі. У 1662 годзе ён усё ж не вытрымаў пастаянных аблог ворагаў і паў.

У канцы XVII стагоддзя Барысаўскі замак быў прыведзены ў парадак, і яго бастыённыя ўмацаванні захаваліся ў добрым стане да канца XVIII стагоддзя. У 1776 годзе кароль Станіслаў Аўгуст падараваў яго разам з землямі князю Міхаілу Радзівілу, які размясціў тут адміністрацыю сваіх маёнткаў. У пачатку XIX стагоддзя яна перайшла ў новазбудаваныя памяшканні ў маёнтку Стара-Барысаў, а замак без гаспадара хутка прыйшоў у заняпад і амаль струхлеў. У 1857 годзе замак становіцца каменным і ператвараецца ў турму. У часы вайны з палякамі ў 20-я гады XX стагоддзя замак канчаткова прыйшоў у заняпад.



Барысаўскі замак. Сярэдзіна XVII ст.

У нашы дні ад замка засталіся толькі падмурак ды роў, у якім пастаянна стаіць вада.

Паводле матэрыялаў
гісторыка-дакументальнай хронікі "Памяць".
Мінск: БелЭн, 1997.

2. Барысаўскі замак

Замак узнік у XIII – пачатку XIV стагоддзя пасля пераносу горада Барысава з першапачатковага месца на 4 км ніжэй па цячэнні ракі Бярэзіна. Размяшчаўся на яе левым беразе, каля сутокаў ракі Пралля, займаў пляцоўку плошчай каля 2 гектараў, абкружаную высокім земляным валам з драўлянымі сценамі і вежамі, а таксама ровам, які жывіўся водамі Бярэзіны і Праллі. Паводле звестак польскага гісторыка А. Гваньіні, у XVI стагоддзі замак быў умацаваны вежамі і драўлянымі гароднямі, запоўненымі зямлёю і камянямі. На выпадак яго аблогі існавала сістэма скрытага водазабеспячэння. Замак меў стратэгічнае значэнне, бо кантраляваў суднаходны шлях з басейна Балтыйскага ў Чорнае мора і сухапутны шлях у цэнтр Беларусі.

У 1514 годзе Барысаў асаджвалі войскі рускіх ваяводаў М. І. і Д. І. Булгакавых, аднак замак выстаяў. У 1519 годзе, калі групоўка войск 9 маскоўскіх ваяводаў, рухаючыся ў напрамку Орша – Мінск – Вільня, "воеваша и плениша Литовскую землю", Барысаўскі замак згадваецца ў ліку "повоеванных городов". У час Лівонскай вайны (1558 – 1585) у замку пастаянна знаходзіўся гарнізон салдат.

Пасол аўстрыйскага імператара Мікалай Варкач 24 жніўня 1593 года адзначаў, што паблізу Барысава "даволі вялікі замак, увесь пабудаваны з дрэва". У першай палове XVII стагоддзя замак перабудаваны ў пяцібастыённую фартэцыю, умацаваную вялікім ровам

з вадою. З усходу да яго прымыкала "падзамча", якое таксама мела лінію абароны. Паблізу ўмацаванняў знаходзіўся драўляны мост на палях цераз Бярэзіну. У час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай (1654 – 1667) каля Барысаўскага замка атрад шляхціца К. Паклонскага 10 чэрвеня 1655 года пацярпеў паражэнне ад войскаў ваяводы Ю. Барацінскага і мусіў адступіць да Мінска. Аднак узяць замак рускаму атраду не ўдалося, на дапамогу яму была кінута групоўка войскаў акольнічага ваяводы Б. М. Хітраво (4159 чалавек пяхоты і 1207 коннікаў). Пасля працяглага жорсткага бою 19 чэрвеня замак быў узяты і спалены. Рэшткі гарнізона адступілі на правы бераг Бярэзіны, спаліўшы за сабою мост. На аднаўленне замка былі накіраваны вялікія сілы салдат і рэйтараў рускай арміі, сагнаны сяляне навакольных вёсак. Неўзабаве "острог на Берёзе реке" і мост цераз раку былі адноўлены. На тэрыторыі падзамка насыпалі бастыёны, зрабілі падмосткі для стралкоў.

У Барысаўскім замку і на падзамку стаяла 145 дамоў і жытніц, тут былі майстэрні, у якіх рамантавалі агнястрэльную зброю, у тым ліку гарматы. Толькі ў канцы 1660 года з замка ў Смаленск і Маскву адправілі 73 гарматы, 252 пуды гарматнага пораху, 290 пудоў свінцу і мушкетных куль. Адсюль жа вывозілі кваліфікаваных рамеснікаў, фуры з баявымі даспехамі-латамі, халоднай зброяй, заступамі, рыдлёўкамі, з трафейнымі барабанамі, літаўрамі і сцягамі.

У час аблог ці раптоўнага нападу гарнізон замка меў права карыстацца ўсімі звезенымі сюды прыпасамі і правіянтам з хлебных свірнаў, што і было зроблена зімой 1661 года, калі Барысаўскі замак асаджвалі атрады Вялікага княства Літоўскага на чале з гетманам С. Чарнецкім. Каб не даць магчымасці па лёдзе падысці да сцен фартэцыі, гарнізон рускіх войскаў пастаянна абколваў лёд у вадзяным рове. Вясной 1661 года ўмацаванні замка зноў рамантавалі: выкапалі абарончы роў глыбінёй 4 і шырынёй 7 сажняў, гарадавую сцяну на байніцы абклалі дзёрнам, каб "зажечь было немочно".

У чэрвені 1661 года замак пастаянна знаходзіўся ў аблозе. Нешматлікі рускі гарнізон не мог трымаць абарону па ўсім перыметры замка і падзамка, таму ўмацаванні падзамка на 2/3 былі спалены і знішчаны гарадскі пасад. Дзякуючы запасам зброі і хлеба замак цэлы год вытрымліваў аблогу атрадаў С. Чарнецкага, В. Валовіча, А. Русецкага і пяхотнага палка П. Сапегі. 9 ліпеня 1662 года знясілены гарнізон пакінуў замак і адступіў на усход.

У канцы XVII стагоддзя Барысаўскі замак і падзамак прыведзены ў парадак, і яго бастыённыя ўмацаванні захоўваліся ў добрым стане да канца XVIII стагоддзя. Да цяперашняга часу захаваліся равы, у якіх пастаянна стаіць вада.

Паводле **М. Ткачова.**

II

1. Вызначце стыль і тып тэксту, дайце яму загаловак. Растлумачце лексічнае значэнне слоў *ратныя*, *брама*, *магдэбургскае права*.

2. Расстаўце знакі прыпынку, устаўце прапушчаныя літары.

3. У складаных сказах вызначце від даданай часткі, зрабіце сінтаксічны разбор.

Ён нарадзіўся і вырас на берагах Бярэзіны, якая стала для яго гандлёвым шляхам і надзейным сябрам. Барысаў быў заснава..ы ў 1102 годзе. Летапісы і пада..і ра..казваюць пра мірную працу і ратныя по.. вігі былых пакаленняў. У 1792 годзе горад атрымаў магдэбургскае права і гара..скі герб на с..рэбраным полі брама з дз..вюма вартаўнічымі вежамі. Шве..кія і кайзераўскія захопнікі нямецка-фашы..кія акупанты ішлі з мячом і агнём. Колькі разоў з руін і папялішчаў падымалі горад працавітыя людзі. Горад у якога за плячыма амаль дзевяць стаго..яў свята захоўвае памяць пра тых хто ў ця..кія дні аддаў жыццё абараняючы Радзіму.

Паводле хронікі "Памяць".

III

1. Вызначце стыль і тып тэксту.

2. Выпішыце складаныя бяззлучнікавыя сказы, зрабіце іх поўны сінтаксічны разбор.

3. Пабудуйце схемы сказаў з цытатамі.

4. Зрабіце марфемны і словаўтваральны разборы выдзеленага слова.

Горад Барысаў спакон веку стаіць на бойкім тракце, які звязвае ўсходнюю расійскую дзяржаву з заходнімі. Тут працякае буйны прыток Дняпра – рака Бярэзіна. І таму здаўна нёс ён важную службу-дазор. Гэтае яго прызначэнне адлюстравана і ў старажытным гербе: у чыстым полі – вароты з дзвюма вартаўнічымі вежамі.

Аднак вялікім было яго значэнне і ў мірны час: ён звязваў гандлёвымі шляхамі паўночна-ўсходнюю Прыбалтыку з Кіеўскай Руссю, Мінск з Полацкам.

Старажытныя крыніцы, у тым ліку Іпацьеўскі летапіс, у якім упершыню ўпамінаецца Барысаў, далі падставы вядомаму гісторыку В. М. Таціщаву (1656 – 1750) напісаць у "Гісторыі Расійскай": "Того же году (1102) …Борис Всеславович полоцкий ходил на ятвяг и, победя их, возвратясь, поставил град Борисов во своё имя и людьми населил".

Пацверджанне гэтаму знаходзім і ў Беларуска-Літоўскім летапісе: «Город Борисов на реке Березине "вчинил" великий князь Полоцкий Борис и назвал его своим именем. Он был русином».

Паводле хронікі "Памяць".

IV

1. Прачытайце тэкст, дайце загаловак. Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары.

2. Зрабіце сінтаксічны разбор:

I варыянт – складаназалежнага сказа з даданай азначальнай часткай;

II варыянт – складанага сказа з рознымі відамі сувязі.

3. Зрабіце марфалагічны разбор назоўнікаў:

I варыянт – *мёд*;

II варыянт – *дзёгаць*.

4. Зрабіце марфемны разбор:

I варыянт – *перагружаліся*, *аддаленыя*;
II варыянт – *правозіліся*, *названы*.

Прыродныя бага..і, зручнае геаграфічнае станові..а на скрыжава..і водных і сух..путных шляхоў і як вынік – рост гаспадарчых сувязей з іншымі пасел.. шчамі рабілі Барысаўскі край больш значным. Ужо ў с..рэдзіне XII стаго..я Барысаў увайшоў у лік в..домых гандлёва-рамесных гарадоў. На гандаль і яго разві..ё ўплывала тая акалічнасць, што праз полацкія землі ішла важная частка гандлёвага воднага шляху "з варагаў у грэкі". Названы шлях закрануў раку Б..рэзіна – прыток Дн..пра. Вядома, што паміж Дн..пром і Заходняй Дз..віной, Заходняй Дз..віной і Ловаццю былі волакі. Былі яны і паміж Б..рэзінай і Заходняй Дз..віной. Тут водны шлях перарываўся, тавары перагружаліся, іх трэба было "валачы" па сушы да возера, потым – да ракі. На водным шляху панавалі гандляры, сюды ц..гнуліся людзі, якія шукалі заро..ку. Правозіліся іншаземныя і м..сцовыя тавары.

Барысаўшчына была багатая на хвою, якая сплаўлялася і ў аддаленыя краіны. Акрамя таго, нашы продкі вывозілі на рынкі, якіх было шмат на водным шляху, скуры і футра л..сных звяроў, мёд, дзёгаць і іншыя тавары. А з далёкіх паўночных і паўднёвых зямель прывозіліся п..рсцёнкі, пацеркі, аксаміты, бранзалеты, рэчы з золата, бронзы і жалеза. Пра гэта све..чаць знаходкі арх..олагаў у час раскопак пасел..шча XII стаго..я ў пасёлку Стара-Барысаў. Цяпер яны знаходзя..а ў м..сцовым кра..знаўчым музеі.

Паводле хронікі "Памяць".

Працяг будзе.

Ганарар аўтары ахвяруюць на развіццё часопіса.

Падагульняльны ўрок

ПАДАРОЖЖА ПА КРАІНЕ ПРЫМЕТНІК

VI клас

Мэты: сістэматызаваць і паглыбіць веды вучняў пра прыметнік і яго формы; удасканаліць уменне вызначаць тэкстаўтваральную і стылістычную ролю прыметніка, яго граматычныя прыметы; развіваць лінгвістычнае мысленне вучняў, фарміраваць навыкі функцыянальнай пісьменнасці і дарэчнага словаўжывання; выхоўваць у вучняў любоў да роднага краю, уменне бачыць прыгажосць беларускай зямлі.

Форма: урок-падарожжа.

Тып урока: абагульненне і сістэматызацыя.

Абсталяванне: Беларуская мова: Падручнік для 5-га класа агульнаадукац. шк. з руск. мовай навучання / Г. Малажай, Л. Васюковіч, З. Кавалевіч, С. Рачэўскі. – Мінск, 2002; Лепешаў І. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў. – Мінск, 1981; Клышка М. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў. – Мінск, 2005;

запісы на дошцы, аркушы з падрыхтаванымі заданнямі для работы ў групах; карта "Краіна Прыметнік", слайды "Зіма ў Пружанскім раёне" (настаўнікі могуць падрыхтаваць здымкі родных вучням мясцін), аўдыёзапісы, рознакаляровыя карткі, відэафільм "Зіма ў парку", карта Беларусі, мультымедыйная ўстаноўка.

Эпіграф:

Якая срэбная лягла зіма,
Махнаты іней густа сеў на вецці,
І калі сонца ўсё асвеціць –
Мне радасць захаплення не стрымаць.

Канстанцыя Буйло.

ХОД УРОКА

I. Арганізацыйны момант.

Настаўнік вітаецца з вучнямі, запрашае паглядзець адно на аднаго і ўсміхнуцца, кінуць усмешку педагогу, падарыць ласкавы позірк і гасцям, бо ўсмешка працягвае жыццё, дорыць дабрыню, ласку, пяшчоту, чаго так не хапае ў наш імклівы і неспакойны час.

Расповед пра творчы шлях настаўніцы змешчаны на с. 97.

Пад фанаграму беларускай музыкі ідзе праверка падрыхтаванасці да ўрока. Настаўнік пытаецца:

– У якой краіне мы жывём?

– Што вы ўяўляеце, калі чуеце назву сваёй краіны?

(*Бусел, лён, бульба, лес, поле, возера, блакітнае неба, зялёная трава, белая сняжынка…*)

– А белы бусел, чыстае неба, светлая будучыня – гэта сімвалы міру, святла і шчасця.

II. Асноўная частка.

– Ці любіце вы падарожнічаць па сваёй краіне?

– Якія мясціны наведалі?

Пасля адказаў вучняў педагог тлумачыць, што сёння – незвычайны ўрок, урок-падарожжа. (На фоне фільма "Зіма ў парку" зачытваецца эпіграф, на экране застаецца апошні кадр фільма.) Вандроўка адбудзецца ў час, калі, як пісаў Якуб Колас,

Пад пялёнкай белай
Травы і лісточкі.
Рэчка анямела,
Змоўклі ручаёчкі.

Амярцвелі лозы
Чуць галлём хістаюць.
А ў палях марозы
Ды вятры гуляюць.

– А па якой краіне мы будзем вандраваць, даведаемся, працуючы з крыжаванкай.


1. Значымая частка слова, якая знаходзіцца перад коранем і служыць для ўтварэння новых слоў.
2. Раздзел навукі аб мове, дзе словы вывучаюцца як часціны мовы.
3. Нязменная часціна мовы, што адказвае на пытанні: дзе? куды? адкуль?
4. Словы, якія пішуцца аднолькава, але маюць рознае лексічнае значэнне.
5. Галоўны член сказа.

6. Раздзел навукі аб мове, у якім вывучаюцца спосабы ўтварэння слоў.

7. У беларускай мове іх шэсць.

8. Ён можа быць і адзіночным, і множным.

9. Значымая частка слова, што стаіць пасля канчатка ці формаўтваральнага суфікса.



(1. Прыстаўка. 2. Марфалогія. 3. Прыслоўе. 4. Амонімы. 5. Дзейнік. 6. Словаўтварэнне. 7. Склон. 8. Лік. 9. Постфікс. Па вертыкалі атрымаецца слова "прыметнік".)

Франтальнае апытванне.

Настаўнік прапануе прадоўжыць сказы.

1. Прыметнік – гэта часціна мовы, якая … .

2. Прыметнікі *мяккі, белы, чысты* адносяцца да разраду … , таму што … .

3. Прыметнікі *зімні, гарадскі, ранні* адносяцца да разраду … , таму што … .

4. Прыметнікі маюць дзве формы: … , … .

5. Прыметнікі ў сказах выступаюць у ролі … .

6. Вышэйшая ступень параўнання ўтвараецца шляхам … .

7. Найвышэйшая ступень параўнання ўтвараецца шляхам … .

Педагог правярае заданні, вучні дзеляцца ўражаннямі ад падарожжа.

Настаўнік зазначае, што ў любой вандроўцы неабходная карта, ёсць яна і ў вучняў. І зараз групы падарожнічаюць па вуліцах Якасных, Адносных і Прыналежных прыметнікаў. (У час працы гучыць музыка "Поры года" П. Чайкоўскага.)

Заданні для 1-й групы.

Прачытайце тэкст. Як звязаны ў ім сказы? Які спосаб сувязі сказаў у тэксце? Вызначце стыль тэксту. Выпішыце якасныя прыметнікі, утварыце ўсе магчымыя формы ступеняў параўнання ад двух выпісаных прыметнікаў (на выбар).

Надыход зімы

Пасля палудня з поўначы падзьмула здаровым халадком. Зямля стала сухой, пакрылася цвёрдаю скарынкаю. Затым пасыпаў спорны, густы сняжок, які ішоў усю ноч і ўвесь дзень. Пад вечар снег суняўся і на захадзе бліснула ласкавая ўсмешка сонца і патухла. У небе засвяціліся зіхатлівыя зоркі. Прыціснуў моцны мароз.

Паводле **Якуба Коласа**.

Заданні для 2-й групы.

Прачытайце тэкст і дайце яму загаловак. Да якога тыпу маўлення належыць тэкст? Выпішыце адносныя прыметнікі. Абазначце суфіксы. Зрабіце сінтаксічны разбор выдзеленага сказа.

Моцна скаваў мароз голую зямлю, зрабіў яе цвёрдай. Вымерзлі лужыны, высахла гразь. Халодная ледзяная кара пакрыла рэкі і азёры. ***Цвёрдую пасцель падрыхтаваў мароз для белага снегу.*** *Вось падзьмуў сівер. Папаўзлі па небе снегавыя хмары. Яны завалаклі ўсё неба.*

Вось ціха закружыўся ў паветры белы лёгкі пушок і нячутна лёг на зямлю. За ім паказаўся другі, трэці. Усё часцей і часцей залёталі гэтыя белыя халодныя зімовыя матылькі і пасыпаліся на зямлю. Як многа іх!

Паводле **Якуба Коласа**.

Заданні для 3-й групы.

Выпішыце з "Этымалагічнага слоўніка фразеалагізмаў" тры ўстойлівыя спалучэнні, у склад якіх уваходзяць прыналежныя прыметнікі. Растлумачце сэнс фразеалагізмаў. Абазначце суфіксы прыналежных прыметнікаў. (Настаўніку варта адзначыць, што прыналежны прыметнік, які ўтварыўся ад уласнага імя і стаў кампанентам фразеалагізма, трэба пісаць з малой літары.)

Адамаў яблык, антонаў агонь, аўгіевы стайні, ахілесава пята, бабіна лета, праметэеў агонь, фількава грамата і інш.

(У час праверкі заданняў тэксты размешчаны на экране, у тым ліку і фразеалагізмы.)

Пісьмо па памяці.

Падрыхтаваны вучань чытае на памяць верш "Зімой" Максіма Багдановіча на фоне слайдаў "Зіма ў Пружанскім раёне" (слайды мяняюцца на кожны радок верша). Педагог дае заданні: назваць аўтара і твор, запісаць па памяці прыметнікі, вызначыць іх ролю ў тэксце.

Здароў, марозны, звонкі вечар!
Здароў, скрыпучы, мяккі снег!
Мяцель не вее, сціхнуў вецер,
І волен лёгкіх санак бег.

Як мары, ***белыя*** *бярозы*
Пад сінявой начной стаяць,
У небе зоркі ад марозу
Пахаладзеўшыя дрыжаць.

Вільготны месяц стуль на поле
Празрысты, светлы стоўп спусціў
І рызай срэбнаю раздолле
Снягоў сінеючых пакрыў.

Ўзрывайце ж іх санямі, коні!
Звіні, ***вясёлых*** *бомаў медзь!*
Вакол лятуць бары і гоні,
Ў грудзях пачала кроў кіпець.

Пасля таго як вучні запішуць прыметнікі, тэкст верша з'яўляецца на экране. Настаўнік прапануе падабраць да выдзеленых слоў сінонімы і адказаць, чым адрозніваюцца словы, якія ўваходзяць у сінанімічны рад.

Работа з картай.

Настаўнік зноў звяртае ўвагу на карту: тры вуліцы перасякаюць Галоўны праспект, вуліца Жаночага

роду, вуліца Мужчынскага роду, вуліца Ніякага роду. Трэба да назоўнікаў *снег*, *гурба* (1-я група), *іней*, *зіма* (2-я група), *дарога*, *палатно* (3-я група) падабраць адпаведныя прыметнікі, праскланяць словазлучэнне з якасным (1-я група) і адносным (2-я група) прыметнікамі, словазлучэнне *марозаў падарунак* (3-я група) (3 вучні скланяюць словазлучэнні на дошцы, а астатнія ў сшытках).

Прыгожы, белы, іскрысты, густы, мяккі, халодны, чысты, пушысты, казачны, дзіўны, серабрысты, лёгкі, блакітны, бязмежны, неабсяжны, бялюткі, хрусткі, шорсткі, глыбокі, пухкі, пульхны, снежны. (Словы на экране.)

Хвіліна адпачынку.

Псіхалагічны эцюд "Снегапад" (пад музыку "Поры года: зіма" А. Вівальдзі). Педагог прапануе вучням выйсці з-за партаў, заплюшчыць вочы і ўявіць снегапад. Сняжынкі падаюць зверху, трэба павярнуць да іх тварыкі, падняць рукі і падставіць сняжынкам далоні. Снег гусцее, гусцее. Школьнікі махаюць рукамі, разганяюць сняжынкі, дзьмуць на іх, тады грэюць шчочкі, апускаюць рукі. Расплюшчваюць вочы сонейку, усміхаюцца яму.

Самастойная работа з тэстам.

З дапамогай тэста школьнікі правяраюць, як ведаюць правілы правапісу прыметнікаў.

1. Выберыце слупок, у якім паслядоўнасць "разам" ці "злучок" адпавядае правапісу складаных прыметнікаў.

(добра)сумленны	(паўднёва)ўсходні
(бура)зялёны	(светла)валосы

А.	Б.	В.
разам	разам	злучок
злучок	злучок	разам
злучок	злучок	разам
злучок	разам	разам

2. Укажыце, у якім слупку паслядоўна размешчаная літара **ь** ці яе адсутнасць адпавядаюць прапушчаным у прыметніках літарам.

казан…скі	студзен…скі
восен…скі	кубан…скі

А.	Б.	В.	Г.
ь	-	-	-
-	ь	-	ь
ь	ь	ь	-
-	-	-	-

3. Вызначце, у якім слупку паслядоўна размешчаныя літары адпавядаюць прапушчаным у дадзеных словах.

стара…ы	сцюдзё…ы
палымя…ы	раме…ы

А.	Б.	В.	Г.
нн	н	нн	н
н	нн	н	н
нн	н	н	н
нн	н	нн	нн

4. Укажыце, у якім сказе ***не*** з прыметнікам трэба пісаць асобна.

А. Усхліпваюць у чаратах (не)спакойныя хвалі Прыпяці.

Б. Вакол пануе (не)парушны спакой зімняй ночы.

В. Дом быў (не)высокі, а нізкі.

Адказы: 1– Б, 2 – Б, 3 – В, 4 – В.

(Тэст у час праверкі знаходзіцца на экране.)

Настаўнік зазначае, што падарожжа працягваецца, бо наведаныя яшчэ не ўсе куточкі краіны Прыметнік. І зараз ролі перамяняцца: вучні стануць пісьменнікамі і перакладчыкамі.

Пісьменнікам творчае заданне. Выкарыстоўваючы прыметнікі *мядзведжы* і *воўчы*, напісаць міні-сачыненне "Зімовая азбука". Чаму з гэтымі прыметнікамі? Бо яны не падпарадкоўваюцца агульным правілам і на карце займаюць асобнае месца.

Перакладчыкі робяць пераклад тэксту на беларускую мову. Трэба ўмець не толькі пераказаць тэкст, перадаць яго сэнс, але і адлюстраваць своеасаблівую манеру пісьменніка, моўныя асаблівасці твора. Для гэтага неабходна ведаць тонкасці абедзвюх моў: той, з якой перакладаецца, і той, на якую перакладаецца.

Декабрь

Подули студёные ветры. День стал намного короче ночи. Пошёл снег.

Всё небо и весь воздух были полны снежинок. Они ложились на чёрствую грязь на дороге. И на крыши домов. И на деревья, которые стали белее молока.

Когда крупные снежинки летят, они красивее нежных цветков. Если приглядеться, можно увидеть звёздочки. И все они разные: у одной листики широкие и зубчатые, у другой – острые, как стрелки.

По **Л. Воронковой.**

Калектыўная работа.

Педагог кажа, што падарожжа хутка закончыцца, таму варта прыгадаць, што вучням вядома пра прыметнік як часціну мовы. (На экране – сосны ў інеі.) Трэба запісаць сказ, які выбраны эпіграфам да ўрока і зрабіць марфалагічны разбор слова *срэбная*. (Адзін вучань працуе ля дошкі, а астатнія ў сшытках.)

III. Падвядзенне вынікаў урока, ацэнка ведаў вучняў.

IV. Рэфлексія.

– У час вандроўкі кожны з вас пакінуў шмат слядоў, разабрацца ў якіх вы можаце самі. Калі спадабаўся ўрок, то пакіньце след цёплага колеру на карце там, дзе вам было найбольш цікава, калі не спадабаўся, то пакіньце сляды халоднага колеру, а калі засталіся пытанні, то пакіньце сляды з пытальным знакам.

V. Дамашняе заданне (на выбар).

1. Скласці верш "Наш горад зімой".
2. Прыдумаць лінгвістычную казку "Прыметнік".
3. Выканаць практыкаванне паводле падручніка.

Галіна КНІГА,
настаўніца беларускай мовы і літаратуры
дзяржаўнай установы адукацыі "Гімназія г. Пружаны".

Крытыка і бібліяграфія

ІМЯ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Мезенка Г., **Ляшкевіч В.**, **Семянькова Г.** Віцебшчына ва ўласных імёнах: мінулае і сучаснасць: Манаграфія. – Віцебск: ВДУ імя П. М. Машэрава, 2006. 238 с. Тыраж 100 экз.

У 2006 г. убачыла свет дастаткова грунтоўная ў галіне антрапаніміі навуковая праца – манаграфія "Віцебшчына ва ўласных імёнах: гісторыя і сучаснасць" (аўтары Ганна Мезенка, Вольга Ляшкевіч, Галіна Семянькова). Кніга прысвечана даследаванню сучаснага стану, этапаў і шляхоў фармавання розных формул называння жыхароў Віцебшчыны ў перыяд з XVI да XXI ст.

Беларускае Паазер'е – надзвычай цікавы ў лінгвістычных адносінах рэгіён Беларусі, у якім, як вядома, акумулююцца моўныя асаблівасці як захаду, так і ўсходу краіны. Унікальнасць назваў Віцебшчыны абумоўлена тым, што ў старажытнасці гэты край уяўляў з сябе тэрыторыю актыўных кантактаў славянскага насельніцтва з неславянскім, а ў наш час ён мяжуе з трыма дзяржавамі – Латвіяй, Літвой і Расійскай Федэрацыяй, што і знайшло адлюстраванне ў складзе ўласных асабовых імёнаў, мянушак і прозвішчаў яе жыхароў.

Усе тры главы гэтай кнігі напоўненыя найцікавейшымі фактамі: асабовае імя ў гісторыі Віцебшчыны, разгорнутая сістэма называння, сучасны прозвішчны антрапанімікон. У першай главе аналізуецца склад, форма, этымалогія, словаўтварэнне, частата ўжывання, папулярнасць мужчынскіх і жаночых асабовых імёнаў перыяду XVI – XVIII стст., прыводзяцца варыянты імёнаў, якія ўзніклі на аснове традыцыйна-царкоўнай формы, апісваюцца вынікі фанетычнай і марфалагічнай адаптацыі хрысціянскіх імёнаў. Цікавымі падаліся нам звесткі пра склад, статыстычную структуру і асаблівасці зменаў сучаснага іменніка беларусаў, а таксама эстэтыка-этычная характарыстыка асабовых імёнаў, выяўленая на аснове эксперымента ў Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава.

Як вядома, сучасная трохчленная формула іменавання стала агульнай і абавязковай толькі ў XX ст. Прынята лічыць, што яна складвалася паступова наступным чынам: імя → мянушка → імя па бацьку → прозвішча. Аналіз рэальных гістарычных фактаў, прапанаваны аўтарамі ў другой главе, не пацвярджае гэтага лагічнага меркавання. Думаецца, чытачам цікава будзе даведацца, што ў XVI – XVII стст. на віцебскай тэрыторыі пачала фармавацца такая афіцыйная антрапанімічная адзінка ў складзе наймення асобы, як імя па бацьку. Прычым фактычны матэрыял сведчыць, што існавалі двух-, трох-, чатырохслоўныя найменні асоб мужчынскага і жаночага полу, а жаночага полу – нават пяціслоўныя (*Иван Пивовар, Нестер Бурый, Фран Жаба, Ивановая Марья, Axinia Harbatka, Ианъ Юрьевичь Глебовичь, Василей Михайловичъ Зеноевичъ, Ядвига Шванская Прушинская, Barbara Raminska Bazilina, Филон Семенович Кмита Чорнобольский, Марина Биневна Гарадоцкая Макаравичовая, Васильевая Семёновича Жилинъский Ганна Борысовна* і г. д.).

Даследчыкі сцвярджаюць, што народ-творца шукаў зручных і эканомных спосабаў называння асобы ў адзначаны перыяд. Дарэчы, з пяці- і чатырохчленнай мадэлі з цягам часу адпалі нерэгулярныя элементы і захаваліся найбольш частыя; так утварылася трохчленная мадэль называння. Шматлікія прыклады названых формул найменняў выбраныя з помнікаў мясцовай справавой пісьменнасці.

Трэцяя глава прысвечана комплекснаму аналізу сучасных прозвішчаў жыхароў Віцебска і Віцебскай вобласці. У ёй апісваецца структурна-граматычная арганізацыя антрапонімаў, выяўляюцца канкрэтныя матывацыйныя дэфініцыі, пры гэтым прымяняецца тэарэтычная формула семантычнага поля па прынцыпе *ядро – каляядзерная прастора – перыферыя.* На перыферыю семантычнага поля аднесены прозвішчы, якія паходзяць ад тапонімаў. Аўтары прыводзяць шмат аргументаў, заснаваных на фактах мясцовай антрапаніміі і дыялектнай лексікі. Асабліва цікавай у філалагічным плане ўяўляецца нам класіфікацыя прозвішчаў беларусаў Віцебшчыны па сектарах. Напрыклад, сектар "Антрапонімы, утвораныя ад мянушак, якія характарызуюць абставіны з'яўлення дзіцяці ў сям'і і адносіны да яго бацькоў": "дзіця, якога чакалі" – *Бажанаў*, *Бажанкоў*, *Бажанок*, *Бажэн*, *Бажэнаў* і "дзіця, якога не чакалі" – *Няжданаў*, *Нячай*, *Нічай*, *Нічаеў*. Сапраўды, як з гэтых, так і з іншых навуковых фактаў манаграфіі вынікаюць каштоўнасныя арыенціры грамадства. Менавіта праз называнне чалавекам сябе раскрываецца яго бачанне навакольнай рэчаіснасці і асэнсоўваецца сваё месца ў ёй праз мову. Чалавек ацэньваў асаблівасці сваіх паводзінаў, знешнія прыметы, псіхічныя ўласцівасці, маўленне, інтэлект, сваяцкія адносіны, сямейны стан і г. д. Аказваецца, прозвішчы *Варабей*, *Вараб'ёў* называлі-характарызавалі палахлівага чалавека, як і прозвішчы *Урубель*, *Урублеўскі*, якія паходзяць ад польск. *wrobel* 'верабей', прозвішчы *Бабарыка* (кірг. 'гаварун'), *Баеў* (рус. *бай* 'гаварун'), *Батура* (рэг. 'пустамеля'), *Гутор* (бел. 'гаварлівы') называюць людзей гаваркіх, пустамеляў.

Арыгінальныя карты паказваюць асаблівасці геаграфічнага пашырэння сучасных прозвішчаў, адлюстроўваюць моўныя і антрапанімічныя працэсы не толькі ў сінхронным, але і ў гістарычным аспектах, бо фіксуюць факты, якія сёння ўжо адсутнічаюць. На 22 картах зафіксаваны макра- і мікраарэалы распаўсюджання пэўных прозвішчных груп, кірункі зніжэння або павышэння прадуктыўнасці розных паводле структуры і семантыкі тыпаў прозвішчаў. Характэрна, што нават у межах вобласці кожны тып мае сваю непаўторную геаграфію.

У каментарыях да картаў прыводзяцца разнапланавыя тлумачэнні прычын лакалізацыі, высокай або

Кладзі слова ў лад

АДКРЫЦЬ ЦІ *АДЧЫНІЦЬ*?

Нарматыўныя слоўнікі беларускай мовы кантэкстуальна размяжоўваюць ужыванне дзеясловаў *адкрыць* і *адчыніць*. "Русско-белорусский словарь" (1982) перакладае дзеяслоў *открыть* як ***адчыніць*** (дзверы, акно), ***пачаць*** (пасяджэнне), ***адкрыць*** (тэатр, дарогу ў будучыню, грудзі, душу, паклады руды), ***пусціць*** (ваду), ***разгарнуць*** (кнігу), ***расплюшчыць*** (вочы), ***выкрыць*** (загавор). У "Тлумачальным слоўніку беларускай мовы" (у 5 т., т. 1, 1977) дзеяслову ***адчыніць*** даюцца наступныя азначэнні: "1. Адводзячы, знімаючы або адстаўляючы ў бок тое, чым перакрыты ўваход ці выхад, пройма ў якое-небудзь памяшканне, у якую-небудзь пасудзіну і падобнае, зрабіць даступнай унутраную або знешнюю прастору; адкрыць. 2. Тое, што і ***адкрыць*** (у 3-м значэнні)". А дзеяслоў ***адкрыць*** у 3-м значэнні азначае 'арганізаваць, стварыць што-небудзь і абвясціць пра пачатак яго (адкрыць завод)'. "Беларуска-рускі слоўнік" (2003) перакладае дзеяслоў ***адкрыць*** на рускую мову як *открыть* (собрание, театр, залежи руды, свои планы кому-либо, секрет, огонь, Америку), *посвятить* (кого во что), *обнажить* (части тела), а дзеяслоў ***адчыніць*** як *открыть*, *отворить* (двери, окно, шкатулку), *откупорить* (бутылку), а на прыклады *театр*, *школу*, *собрание* і да т. п. даецца памета: см. ***адкрыць***. "Беларуска-расейскі слоўнік: міжмоўныя амонімы, паронімы і полісемія" (www.slounik.org) перакладае дзеясловы ***адамкнуць***, ***адчыніць*** як *отпереть*.

На наш погляд, выкарыстоўваць дзеяслоў ***адчыніць*** можна толькі ў тых выпадках, калі размова ідзе пра нешта, што раней было зачынена, замкнута на ключ і да т. п. Аднак на старонках сучасных сродкаў масавай інфармацыі, у электронных выданнях і на інтэрнет-сайтах можна сустрэць выкарыстанне абодвух разгляданых дзеясловаў у аднолькавых выпадках: *Пасля прыезду ў 2001 годзе Лі Хонг Тая ў Менск Алесь Рапека атрымаў ад яго асабісты дазвол* ***адчыніць*** *сваю школу* (www.hong-gia.iatp.by); *14 красавіка 1901 года дырэктар Віленскай дырэкцыі народных навучальняў звярнуўся з хадайніцтвам да папячыцеля Віленскай навучальнай акругі з нагоды заявы жонкі штатнага прыглядчыка Лідскай уезнай навучальнай акругі Марыі Навіцкай аб дазволе ёй* ***адчыніць*** *у горадзе Лідзе прыватную 3-класную з падрыхтоўчым класам жаночую навучальню* (http://lib.active.by); *Але ніхто не спрабаваў* ***адчыніць*** *Недзяржаўны беларускі ўніверсітэт, па аналогіі з рускамоўнымі камерцыйнымі ВНУ* ("Наша Ніва"); *Рэгіянальныя турыстычныя цэнтры плануецца* ***адкрыць*** *у гэтым годзе ў Слоніме і Навагрудку* (pahonia.promedia.by); *Універсітэт плануе* ***адкрыць*** *тэлеканал* ("Биржа информации", 19.02.2004).

Мовазнаўца Юрась Бушлякоў слушна разважае: "Апавядаючы пра тое, што знойдзена ў выніку пошукаў або пра тое, што стала вядомым, хоць доўга ўтойвалася, скарыстоўваем дзеяслоў ***адкрыць***: ***адкрыць*** *радовішча,* ***адкрыць*** *Амерыку,* ***адкрыць*** *сакрэт*. ***Адкрываем*** і ***закрываем*** *сход*, *пасяджэнне* – абвяшчаем пра яго пачатак або канец. Калі размова ідзе пра арганізаванне, стварэнне нейкай структуры або, наадварот, пра спыненне яе дзейнасці, таксама ўжываюцца дзеясловы ***адкрыць*** і ***закрыць***: ***адкрыць*** *студыю,* ***закрыць*** *фабрыку*. Тут, праўда, магчымая і пара ***адчыніць – зачыніць***. Усё болей сёння такога пераноснага ўжывання: гавораць, што ***адчынілі*** *фірму* або *школу*, ***зачынілі*** *партыю* або *газету*" (www.svaboda.org).

Абсалютна відавочна, што дзеяслоў *адчыніць*, калі мы гаворым пра навучальныя ўстановы, камп'ютэрныя файлы і папкі, сайты і іншае, ужываць немэтазгодна, у гэтых выпадках трэба выкарыстоўваць выключна слова ***адкрыць***.

Наталля ПЕРАВАЛАВА,
кандыдат філалагічных навук.

нізкай канцэнтрацыі таго ці іншага тыпу на пэўным тэрытарыяльным масіве. Прычым аналіз вызначаецца высокай ступенню дэталізацыі: падаюцца звесткі не толькі па асобных раёнах, але і па асобных сельсаветах. Такі скрупулёзны падыход да падбору і інтэрпрэтацыі фактычных дадзеных – гарантыя паўнаты і сапраўднасці вынікаў. У некаторых выпадках пашыраецца ранейшая навуковая факталагічная база (дапаўняюцца матэрыялы даследаванняў вядомых беларускіх антрапанімістаў), а таксама ўдакладняюцца асобныя агульнавядомыя антрапанімічныя факты (напрыклад, інфармацыя пра змяншэнне частотнасці прозвішчаў на ***-оў/-еў/-аў*** і ***-ін/-ын*** на тэрыторыі Віцебшчыны ў напрамку не строга з усходу на захад, як увогуле на беларускай тэрыторыі, а па дузе – з усходу на поўнач і паўночны захад, а потым – на паўднёвы захад).

Такім чынам, манаграфія звязвае ў адно цэлае дыяхронны і сінхронны падыходы да апісання антрапанімных адзінак пэўнай тэрыторыі. Як вядома, рэгіянальныя даследаванні атрымліваюць у наш час шырокае прызнанне дзякуючы магчымасці рознабаковага выкарыстання вуснамоўнага матэрыялу і дадзеных пісьмовых гістарычных крыніц, што не прадугледжвае глабальная методыка. Таму рэгіянальныя і глабальныя падыходы арганічна ўзаемадзейнічаюць, дапаўняюць і ўдакладняюць адзін аднаго.

Вольга ГУЛІЦКАЯ,
кандыдат філалагічных навук, прафесар.
Алена ПІСАРЭНКА,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

Рыхтуемся да тэсціравання

Уладзімір КУЛІКОВІЧ

КАНТРОЛЬНЫЯ ТЭСТЫ ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ЦЭНТРАЛІЗАВАНАГА ТЭСЦІРАВАННЯ Ў 2007/2008 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ

ФАНЕТЫКА. ГРАФІКА

ГАЛОСНЫЯ І ЗЫЧНЫЯ ГУКІ

Частка А

№ 1. Адзначце словы, у якіх побач знаходзяцца два галосныя гукі:

1) заязджаць
2) рэзервуар
3) індывідуальны
4) біятлон
5) радэо

№ 2. Адзначце словы, у якіх колькасць зычных і галосных гукаў супадае:

1) Маямі
2) арфаэпія
3) тэлефон
4) дзядуля
5) абаўю

№ 3. Адзначце словы, у якіх ёсць два гукі [ы]:

1) бортінжынер
2) з Івановым
3) аб'інелы
4) звышімклівасць
5) міжінстытуцкі

№ 4. Адзначце гукі, якія не могуць знаходзіцца на канцы асобна ўзятага слова:

1) [х]
2) [в]
3) [к]
4) [з']
5) [ы]

№ 5. Адзначце слова, якое складаецца з наступных гукаў: санорны (мяккі)+галосны (націскны)+санорны (мяккі) + галосны (ненаціскны)+шумны (свісцячы)+шумны (глухі)+галосны (ненаціскны):

1) рытміка
2) полаўцы
3) ілісты
4) веялка
5) лёгкія

№ 6. Адзначце словы, дзе ўсе зычныя гукі – глухія:

1) падчапіць
2) дзесьці
3) падвозчык
4) казка
5) куп'ё

№ 7. Адзначце словы, затранскрыбіраваныя няправільна:

1) выбегчы [выб'эхчы]
2) нарэшце [нарэс'ц'э]
3) асфальт [асвал't]
4) Патсдам [Пацдам]
5) субтропікі [субтроп'ік'і]

№ 8. Адзначце словы, у якіх маюцца зацвярдзелыя звонкія гук(і):

1) дождж
2) дрожджы
3) паштовы
4) лічбіна
5) пошчак

№ 9. Адзначце словы, у якіх ёсць толькі два мяккія гукі:

1) Свіцязь
2) маскіроўка
3) падсцілка
4) пад'язджаць
5) сімфонія

№ 10. Адзначце словы з выбухным гукам [г]:

1) розгі
2) згінуць
3) экземпляр
4) пакгауз
5) Гродна

№ 11. Адзначце словы, у якіх няма шумных зычных гукаў:

1) вяроўка
2) зямля
3) рэвальвер
4) ярмо
5) лемантар

№ 12. Вусна перакладзіце на беларускую мову прапанаваныя словы і адзначце толькі тыя, дзе ёсць гук(і) [д] або [т]:

1) детектив
2) диктофон
3) командировать
4) квартира
5) тебя

№ 13. Адзначце словы з прыстаўнымі зычнымі гукамі:

1) вуаль
2) вучнёўскі
3) вуздэчка
4) вольналюбівы
5) вустрыца

№ 14. Адзначце словы з прыстаўнымі галоснымі гукамі:

1) з амшарыны
2) нашы імігранты
3) колер індыга
4) на ржышчы
5) імкненне

№ 15. Адзначце словы, у якіх ёсць фанетычнае падаўжэнне:

1) аддзячыць
2) суддзя
3) ажыннік
4) вараннё
5) пралля

№ 16. Адзначце словы, у якіх ёсць афрыкаты:

1) чарга
2) нумар
3) цэнтнер
4) дзеянне
5) калісьці

№ 17. Адзначце словы, пры змяненні якіх гукі [о], [э] чаргуюцца з нулём гука:

1) чаўн**о**к
2) храбр**э**ц
3) цюл**е**нь
4) хляб**е**ц
5) павуч**о**к

№ 18. Адзначце словы, якія з'яўляюцца прыкладамі фанетычных асаблівасцей беларускай літаратурнай мовы ў параўнанні з рускай:

1) лясны
2) па-людску
3) бадзёрасць
4) ветразь
5) шаўковы

№ 19. Адзначце словы, пры змяненні якіх цвёрдыя зычныя гукі чаргуюцца з мяккімі:
1) заснавальні**к**
2) істуж**к**а
3) італьян**ц**
4) гуш**ч**а
5) дабрабы**т**

№ 20. Адзначце словы, у якіх ёсць шумныя глухія гукі:
1) надвор'е
2) калодзеж
3) цюлень
4) гуталін
5) дабрыня

Частка Б

№ 21. Запішыце тэрмін, які выкарыстоўваецца для называння гукаў [м], [м'], [н], [н'], [в], [в'], [л], [л'], [р], [ў].

№ 22. Запішыце словам, колькі разоў сустракаецца гук [с] у сказе: *Каласок да каласка – і зараз жа снапоў сцірта.*

№ 23. Запішыце ў квадратныя дужкі гукі, якія абазначаюць выдзеленыя літары:
1) бяро**з**ка
2) мун**дз**ір
3) перабе**жч**ык
4) супра**цьд**ымны
5) хрэ**сьб**іны

№ 24. Дапішыце неабходнае: Фанетыка як раздзел мовазнаўства вывучае гукі, склады, інтанацыю і ... .

№ 25. Запішыце, як называецца склад, які заканчваецца на галосны гук.

№ 26. Запішыце ў транскрыпцыі глухія гукі, якія ў беларускай мове не маюць парных звонкіх.

№ 27. Запішыце чатыры словы, якія перададзены фанетычнай транскрыпцыяй:
1) [ношка] – … ; 2) [с'в'этка] – … .

№ 28. Запішыце на месцы пропуску неабходны фанетычны тэрмін: *Сказанага слова да … не вернеш.*

№ 29. Запішыце назву фанетычнага працэсу, з якім звязана з'яўленне амафонаў: *плод – плот, код – кот.*

№ 30. Запішыце патрэбнае слова, каб атрымалася "гукавая прапорцыя":
Грам : _____ = *борт* : *порт*

СКЛАД. СКЛАДАПАДЗЕЛ. АКЦЭНТАЛОГІЯ.

Частка А

№ 1. Адзначце словы, правільна падзеленыя на склады.
1) даб-рыс-ці
2) за-да-чнік
3) кла-доў-ка
4) на-па-чат-ку
5) па-дмя-шаць

№ 2. Адзначце словы, у якіх ёсць склады з аднаго гука:
1) абітурыент
2) яблык
3) сваяцкі
4) званіца
5) ілюстрацыя

№ 3. Адзначце словы, дзе ўсе склады – адкрытыя:
1) Андрэйка
2) Ліда
3) брэсцкі
4) Баранавічы
5) Еўдакія

№ 4. Адзначце словы, у якіх колькасць адкрытых і закрытых складоў супадае:
1) цэнтнер
2) сквапны
3) начлег
4) доктар
5) цудоўна

№ 5. Адзначце словы, у кожным складзе якіх ёсць мяккія гукі:
1) маёрскі
2) аб'яўляць
3) сем'янін
4) унесці
5) ніякі

№ 6. Адзначце радкі, дзе ўсе падкрэсленыя літары абазначаюць націскныя гукі:
1) ды**я**мент, пар**а**ліч
2) за**і**нець, ім**я**
3) адз**і**наццаць, спін**а**
4) спад**ы**спаду, фарт**у**х
5) аднасаст**а**ўны, упрык**у**ску

№ 7. Адзначце словы, якія могуць служыць прыкладамі рухомага націску:
1) бот
2) лес
3) крот
4) бераг
5) восень

№ 8. Адзначце словы з другім націскным складам:
1) аер
2) генезіс
3) гармідар
4) гліняны
5) гваздзікі

№ 9. Адзначце пары слоў-амографаў, якія адрозніваюцца акцэнтуацыйна:
1) расс**ы**паць – рассып**а**ць
2) б**а**цькаўскі – бацьк**о**ўскі
3) м**а**ніць – ман**і**ць
4) г**а**ненне – ган**е**нне
5) з**а**вязка – зав**я**зка

№ 10. Адзначце толькі тыя пары слоў, у якіх першае слова адпавядае акцэнталагічнай норме беларускай літаратурнай мовы:
1) бр**а**тавая – братав**а**я
2) жнів**о** – жн**і**ва
3) заўжд**ы** – з**а**ўжды
4) л**е**карскі – лык**а**рскі
5) в**і**давы – відав**ы**

№ 11. Адзначце толькі тыя пары, у якіх два словы з'яўляюцца нарматыўнымі акцэнталагічнымі дублетамі:
1) н**а**йміт – найм**і**т
2) прам**е**нь – пр**о**мень
3) тр**ы**пціх – трыпц**і**х
4) прас**е**ка – пр**о**сека
5) прыгл**е**дзецца – прыглядз**е**цца

№ 12. Адзначце пары слоў-амаформаў, якія адрозніваюцца пры дапамозе націску сваім лексіка-граматычным значэннем:
1) кав**а**лі – кавал**і**
2) к**а**са – кас**а**
3) м**а**залі – мазал**і**
4) н**а**сып – нас**ы**п
5) р**а**са – рас**а**

№ 13. Адзначце словы, у якіх націск пастаўлены няправільна:
1) таварыскі
2) фурман
3) кулінарыя
4) садавіна
5) шкляны

№ 14. Адзначце словы з другім націскным складам:
1) дасуха 4) арнамент
2) затычка 5) камбайнер
3) анапест

№ 15. Адзначце словы, вымаўленне якіх адпавядае акцэнталагічнай норме сучаснай беларускай літаратурнай мовы:
1) абку́саны 4) пра́дзедаўскі
2) абкуса́ны 5) випа́дак
3) прадзе́даўскі

№ 16. Адзначце словы, вымаўленне якіх не адпавядае акцэнталагічнай норме сучаснай беларускай літаратурнай мовы:
1) су́павы набор 4) суту́лаватасць
2) сутулава́тасць 5) про́паліс
3) супавы́ набор

№ 17. Адзначце словы, якія не адпавядаюць акцэнталагічным нормам сучаснай беларускай літаратурнай мовы:
1) до́чка 4) во́льха
2) дачка́ 5) тала́нт
3) альха́

№ 18. Адзначце словы з першым націскным складам:
1) ракушка 4) нашыўка
2) кляштар 5) нібы
3) пахмурна

№ 19. Адзначце словы з трэцім націскным складам:
1) адзінаццаць 4) параліч
2) чарговы 5) базіліка
3) абутнік

№ 20. Адзначце словы, у якіх націск пастаўлены правільна:
1) мілімéтр 4) шэсцьдзеся́т
2) каштáрыс 5) шчы́пцы
3) крыху́

№ 21. Адзначце словы, у якіх ёсць пабочны націск:
1) мнагалюдны 4) косавугольнік
2) добраўпарадкаванне 5) крывацёк
3) многазарадны

№ 22. Адзначце толькі тыя пары слоў, у якіх другое слова адпавядае акцэнталагічнай норме беларускай літаратурнай мовы:
1) табу́ – та́бу
2) на́сціл – насці́л
3) нікудзы́ – нікуды́
4) на́спех – наспе́х
5) фарфо́р – фа́рфар

№ 23. Адзначце толькі тыя пары слоў, у якіх два словы з'яўляюцца нарматыўнымі акцэнталагічнымі дублетамі:
1) фее́рыя – феерыя
2) узгадава́ны – узгадо́ваны
3) ха́бар – хаба́р
4) цві́лы – цвілы́
5) цагліна́ – цэ́гліна

№ 24. Адзначце словы, у якіх націск пастаўлены няправільна:
1) фу́рман 4) крапі́ва
2) таварыскі 5) кулінáрыя
3) шкля́ны

№ 25. Адзначце словы, у якіх ёсць два націскі:
1) вялікагаловы 4) каменедрабілка
2) велікаслы 5) цеплаабмен
3) каменяломня

№ 26. Адзначце словы з першым націскным складам:
1) лыжня 4) інсульт
2) удалы 5) камбала
3) карыес

№ 27. Адзначце словы з трэцім націскным складам:
1) неабыякі 4) кабура
2) каліграфія 5) мезенец
3) прыгожасць

№ 28. Адзначце словы з чацвёртым націскным складам:
1) садавіна 4) грамадзянін
2) блакітніца 5) сантыметровы
3) карабінер

№ 29. Адзначце пары слоў, у якіх націск выкарыстоўваецца як словаўтваральны сродак.
1) масці́ць – мо́сціць
2) хле́вішча – хлявішча
3) мо́гілкі – магі́лкі
4) велічыні – велічыні́
5) недасы́паць – недасыпа́ць

№ 30. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 2-й асобы множнага ліку абвеснага ладу маюць націскны канцавы склад:
1) спяваць 4) завесці
2) біцца 5) калясіць
3) бласлáвіць

Частка Б

№ 31. Запішыце, як называецца раздзел мовазнаўства, які вывучае націск, яго прыроду, функцыянаванне, асаблівасці і гістарычныя змены.

№ 32. Запішыце, як называецца першы націск у слове *добразычлівы*.

№ 33. Запішыце, як называецца націск, месца якога пры формаўтварэнні можа змяняцца.

№ 34. Запішыце па-беларуску словы *набережная* і *медвежонок*.

№ 35. Запішыце, як называецца склад, што пачынаецца зычным гукам.

№ 36. Запішыце, як называецца склад, што заканчваецца зычным гукам.

ГУКІ І ЛІТАРЫ

Частка А

№ 1. Адзначце словы, у якіх літара *ю* абазначае два гукі:
1) Юрмала 4) баюся
2) сюрпрыз 5) усю
3) інтэрв'ю

№ 2. Адзначце выпадкі, дзе літара *і* абазначае адзін гук [і]:
1) нос і рот 4) аб'інець
2) смех і грэх 5) зіма
3) ішла і маўчала

№ 3. Адзначце словы, у якіх тры літары абазначаюць адзін гук:
1) сцвердзіць 4) абтрасаць
2) бруствер 5) дзядзька
3) мядзведзь

№ 4. Адзначце словы, у якіх *дж* абазначае два гукі [д] і [ж]:
1) паджартаваць 4) аджлукціць
2) джунглі 5) аджгі́р
3) дрожджы

№ 5. Адзначце словы, у якіх маюцца літары, што не абазначаюць гукаў:
1) пер'е 4) адкашляцца
2) кальe 5) вопратка
3) адзінаццаць

№ 6. Адзначце словы з такімі зычнымі гукамі, для якіх у беларускім алфавіце няма асобных літар:
1) настаўнік 4) выхавацелька
2) працэдура 5) сшытак
3) графіка

№ 7. Адзначце гукі, якія на пісьме можна перадаць літарай *з*:
1) [ц'] 4) [с']
2) [з] 5) [ж]
3) [ш]

№ 8. Адзначце гукі, якія на пісьме можна перадаць літарай *б*:
1) [п] 4) [б]
2) [п'] 5) [т]
3) [б']

№ 9. Адзначце словы, у якіх літар больш, чым гукаў:
1) падказка 4) перадсэрдзе
2) казахскі 5) застрашыць
3) французскі

№ 10. Адзначце словы з такімі літарамі, якіх няма ў рускім алфавіце:
1) кароўка 4) згуртавацца
2) балаваць 5) кляновік
3) баечнік

№ 11. Адзначце словы, дзе колькасць гукаў і літар не супадае:
1) батальён 4) нясвіжскі
2) дзядзінец 5) капыльскія
3) міфалогія

№ 12. Адзначце радок, у якім кожная літара абазначае на пісьме толькі адзін гук:
1) ж, л, й, а, ы; 4) й, ў, о, р, у;
2) я, ў, э, з, к; 5) г, й, а, ю, ц.
3) ш, ч, і, ф, м;

№ 13. Адзначце словы, у якіх літара *і* абазначае два гукі [йі]:
1) імгла 4) вераб'іны
2) каляіна 5) Маша ішла
3) ілісты

№ 14. Адзначце словы, у якіх падкрэсленыя літары абазначаюць на пісьме гук [с]:
1) сусе**дс**кі 4) каза**хс**кі
2) **с**вядомасць 5) **с**хіл
3) нарве**жс**кі

№ 15. Адзначце словы, у якіх падкрэсленыя літары абазначаюць на пісьме гук [ы]:
1) зав**і**руха 4) кр**ы**ніца
2) з**і**рні 5) дэз**і**нфармацыя
3) контр**і**гра

№ 16. Адзначце слова, якое ў Тлумачальным слоўніку беларускай літаратурнай мовы будзе стаяць першым:
1) здарэнне 4) здатчык
2) здатны 5) здароўкацца
3) здарыцца

№ 17. Адзначце словы, дзе літара *е* абазначае гук [э] і мяккасць папярэдняга гука:
1) серада 4) чэрвень
2) веранда 5) здолець
3) ельнік

№ 18. Адзначце, якімі літарамі адрозніваюцца словы са значэннем **'**пакаёвая печ з шырокай адкрытай топкай**'** і **'**труба для адводу дыму з печы**':**
1) [у] – [о] 4) [а] – [о]
2) [э] – [а] 5) [к] – [к']
3) [ы] – [і]

№ 19. Адзначце словы, у якіх літара *б* абазначае на пісьме мяккі гук [б']:
1) аб'едкі 4) абледзянелы
2) абедня 5) бетонны
3) аб'ектыў

№ 20. Адзначце словы, у якіх падкрэсленыя літары абазначаюць на пісьме падоўжаны гук [ч]:
1) верталё**тч**ык 4) разно**сч**ык
2) а**дч**апіся 5) у бо**чц**ы
3) су**чч**а

Частка Б

№ 21. Запішыце словамі, колькі літар у беларускім алфавіце.

№ 22. Запішыце, як называецца раздзел мовазнаўства, які вывучае спосабы перадачы вуснай мовы на пісьме.

№ 23. Запішыце, як называецца мінімальная нечлянімая далей адзінка гукавой плыні.

№ 24. Запішыце, якому тэрміну адпавядае наступная дэфініцыя: 'графічны знак, які выкарыстоўваецца для абазначэння на пісьме гука'.

№ 25. Запішыце, як называецца сукупнасць літар, прынятых у мове і размешчаных у пэўным парадку.

№ 26. Запішыце ў транскрыпцыі слова, у якім *дз* абазначае гук [ц]:
1) пэндзаль 4) завадзь
2) Дзвіна 5) дзядзька
3) ксёндз

№ 27. Запішыце, як называюцца ў мовазнаўстве літары *дз* і *дж*.

№ 28. Выпішыце слова, у якім усе зычныя глухія:
1) апазіцыя 4) падкасаць
2) кітаец 5) салодкі
3) бакоўка

№ 29. Выпішыце слова, у якім дзве літары абазначаюць адзін гук:
1) надкусаны 4) перадгор'е
2) белавежскі 5) суддзя
3) іхні

№ 30. Якой літары беларускага алфавіта пастаўлены помнік у г. Полацку?

МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ ПРАВЯДЗЕННЯ ДРУГОГА (РАЁННАГА, ГАРАДСКОГА) ЭТАПУ АЛІМПІЯДЫ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ Ў 2007/2008 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ

XI КЛАС

ЛІНГВІСТЫЧНЫ КОНКУРС

Варыянт I

Заданне 1. Падкрэсліце неабходныя сцвярджэнні.

Максімальная колькасць балаў – 2.

У школьнай практыцы пры класіфікацыі зычных гукаў улічваюцца:

а) спосаб утварэння;

б) удзел голасу і шуму;

в) месца ўтварэння;

г) наяўнасць, адсутнасць палаталізацыі.

Заданне 2. Устаўце, дзе лічыце неабходным, патрэбныя літары ці спалучэнні літар.

Максімальная колькасць балаў – 3 (кожная памылка – мінус 0,5 бала).

П…стмадэрнізм, стэр…тып, ча…чоба, бру…чаты, супя…чанік, в…льнадумства, а…стракцыя, …осеньская …мгла, праяз…ны …льготны.

Заданне 3. Падкрэсліце пары, у якіх словы маюць аднолькавыя канчаткі.

Максімальная колькасць балаў – 3.

1) здароўе – канферансье

2) сталовая – зямля

3) пірагоў – кароў

4) сняцца – заяц

5) сонечны – дажджы

6) Ма́шын – машы́н

7) Пецяў – караляў

8) акно – паліто

Заданне 4. Суаднясіце агульныя значэнні прыметнікаў са словамі, якімі прадстаўлены гэтыя значэнні ў сучаснай беларускай літаратурнай мове.

Максімальная колькасць балаў – 4.

Агульныя значэнні прыметнікаў	Словы
а) ‘разумны, дасціпны’; б) ‘культурны, асвечаны’; в) ‘таленавіты’; г) ‘неадукаваны, некультурны’	1) прымітыўны, 2) выхаваны, 3) кемлівы, 4) адораны, 5) мазгавіты, 6) шэры, 7) здольны, 8) інтэлігентны

а)	в)
б)	г)

Заданне 5. Падбярыце аднаслоўныя сінонімы да наступных вядомых фразеалагізмаў. Запішыце.

Максімальная колькасць балаў – 3.

1. Вадой не разальеш – _____;
2. Лісам падшытыя – _____;
3. Блёкату аб’еліся – _____;
4. Біць лынды – _____;
5. Цюцелька ў цюцельку – _____;
6. Душа ў душу – _____.

Заданне 6. Запішыце ў табліцу лексіка-граматычныя разрады слоў з двума-трыма прыкладамі, якія выкарыстоўваюцца ў сучаснай беларускай літаратурнай мове для выражэння прыналежнасці.

Максімальная колькасць балаў – 3.

Лексіка-граматычныя разрады слоў	Прыклады

Заданне 7. Прапанаваныя словазлучэнні замяніце сінанімічнымі. Запішыце.

Максімальная колькасць балаў – 3.

поле аўса	
песня шпака	
імяніны сына	
размова па тэлефоне	
гладзь ракі	
подзвіг Алеся	

Заданне 8. Падкрэсліце безасабовыя сказы.

Максімальная колькасць балаў – 4.

1. Так яно і было: Рыгор і Піліп сябравалі даўно.

2. Ужо даўно развіднела, сонца з-за гор яшчэ не паказалася, але бясхмарнае неба ўгары, здавалася, аж звінела яркасцю ранішняга блакіту. (*В. Быкаў*)

3. У Цімошкіна схаладзела скрозь унутры, пасля нейкім гарачым варам пляснуўся ў душу спалох. (*В. Быкаў*)

4. На змярканні з-за лесу напаўзлі шызыя змрочныя хмары. Сваім шчыльным цяжарам яны зусім загрувасцілі неба, затулілі блішчастую шчыліну над касагорам; стала пагрозліва, трывожна і сцюдзёна. (*В. Быкаў*)

Заданне 9. Запішыце назву твора, імя і прозвішча аўтара, імя героя, якому належаць словы:

Максімальная колькасць балаў – 3.

А дзе ж той выхад? дзе збавенне
З няволі цяжкай, з паланення?
Адзін ён ёсць: зямля, зямля,
Свой пэўны кут, свая ралля:
То – наймацнейшая аснова
І жыцця першая ўмова.
Зямля не зменіць і не здрадзіць,
Зямля паможа і дарадзіць.

Адказ: _____

Варыянт II

Заданне 1. Спалучыце адпаведным чынам лічбы і літары.

Максімальная колькасць балаў – 3.

1. Гук [р]	а) плаўны(я)
2. Зычныя [в], [в′], [ў], [л], [л′], [й]	б) насавы(я)
3. Гукі [м], [м′], [н], [н′]	в) дрыжачы(я)
4. Гукі [ж], [ш], [дж], [ч]	г) губны(я)
5. Гукі [з′], [б′], [к′], [г′], [х′]	д) мяккі(я)
6. Гукі [б], [п], [м], [ф], [в], [ф′], [в′]	е) шыпячы(я)

Адказ: 1. __ , 2. __ , 3. __ , 4 __ , 5. __ , 6. __ .

Заданне 2. Генадзь Кляўко ў вершы "Слова" пісаў: "*У кожным слове корань ёсць…*". Графічна абазначце марфемы ў наступных парах слоў.

Максімальная колькасць балаў – 4.

Асець – засеяць, душавы – душэўны, замкавы – замкнёны, імшыць – імшара, пакойчык – спакойны, перадгор'е – гора, дранік – дранка, падводны – адводак.

Заданне 3. Суаднясіце агульныя значэнні прыметнікаў са словамі, якімі прадстаўлены гэтыя значэнні ў сучаснай беларускай літаратурнай мове.

Максімальная колькасць балаў – 4.

Агульныя значэнні прыметнікаў: **а)** 'разумны, дасціпны': **б)** 'культурны, асвечаны'; **в)** 'таленавіты'; **г)** 'неадукаваны, некультурны'.

Словы: 1) *цывілізаваны*, 2) *цямлівы*, 3) *дзікі*, 4) *геніяльны*, 5) *талковы*, 6) *абмежаваны*, 7) *творчы*, 8) *цікавы*.

а)	в)
б)	г)

Заданне 4. Замест слоў, змешчаных у дужках, запішыце фразеалагізмы з адпаведным значэннем, у складзе якіх маецца слова *рука* (*рукі*).

Максімальная колькасць балаў – 4.

1. Сёння ні адзін выпадак, ні адна спроба (*незаконна захапіць што-небудзь, карыстацца чым-небудзь чужым*=) _____ ў грамадскую кішэню не павінна застацца без рэагавання. 2. Пасля слоў дырэктара хлопцы (*прыйшлі да пагаднення*=) _____, і закіпела работа. 3. "Колькі можна сядзець (*бяздзейна, нічога не робячы*=) _____?" – запытала маці ў дачкі. 4. Адну параду хацелася б даць удзельнікам алімпіяды: калі што-небудзь не будзе атрымлівацца, не (*трацьце здольнасці, жадання займацца чым-небудзь*=) _____ _____.

Заданне 5. Замест назоўнікаў, змешчаных у дужках, запішыце ўтвораныя ад іх прыналежныя прыметнікі.

Максімальная колькасць балаў – 5.

1. Галінку ўсцешыў (*свякроў*) → _____ _____ падарунак. 2. Я толькі дзіву даваўся, куды падзявалася (*старшыня*) → _____ высакамернасць. 3. (*Суддзя*) → _____ _____ рашэнне збянтэжыла хлопца. 4. На сустрэчу з кіраўніком фірмы прыйшлі (*цётка*) → _____ унук Валодзя і (*санітарыха*) → _____ Пецька.

Заданне 6. Прачытайце словазлучэнні. Замяніце іх так, каб пры гэтым змяніўся і спосаб сувязі.

Максімальная колькасць балаў – 3.

Каменны дом –
Беларуская гаворка –
Час пасля абеду –
Сустрэць сябра –
Сельскія жыхары –
Сустрэліся днём –

Заданне 7. Запішыце ў табліцу, да якой часціны мовы адносяцца выдзеленыя словы ў словазлучэннях і сказах, прыведзеных парамі.

Максімальная колькасць балаў – 6.

1. а) **адзін**, а не два сканеры – б) цяпер я **адзін;**

2. а) беларусы – шчырыя **людзі** – б) у цябе ўсё не так, як у **людзей;**

3. а) праблемы вырашылі **па-добраму** – б) бегалі **па добрым** полі;

4. а) **свае** дзеці – б) на сходзе прысутнічалі толькі **свае;**

5. а) **усё** ў жыцці мяняецца – б) я **ўсё** думаю пра нас;

6. а) **жах** апанаваў натоўпам – б) **жах**, як шмат народу!

№	Часціна мовы	Часціна мовы
1.	а)	б)
2.	а)	б)
3.	а)	б)
4.	а)	б)
5.	а)	б)
6.	а)	б)

Заданне 8. Аформіце тэкст у адпаведнасці з арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі нормамі.

Максімальная колькасць балаў – 6.

За кожную памылку здымаецца 0,5 бала.

Калыханка

Самыя першыя ўражанні, што гл…бока западаюць яшчэ не ў свядомасць н…маўляці, а ў яго пачуцці – гэта гукі. Паступова ў гукавым наваколлі спярша бязладным і н…стройным слых пачынае адрозніваць той парадак, што падначальваецца рытму дыхання, а потым – настрою. Перш чым зразумець слова, дзіця авалодвае мовай гукаў.

Натуральна, што адгэтуль пачынаюцца вытокі эмацы…нальнага фармавання чалавека. Мілагучнасць, суладнасць, гармонія, адкрытыя раней за слова – стартавая пляцоўка для ўзнікнення думкі.

Задоўга да таго як дзіця пачне гаварыць, яно ўжо адчувае м…лодыю, чуйна адгукаецца на той настрой, які нясе песня. Дзіця само пачынае спяваць.

У народзе пра гэты перыяд гавораць больш вобразна дзіця гудзе! Цікава, што ў славянскіх мовах слова гудзьба (гудба) і ёсць – музыка.

Калі бывае чуеш, як маладыя бацька і маці з жалем скардзяцца, што іх дачц… ці сыну "мядзведзь вуха адтаптаў", так і хочацца сказаць: не мядзведзь, а вы, паважаныя! Калі дзіця з першых дзён не жыло ў свеце хараства гукаў, не чула вашых лепшых песен…, цяжка, ой, як цяжка будзе яму самому набыць гэтыя душэўныя багацці!

Ніякія спецыялісты не паставяць голасу, калі ў чалавека змалку, з пялёнак не пастаўлены слых!

Нашы маці цераз вопыт многіх пакаленняў добра ведалі, што першаасновы душэўнага хараства чалавека пачынаюцца з калыскі, з той самай простай, гені…льнай у сваёй мудрасці і паэтычнасці пес…ні, якая называецца – калыханка.

Як жа крыўдна, што сучасныя маці так рэдка спяваюць калыханкі сваім дзецям, што многія з іх самі

не чулі калыханак, створаных і сагрэтых ма…чынымі сэрцамі.

Нашы маладыя маці збядняюць душы сваіх дзяцей, калі думаюць, што калыханку можна замяніць любой бяздумнай песен…кай.

Ад свайго нараджэння чалавек павінен адчуваць, што ўсё самае прыгожае ў жыцці створана дзеля яго …часця.

В. Вітка.

Заданне 9. 125-годдзе з дня нараджэння якіх пісьменнікаў адзначалася ў 2007 годзе? Запішыце іх прозвішчы, імёны і імёны па бацьку.

1 бал за кожнае правільна запісанае прозвішча, імя, імя па бацьку.

_____

_____

_____

_____

_____

Заданне 10. Прыгадайце 10 назоўнікаў на ***-ын-*** (***-ін-***), 5 з якіх абазначалі б прозвішчы вядомых беларускіх пісьменнікаў, 5 – назвы населеных пунктаў. Запішыце ў табліцу гэтыя назоўнікі ў форме творнага склону. Прозвішчы пісьменнікаў укажыце разам з імёнамі.

Максімальная колькасць балаў – 5.

Прозвішчы пісьменнікаў	Назвы населеных пунктаў
1.	1.
2.	2.
3.	3.
4.	4.
5.	5.

ТЭКСТ ДЛЯ ВОДГУКУ
ЗЯМЛІ

Крылы вечнасці – лебядзіныя.
Ў зоры вышыта далеч небная.
Не знайсці другой, ты адзіная,
Ты – радзінная,
Пахка-хлебная.
Між чужых планет, што самотаю
Апавітыя безжыццёваю,
Чалавечых душ свеціш цнотаю,
Будзіш выш нябёс
Спеўнай моваю.
Не бясплодная – першародная,
Мнагадзетная, мерыш крокамі
Даль шляхоў сваіх. І, халодная,
Укрываешся бель-аблокамі.
Не займець другой. Ты – адзіная,
Ты сынам сваім так патрэбная.
Крылы вечнасці – лебядзіныя.
Ў зоры вышыта
Далеч небная.

Мікола Мятліцкі.

ДАВЕДКІ
ВАРЫЯНТ І

Заданне 1.

а) спосаб утварэння;

б) **удзел голасу і шуму**;

в) месца ўтварэння;

г) **наяўнасць, адсутнасць палаталізацыі**.

Заданне 2.

П**о**стмадэрнізм, стэр**э**атып, ча**ш**чоба, бру**с**чаты, супя**с**чанік, в**а**льнадумства, а**б**стракцыя, восеньская **і**мгла, праязны льготны.

Заданне 3.

1) здароў-е – канферансье	5) сонечн-**ы –** даждж-**ы**
2) сталов-ая – зямл-я	6) Ма́шын-**Ø –** машы́н-**Ø**
3) піраг-оў – кароў-Ø	7) Пец-**яў** (*мн.лік. ад Пеця*) – карал-**яў**
4) сн-яц-ца – за-яц-Ø (*зай-ац*)	8) акн-о – паліто

Заданне 4.

а) 3 (кемлівы), 5 (мазгавіты).	в) 4 (адораны), 7 (здольны).
б) 2 (выхаваны), 8 (інтэлігентны).	г) 1 (прымітыўны), 6 (шэры).

Заданне 5.

1. Вадой не разальеш – *дружныя, неразлучныя*.
2. Лісам падшытыя – *хітрыя*.
3. Блёкату аб'еліся – *ашалелі*.
4. Біць лынды – *гультаяваць; бяздзейнічаць*.
5. Цюцелька ў цюцельку – *дакладна*.
6. Душа ў душу – *дружна*.

Заданне 6.

Лексіка-граматычныя разрады слоў	Прыклады
Адносна-прыналежныя прыметнікі:	*братаў* веласіпед, *зайцаў* след, *казінае* малако, *сыноўняя* ўдзячнасць, *дзіцячыя* галасы, *цялячы* хлеў, *вучнёўскі* сшытак, *свіны* піск.
Прыналежныя займенні:	*наш* клас, *свайго* народа, *яго* кнігі, *твае* мары, *іх* дзеці.
Назоўнікі:	паліто *Наташы*, грэбень *пеўня*, хатка *бабра*, усмешка *бабулі*.

Заданне 7.

поле аўса	аўсянае поле
песня шпака	шпачыная (шпакова) песня
імяніны сына	сынавы імяніны
размова па тэлефоне	тэлефонная размова
гладзь ракі	рачная гладзь
подзвіг Алеся	Алесеў подзвіг

Заданне 8.

1. **Так яно і было**: Рыгор і Піліп сябравалі даўно.

2. **Ужо даўно развіднела**, сонца з-за гор яшчэ не паказалася, але бясхмарнае неба ўгары, здавалася, аж звінела яркасцю ранішняга блакіту. (*В. Быкаў*)

3. **У Цімошкіна схаладзела скрозь унутры**, пасля нейкім гарачым варам пляснуўся ў душу спалох. (*В. Быкаў*)

4. На змярканні з-за лесу напаўзлі шызыя змрочныя хмары. Сваім шчыльным цяжарам яны зусім загрувасцілі неба, затулілі блішчастую шчыліну над касагорам; **стала пагрозліва, трывожна і сцюдзёна.** (*В. Быкаў*)

Заданне 9.

Паэма "Новая зямля"; Канстанцін Міцкевіч; Міхал.

ВАРЫЯНТ ІІ

Заданне 1.

1. **в** , 2. **а** , 3. **б** , 4. **е** , 5. **д** , 6. **г**.

Заданне 2.

душ-ав-ы́ – *душ*-эўн-ы*	*асець*-Ø* – за-*се*-я-ць
пакой-чык-Ø – с-*пакой*-н-ы	*за́мк*-ав-ы – за-*мк*-н-ён-ы
перад-*гор'*-(j)е – *гор*-а	*імш*-ы-ць – *імш*-ар-а*
пад-*вод*-н-ы – ад-*вод*-ак-Ø *	*др*-а-н-ік-Ø – *др*-а-н-к-а*

Каментарый.

**Адводак* – 1) галінка або частка кораня з вочкамі, пасаджаныя асобна для самастойнага росту; 2) пчаліны рой, які толькі што ўтварыўся і аддзяліўся ад старога.

**Асець* – памяшканне пры гумне для сушкі снапоў перад малацьбой.

**Душэўны* – поўны шчырай прывязанасці.

**Імшыць* – перакладваць мохам бярвёны; *імшара* – мохавае балота.

**Дранка* – тонкая драўляная дошчачка для крыцця даху або для абівання сцен пад тынкоўку; *дранік* – блін з дранай бульбы.

Заданне 3.

а) 2 (цямлівы), 5 (талковы).	в) 4 (геніяльны), 7 (творчы).
б) 1 (цывілізаваны), 8 (цікавы).	г) 3 (дзікі), 6 (абмежаваны).

Заданне 4.

1. Сёння ні адзін выпадак, ні адна спроба (*незаконна захапіць што-небудзь, карыстацца чым-небудзь чужым*=) **запусціць руку** ў грамадскую кішэню не павінна застацца без рэагавання. 2. Пасля слоў дырэктара хлопцы (*прыйшлі да пагадненя*=) **ударылі па руках**, і закіпела работа. 3. "Колькі можна сядзець (*бяздзейна, нічога не робячы*=) **склаўшы рукі**?" – запытала маці ў дачкі. 4. Адну параду хацелася б даць удзельнікам алімпіяды: калі што-небудзь не будзе атрымлівацца, не (*трацьце здольнасці, жадання займацца чым-небудзь*=) **апускайце рукі**!

Заданне 5.

1. Галінку ўсцешыў (*свякроў*) → **свякровін** падарунак. 2. Я толькі дзіву даваўся, куды падзявалася (*старшыня*) → **старшынёва** высакамернасць. 3. (*Суддзя*) → **Суддзёва** (**судзейскае**) рашэнне збянтэжыла хлопца. 4. На сустрэчу з кіраўніком фірмы прыйшлі (*цётка*) → **цётчын** унук Валодзя і (*санітарыха*) → **санітарышын** Пецька.

Заданне 6.

Каменны дом – *дом з каменю;* беларуская гаворка – *гаворка па-беларуску*; час пасля абеду – *пасляабедзенны час;* сустрэць сябра – *сустрэць па-сяброўску*; сельскія жыхары – *жыхары сяла*; сустрэліся днём – *дзённая сустрэча.*

Заданне 7.

№	Часціна мовы	Часціна мовы
1.	а) *лічэбнік*	б) *прыметнік*
2.	а) *назоўнік*	б) *займеннік*
3.	а) *прыслоўе*	б) *прыназоўнік + прыметнік*
4.	а) *займеннік*	б) *назоўнік*
5.	а) *займеннік*	б) *часціца*
6.	а) *назоўнік*	б) *выклічнік*

Заданне 8.

Калыханка

Самыя першыя ўражанні, што гл**ы**бока западаюць яшчэ не ў свядомасць н**е**маўляці, а ў яго пачуцці**,** – гэта гукі. Паступова ў гукавым наваколлі**,** спярша бязладным і н**я**стройным**,** слых пачынае адрозніваць той парадак, што падначальваецца рытму дыхання, а потым – настрою. Перш чым зразумець слова, дзіця авалодвае мовай гукаў.

Натуральна, што адгэтуль пачынаюцца вытокі эмацы**я**нальнага фармавання чалавека. Мілагучнасць, суладнасць, гармонія, адкрытыя раней за слова**,** – стартавая пляцоўка для ўзнікнення думкі.

Задоўга да таго, як дзіця пачне гаварыць, яно ўжо адчувае м**е**лодыю, чуйна адгукаецца на той настрой, які нясе песня. Дзіця само пачынае спяваць.

У народзе пра гэты перыяд гавораць больш вобразна: дзіця гудзе! Цікава, што ў славянскіх мовах слова *гудзьба* (*гудба*) і ёсць – музыка.

Калі**,** бывае**,** чуеш, як маладыя бацька і маці з жалем скардзяцца, што іх дачцэ ці сыну "мядзведзь вуха адтаптаў", так і хочацца сказаць: не мядзведзь, а вы, паважаныя! Калі дзіця з першых дзён не жыло ў свеце хараства гукаў, не чула вашых лепшых песен**ь**, цяжка, ой, як цяжка будзе яму самому набыць гэтыя душэўныя багацці!

Ніякія спецыялісты не паставяць голасу, калі ў чалавека змалку, з пялёнак не пастаўлены слых!

Нашы маці цераз вопыт многіх пакаленняў добра ведалі, што першаасновы душэўнага хараства чалавека пачынаюцца з калыскі, з той самай простай, геніяльнай у сваёй мудрасці і паэтычнасці песні, якая называецца – калыханка.

Як жа крыўдна, што сучасныя маці так рэдка спяваюць калыханкі сваім дзецям, што многія з іх самі не чулі калыханак, створаных і сагрэтых мат**ч**нымі сэрцамі.

Нашы маладыя маці збядняюць душы сваіх дзяцей, калі думаюць, што калыханку можна замяніць любой бяздумнай песен**ь**кай.

Ад свайго нараджэння чалавек павінен адчуваць, што ўсё самае прыгожае ў жыцці створана дзеля яго **ш**часця.

В. Вітка.

Заданне 9.

Іван Дамінікавіч Луцэвіч,
Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч.

Заданне 10.

Прозвішчы пісьменнікаў	Назвы населеных пунктаў
1. *Рыгорам Барадуліным*	1. *Жлобінам* (Жлобін)
2. *Генадзем Бураўкіным*	2. *Княгінінам* (Княгінін)
3. *Алегам Мінкіным*	3. *Старобінам* (Старобін)
4. *Уладзімірам Скарынкіным*	4. *Столінам* (Столін)
5. *Іванам Шамякіным*	5. *Лагішынам* (Лагішын)

Падрыхтаваў **Уладзімір КУЛІКОВІЧ.**

Вуснае выказванне

ВІНЦЭНТ ДУНІН-МАРЦІНКЕВІЧ

У кожнага народа ёсць людзі-паходні, людзі-зоркі, якія праз усё жыццё праносяць палымянае імкненне да праўды, дасканаласці, перадаюць яго наступнікам, прадаўжальнікам справы сваёй, каб гэты жар цягі да вяршыняў гарэў ярчэй, абуджаў усё больш душаў да творчасці, дабрыні, прыгажосці. Такой была Еўфрасіння Полацкая – асветніца Сярэднявечча, нябесная заступніца зямлі беларускай, такім стаў тытан Рэнесансу Францыск Скарына, такім быў і Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч – паэт, празаік і драматург, стваральнік беларускага тэатра, першы прафесійны пісьменнік нашага краю, асветнік, грамадскі дзеяч, адзін з пачынальнікаў новае беларускае літаратуры.

Менавіта на яго лёсам была ўскладзена вялікая адказнасць – стаць першым. Высакародна і мужна ён выканаў свой абавязак пачаць, абудзіць, закласці падмурак новага мастацкага слова. Заўсёды нялёгка і рызыкоўна ісці па цаліку, а не па прапаранам шляху, пракладаць сваю сцяжыну, каб потым яна стала для нашчадкаў шырокай дарогаю, пазбавіўшыся смецця, пераўтварылася ў сапраўдную пуцявіну нацыянальнага мастацтва. Першым каменем, які Дунін-Марцінкевіч заклаў у брук новага літаратурнага тракту Беларусі, стала родная мова – аснова культуры народа, скарбонка мудрасці і крыніца вобразаў. Дзякуючы Беларускаму Дудару (менавіта так яго называюць Уладзімір Мархель, Язэп Янушкевіч) акрыленыя матчыным словам Максім Багдановіч, Янка Купала і Якуб Колас на цэлы свет абвясцілі права беларусаў "людзьмі звацца". Яркі талент Навума Прыгаворкі (а гэта ўжо псеўданім, прыдуманы самім Марцінкевічам) прывёў да сцэны тэатра Ігната Буйніцкага, Уладзіслава Галубка – людзей, чые імёны ведаюць далёка за межамі нашай краіны. Адчуваючы неабходнасць пісаць, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч наважыўся цалкам прысвяціць сябе літаратуры – знайшоўшы мужнасць кінуць казённую службу, стаў першым прафесійным пісьменнікам нашай зямлі.

Але мне хочацца расказаць пра тое, якім чалавекам быў Беларускі Дудар, якая была яго душа, якія погляды ён падзяляў, да чаго імкнуўся, у што верыў – адным словам, якой асобаю быў вялікі пачынальнік.

Перш за ўсё, мне хацелася б адзначыць такую рысу характару Дуніна-Марцінкевіча, як мэтанакіраванасць. Праз палову жыцця ён пранёс у душы жаданне тварыць: у 1840 годзе з вялікімі намаганнямі купіў маёнтак Люцынка, пакінуў службу і цалкам прысвяціў сябе слову. Не маючы галоўнай зброі мастака – распрацаванай літаратурнай мовы – ён не выракся яе, з кожным новым творам адточваў сваё веданне гаворкі народа, сярод якога жыў, выбіраў з яе самыя дасціпныя, яркія выразы, каб іх пачулі са сцэны тэатра, зацікавіліся, а мову прызналі не мужыцкай і сярмяжнай, а сапраўды багатай і вартай далейшага ўдасканалення.

Гэта патрабавала ад яго вялікай мужнасці – абавязковай прыкметы першаадкрывальніка, асветніка. Каб асэнсаваць гэтую якасць Марцінкевіча, варта звярнуцца да таго часу, на які прыпала яго творчая дзейнасць: XIX стагоддзе – "чорны перыяд" для беларускай культуры. Пасля паўстання 1830 – 1831 гадоў закрыты Віленскі універсітэт, забаронена ўжываць назву "Беларусь", выкладанне ў "Северо-Западном" краі вядзецца выключна па-руску. Пасля 1863-га – зноў настае лютая рэакцыя. У такія часы Дунін-Марцінкевіч перакладае на родную мову "Пана Тадэвуша" – паэма Адама Міцкевіча ўпершыню гучыць на ўсходнеславянскай мове, пераклад стаў адным з найкаштоўнейшых здабыткаў не толькі беларускай, але і еўрапейскай літаратуры. Пасля канфіскацыі "Пана Тадэвуша" перакладчык праяўляе сябе і мужным бацькам: безумоўна, ён не мог не ведаць пра тое, што чакала Камілу за ўдзел у паўстанні Кастуся Каліноўскага – ён працаваў некалі ў следчых і судовых установах, сам не раз прыцягваўся да справы, – але, разумеючы шчырыя памкненні дачкі, не забараняў гэтага, спачуваў і часам дапамагаў – выпусціў яе руку са сваёй, даў магчымасць ужо дарасламу чалавеку будаваць жыццё адпаведна сваім марам і ўяўленням. Крыху пазней Беларускі Дудар праяўляе сябе і непахісным дзеячам асветы: у Люцынцы адкрыў сялянскую школу, кажучы словамі яго навучэнца Антона Лявіцкага, умеў заахвочваць да навукі, строіць жарты, апавядаць пра Бацькаўшчыну. Такая шчырая дзейнасць: пісанне па-беларуску, далучэнне да нацыянальнага руху, адкрыццё школы – выглядала выклікам у бок афіцыйных уладаў, а для літаратуры і людзей, што жылі побач, для гісторыі Беларусі гэта стала, па словах Алега Лойкі, "вялікай грамадзянскай мужнасцю".

Як бачым, Дунін-Марцінкевіч быў таленавітым змагаром за годнасць беларуса, асобай мужнай, з якой пажыццёва заставалася імкненне да самаўдасканалення, дасягнення мэтаў, падпарадкаваных яго грамадзянскай і творчай пазіцыі.

Светапогляд вялікага пачынальніка выявіўся ў яго творах: пачаўшы пісаць у рамантычным накірунку, сентыментальна, потым ён стварыў першыя рэалістычныя творы беларускай літаратуры – ад "Ідыліі" і "Гапона" да "Пінскай шляхты". Патрыёт, ён не мог не турбавацца пра далейшыя адносіны шляхціца і селяніна – пра лёс тагачаснага грамадства. Безумоўна, Марцінкевіч, жывучы ў народным асяроддзі, адчуваў неабходнасць зменаў. Але будучы дваранінам, прадстаўніком інтэлігенцыі, не падтрымліваў рэвалюцыйныя ідэі. Для Марцінкевіча характэрна своеасаблівая ідэалізацыя памешчыкаў, паказ іх імкнення дапамагчы селяніну: Пані з паэмы "Гапон" – увасабленне дабрыні і спагады, Юлія здольна пераапрануцца ў сялянку, яна верыць, што можа прывабіць Лятальскага народнай шчырасцю, дабрынёю, моваю. Мабыць, гэта абумоўлена тым, што сам Марцінкевіч быў такім шляхціцам і адпаведна ўяўляў астатніх, а несправядлівасць і гаротнае становішча простага люду тлумачыў злосцю, сквапнасцю, прагай да нажывы цівуноў, аканомаў, войтаў. З другога боку,

Дунін-Марцінкевіч разумеў, да чаго прыводзіць любая ўзброеная барацьба, чым бы яна ні скончылася – перамогай ці паражэннем. Гэта, перш за ўсё, забойствы людзей, прыхільнікаў адной веры, адной краіны, сялян, узброеных косамі, сялянамі, апранутымі ў салдацкі мундзір, ці наадварот. Узняўшы голас супраць прыгону і не згаджаючыся з рэвалюцыяй, Марцінкевіч паказаў неабходнасць, перш за ўсё, чалавечых адносін адно да аднаго. Ён лічыў, што міру, гармоніі між памешчыкам і селянінам, увогуле між людзьмі, можна дасягнуць праз асвету: на яго погляд, дастаткова належным чынам расказаць пану пра багацце ўнутранага свету селяніна, яго мудрасць, вопыт, назапашаны стагоддзямі, – таму мова Навума Прыгаворкі, Марысі, Грышкі і Гапона такая багатая на прыказкі, таму ў Люцынцы Беларускі Дудар адкрывае школу – ён адзін з першых, хто прынёс ідэі гуманізму і асветніцтва ў нашу літаратуру.

Той запал прагі да справядлівасці і праўды, прыгажосці і гармоніі высакародна палае імёнамі Кастуся Каліноўскага, Францішка Багушэвіча, Янкі Купалы, Уладзіміра Караткевіча, Максіма Танка, Васіля Быкава, Рыгора Барадуліна, Сяргея Законнікава... Шмат яшчэ імёнаў можна будзе паставіць у адзін рад з гэтымі, але нельга таго зрабіць з другога краю: для новай беларускай літаратуры назаўсёды адзіным застанецца імя чалавекалюбцы, асветніка, грамадзяніна, патрыёта, мужнага і адданага працаўніка Вікенція Дуніна-Марцінкевіча – фундатара шляху сучаснага мастацкага слова, вольнага і гучнага, пра якое ён марыў, якое ствараў.

Любоў ПАДПОРЫНАВА,
вучаніца 11-га класа гімназіі № 1 г. Барысава,
сакавік 2007.

З узорамі вусных выказванняў і заданняў для лінгвістычнага конкурсу больш падрабязна можна пазнаёміцца ў кнізе "Алімпіяды па беларускай мове" (склад. У. Куліковіч. Мінск: Аверсэв, 2007).

Водгук на мастацкі твор

Сяргей КРАСОЎСКІ

АСУДЖАНЫ НА НЕЎМІРУЧАСЦЬ

ДОСВЕД ПРАЧЫТАННЯ АДНАГО ВЕРША

УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ

Жыццялюб, фантазёр і рамантык відушчы,
Не сябе шанаваў, не сабой даражыў –
Са стагоддзяў ён нёс, нібы з чорнае пушчы,
Кветку матчынай чыстай душы.

Толькі сэрцам кранаў – і легенды сівыя
Не з Афінаў выходзілі, звалі не ў Рым –
Паўставалі ахвярныя, вечна жывыя
Каліноўскі, Машэка, Багрым.

Сэрцам кветкі кранаўся – і дзівосныя фарбы,
Гукі матчынай песні служылі яму,
А ці толькі яму, калі шчодрыя скарбы
Раздаваў ён сусвету ўсяму.

Чарадзей легендарнае волі і сілы,
Ён чароўную кветку як вока бярог.
Смерць раптоўна, як колас, пад корань скасіла,
Ён – як колас – яе перамог.

Гэты верш Васіля Жуковіча называецца проста і ўадначас сімвалічна – "Уладзімір Караткевіч". Аўтар словамі, быццам мастак фарбамі, спрабуе накідаць, увекавечыць жывы фізічны партрэт Паэта і паралельна зрабіць гранічна дакладны малюнак духоўнага аблічча Паэта. Мы ўвачавідкі можам назіраць Караткевіча-чалавека (мы ж усе – чалавекі!): "жыццялюб, фантазёр". Ён той, хто (паводле Р. Барадуліна) "асцярогу не любіў пасці, каго любіла доля ветравая".

Аднак мы бачым, што ўжо ўзгаданыя намі першыя два назоўнікі-азначэнні пачынаюць і завяршаюць апісанне зямной іпастасі героя. Ужо ў трэцім радку першай страфы ўзнікае ўласнапаэтычнае: вобраз Караткевіча – надчасавага падарожніка, руплівага збіральніка скарбаў зямлі беларускае, адданага сына, бо:

… Са стагоддзяў ён нёс, нібы з чорнае пушчы,
Кветку матчынай чыстай душы.

Уладзімір Караткевіч, які *"не сябе шанаваў, не сабой даражыў"* (2-і радок першай страфы), паступова ў вершы набывае рысы легендарнага волата, якасці, атрыбуты сапраўднага казачнага героя. Ён хоць і рамантык, але рамантык відушчы, надзелены дарам усёбачання, усёведання. Ён – усёмагутны чарадзей, яму падуладна нават мінулае, ён можа яго ўваскрэсіць, бо

Толькі сэрцам кранаў – і легенды сівыя
Не з Афінаў выходзілі, звалі не ў Рым –
Паўставалі ахвярныя, вечна жывыя
Каліноўскі, Машэка, Багрым.

У гэтай (другой) страфе аўтар звяртае ўвагу свайго чытача-сучасніка на важную і важкую акалічнасць, а менавіта на тое, што У. Караткевіч-чарадзей абуджаў да жыцця зусім не старажытнагрэчаскіх ці старажытнарымскіх гістарычных персанажаў, а ўдыхнуў жыццядайную сілу ў гераічныя постаці з беларускага пантэона барацьбітоў-тытанаў, дзякуючы якім і праз якіх сёння мы ёсць нацыя. Дзякуючы яму нам не так адзінока і страшна ў пякельным агні і ў лютым холадзе неахопнай Гісторыі, як бывае ўтульна і ціхамірна нам у паўсядзённым кругабегу, пакуль нашы бацькі, нібы мур, стаяць паміж намі і невядомым, непазбежным небыццём.



Сяргей Іванавіч Красоўскі *– старшы выкладчык кафедры сусветнай літаратуры і культуралогіі Полацкага дзяржаўнага універсітэта. Закончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1991), аспірантуру пры ім (2000). Працаваў малодшым навуковым супрацоўнікам Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, дырэктарам Навапалацкага краязнаўчага музея. Выступае ў друку з вершамі і артыкуламі.*

Але ні ў якім разе не трэба думаць, што В. Жуковіч спрабуе "прызямліць", наўмысна прывязаць У. Караткевіча выключна толькі да тутэйшага, хоць і роднага. Наступная страфа верша сцвярджае якраз адваротнае: аўтар падзяляе тэзу М. Бярдзяева, які ў свой час слушна адзначыў, што "творчы нацыянальны шлях і ёсць шлях да ўсечалавецтва", а "гістарычны лёс народаў і ўсяго чалавецтва ёсць мой лёс, я ў ім і ён ува мне"[1].

Мала таго, аўтар, як бы спалохаўшыся гэтага нявольнага "звужэння" ролі зямной місіі У. Караткевіча, спяшаецца паведаміць чытачу, што ўсе высакародныя сэрцы, адкрытыя пачуццю прыўкраснага, маглі і могуць у будучым спатоліць прагу духоўнага, чыстага гаючай вадой з Караткевічавай крыніцы, гэта значыць, з ягонай творчай спадчыны.

Сэрцам кветкі кранаўся – і дзівосныя фарбы,
Гукі матчынай песні служылі яму,
А ці толькі яму, калі шчодрыя скарбы
Раздаваў ён сусвету ўсяму.

Перачытаем: *"Шчодрыя скарбы раздаваў ён сусвету ўсяму"*. А іначай і не магло быць! Ні суб'ектыўна, па-чалавечы (зашырокі ён быў у мысленні і ў праяўленні сваёй душы!), ні аб'ектыўна, бо, як трапна зазначаў Адам Мальдзіс: "Сваё, айчыннае, нацыянальнае, у Караткевіча арганічна спалучалася з агульнаеўрапейскім і агульначалавечым"[2]. А гэта ўжо адзнака наднацыянальнага, планетарна-геніяльнага. Крыху іншымі словамі амаль тую самую думку сцвярджае і Вольга Шынкарэнка, справядліва заўважаючы, што "якраз у ракурсе супадзення, узаемапранікнення нацыянальнага і ўсечалавечага, сучаснага і адвечнага становіцца бачным прамень спасціжэння непаўторнасці, геніяльнасці У. Караткевіча"[3]. І, вяртаючыся да пераўвасаблення-рэінкарнацыі У. Караткевіча зямнога ў прадмет паэтычнага асэнсавання і асваення-даследавання спадкаемцамі па літарацкім цэху, адважымся, падсумаваўшы ўсё вышэйсказанае, сцвярджаць, што менавіта ў ягонай звышчалавечай усёабдымнасці, перманентнай усёгатоўнасці да ўспрымання тысячагадовага многанацыянальнага і шматпакутнага вопыту чалавецтва якраз і тоіцца той сакрэт, які дае глебу паэтам, каб наноў і наноў перастварацьрэканструяваць вобраз У. Караткевіча, адштурхоўваючыся: першае, ад ужо наяўнага і іманентна прысутнага ў літаратурным полі рэальнага лірычнага героя паэтычнага космасу У. Караткевіча (маюцца на ўвазе 4 зборнікі ягонай паэзіі) і, другое, ад свайго асобаснага, індывідуальнага разумення непаўторнасці і велічнасці самой постаці У. Караткевіча – чалавека, паэта, празаіка…

Працягваючы разгляд прапанаванага верша, нельга не заўважыць яго ёмістай насычанасці алюзіямі, рэмінісцэнцыямі, гіперцытатамі літаратурнага і проста жыццёвага планаў. Паспрабуем наблізіцца да 1-га, г. зн. літаратурнага. У 1-й страфе верша ў В. Жуковіча сустракаем радок: *"Кветку матчынай… душы"*. Безумоўна, хацеў таго аўтар ці не, а ў нашай памяці міжволі ўсплывае шматзначная, сімвалічная назва 1-га зборніка У. Караткевіча "Матчына душа", дзе ён, У. Караткевіч (не толькі лірычны герой), паўстае перад намі заўзятым "жыццялюбам", непаўторным "фантазёрам" і запозненым, аднак адважным "рамантыкам", якому давялося на сваім веку пажыць у старажытных Афінах і Рыме, пабываць у шэрагах касінераў К. Каліноўскага, сустрэцца асабіста з Машэкам. Быць сведкам чалавечай і нацыянальнай трагедыі, калі хлопцу з Крошына – П. Багрыму – не далі стаць тым, кім ён сябе усведамляў ад нараджэння, а Беларусі – нарадзіць выразніка Душы, свайго Роберта Бёрнса.

Слова *кветка* ў вершы мы сустракаем тры разы, што дае нам падставу аднесці яго ці не да ключавых у спасціжэнні зместу верша. У апошняй страфе ёсць словазлучэнне *чароўная кветка*. Як тут не ўзгадаць дзівосную і ўсёмагутную Папараць-кветку з яе, авеянымі вуснай народнай творчасцю, неверагоднымі цудадзейнымі магчымасцямі. Слова *колас* трапляецца ў вершы два разы. Безумоўна, пад сярпом няўмольнага лёсу колас загіне, але зярнятка, якое падае ў гэты міг у зямлю, абавязкова дасць жыццё новаму коласу.

У чацвёртай, заключнай, страфе слова *смерць* немінуча прымушае чытача на нейкае імгненне здрыгануцца ад нечаканасці, напружыцца, бо несмяротны чарадзей, творца, якому падуладны час і, значыць, царства ценяў, не можа з ёй сутыкнуцца, а тым больш паддацца. Але адна самотная нота, што закралася ў фінальным акордзе, ніколькі не бурыць апафеозу аптымістычнасці, бессмяротнасці. Паслухаем:

Смерць раптоўна, як колас, пад корань скасіла,
Ён – як колас – яе перамог.

Паэзія, проза, драматургія… Неймаверна, ашаламляльна многа паспеў зрабіць Уладзімір Караткевіч за сваё непрацяглае жыццё, а яшчэ ж болей было задумана. Але самае галоўнае ўсё ж такі стала, адбылося. Перафразуючы словы Лявона Вашко, ска-

заныя ім, праўда, пра іншага вялікага сына Беларусі (К. Каліноўскага), можна сцвярджаць, што "вобраз Караткевіча (у нашай літаратуры) набыў глыбока нацыянальны змысл, у ім адбіліся памкненні беларускае гістарычнае свядомасці да самастойнага тварэння свае гісторыі"[5].

Буду шчырым, думка падступіцца да літаратуразнаўчага аналізу вершаў, прысвечаных У. Караткевічу, узнікла міжволі, нечакана. Выпадкова сустрэўшы верш В. Жуковіча, неўпрыкмет для сябе я адчуў, што ён, гэты верш, бяре мяне ў палон, зачароўвае, абуджаючы далёкія ўспаміны. Мне прыгадаўся 1984 год, жнівень. Я нясу тэрміновую вайсковую службу за межамі СССР. У чацвер атрымліваю ад Уладзіміра Арлова чарговы доўгачаканы ліст. Раскрываю. У ім – апошняя старонка "ЛіМа". На ёй прозвішча "Караткевіч" у жалобнай рамцы. У момант розум як здранцвеў. Сэрца затахкала хутка-хутка, а потым паступова сцішылася і – знікла… Праз нейкі час я ачомаўся. Перада мной ляжаў толькі што напісаны верш, да якога я, бадай, і не датыкаўся. Хіба што, значна пазней, для друку, замяніў два-тры словы, каб вытрымаць рытм…

Першае, што аб'ядноўвае Жуковічаў верш і мой, ляжыць на паверхні і адразу кідаецца ў вочы нават маласпрактыкаванаму чытачу – гэта метр, якім напісаны абодва творы, – чатырохстопны анапест. Гэты памер вельмі ўдала і арганічна выяўляе ў сабе інтанацыю сур'ёзнага, разважлівага роздуму, своеасаблівай гутаркі-звароту да неабыякавага і абазнанага чытача-суразмоўцы:

ЛІПЕНЬ 1984

Непазбежная ростань…
адплывае ладдзя ў нязнаную стынь;
адплывае без песняў – марудна, тужліва,
каб шукаць свой апошні, астатні спачын…
адно чайкі кігічуць нязносна звягліва.

У бязмежжы нябыцця, у вусцішным "там",
дзе свядомасць губляе і пыху, і роздум.
Ці суцешыўся ты? ці пусцілі ў Храм?
дзе заўсёды разлітыя смутак і одум…

Правялебная ісціна…
неспатольна ўведаць каму ёсць патрэба?
зноў – адзінцы з адзінак, сярод сутна сутных…
О, ты іхні, якім завядзёнкай без скібачкі хлеба
усё ж шчасціла быць дзеля думак пакутных.

Жыў – лісточкам трымцеў на ветры;
хоць спяшаўся, аднак не завершыў сяўбы,
толькі Службу пачаў і – у сцюдзёныя нетры
нетутэйшага свету памкнуў назаўжды.

[1] **Бердяев, Н.** Судьба России : Опыты по психологии войны и национальности. Репринтное воспр. изд. 1918 г. / Н. Бердяев.– М. : Филос. общество СССР, 1990. – С. 100.

[2] **Мальдзіс, А.** У. Караткевіч – пісьменнік беларускі і еўрапейскі / А. Мальдзіс // Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным аспекце. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2000. – С. 39.

[3] **Шынкарэнка, В.** Шляхам Беларусі ў свет шырокі / В. Шынкарэнка // Уладзімір Караткевіч. – Наваполацк, 2001. – С. 31.

[4] **Верабей, А.** Жывая повязь часоў : Нарыс творчасці Уладзіміра Караткевіча / А. Верабей. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – С. 79.

[5] **Вашко, Л.** Гістарыязацыя свядомасці / Л. Вашко. – Мінск, 1997. – С. 43.

ДАВЕДКІ

ГАЛОСНЫЯ І ЗЫЧНЫЯ ГУКІ

Частка А: № 1. – 2, 3, 5; **№ 2.** – 1, 4, 5; **№ 3.** – 1, 2, 4, 5; **№ 4.** – 2, 4; **№ 5.** – 3; **№ 6.** – 1, 4; **№ 7.** – 3, 4, 5; **№ 8.** – 2, 4; **№ 9.** – 3, 4; **№ 10.** – 1, 3, 4; **№ 11.** – 3, 4; **№ 12.** – 1, 2, 4; **№ 13.** – 2, 3, 5; **№ 14.** – 1, 5; **№ 15.** – 2, 4, 5; **№ 16.** – 1, 3, 4, 5; **№ 17.** – 4, 5; **№ 18.** – 1, 3, 5; **№ 19.** – 1, 2, 5; **№ 20.** – 2, 3, 4.

Частка Б: № 21. – санорныя; **№ 22.** – тры; **№ 23.** – 1 – [ск]; 2 – [н'дз']; 3 – [шч]; 4 – [дз'д]; 5 – [з'б']; **№ 24.** – націск; **№ 25.** – адкрыты; **№ 26.** – [ф], [ф']; **№ 27.** – 1) – ножка, ношка; 2) – Светка, сведка; **№ 28.** – губы; **№ 29**. – аглушэнне; **№ 30**. – храм.

СКЛАД. СКЛАДАПАДЗЕЛ. АКЦЭНТАЛОГІЯ.

Частка А. **№ 1.** – 2, 3, 5; **№ 2.** – 1, 5; **№ 3.** – 2, 3, 4; **№ 4.** – 2, 3, 4; **№ 5.** – 3, 5; **№ 6.** – 2, 4, 5; **№ 7.** – 2, 3, 4; **№ 8.** – 1, 3, 4; **№ 9.** – 2, 4, 5; **№ 10.** – 1, 2, 3, 4; **№ 11.** – 2, 3, 4; **№ 12.** – 1, 3, 4; **№ 13.** – 2, 5; **№ 14.** – 1, 3, 4, 5; **№ 15.** – 2, 4; **№ 16.** – 2, 3; **№ 17.** – 1, 3, 5; **№ 18.** – 2, 5; **№ 19.** – 1, 5; **№ 20.** – 1, 3; **№ 21**. – 2, 3, 4; **№ 22**. – 2, 3, 4; **№ 23**. – 2, 5; **№ 24**. – 1, 3, 4; **№ 25**. – 1, 4, 5; **№ 26**. – 3, 5; **№ 27**. – 2, 4; **№ 28**. – 1, 3, 5; **№ 29**. – 2, 3; **№ 30**. – 2, 3, 4, 5.

Частка Б. **№ 31.** – акцэнталогія; **№ 32.** – пабочны; **№ 33.** – рухомы; **№ 34.** – набярэжная, медзведзяня; **№ 35.** – прыкрыты; **№ 36.** – закрыты.

ГУКІ І ЛІТАРЫ

Частка А. № 1. – 1, 3, 4; **№ 2.** – 2, 5; **№ 3.** – 3, 5; **№ 4.** – 1, 4; **№ 5.** – 2, 3; **№ 6.** – 1, 3, 4 (словы з мяккімі зычнымі, для якіх у беларускім алфавіце няма асобных літар); **№ 7.** – 2, 3, 4, 5; **№ 8.** – 1, 4; **№ 9.** – 3, 4, 5; **№ 10.** – 1, 3, 5; **№ 11.** – 2, 3, 4; **№ 12**. – 4; **№ 13**. – 2, 3, 4; **№ 14.** – 3, 5; **№ 15.** – 3, 4, 5; **№ 16** – 5; **№ 17**. – 1, 2, 4, 5; **№ 18**. – 4; **№ 19**. – 2, 5; **№ 20**. – 1, 2, 3;

Частка Б. **№ 21. –** трыццаць дзве**; № 22.** – графіка; **№ 23.** – гук; **№ 24.** – літара; **№ 25.** – алфавіт; **№ 26.** – [кс'онц]; **№ 27.** – дыграфы; **№ 28.** – падкасаць; **№ 29.** – белавежскі; **№ 30.** – ў.



КАЛІ ЗАКОНЧЫЎСЯ ЎРОК

Таццяна ПАДАЛЯК

РЭПАРЦЁР АТРЫМАЎ ЗАДАННЕ…

СПЕЦЫФІКА РЭПАРТАЖУ Ў СУЧАСНАЙ ПРЭСЕ

У працэсе развіцця журналістыкі яе жанравая сістэма дыялектычна змяняецца. Адны жанры ўзнікаюць, іншыя звужаюць сферу бытавання. Сёння рэпартаж – адзін з самых папулярных жанраў журналістыкі, на старонках газет часта з'яўляюцца рубрыкі *"Рэпартаж"*, *"Рэпарцёр атрымаў заданне"*, *"Выпрабавана на сабе"*, *"Журналіст змяняе прафесію"* і іншыя. Цяжка паверыць, што ў 1990-я гг. жанр не быў дастаткова запатрабаваным у газетна-часопіснай перыёдыцы. Тлумачыцца гэта, перш за ўсё, імклівым развіццём лічбавых тэхналогій перадачы інфармацыі, магчымасцю весці прамыя тэлевізійныя і радыёрэпартажы непасрэдна з месца падзей, як прынята гаварыць, у рэжыме on-line. Газетчыкам здавалася, што няма патрэбы апісваць падзею паводле канонаў рэпартажнага жанру, бо яе паказалі па тэлебачанні і рэпартажна расказалі пра яе па радыё. Аднак, як высветлілася з ходам часу, матывацыя была не зусім карэктная: людзі хочуць не толькі бачыць і чуць, але і адчуваць спецыфіку падзеі – праз эмоцыі рэпарцёра, самыя дробныя дэталі і нюансы, якія не ў стане зафіксаваць ні тэлекамера, ні мікрафон.

Рэпартаж (ад лац. *reportare* паведамляць, перадаваць) – інфармацыйны жанр журналістыкі, дзе аператыўна паведамляецца пра падзеі, здарэнні, з'явы, відавочцам альбо ўдзельнікам якіх быў карэспандэнт.

Звычайна гавораць, што рэпартаж апісвае "гісторыю падзеі", яе разгорнутую карціну, ад пачатку да завяршэння. Даследчык Сямён Гурэвіч слушна ўдакладняе: "Прадметам рэпартажу становіцца падзея, якая спалучае візуальную і вусную форму выражэння яе зместу" (Гуревич С. Газета: Вчера, сегодня, завтра. Москва, 2004, с. 187).

Жанравыя асаблівасці рэпартажу: аператыўнасць, актуальнасць, дакладнасць, дынамізм, наглядзнасць, эмацыянальнасць, выразнае аўтарскае "я", стварэнне "эфекту прысутнасці".

Журналіст у рэпартажы не проста паведамляе пра факты, падзеі, з'явы, а паказвае іх (вачамі відавочцы ці нават удзельніка) праз сваё асабістае ўспрыманне – непасрэднае ўспрыманне аўтара. Рэпартаж – ці не самы суб'ектыўны, персанальна арыентаваны жанр журналістыкі, дзе надзвычай важнае значэнне маюць пачуцці, адчуванні, думкі самога журналіста. Гэта, па-першае, надае рэпартажу большую пераканальнасць і, па-другое, дазваляе дасягнуць "эфекту прысутнасці" чытача на месцы падзеі. Адсюль, дарэчы, вынікае, што рэпарцёр а б а в я з к о в а павінен прысутнічаць на месцы падзеі: калі тэкст пішацца паводле назіранняў і сведчанняў іншых відавочцаў, то і выкарыстоўваюцца іншыя інфармацыйныя жанры – заметка, замалёўка, інтэрв'ю.

Асабліва цікавымі атрымліваюцца рэпартажы, калі журналіст выступае не толькі як сведка, але і як удзельнік падзеі. У якасці прыкладу разгледзім рэпартаж, апублікаваны ў газеце "Звязда" 20 верасня 2007 г. Яго тэма і актуальная, і пазнавальная: увосень у многіх гарадах Беларусі фарміруюцца штодзённыя выязныя брыгады па ўборцы гародніны. Журналіст "Звязды" высвятляў, хто звычайна бярэ ў іх удзел, у чым спецыфіка работы, якая аплата за працадзень і г. д. Звяртаем увагу: рэпартаж друкуецца ў рубрыцы *"Рэпарцёр атрымаў заданне"*, прычым нават у подпісе пад рэпартажам указваецца: *"Збіраў цыбулю Уладзімір Пернікаў"* – гэта таксама пацвярджае актыўны ўдзел журналіста ў падзеі.

Рэпарцёр атрымаў заданне...

...З НАЖОМ – ДЫ НА ЦЫБУЛЮ

– Значыць так, заўтра да васьмі гадзін раніцы вы прыходзіце да нас і едзеце на работу. Выбірайце лю-

Раней Таццяна Падаляк, пастаянны выкладчык роднаславускай "Школы юнага журналіста", апублікавала ў нашым часопісе матэрыялы "Паглядзім на свет па-журналісцку?: Творчы факультатыў", "Праграма заняткаў факультатыву, гуртка, профільнага класа" (2005, № 1), "Добра піша той, хто добра думае: Педагагічныя парады да заняткаў" (2005, № 2), «"Ні дня без радка": Творчы практыкум да факультатыву» (2005, № 3), "Хто валодае інфармацыяй, той валодае светам: Сучасная журналістыка ў кантэксце гістарычнага развіцця" (2005, № 5), "Слова – таксама справа: Старонкі з гісторыі айчыннай журналістыкі" (2005, № 8), "Жанры журналістыкі: традыцыі і навацыі" (2006, № 3), "Газеты Беларусі: люстра дзён і падзей" (2006, № 8), "Яго вялікасць факт: Спецыфіка адбору і інтэрпрэтацыі фактаў у журналістыцы" (2007, № 2) і "Здольнасць убачыць галоўнае: Заметка ў сучасным друку" (2007, № 8). Марына Абрагімовіч распавяла пра гісторыю слоў "нататка" і "эсэ" (адпаведна: 2006, № 12 і 2007, № 8), а Ірына Лапуцкая – пра "рэпартаж" і "нарыс" (адпаведна: 2006, № 12 і 2007, № 8).



Таццяна Уладзіміраўна Падаляк *– журналіст, выкладчык. Кандыдат філалагічных навук. Закончыла журфак Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1986), аспірантуру пры БДУ (1992). Дацэнт кафедры тэорыі і метадалогіі журналістыкі БДУ, рэдактар аддзела культуры газеты "Звязда". Аўтар манаграфіі "Маральна-этычныя прыярытэты беларускага друку" (2001), навучальна-метадычнага комплексу "Прафесійная этыка журналіста" (2003). Выдатнік друку Беларусі, выдатнік адукацыі Беларусі.*

бую: нарыхтоўка бульбы, буракоў, морквы ці цыбулі. З сабой бярыце вядро або кошык, рукавіцы і нож. <…>

У наступны дзень а палове восьмай я ўжо быў на вуліцы Пралетарскай, дзе знаходзіцца вышэйпамянёная ўстанова. Народу там убачыў чалавек сто – сто дваццаць. Але людзі ўсё прыходзілі і прыходзілі. Рознага ўзросту. Маладых, праўда, было менш. Большасць жа – пенсіянеры. Пад'ехала сюды шаснаццаць аўтобусаў, і ў восем гадзін выйшлі работніцы ўпраўлення і пачалі размяркоўваць людзей у транспарт: каго куды… Я запісаўся на пераборку цыбулі ў племзавод "Бярозкі". <…>

Насупраць мяне сядзела жанчына, якую я неаднаразова бачыў на рынку і нават купляў у яе абрыкосы і вішні. Таму пацікавіўся, чаму яна змяніла свой занятак, і пачуў: той прыватнік-азербайджанец вельмі сквапны, мала плаціў. А тут яна заробіць больш ды і на зіму сабе нарыхтуе гародніны на свой густ, бо яе дазволена выбіраць самім працаўнікам. Пакуль ехалі на работу, завёў я гутарку і з маладой дзяўчынай, з якой сядзеў побач. Юля. Учарашняя школьніца… У яе гэта – трэцяя паездка. Першы раз яна зарабіла васемнаццаць кілаграмаў бульбы, учора – восем кілаграмаў цыбулі, сёння ж мае намер атрымаць больш, бо ўжо крыху налаўчылася. <…>

Вось і прыехалі. На шыльдзе напісана: кансервавы завод гаспадаркі. Аўтобус развярнуўся і будзе чакаць нас, пакуль не закончым работу. А мы выстраіліся ў чаргу і паводле спіса пачалі атрымліваць па дзесяць сеткавых мяшкоў, куды і павінны складваць цыбулю. Яна ляжала ў двух месцах. Там ужо корпалася некалькі жанчын, а нас павялі да самай вялікай гары, з якой быў сцягнуты брызент... Я заўважыў, што некалькі чалавек накіраваліся на склад і прынеслі адтуль кошыкі-двухручкі і скрыні. Тое ж самае зрабіў і я, здагадаўшыся, што так, значыць, трэба. І не памыліўся. Бо на скрыні можна было сядзець, а ў той кошык класці нестандартную зялёную цыбулю. Дарэчы, кошык той мы падзялілі з Юляй, якая працавала побач са мной пад пятнаццатым нумарам. У мяне ж быў чатырнаццаты, а трынаццаты – у інтэлігентнай бабулі больш чым 70-гадовага ўзросту, якая назвалася Пятроўнай.

Нам растлумачылі, што і як трэба рабіць. Таварная цыбуля большага і меншага памераў – у розныя мяшкі, а нетаварная (зялёная) – у кошыкі ці таксама мяшкі. Асобныя. Работа такая: адразаць хвосцікі і вусікі. Мяшкі павінны быць поўнымі. Вось і ўсё. Усё проста. Якая аплата? За мяшок, у які ўмяшчаецца трыццаць кілаграмаў цыбулі, табе належыць кілаграм. Не захочаш цыбулю браць, свой выбар можаш спыніць, скажам, на бульбе: паўтара кілаграма за мяшок перабранай цыбулі. <…>

Працуем, размаўляем, перакідваемся фразамі. Пятроўна – сапраўдны "аўтамат". Цыбуля так і лётае ў яе з-пад вострага сцізорыка ў чатыры мяшкі, якія хутка напаўняюцца. <…>

Тым часам раз-пораз да нас на цялежцы пад'язджаюць мужыкі-грузчыкі з нашай брыгады ў суправаджэнні работніцы гаспадаркі, якой называем свой нумар, і яна ў нейкім сшытку адзначае, колькі мяшкоў цыбулі ты здаеш. <…>

Хто хацеў за работу атрымаць бульбу, паехаў на аўтобусе на поле, дзе сам выбіраў яе з бурта. Астатнія, у тым ліку і я, засталіся на месцы. Пасля на тым жа аўтобусе нашу брыгаду даставілі ў горад. З размоў людзей: адны засталіся задаволенымі вынікамі сваёй працы і казалі, што будуць і далей удзельнічаць у падобных работах, другія – што цяжкая гэта праца і, напэўна, не вартая яна іх. Першыя – у адказ ім пра вядомую рыбку, якую з сажалкі не выцягнеш без цяжкасці. Што датычыць асабіста мяне, дык скажу, што ў дадатак да таго, што я выканаў рэдакцыйнае заданне, яшчэ прывёз дадому паўпуда цыбулі, зарабіўшы ў камунальным сельскагаспадарчым унітарным прадпрыемстве "ганарар" у выглядзе 7200 рублёў, калі ўлічыць магазінную цану цыбулі: за адзін яе кілаграм – дзевяцьсот рублёў.

Збіраў цыбулю
Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Канкрэтныя факты – аснова рэпартажнай падзеі, і даюцца яны ў дынаміцы, у руху. Рэпарцёр як удзельнік падзеі выкарыстоўвае шматлікія дэталі і падрабязнасці, што дапамагаюць дакументальна намаляваць, "відовішчна" паказаць рэчаіснасць. Ды і па кампазіцыі выбудаваны матэрыял сапраўды сцэнарна: аўтар і сам не ведаў сюжэтнага завяршэння "мерапрыемства". Элемент інтрыгі, непрадказальнасці, навізны, які ўтрымліваецца ў рэпартажы, узмацняе цікавасць чытача: а што ж далей, а чым жа ўсё скончыцца?

Прысутнічае і асобасная ацэнка таго, што адбываецца: не толькі назіранні, але і ўражанні аўтара. Праз суб'ектыўную афарбаванасць тэксту чытач мае магчымасць адчуць эмацыянальную і псіхалагічную атмасферу, "подых" падзеі.

Даследчык Максім Кім слушна ўказвае, што ў рэпартажы "аўтару, каб дасягнуць максімальнай дакладнасці, неабходна быць акуратным і ў перадачы ўласнага эмацыянальнага стану, і ў апісанні жыццёвых сітуацый, з якімі ён мае справу, і ў вызначэнні ракурсу падзеі. Пры гэтым дакументалізм апісання дасягаецца за кошт непасрэдна аўтарскіх уражанняў, паколькі рэпарцёр у дадзеным выпадку выступае відавочцам падзеі. Менавіта таму ў рэпартажы важ-

нае значэнне мае не рэканструкцыя і рэтраспекцыя падзеі, а паказ таго, што адбывалася на вачах аўтара, не творчая выдумка, якая ў прынцыпе магчымая ў нарысе ці фельетоне, а жывая карцінка з натуры" (Ким М. Репортаж: Технология жанра. С.-Петербург, 2005, с. 181).

Цікавая **гісторыя ўзнікнення** і развіцця рэпартажу як жанру. Даследчыкі адзначаюць, што першапачаткова ў гісторыі журналістыкі жанр рэпартажу прадстаўлялі публікацыі, якія паведамлялі пра ход судовых пасяджэнняў, парламенцкіх дэбатаў, розных сходаў і г. д. Расійскі навукоўца Аляксандр Цяртычны ўдакладняе, што пазней такія матэрыялы сталі называць "справаздачамі", а "рэпартажамі" называлі публікацыі, якія па змесце і форме падобныя на сучасныя айчынныя нарысы. «І зараз, калі еўрапейскі журналіст гаворыць штосьці пра рэпартаж, ён мае на ўвазе тое, што мы называем нарысам. Якраз заходнія нарысы, з пункту гледжання іх "імя", і з'яўляюцца генетычнымі папярэднікамі і найбліжэйшымі "сваякамі" цяперашняга расійскага рэпартажу. Гэта неабходна ўлічваць у выпадку выкарыстання ў айчыннай тэорыі рэпартажу тэарэтычных разваг заходніх даследчыкаў» (Тертычный А. Жанры периодической печати. Москва, 2000, с. 84).

Бліскучымі рэпарцёрамі былі Чарльз Дзікенс, Джэк Лондан, Тэадор Драйзер, Эрнест Хемінгуэй, Юліус Фучык (сусветна вядомая яго кніга "Рэпартаж з пятлёй на шыі"), Максім Горкі, Ларыса Рэйснер, Міхаіл Кальцоў, іншыя пісьменнікі і журналісты. Каралём рэпартажу справядліва называлі Уладзіміра Гіляроўскага, дастаткова ўзгадаць яго кнігі "Москва газетная", "Мои скитания", "Москва и москвичи".

Многія беларускія пісьменнікі таксама звярталіся да рэпартажнага жанру. Даследчыкі сведчаць: беларускі рэпартаж нараджаўся праз падарожныя замалёўкі Янкі Лучыны і Ядвігіна Ш., развіццё атрымаў у газеце "Наша Ніва", дзе друкаваліся допісы Янкі Купалы, Якуба Коласа, іншых пісьменнікаў. На працягу XX ст. рэпартаж як жанр увесь час удасканальваўся, выкрышталізоўваўся – і перш за ўсё ў газетнай і часопіснай перыёдыцы.

Рэпартаж як жанр развіваецца і далей. Прафесар Ніна Фральцова адзначае: «Рэпарцёр – гэта самая складаная прафесія ў любой журналістыцы: і ў электроннай, і ў друкаванай. Сучасны рэпарцёр – гэта чалавек, які ўмее знайсці факт, імгненна яго прааналізаваць, даць каментарый і зарыентаваць слухача, чытача, гледача ў неабходным накірунку. А не так: "Чакаем далейшага развіцця падзей". А ў нас часам думаюць, што рэпартаж – гэта самае простае: трапіў, убачыў, перамог» [Журналист (РБ), 2007, № 2 (3), с. 18].

Рэпарцёр – адна з самых небяспечных прафесій. У пасланні Генеральнага дырэктара ЮНЕСКА Кааціра Мацууры з нагоды Сусветнага дня свабоды друку ў 2007 г. адзначана, што ў 2006 г. было забіта больш як 150 рэпарцёраў і больш за ўсё ў Іраку.

Многія навукоўцы робяць **жанравую класіфікацыю** рэпартажаў, зыходзячы, з таго, якія элементы дамінуюць у тэксце. Даследчык М. Кім, як і шэраг яго калег, падзяляе рэпартажы па прадметна-тэматычнай прыкмеце: падзейны, праблемны (аналітычны), спазнавальна-тэматычны. С. Гурэвіч вылучае таксама розныя тэматычныя віды рэпартажу: навуковы, спартыўны, сацыяльны і г. д.

Беларускі даследчык Барыс Стральцоў падзяляе рэпартажы на аператыўныя і сінтэзаваныя, у якіх "на рэпартажнай аснове злучаны (сінтэзаваны) элементы розных жанраў" (Стрельцов Б. Основы публицистики. Жанры. Мінск, 1990, с. 72).

Разгледзім больш падрабязна асноўныя жанравыя разнавіднасці.

➔ Падзейны (аператыўны) рэпартаж – аператыўны водгук на тое, што адбылося. Для яго характэрна храналагічнае апісанне падзеі, дакладнае ўказанне месца і часу дзеяння.

➔ У аснове спазнавальна-тэматычнага рэпартажу – не падзея, а тэма, якую асвятляе рэпарцёр. Такія рэпартажы звычайна плануюцца загадзя, яны не настолькі аператыўныя, як падзейныя (гэта можа быць паведамленне з навуковай лабараторыі, з майстэрні мастака, з музея і г. д.).

Спазнавальна-тэматычныя рэпартажы, у сваю чаргу, часам падзяляюць на спецыяльныя і расследчыя. Тут на першы план вылучаецца апісанне цікавай жыццёвай сітуацыі, таму галоўнае – не аператыўная падстава, а раскрыццё новых, невядомых бакоў грамадскага жыцця.

➔ Спецыяльны рэпартаж пішацца на самыя розныя грамадска значныя тэмы, калі сітуацыя ці праблема патрабуюць ад журналіста ўсебаковага даследавання.

➔ Расследчы рэпартаж арыентаваны не на падрабязнае асвятленне падзеі, а на яе дэтальны каментарый. Акцэнт робіцца на самім працэсе вывучэння сітуацыі рэпарцёрам.

Нярэдка журналісты пры гэтым выкарыстоўваюць метад "уключанага назірання": "перамену прафесіі", эксперымент – калі журналіст штучна стварае магчымую жыццёвую сітуацыю, каб уважліва разгледзець усе яе нюансы. Надзвычай плённа выкарыстоўваў эксперымент журналіст Анатоль Рубінаў (Рубинов А. Операции без секретов. Москва, 1980).

➔ Аналітычны рэпартаж, сцвярджаюць некаторыя навукоўцы, арыентаваны не толькі на апісанне падзеі, але і на выяўленне прычын яе ўзнікнення і развіцця.

Варта адзначыць, што далёка не ўсе тэарэтыкі і практыкі журналістыкі пагаджаюцца з выдзяленнем гэтага класіфікацыйнага віду рэпартажу. Так, вядомы расійскі журналіст Віталь Траццякоў, стваральнік і на працягу многіх гадоў галоўны рэдактар уплывовай "Независимой газеты" ў кнізе "Як стаць знакамітым журналістам" (Масква, 2004) адзначае, што калі за некаторымі інтэрв'ю можна пакінуць эпітэт "аналітычнае", то само словазлучэнне "аналітычны рэпартаж" – гэта аксюмаран, тое самае, што "гарачы лёд". Мяркуем, з гэтай пазіцыяй можна пагадзіцца.

Рэпартаж цесна ўзаемадзейнічае з іншымі жанрамі журналістыкі. Нярэдка журналісты выкарыстоў-

ваюць у рэпартажы элементы інтэрв'ю, замалёўкі, карэспандэнцыі, іншых жанраў. Часта сустракаецца на старонках сучасных выданняў і фотарэпартаж, калі слоўны і фотаілюстрацыйны складнікі выступаюць на роўных. Жанры ў чыстым выглядзе напаткаем, вядома, не вельмі часта. Элементы іншых жанраў, уключаных у рэпартаж, дазваляюць больш выразна і шматгранна адлюстраваць рэчаіснасць. Галоўнае – захоўваць пачуццё меры пры напісанні твора.

Асаблівую ўвагу педагогу варта звярнуць на **методыку работы над рэпартажам**.

Прапаную прыклад з асабістай практыкі. Пры вывучэнні тэмы "Рэпартаж" студэнты атрымалі заданне напісаць рэпартаж з вакзала. Для збору матэрыялу ім адводзілася адна акадэмічная гадзіна. Потым сабраліся ў аўдыторыі пісаць рэпартаж. Аднак выканаць заданне студэнты не змаглі, бо амаль усе пайшлі па шляху найменшага супраціўлення: што бачу, тое і пішу. Кожны допіс абавязкова ўтрымліваў апісанні цыганак-варажбітак, чэргаў па білеты, цяжкіх чамаданаў. Будучыя журналісты не здолелі ўбачыць тэму ў тэме.

Праявілася павярхоўнасць погляду: злоўлена бачная частка айсберга, а сутнасць, "соль" засталіся за кадрам (вакзал – не толькі чамаданы і варажбіткі). Мы свядома не акрэслілі тэму (аб'ект – складаны, заданне – досыць абстрактнае), каб паглядзець, як праявяць сябе маладыя журналісты, ці здолее кожны з іх знайсці *свой* вакзал. Аднак без прафесійнай установкі тэма не знойдзена. Як аказалася, недахоп ведаў абумоўлівае і беднасць творчых сродкаў, бляклясць журналісцкай палітры.

Рэпартаж – жанр, які патрабуе асаблівага журналісцкага майстэрства, творчага падыходу. Бо "эфект прысутнасці" – абавязковы, але недастатковы элемент рэпартажу: важную ролю адыгрывае **ўменне за знешнім разглядзець унутранае, за прыватным – агульнае, тыповае і адметнае, знайсці цікавую дэталь, нечаканы ракурс**. Менавіта гэта – прафесійнае назіранне – і адрознівае журналісцкі погляд на рэчаіснасць ад звычайнага, абывацельскага.

Беларусь – мая Радзіма

"ВЕЖЫ ЗАМКАЎ У НЕБА ЛЯТУЦЬ...".

ВУСНЫ ЧАСОПІС. VIII клас

Мэты: паглыбіць веды вучняў пра гісторыю Радзімы, у прыватнасці пра яе гераічнае мінулае; развіваць навыкі выразнага чытання; выхоўваць патрыятызм, пачуццё адказнасці за тое, што засталося нам у спадчыну ад продкаў, цікавасць да мінулага.

Абсталяванне: фотаілюстрацыі помнікаў дойлідства, выстава кніг пра помнікі Беларусі, кніга "Памяць: Мёрскі раён", альбом "Славутыя гарады", запісы песняў "Белавежская пушча", "Два Полацкі", "Каб любіць Беларусь нашу мілую", "Спадчына", назва часопіса на сцэне. (Назвы старонак кнігі і эпіграфы да іх зачытвае вядучы, які знаходзіцца за кулісамі.)

Гучыць песня "Спадчына" (верш Я. Купалы, у выкананні "Песняроў").*

► **Уступнае слова настаўніка.**

Гісторыю краю не ведаць нягожа нам,
Хоць з-пад Дзісны мы, хоць з-пад Валожына.
Наша зямля на падзеі багата.
Памяць пра іх мы захоўваем свята.

Так, вельмі багатая ў нашай Радзімы гісторыя, шмат падзей адбылося на Беларусі. І сведкамі гэтых падзей з'яўляюцца помнікі дойлідства: замкі, цэрквы, касцёлы, вежы – наша з вамі спадчына, якую мы павінны берагчы і захоўваць для будучых пакаленняў. І перш за ўсё мы павінны ведаць як мага больш пра гэтую спадчыну, каб маглі падзяліцца ведамі з тымі людзьмі, якія прыязджаюць да нас з розных краін.

А папоўніць вашы веды дапаможа вусны часопіс "Вежы замкаў у неба лятуць...", які падрыхтавалі вучні.

Вядучы (зачытвае эпіграф).

Мур вымуроўваецца з самага цвёрдага, самага "дрымотнага" матэрыялу – і таму ўпарта не паддаецца размыванню, разніманню, руйнаванню.

Аб мур разбіваюцца арміі заваёўнікаў, і калі некаму ён перашкода, дык некаму і апора, калі некаму ў роспач, дык некаму ў радасць.

Мур мудры: ён стаіць нерухома на аднойчы выбраным месцы, на скрыжаванні жыцця і смерці, вайны і міру, вартуючы тое, што адышло ў іншае вымярэнне, – і веліч Рыма, і няўрымслівасць Навагрудка.

Алесь Разанаў.

*Гучыць песня "Белавежская пушча" (у выкананні "Песняроў")**.*

Старонка 1-я – "Камянецкая, або Белая, вежа".

Гістарычная даведка.

1-ы вучань. Для абароны сваіх заходніх уладанняў ад крыжакоў князь Уладзімір Валынскі пабудаваў Белую вежу, ад якой і паходзіць назва пушчы. Вежа вышынёй 30 *м* мае форму правільнага цыліндра, зробленага з цэглы. Таўшчыня сцен – два метры. Гэты аскепак старажытнасці нагадвае шахматную туру – вяршыню яго вянчае не купал, а пляцоўка з мноствам байніц. У вежы не было ўваходу з зямлі, ён знаходзіўся на ўзроўні 3-га паверха. У ёй мог размя-

* Ноты і словы гэтай песні можна знайсці ў красавіцкім нумары нашага часопіса за 1996 г. – *Заўвага рэд.*

** Гэтая песня змешчаная на старонках "Роднага слова" ў студзеньскім нумары за 1993 г. – *Заўвага рэд.*

сціцца даволі вялікі ваенны гарнізон. У сярэдзіне вежы знаходзілася лесвіца, якая вяла на пляцоўку. У XIII ст. вежа была абкружана земляным валам і ровам.

2-і вучань (выразна чытае верш).

Белая вежа

Над вечнай страхою пушчанскіх бароў
Стаіш ты, гайдаеш аблокаў вясну.
І белае голле тутэйшых бяроз
Табе аддае сваю ўсю белізну.

Бяроза каменная краю майго,
Ці раз цябе вораг ішоў ачарніць?
І як ні паліў цябе скрушны агонь,
А ты яшчэ болей бялела ў агні.

Ты так на чужынца глядзела з-пад хмар,
Што твар у таго палатнеў і бялеў.
Свяціла ты пушчы – і вечнасць сама
У белым тваім паўставала святле.

Байніц тваіх позірк лагодзіць зара,
Сцякае раса па каменным ствале,
І бачыцца выраю шлях у мой край
Па белым тваім маяковым святле.

Аблокамі белымі коцяцца дні
За векам, за думкай маёй наўздагон.
Ты – белая крэпасць маёй чысціні,
Бяроза каменная краю майго.

Казімір Камейша.

Старонка 2-я – "Наваградскі замак".

Вядучы (чытае эпіграф).

Разбураны замак. Высокія травы.
У травах высокіх блукаюць самотна вятры.
І пыл падымаецца ў неба гаркавы,
Чырвоны, як кроў, і бязважкі, як водбліск зары.

Віктар Шніп.

Гістарычная даведка.

3-і вучань. Яшчэ здалёк відаць на ўзгорку два "зубы" – вежы Наваградскага замка. Замак – помнік крапаснога дойлідства X – XVI стст. – старажытны цэнтр Наваградка, рэзідэнцыя рускіх і літоўскіх князёў. Закладзены быў на месцы гарадзішча на высокім, часткова насыпаным узгорку, абкружаным ровам. Не раз разбураўся і аднаўляўся. У канцы XVI – пачатку XVII ст. у замак быў убудаваны палац, да якога прылягала капэла. На пачатку XVIII ст. узарваны шведамі. У час раскопак (у 1924 г.) на тэрыторыі замка выяўлены фундамент царквы XIV ст. Збярэгліся руіны галоўнай і адной з вуглавых вежаў.

4-ы вучань.

Колькі вятроў Беларусі
тут начавала,
не ведае нават
трава.
Колькі разоў небяспека
сюды прыпаўзала
з агнём і мячом,
зямля не палічыць.

Колькі паданняў тут
уваскрэсла,
не згадаюць русалкі
на Свіцязі.

Колькі аблокаў адсюль
адплыло
ў Канстанцінопаль,
не скажа грабніца
на Вавелі.

Думаў так падарожны
нядаўна
на дзядзінцы
Навагрудскага замка.

Юрка Голуб.
Колькі вятроў Беларусі...

Старонка 3-я – "Мірскі замак".

Вядучы (зачытвае эпіграф).

Мір. 1. Адсутнасць варожасці, сварак, згода. 2. Адсутнасць вайны. 3. Пагадненне паміж варожымі бакамі аб канчатковым спыненні варожых дзеянняў, мірны дагавор, спакой, цішыня. 5. Сельская грамада. *(З тлумачальнага слоўніка беларускай мовы.)*

Мястэчка з такой назвай шмат цярпела ад войнаў, а на абарону яго паўставаў Мірскі замак.

Гістарычная даведка.

5-ы вучань. У пачатку XVI ст. мясцовы магнат Юры Іллініч, які займаў пасады літоўскага маршалка і брэсцкага старасты, пачаў будаваць у Міры замак. З 1568 г. замак перайшоў ва ўладанне Мікалая Радзівіла з мянушкай Сіротка, які закончыў будаўніцтва. Два разы на замак нападалі шведы і спальвалі яго. У 1794 г. Мірскі замак узяў Суворaў. У ліпені 1812 г. пад мястэчкам казакі атамана М. Платава затрымалі французаў. Замак гарэў, была ўзарвана паўночна-ўсходняя вежа. Пасля 1885 г. уладальнікамі замка сталі рускія князі Святаполк-Мірскія. У 1994 г. за захаванне, даследаванне, рэканструкцыю і часткавую рэстаўрацыю Мірскі замак атрымаў дыплом еўрапейскай арганізацыі "Еўропа Ностра", якую стварылі 19 еўрапейскіх краін спецыяльна дзеля захавання архітэктурнай спадчыны.

6-ы вучань.

Стромкія вогнішчы даўніх муроў –
Зыркія вогнішчы нашага краю,
Белым пажарам у неба шугаюць,
Барвай палаюць між вольных вятроў.
Часу спадужнікі, тайкі нябёс,
Срэбна-ірдзяныя сёстры агнісак,
Я каля вас толькі прывідны прысак
Вашых бялява-скрываўленых слёз.
Стромкія вогнішчы даўніх муроў,
Полыскі дойлідскіх думак гарачых,
Полыскі гневу і полыскі плачу,
Водгалас продкаў маіх – ваяроў.

Ноч загараецца ў роснай траве,
Ноч узыходзіць над стомленым светам,
Пахне легендамі, казкамі, летам,
Птушка гібейла крычыць на дрыгве.
Дзе вы, нашчадкі былых муляроў?
Дзе вы, мінулая слава Айчыны?
Клічна палаюць апошняй лучынай
Стромкія вогнішчы даўніх муроў.

Сяржук Сокалаў-Воюш.
Беларускім дойлідам.

Старонка 4-я – "Нясвіжскі замак".

Гістарычная даведка.

7-ы вучань. Нясвіжскі замак стаў новым тыпам замкаў Беларусі так званай новаітальянскай сістэмы. Падчас вайны 1654 – 1667 гг. Нясвіж адбіваў напады ворагаў, але ў 1706 г. войскі шведскага караля Карла XII штурмавалі Нясвіж і заваявалі яго. Нясвіжскі замак, радавое гняздо Радзівілаў, у свой час быў яшчэ і заможным культурным цэнтрам. У 12 залах размяшчаліся бібліятэка, партрэтная і карцінная галерэі, знакамітыя слуцкія паясы, раскошная мэбля. Да нашага часу ацалела толькі адна брама – Слуцкая. 24 снежня 2004 г. замак гарэў. Быў створаны дабрачынны фонд, каб дапамагчы аднавіць замак. З Нясвіжскім палацам звязана шмат легендаў. Найбольш вядомая – пра Чорную панну.

8-ы вучань. Чатыры з паловай стагоддзі жыве паэтычная легенда пра Чорную панну. І ў нашы дні вераць у прывід Нясвіжскага замка: сцвярджаюць, што роўна ў 15 хвілінаў на першую гадзіну ночы таямнічая жаночая постаць пачынае абход пакояў. Яна стогне, усхліпвае, плача па сваім рана загубленым жыцці і вялікім каханні, а ў 15 хвілінаў на пятую гадзіну раніцы вяртаецца ў сховішча. Гэта, як лічаць, цень Барбары Радзівіл, жонкі князя Жыгімонта Аўгуста, якая вельмі рана памерла.

Князь так сумаваў па каханай, што вырашыў выклікаць яе дух. У зале ўсё было падрыхтавана, каб з дапамогай люстраў разыграць сцэну сустрэчы караля і душы яго каханай. Каралю хацелі прывязаць рукі да крэсла, каб ён не дакрануўся да прывіда. Жыгімонт даў слова, што будзе сядзець спакойна. Але калі з'явілася здань, ён ад хвалявання забыўся на сваю клятву, кінуўся да прывіда з крыкам. Адбыўся выбух – здань прапала... Цяпер душа Барбары не магла вярнуцца ў магілу і вымушана была хадзіць сярод людзей.

Многія ў замку лічылі, што прывід папярэджвае гаспадароў, калі ім пагражае нейкая небяспека, хвароба, вайна. У сярэдзіне XVIII ст. Чорная панна пачала выконваць новыя абавязкі – сачыць за паводзінамі маладых прыгожых дзяўчат і жанчын. Некаторых яна правучвала ў цёмных месцах у час баляў, калі яны дазвалялі сабе з'яўляцца ў вельмі адкрытых туалетах.

У існаванне Чорнай панны верылі і немцы, якія двойчы акупавалі Нясвіж. Калі яны бачылі ў канцы парку што-небудзь чорнае, то з крыкам "Шварцфраў!" стралялі ў тым напрамку і беглі хавацца.

Старонка 5-я – "Полацкія вежы".

Вядучы.

"Усё тут стаіць на старажытнасці", – трапна заўважыў Уладзімір Караткевіч. Гэты горад западае ў душу ўжо з першай сустрэчы з ім. Людзі, нават пакідаючы Беларусь, заўсёды памятаюць вежы Сафійскага сабора і Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра. І нараджаюцца песні...

Гучыць песня "Два Полацкі" (у выкананні Данчыка).

Сафійскі сабор

Гістарычная даведка.

9-ы вучань. Павольна коціць свае воды Заходняя Дзвіна. На яе высокім беразе вось ужо больш за дзевяць стагоддзяў стаіць Сафійскі сабор, найстаражытнейшы ў Беларусі помнік каменнага дойлідства. Сабор быў пабудаваны ў сярэдзіне XI ст. за пяць будаўнічых сезонаў. Ён уяўляў з сябе ў аб'ёме куб з кантам 26,4 *м*. Вянчалі сабор пяць купалаў у выглядзе шаломаў. Гісторыя не захавала імёнаў тых, хто ўзвёў святыню, але пабудавана яна была ў тым самым стылі і па той самай тэхналогіі, як Кіеўская і Наўгародская.

На працягу ўсёй сваёй гісторыі Сафійскі сабор перажыў нямала драматычных падзей, разбурэнняў і пажараў (у 1607 і 1643 гг. спалены, у 1710 г. – пашкоджаны выбухам). Самае сур'ёзнае перабудаванне поўнасцю відазмяніла помнік у сярэдзіне XVIII ст. Верх будынка быў нарошчаны, з'явіліся дзве высокія вежы на галоўным фасадзе, і храм ператварыўся ва уніяцкую базіліку ў стылі познебеларускага барока.

Побач з сівой старажытнасцю ў сённяшнім саборы можна ўбачыць барочнае ўбранства: багатая лепка на сценах, калоны з пазалочанымі капітэлямі, аркатурныя паясы, плоскія і аб'ёмныя вазы... Сёння Сафійскі сабор – цэнтр гістарычна-культурнага запаведніка горада Полацка, музей, у якім можна пазнаёміцца з гісторыяй забудовы храма, убачыць фрагменты старажытнай кладкі і фрэскавага роспісу, агледзець інтэр'ер сярэдзіны XVIII ст.

10-ы вучань.

Ля Полацкай Сафіі прыпынюся,
Сустрэне строгім выглядам яна.
Я Полацкай Сафіі пакланюся –
Прытулку, дзе ўладарыць даўніна.
Калісьці намаганнямі Ўсяслава
Сафія свой зазнала зорны час.
У галубцы выводзіла Прадслава
Па літары свяшчэннапісу вязь...
Ля Полацкай Сафіі прыпынюся.
Дзвіна свае калыша берагі.
Я гаварыць і дыхаць тут баюся,
Бо тут гавораць, дыхаюць вякі.
Паслухаць іх – з нас кожнаму спяшацца,
Пакуль сцяжына памяці бяжыць.
Таму я тут, што душам дакранацца:
Маёй і часу,
Трэба – з тым, каб жыць.

Ірына Багдановіч.
Ля Полацкай Сафіі прыпынюся...

Спаса-Еўфрасіннеўская царква

Гістарычная даведка.

11-ы вучань. Прыкладна ў 1159 г. полацкім дойлідам Іаанам быў пабудаваны галоўны сабор манастыра – Спаская царква – вяршыня архітэктурнай думкі Полацка. Пабудавана яна была за рэкордны тэрмін – 9 месяцаў. Помнік быў аздоблены унікальнымі фрэскамі, якія, на жаль, не ўсе захаваліся. Мяркуюць, што на іх – выява самой Еўфрасінні Полацкай, нябеснай заступніцы Беларусі, мошчы якой захоўваюцца ў храме.

Спаса-Еўфрасіннеўская царква адносіцца да тыпу пабудоў з адным купалам. Гэтаму храму Еўфрасіння падаравала свой знакаміты крыж, зроблены майстрам Лазарам Богшам. На жаль, крыж прапаў. Але ў наш час брэсцкі майстар Мікалай Кузьміч зрабіў дакладную копію крыжа.

12-ы вучань.

У Полацкай Спаса-Ефрасіннеўскай царкве
Перад спакойнай веліччу замры.
Насельніцтва славянства маладога
Плячыма грэе стылыя муры,
Кароцячы вачыма шлях да Бога.
Не на пякельным – на жывым жвіры
Святыя, як раташ, басанога
Стаяць, хоць штовякова пласт сыры
Кладзе на іх абліччы асцярога.

Душы і фрэсцы хочацца раскрыцца.
На ветры часу стыне веры крыца.
Красой падзольнай думку расцвялі.
У крыжакрылай келлі Ефрасінні
Згадаецца акрайчык неба сіні
І посах, што падаўся ў бабылі.

Рыгор Барадулін.

Старонка 6-я – "Дзісенская Уваскрэсенская царква".

Вядучы.
Веі замружу, і ўбачыцца вечар –
Белая цэркаўка тоненька свечкай,
Гнёзды буслоў над Дзвіной і Дзісной,
Цені дубоў над халоднай вадой.

Гістарычная даведка.

13-ы вучань. Храм Уваскрэсення Хрыстова ў Дзісне асвячоны 12 мая 1870 г. Пабудаваны з цэглы на сродкі Мураўёва. Разбураны ў час Вялікай Айчыннай вайны. Адноўлены ў 90-я гг. мінулага стагоддзя.

14-ы вучань.

Дзісенскай Уваскрэсенскай царкве
Дзе хвалі гуляюць самі з сабою,
Там горад існуе здаўна.
Той горад з бакоў амываюць вадою
Дзве рэчкі-сястрыцы – Дзвіна і Дзісна.

У горадзе гэтым цэркаўка белая.
Зведала мір і войны яна.
І ва ўсе годы рашуча і смела
Душы людзей ратавала ад зла.

Няхай яе рушылі людзі здалёку,
Якія да нас прынеслі вайну, –
Горда ўзнялася яна з-пад абломкаў
І ранішнім звонам будзіць Дзісну.
Звон – пра дабро і любоў напамінак
Людзям, што ў горадзе нашым жывуць.
Белыя сцены царквы, бы ў Сафіі,
Заўжды абароняць, спакой прынясуць.

Крысціна Казлоўская.

Настаўнік. Вы пачулі сёння толькі пра невялікую колькасць помнікаў гісторыі. Больш падрабязна пазнаёміцца з імі вы можаце з дапамогай вось гэтых кніг або твораў мастацкай літаратуры. (Паказвае кнігі.)

А зараз, каб падвесці вынік нашай сустрэчы, паслухайце верш Ніла Гілевіча і падумайце, што хацеў сказаць нам аўтар.

15-ы вучань.
У старажытным гарадку над Гайнай
Ля зруйнаванай кляштарнай сцяны
Я думаю, як дзіка, як нядбайна мы
Парою ставімся да старыны.

Чым ганарыцца перад светам варта нам,
Чым даражыць павінен чалавек, –
Ірвем, грызём, руйнуем экскаватарам –
Тэхнічны, балазе, дваццаты век!

Гісторыю трымаюць у пашане ўсе.
Навошта ж безаглядна так наўсцяж
Мы разбурыць мінулае спяшаемся,
Як бы яно – галоўны вораг наш?

Хіба не з працы гаратліўцаў прадзедаў
Яно вякамі паўставала тут?
Чаму ж няўдзячна гэтак абакрадзена
Зямная памяць іх зямных пакут?

Асцеражней, таварыш, са святынямі.
Чым замяніць іх думаеш, скажы?
Страшней за ўсё, як робяцца пустынямі
Палеткі плодныя людской душы.

Вучні адказваюць.

Настаўнік. Сапраўды, спадчыну сваю мы павінны шанаваць, зберагаць, бо гэта – наша гісторыя, наша жыццё. Часам нядбайна ставімся да помнікаў, і як вынік – калі не разбурыў час, то разбураюць людзі. Шмат помнікаў не захаваліся, бо час, войны і абыякавасць людская зрабілі сваю чорную справу. І цяпер некаторыя з іх мы можам убачыць толькі на гравюрах Напалеона Орды, нашага славутага мастака. Таму трэба зберагчы тое, што засталося.

Цікаўцеся, вывучайце гісторыю роднай зямлі, каб не быць манкуртамі, каб не знікнуць з зямлі як народ, бо без мінулага няма будучыні.

Гучыць песня "Каб любіць Беларусь нашу мілую..." (верш А. Ставера, у выкананні "Песняроў").

Усе ўдзельнікі выходзяць на сцэну.

Настаўнік. Мы загарнулі апошнюю старонку часопіса. Дзякуем за ўвагу.

Алена КРАСОЎСКАЯ,
настаўніца беларускай мовы і літаратуры
Дзісенскай СШ Мёрскага раёна.



ГАЛІНА ПАЎЛАЎНА КНІГА

Настаўніца беларускай мовы і літаратуры дзяржаўнай установы адукацыі "Гімназія г. Пружаны". Нарадзілася 23 студзеня 1967 г. у в. Аброва Івацэвіцкага р-на. Закончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1990). Мае вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю.

Узнагароджана дыпломамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і грамадскай арганізацыі "Беларускі зялёны крыж", пахвальнымі граматамі аддзела адукацыі Пружанскага райвыканкама. Мае падзякі ад грамадскай арганізацыі "Беларускі зялёны крыж", Пружанскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі, грамадскага аб'яднання "Дыярыуш". На конкурсе педагагічнага майстэрства "Прызванне – 2007" была ўзнагароджана дыпломам у намінацыі "Творчасць і майстэрства".

225133, Пружаны, вул. Р. Шырмы, 11,
тэл. 8-01632-9-24-26.

УМЕЕ КІРАВАЦЬ СРАБРЫСТЫМ КАРАБЛЁМ

Урокі роднай мовы і літаратуры, пазакласная праца Галіны Паўлаўны Кнігі прыцягваюць увагу вялікай аўдыторыі настаўнікаў Брэстчыны, і, натуральна, творчым педагогам іншых рэгіёнаў таксама будзе цікава патрапіць у лабараторыю яе прафесійных інтарэсаў і майстэрства.

Настаўніца гімназіі з Пружаншчыны Галіна Паўлаўна Кніга выключна сціплая, за плячамі яе 17 гадоў педагагічнага вопыту, нястомнага плённага пошуку і самаспазнання. Яна вывучае досвед калег, спецыяльную літаратуру па асаблівасцях методыкі сучасных адукацыйных тэхналогій (асобасна-арыентаваных, праблемных, гульнёвых, камп'ютэрных і інш.) і пры гэтым не ўспрымае рэкамендацыі як догму, а пашырае арсенал прыёмаў працы на ўроках беларускай мовы і літаратуры. І чым глыбей знаёмішся з педагагічнай скарбонкай настаўніцы, тым, здаецца, цяжэй быць строгім метадыстам.

Чым прывабліваюць яе ўрокі? Глыбокім зместам, жывасцю, арганізацыяй працы вучняў, свабодным абыходжаннем педагога са словам, раскаванай інтанацыяй, атмасферай даверу, ідэямі. Урокі звязваюцца адным тугім вузлом логікі, яны не зусім падобныя паміж сабою нават тады, калі праводзяцца ў паралельных класах.

Галіна Кніга імкнецца знайсці гармонію – і гэта перспектыўны кірунак у методыцы гуманітарных дысцыплін! – праз спалучэнне імёнаў і твораў пісьменнікаў, кампазітараў, скульптараў пры раскрыцці новых уражанняў і новых думак. А як прасторна для гукаў, фарбаў і дзеянняў на ўроках мовы!

У самых разнастайных і часам нечаканых ракурсах арганізуе педагог заняткі па літаратуры з падлеткамі. Так, на інтэграваным уроку (у форме падарожжа) "З народнай спадчыны" (V клас), дзе вучні паглыбляюць веды пра жанравыя асаблівасці народных твораў, багацце тэм і вобразаў, сканцэнтраваны разнастайныя віды дзейнасці падлеткаў.

Часам настаўніца прапануе прыдумаць вобраз-сімвал літаратурнага персанажа і растлумачыць выбар. Цікава, што Зоську з "Раскіданага гнязда" Янкі Купалы вучні паказалі ў вобразе рамонка, васілька, сэрца, напоўненага кветкамі; Марылю – у вобразе вярбы, ластаўкі, торбачкі, квактухі; Сымона – у вобразе арла, запаленага сэрца; Данілку – у вобразе скрыпкі; а пры вывучэнні аповесці "Сірочы хлеб" Янкі Брыля вучні паказалі пана Цабу праз вобраз хамелеона. Школьнікі чытаюць мастацкія творы ўважліва ("пад мікраскопам"), звяртаючы ўвагу на дэталі, многія нават імкнуцца закадаваць некаторыя вобразы з іх сэнсавай шматгранасцю ў самых разнастайных праявах і асацыяцыйных магчымасцях.

Творчыя заданні для груп на ўроках літаратуры разнастайныя па змесце, разлічаны на розныя тыпы мыслення. Пытанні праблемнага характару стымулююць самастойную думку вучняў.

Галіна Паўлаўна вучыць выхаванцаў з павагай ставіцца да народных звычаяў, успрымаць "святочны, старажытны дух калядны, магічны дух язычніцкіх абрас" (Ніл Гілевіч). У гімназіі пад яе кіраўніцтвам ужо 5 гадоў працуе клуб "Купалінка", удзельнікі якога глыбока зацікавіліся нацыянальна-фальклорнымі вытокамі духоўнасці. Калядкі, Масленіца, Гуканне вясны... Былі яшчэ пастаноўкі "Уваходзінаў", "Радзінаў". Любое мерапрыемства з удзелам "Купалінкі" забыць нельга: "Як свецяцца вочы гурткоўцаў, калі яны на сцэне, – заўважае кіраўнік. – І кожны артыст па-свойму адметны!" Зразумела і тое, што настаўнік, які так падступіўся да скарбаў народнай творчасці, казачна багаты і сам. Бо фальклор – гэта яшчэ і аснова маральна-эстэтычных уяўленняў народа, мудрасць навучання і выхавання.

Вучні Галіны Паўлаўны вераць у сябе. Яны былі пераможцамі раённых алімпіяд і абласных навукова-практычных канферэнцый, прызёрамі раённых і рэспубліканскіх конкурсаў, удзельнікамі міжнароднага праекта "З традыцыямі ў будучыню". Дыпломы, граматы, падзякі…


А яшчэ школьнікі пішуць вершы – па-беларуску і па-руску, якія выдаюцца ў альманаху "Першацвет". Ёсць тут і цёплыя ўспаміны пра настаўніцу, яе ўрокі.

У пошуках свайго запаветнага радка і Галіна Паўлаўна. Яе прыцягваюць дзве стыхіі: свет казак і свет маральна-інтымных пачуццяў, што заўсёды вызначаліся загадкавасцю, спрыялі выхаванню душэўнай чысціні.

Зінаіда КАВАЛЕВІЧ,
кандыдат педагагічных навук,
дацэнт Брэсцкага дзяржаўнага інстытута
павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі
кіраўнічых работнікаў і спецыялістаў адукацыі.

Мікола ШАБОВІЧ

ПАРОДЫІ



ЗАЦАЛАВАНЫ СВІТЭР, АЛЬБО ФАНТАСТЫКА НА ДРУГІМ ПАВЕРСЕ

Якім жа лёсам сцежка звіта?
І, пэўна, нам не скажуць губы...
Я песціў твой прыгожы світэр,
Хоць называў цябе я любай...

Цалую світэр, абдымаю,
Ды да рукі мне не кранацца...
Алесь Камароўскі

Алесь! Здзяцінеў ты, магчыма,
Ці мо гарэлкі выпіў літр,
Што абдымаеш не жанчыну,
А лашчыш-песціш яе світэр.

Хоць світэр, мабыць, і прыгожы,
Ды цалаваць яго хто будзе?!
Пакрыўдаваць жанчына можа,
Бо ёсць жа вусны, ёсць жа грудзі...

Што гэткі сціплы ты задужа
(Нат не прысеў, прылёг на лаўцы!),
Відаць, прыдумаў ты, мой дружа,
Бо я то знаю мікалаўцаў.

КАМЕЙША

"Спыніся, – сам сабе кажу, – Камейша!"
.....
Ды і ў прозвішчы – Камейша –
Штось ад каменю таго.
Казімір Камейша

Был на Захарова фуршет,
Читал Камейша о богине...
Юрый Сапажкоў

– Гэй, хто гэта мёрзне?
– Рыбак!
– Камейша?..
Вядома ж, Камейша.
Хведар Гурыновіч

Я не горшы ад Рагойшы
І не меншы ад Камейшы...
Кандрат Крапіва

За славай я ніколькі не ганюся:
Яна за мною ходзіць па пятах.
Калі сваім радком не застануся,
Нашчадкі ўспомняць па чужых радках.

ШТО БЫЛО – ТОЕ БЫЛО, АЛЬБО ДОЎГАЯ ДАРОГА Ў ЦЕРУХУ

Я плыў па Прыпяці з даяркамі...
Міхась Башлакоў

Дамоў дарога досыць яркая:
Спачатку пехам я махаў,
Пасля плыў Прыпяццю з даяркамі
(Адну, прызнацца, пакахаў),

А потым, помню, са свінаркамі,
Ужо ў вячэрнім цягніку,
Такімі мы хрумсцелі шкваркамі
(Свінаркі шчэ былі ў саку!).

Калі ж цялятніцы наведалі,
Ў падводу ўкінуўшы мяхі,
То я ўжо думаў: ці даеду я
Да сваёй роднай Церухі...

І хоць хлапчына досыць яркі я,
Ды не грашыў і не грашу.
"Я плыў па Прыпяці з даяркамі", –
Адно што вершык напішу.

ХОР БОЛЕЙ НЕ СПЯВАЕ

Ды ўжо сонца за бор, за бор,
Адбывае сваю павіннасць.
І спявае птушыны хор
Пра тваю і маю нявіннасць.
Уладзімір Марук

Ты са мною у бор пайшла
(Быў яшчэ я хлапчук бязвусы).
Сцежка нас за сабой вяла,
Бы з табою была ў хаўрусе.

Ці хацела чаго, ці не, –
Я цябе не пытаў пра гэта.
Ты сказала: "Кахай мяне,
Як умеюць кахаць паэты".

Счырванеў, як той мухамор,
Бы якую ўчыніў правіннасць.
Мне здалося: спявае бор
Пра маю і тваю нявіннасць...

Толькі ўсё ж паспяшаўся хор.
Нейк адбыў я сваю павіннасць.
Больш ужо не спявае бор
Пра маю і тваю нявіннасць.

ПА ВІЗУ – ДА ЕРМАЛАЕВА

Шыя, плечы, грудзі, сцёгны,
Да драбніц усе – без віз.
Быццам токам хтосьці сцёбнуў
Мне па жылах зверху ўніз.
Хведар Гурыновіч

Распісаўся з італьянкай –
Візу ў Пізу атрымаў.
Уладзімір Ермалаеў

Дзе б ні быў ты: зверху, знізу,
Ці то ў спальні, ці ў фае,
Памятáй, што візу ў Пізу
Ермалаеў выдае.

Мастацтва ў кантэксце часу

ПАРТРЭТАВАНЫ ЛЕТАПІС ЭПОХІ

ДА 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ЗАІРА АЗГУРА

Творчая біяграфія Заіра Ісакавіча Азгура (15. 01. 1908, в. Маўчаны Сенненскага р-на – 18. 02. 1995, пахаваны на Усходніх могілках) звязаная з яскравымі старонкамі беларускага мастацтва, культурным феноменам "Віцебскай мастацкай школы" – студыі Юдаля Пэна, Віцебскім мастацка-практычным інстытутам, Віцебскім мастацкім тэхнікумам. Творчы шлях мастака супаў з асноўнымі этапамі развіцця выяўленчага мастацтва Беларусі XX ст., у работах З. Азгура адлюстраваліся тэндэнцыі, характэрныя ў цэлым для эпохі таталітарызму: эклектычнасць формы – спалучэнне класіцыстычных прыкметаў і імпрэсіяністычных прыёмаў; падпарадкаванасць ідэйна-тэматычнаму зместу; ідэалізацыя як асноўны спосаб адлюстравання рэчаіснасці.

Творы даваеннага перыяду – найбольш значная і цікавая старонка творчасці З. Азгура. 1920 – 1930-я гг. – этап вучнёўства і станаўлення скульптара. Творы тых часоў не захаваліся, звестак пра іх вельмі мала. Першыя настаўнікі мастака: разьбяр па дрэве Юган Глек і ганчар Піліп Патапенка. Пераломнай стала для З. Азгура сустрэча з І. Рабушкіным, студэнтам Віцебскага мастацка-практычнага інстытута, які паказаў работы будучага скульптара Ю. Пэну (выхаванцу Санкт-Пецярбургскай акадэміі мастацтваў). Заір Азгур быў прыняты ў "Школу малюнка і жывапісу мастака Пэна" (першую студыю ў Беларусі, што адчынілася ў 1892 г.), праз якую ў свой час прайшлі Марк Шагал, Саламон Юдовін, Яўхім Мінін, Восіп Цадкін. Тут З. Азгур вучыўся на працягу 1921 г., у тым самым годзе ён паступіў у Віцебскі мастацка-практычны інстытут, дзе яго педагогам па жывапісе стаў С. Юдовін. Першая сур'ёзная работа, выкананая З. Азгурам у той час, – карціна "Гібель рэлігіі", якую вельмі хвалілі.

Гэтая першая і адзіная тады вышэйшая мастацкая ўстанова ў Беларусі была рэарганізаваная з заснаванай М. Шагалам у 1919 г. Віцебскай мастацкай народнай школы. У інстытуце праводзіліся выставы "левага" мастацтва, ладзіліся дыспуты пра шляхі развіцця мастацтва. З. Азгур не ўдзельнічаў у мерапрыемствах левых. На пачатку 1920 г. М. Шагал ужо пакінуў Віцебск, а за ім – і многія запрошаныя ім мастакі, але менавіта на шагалаўскім фоне фарміраваўся светапогляд маладых творцаў. У 1923 г. інстытут рэарганізавалі ў тэхнікум. З. Азгур вытрымаў праверачны экзамен і быў залічаны на аддзяленне скульптуры. Выкладанне ў інстытуце было прызнанае неэфектыўным – выкладчыцкі склад памянялі. Кіраўніком тэхнікума стаў Міхаіл Керзін, які моцна паўплываў на навучэнцаў, па словах З. Азгура, быў добрым педагогам, бо не навязваў сваёй манеры лепкі вучням, аднолькава патрабавальна ставіўся да сябе, твораў сваіх і вучняў.



Заір Азгур. 1930-я гг.

У "керзінаўскі" перыяд З. Азгур выканаў работы "Марксістка", "Работніца Надзя" (1924), "Галава слесара", "Галава ліцейшчыка", "Галава шляхціча" (1925) – франтальныя, статычныя, жорсткія паводле мадэлявання.

Пасля заканчэння тэхнікума З. Азгур з'ехаў у Ленінград, дзе навучаўся ў Вышэйшым мастацка-тэхнічным інстытуце (1926 – 1928 гг.) у прафесараў Р. Баха, Г. Манізера, В. Лішава. Працягнуў адукацыю ў Кіеўскім дзяржаўным мастацкім інстытуце, у Тбіліскай акадэміі мастацтваў у Я. Нікаладзе, вучня А. Радэна. У 1930 г. скульптар вярнуўся на радзіму і ўключыўся ў мастацкае жыццё Мінска.

Першыя яго творы з'явіліся на справаздачнай выставе Віцебскага мастацкага тэхнікума ў 1924 г. У наступным годзе ён удзельнічаў у І Усебеларускай выставе са штудыямі "Галава рабочага" (дзве адзінкі), "Галава старога". У скульптурах ленінградскага перыяду "Стралок з лука" (1927), "Эцюд" (1928) вырашаліся чыста кампазіцыйныя задачы – пастаноўка фігуры чалавека, размяшчэнне яе ў прасторы, перадача кірунку і матывацыі руху. Больш выразны і дынамічны, паказальны з пункту гледжання пластычнай анатоміі "Торс" (1928). Партрэты, створаныя ў Кіеве, вылучаюцца грубай лепкай з рэзкім святлоценявым мадэляваннем, без нюансавання,



Скульптар працуе над партрэтам князя Уладзіміра Полацкага. 1943 г.

пластычнага абагульнення, з упорам на перадачу фізіягнамічных асаблівасцяў мадэлі. Уплыў Я. Нікаладзе і А. Грубэ адчуваецца ў дэкаратыўных стылізаваных эцюдах "Будаўнік", "Трактарыст" (1929), выкананых у Тбілісі. Ужо ў гады вучнёўства вызначылася асноўная галіна творчасці скульптара – партрэт, метад працы над натурай – аналітычны.

У 1-й палове 1930-х гг. у беларускім мастацтве адбываюцца кардынальныя змены, ліквідуюцца Усебеларуская асацыяцыя мастакоў рэвалюцыі і аб'яднанне "Прамень", ствараецца аргкамітэт Саюза савецкіх мастакоў Беларусі. На І Усесаюзным з'ездзе савецкіх пісьменнікаў у 1934 г. фармулюецца асноўны прынцып творчага метаду савецкіх дзеячаў культуры – сацыялістычны рэалізм. Акрэсліваецца кола тэмаў і вобразаў, да якіх варта звяртацца: чалавек новай фармацыі, з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй. Рэалізм – тэрмін, які адносіўся да фармальных прыкметаў твораў мастацтва.

Гэтыя гады – перыяд самастойнай дзейнасці Заіра Азгура. Скульптар шукае новыя сродкі выразнасці, тэмы, вобразы, удасканальвае пластычную мову. Майстар імкнецца арганічна спалучаць прыватнае, індывідуальнае і агульнае, тыповае, увасабляць шматграннасць выяўленых асобаў. Працуе пераважна ў станковай скульптуры. У гэты час упершыню ўвасабляюцца і манументальныя задумкі мастака.

Заір Азгур стварыў цыкл партрэтаў дзяржаўных дзеячаў: К. Маркса, Ф. Энгельса, Я. Свярдлова, У. Леніна, І. Сталіна, С. Арджанікідзе. Згодна з канонам трактаваліся фігура (маштаб, пастаноўка, жэсты), міміка твараў. Вылучаюцца з цыкла рамантызаваныя вобразы лідэраў у скульптурнай групе "У. Ленін і І. Сталін" (1938), кампазіцыі "Сталін у юнацтве" (1939). Іншы падыход характэрны для цыкла партрэтаў прадстаўнікоў беларускай творчай інтэлігенцыі, яны ствараліся пераважна з натуры. Галоўная задача, якую вырашаў мастак, – даць дакладную псіхалагічную характарыстыку, перадаць шматграннасць творчай асобы.

Партрэт пісьменніка, рэжысёра, акцёра, тэатральнага дзеяча Уладзіслава Галубка (1930) вызначаецца кампазіцыйнай завершанасцю, энергічнасцю, шчыльнай лепкай, ясным сілуэтам. Стылёва і пластычна блізкі да яго партрэт народнага артыста Беларусі рэжысёра і педагога Міхаіла Рафальскага, архітэктанічны, кампактны, з дамінаваннем вертыкальных кірункаў, гладкай фактурай, прапрацоўкай твару. Гэтую лінію працягваюць партрэты псіхіятра Кандрата Манахава (1937), народнай артысткі СССР опернай спявачкі Ларысы Александроўскай (1937), што вылучаюцца чысцінёй аб'ёму, мяккасцю формаў, плаўным, ясным сілуэтам. Інакш трактаваныя вобразы Абрама Бразера, Янкі Купалы і Якуба Коласа. У першым З. Азгур выкарыстаў кампазіцыйную схему, характэрную для самога партрэтаванага мастака, – ніжні зрэз праходзіць па лініі грудзей, няма загладжанасці формы, лепка імпрэсіяністычная, фактура няроўная, жывапісная. Падобныя і выявы класікаў беларускай літаратуры: аднолькавая кампазіцыя (франтальная пагрудная), пасадка галавы, п'едэстал у форме неапрацаванай глыбы каменю.

Такім чынам, у даваеннай творчасці З. Азгура заўважныя два падыходы: станковыя партрэты з натуры, што вымагаюць разумення ўнутранай сутнасці мадэлі, вылучаюцца шырокай, вольнай лепкай, і рэгламентаваныя канонамі рэпрэзентатыўныя выявы.

У 1930-я гг. імя скульптара добра вядомае ў Беларусі, яго творы запатрабаваныя. У ліку іншых творцаў З. Азгур удзельнічаў у выкананні буйных заказаў урада – дэкараванні інтэр'ераў адміністрацыйных і грамадскіх будынкаў: Дома ўрада, Мінскага тэатра оперы і балета, Палаца піянераў. Згодна з планам, на лесвіцы, што вяла ў памяшканні Вярхоўнага Савета БССР, павінны былі размяшчацца партрэты дзеячаў рэвалюцыі, выкананыя ў адным памеры з аднаго матэрыялу. З. Азгур рабіў бюсты Ф. Дзяржынскага, А. Мяснікова, Г. Бабёфа, творам уласцівыя канструктыўнасць, манументалізацыя, абагульненне пры захаванні партрэтнага падабенства.

Развіццё беларускага савецкага мастацтва перарвалася вайной. На пярэдні план выйшла мастацтва агітацыйнае – графіка: плакат, сатырычны малюнак. Скульптура 1941 – 1942 гг. пераважна станковая, матэрыялы часовыя (гліна, гіпс). Асноўны жанр – партрэт, тэматычная кампазіцыя – падрыхтоўчы, эскізны матэрыял. Па-новаму інтэрпрэтуецца гераічны партрэт. Вобразы герояў Вялікай Айчыннай вайны (салдат, военачальнікаў, партызан, падпольшчыкаў) увасабляюцца беларускімі скульптарамі Андрэем Бембелем, Аляксеем Глебавым, Сяргеем Селіханавым, Заірам Азгурам часам з доляй гіпербалізацыі (з мэтай максімальнай сілы ўздзеяння), каб даць уяўленне пра мужнасць абаронцаў Бацькаўшчыны, подзвіг чалавека.

Азгураў рэалізм ваенных гадоў наступальны, дыктоўны. З першых дзён вайны скульптар удзельнічаў у выпуску антыфашысцкіх улётак, супрацоўнічаў з франтавым друкам, ілюстраваў газету "Раздавім фашысцкую гадзіну". У 1942 – 1944 гг. З. Азгур у Маскве,

пры Цэнтральным штабе партызанскага руху. Фактычна за тры гады мастак стварыў каля 40 партрэтаў герояў вайны: М. Гастэлы, А. Крывашэіна, П. Патоцкай, Ф. Смалячкова, Л. Даватара і інш. Большасць – з натуры, за абмежаваную колькасць сеансаў, адсюль жывасць, непасрэднасць, эцюднасць многіх работ, перадача індывідуальнасці мадэляў, іх знешнасці і характару, эмацыянальнага стану, адсутнасць патэтыкі, плакатнасці. Няма месца распаўсюджанаму сюжэтнаму, апавядальнаму пачатку, няма адчування стыхіі бою, драматызму.

У гады вайны З. Азгур звярнуўся да старонак гераічнага мінулага Беларусі ў пошуках актуальных вобразаў, матываў, праводзіў гістарычныя паралелі. У якасці натхняльнага прыкладу выканаў партрэт аднаго з правадыроў беларускага сялянскага вызваленчага руху XVII ст. Філона Гаркушы (1943), які асацыіруецца з партызанамі Вялікай Айчыннай; партрэты князёў Уладзіміра Полацкага і Васіля Мінскага (1943) у вобразе ратнікаў з поўным баявым рыштункам (шалом, кальчуга, шчыт).

Канец 1940 – пачатак 1950-х гг. – пераход ад вайны да міру, аднак ваенная тэматыка надоўга засталася адной з галоўных, запатрабаваных у беларускім мастацтве.

На працягу 1950 – 1970-х гг. асноўным жанрам заставаўся партрэт. Разам з тым замацоўваліся пазіцыі тэматычнай кампазіцыі і побытавага жанру. Ствараецца не толькі станковая, але і манументальная скульптура: помнікі, мемарыяльныя комплексы, ансамблі, што ўвекавечваюць подзвіг герояў вайны; манументальна-дэкаратыўная скульптура. Асноўныя сілы скульптурнага цэху гэтага перыяду прадстаўленыя ўжо вядомымі сталымі майстрамі А. Бембелем, А. Глебавым, З. Азгурам і маладым пакаленнем: С. Селіханавым, А. Заспіцкім і інш.

Дасягненні ў жанры партрэтаў звязаныя найперш з імем Заіра Азгура. Ён – цэнтральная фігура ў беларускай пасляваеннай пластыцы. Скульптар не абмяжоўваўся мяккімі матэрыяламі (глінай і гіпсам), але асвойваў тэхніку працы з мармурам, гранітам, бронзай, шукаў і новыя кампазіцыйныя вырашэнні. Шматстайнасць зацікаўленняў творцы выявілася ў выбары тэмаў і сюжэтаў. Цыклічнасць – нязменны прынцып творчасці: З. Азгур працягнуў серыю партрэтаў герояў Другой сусветнай вайны, дзеячаў культуры, звярнуўся да адлюстравання Герояў Сацыялістычнай Працы і барацьбітоў за мір.

З 2-й паловы 1950-х гг. узмацнілася цікавасць мастака да сучаснасці: гераікі працоўных будняў, вытворчай тэматыкі, запатрабаванай ладам, ідэалогіяй пасляваеннага жыцця краіны. Паўсядзённая праца перадавікоў, вяскоўцаў успрымалася як подзвіг, іх лёсы – як узоры. І ў партрэтах назіралася ідэалізацыя асобаў, захаванне характэрных рысаў знешнасці, манументалізацыя (выявы Т. Шкурко, А. Стыкут, А. Гарэцкай).

Такая самая лакальная і серыя партрэтаў барацьбітоў за мір (згодна з савецкай ідэалогіяй): Мао Цзэдуна, Кім Ір Сена, Хо Шы Міна, Далорэс Ібаруры, Пальміра Тальяці. Усе яны датуюцца 1950 г. і блізкія да афіцыйных парадных выяваў.

Найбольш шырокая, разнастайная, значная ў гісторыі выяўленчага мастацтва Беларусі XX ст. галерэя



Мадэль і твор – падчас працы над партрэтам Янкі Брыля. 1956 г.

партрэтаў дзеячаў сусветнай навукі і культуры, створаная З. Азгурам. Яна налічвае больш за сотню партрэтаў літаратараў, музыкаў, мастакоў розных эпох і народаў. Гэта кола людзей, блізкіх да скульптара духам, характарам творчай дзейнасці, светапоглядам, жыццёвым шляхам: Н. Воранаў, М. Мусаргскі, А. Пушкін, Я. Глебаў, Л. Александроўская, Р. Тагор, З. Бядуля і інш. У працы над гэтым цыклам мастак найбольш вольны, вынаходлівы. Псіхалагічная характарыстыка партрэтаваных дакладная і вычарпальная, паказаны ўнутраны рух, творчыя перажыванні.

Першыя працы серыі адносяцца яшчэ да перыяду вучнёўства (створаныя з натуры выявы Я. Коласа і Я. Купалы, 1924 г.). Пасляваенная частка цыкла распачалася партрэтам беларускай паэткі Алаізы Пашкевіч (Цёткі) (1948). Усе выяўленчыя сродкі скульптуры – кампазіцыя, форма, фактура – раскрываюць канцэпцыю вобраза. А. Пашкевіч прадстаўленая З. Азгурам у фокусе рэвалюцыйных падзей 1905 – 1907 гг., калі для яе паэзіі была характэрная палітычная вастрыня.

1950-я гг. у творчасці скульптара прыкметныя таксама з'яўленнем партрэтаў беларускіх пісьменнікаў Кузьмы Чорнага, Янкі Брыля (1956), жывапісца Натана Воранава (1957), кітайскага паэта Лу Сіня (1953 – 1954), амерыканскага паэта У. Уітмена (1959). Можна прасачыць некалькі сістэм кампазіцыйнага вырашэння: партрэтная галава (Н. Воранаў), франтальны (або амаль) стан корпуса без значных ракурсаў (П. Броўка, Я. Цікоцкі), торс у складаным прасторавым развароце, дапоўнены жэстам рук (К. Чорны). Характар, біяграфія мадэлі вызначалі выбар матэрыялу, тэхнікі, стылістыкі. Нешматслоўная, лаканічная, вытанчаная мова партрэта Лу Сіня, выкананага з белага мармуру. Паўфігура Рабіндраната Тагора высечаная з граніту. Абагульненыя формы каменю і яго фізічная важкасць адпавядаюць маштабу асобы. Выкарыстоўваючы паліхромнасць, рознасць фактур ма-

тэрыялу (паліраваны граніт мае чорны колер, гладкую паверхню з блікамі – твар, рукі паэта; неапрацаваны – шэры колер, рэльефную паверхню – валасы, барада, вопратка), скульптар дасягае сапраўднасці, дакладнасці вобраза паэта-лірыка, вялікага мысляра.

Распрацоўка драматургіі вобраза – галоўная мэта Заіра Азгура падчас працы над партрэтамі дзеячаў навукі і культуры ў наступныя дзесяцігоддзі: Якуба Коласа (1961), Янкі Маўра (1961), Барыса Палявога (1976).

Ад эцюдных даваенных выяваў, дзе найперш зафіксаванае вонкавае аблічча паэта, Каласіяна З. Азгура эвалюцыяніруе да сталага партрэта, які перадае ўсе грані, маштабнасць асобы Песняра (1961). Паўфігура Я. Коласа пададзеная ў нахіле наперад, вялікую ролю ў кампазіцыі адыгрывае становішча рук. Паэт абапіраецца на правую руку, што дадае позе ўстойлівасці, узмацняе адчуванне роздумаў. Уражанне значнасці, моцы вобраза падкрэсліваецца матэрыялам – гранітнай глыбай.

У 1950 – 1970-я гг. Заір Азгур працаваў над манументальнай скульптурай, стварыў помнікі-бюсты, статуі: рускага ваяра Дз. Пажарскага (1945 – 1950, Суздаль), лётчыка С. Грыцаўца (1956, Мінск), прафесара медыцыны А. Очкіна (1957, Масква) і іншыя, усталяваныя ў многіх гарадах Беларусі, Расіі, Украіны, Дагестана, Казахстана.

Самая значная манументальная работа скульптара ў 1950-я гг. – рэльеф для абеліска на плошчы Перамогі ў Мінску, усталяванага да дзесяцігоддзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сцэна на галоўным фасадзе паказвае трыумф Перамогі, бакавыя пано апавядаюць пра барацьбу ваяроў і партызанаў, кампазіцыя на ўсходнім баку помніка прысвечаная развітанню народа з вайскоўцамі, што аддалі жыццё дзеля свайго народа. Заір Азгур выканаў рэльеф "Слава загінулым героям". На ім выяўленая група людзей ля магілы. Камандзіры і салдаты стаяць у ганаровай варце з апушчанымі сцягамі.

Помнік Якубу Коласу Заіра Азгура, усталяваны на аднайменнай плошчы ў Мінску ў 1972 г., стаў сімвалам Беларусі.

1980 – 1990-я гг. – час кардынальных пераменаў у выяўленчым мастацтве ў цэлым і ў скульптуры ў прыватнасці. Вобразна-пластычная мова скульптуры мяняецца ў бок умоўнага рэалізму, стылізацыі, дэфармацыі аб'ёму; знікае мяжа паміж станковымі і манументальнымі творамі, прадметамі дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва і скульптуры. Партрэт саступае пазіцыі складаным тэматычным і абстрактным кампазіцыйным аб'ектам.

На працягу апошніх гадоў жыцця майстар працаваў над партрэтамі дзеячаў культуры: беларускага пісьменніка і грамадскага дзеяча Цішкі Гартнага, паэтаў Ізі Харыка, Генрыха Гейне (усе 1987), яўрэйскага філосафа і паэта Іегуды Галеві (1986). Па-ранейшаму З. Азгур моцны ў пластычнай і псіхалагічнай характарыстыцы партрэтаваных, аднак шэраг твораў вылучаецца чыста фармальным, дэкаратыўным, схематычным вырашэннем.

Спадчына Заіра Азгура значная. Ён стварыў каля тысячы твораў – станковай скульптуры і манументальнай. Асноўная галіна, у якой працаваў майстра, – партрэт (парадны і псіхалагічны, канкрэтны і тыповы, натурны і гістарычны). Заір Азгур увасобіў вобразы дзеячаў сусветнай, беларускай палітыкі, навукі, культуры. Галерэя створаных вобразаў – своеасаблівы летапіс XX ст. у асобах, частка фонду сусветнай мастацкай класікі.

Пераклад з рускай мовы.

Аксана БАГДАНАВА,
мастацтвазнаўца,
дырэктар Мемарыяльнага музея-майстэрні З. І. Азгура.

Здымкі з калекцыі "Архіў З. І. Азгура" (акрамя трэцяга) публікуюцца ўпершыню.

Рупліўцы

НЯСТОМНЫ ЗБІРАЛЬНІК ФАЛЬКЛОРНЫХ СКАРБАЎ

КАНФЕРЭНЦЫЯ ДА 115-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ РЫГОРА ШЫРМЫ

29 – 30 лістапада 2007 г. на базе філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта была праведзена IV Міжнародная фальклорна-этналінгвістычная навуковая канферэнцыя, прысвечаная 115-годдзю з дня нараджэння Рыгора Раманавіча Шырмы, – "Фальклорная спадчына Р. Шырмы і Г. Цітовіча: вопыт збіральніцкай, навуковай і папулярызатарскай дзейнасці ў кантэксце праблем адраджэння традыцыйнай культуры вёскі".

Мэтазгоднасць правядзення канферэнцыі матывавалася, па-першае, тым, што кафедрай тэорыі літаратуры філалагічнага факультэта БДУ назапашаны навуковыя распрацоўкі ў рамках штогадовых Шырмаўскіх навуковых чытанняў, якія праводзяцца з 1999 года; па-другое, тым, што за гэты тэрмін наладжаны цесныя сувязі па навуковым супрацоўніцтве з іншымі ВНУ рэспублікі, навуковымі інстытутамі Беларусі, Расіі і Украіны; па-трэцяе, тым, што вучэбна-навуковая лабараторыя беларускага фальклору, якая функцыянуе пры кафедры тэорыі літаратуры, ужо 25 гадоў з'яўляецца навукова-метадычным каардынацыйным цэнтрам у Беларусі па збіранні, захаванні, сістэматызацыі, вывучэнні і папулярызацыі фальклору.

Канцэпцыя канферэнцыі была абумоўлена постаццю Рыгора Раманавіча, высокаадукаванага ча-

лавека з шырокімі поглядамі на нацыянальную культуру, славутага фальклярыста, выдатнага этнамузыказнаўцы, інтэрпрэтатара беларускага фальклору, педагога. У 1960-я гг. фальклярысты БДУ знайшлі ў яго асобе натхняльніка рэгіянальнага вывучэння беларускага фальклору, мудрага дарадчыка і кансультанта. Ён быў рэдактарам першага рэгіянальнага зборніка "Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Брэсцкая вобласць" (1973). Нястомны збіральнік фальклорных скарбаў пачаў запісваць песні ў пятнаццацігадовым узросце. Вынік шматграннай дзейнасці Р. Шырмы – 12 фальклорных зборнікаў, якія справядліва лічацца класічнымі. Іх матэрыяламі з удзячнасцю карыстаюцца сучасныя фальклярысты і студэнты розных спецыялізацый, у тым ліку і філолагі.

Арганізатарам канферэнцыі выступіў філалагічны факультэт БДУ ў складзе кафедры тэорыі літаратуры, вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору і кабінета-музея беларускай народнай культуры.

У склад аргкамітэта канферэнцыі ўвайшлі:

старшыня – дэкан філалагічнага факультэта БДУ, д. ф. н., прафесар Іван Сямёнавіч Роўда;

сустаршыні – загадчык кафедры тэорыі літаратуры БДУ, д. ф. н., прафесар Вячаслаў Пятровіч Рагойша;

прафесар кафедры беларускай літаратуры і культуры, загадчык кабінета-музея беларускай народнай культуры, д. ф. н. Ірына Валер'еўна Казакова;

члены аргкамітэта – д. ф. н., прафесар, загадчык кафедры беларускай культуры і фальклярыстыкі Гомельскага ДУ імя Ф. Скарыны В. С. Новак;

к. ф. н., асістэнт Інстытута літаратуры, фальклору і мастацтваў Латвійскага універсітэта А. Пуцеліс;

к. ф. н., старшы навуковы супрацоўнік аддзела фальклярыстыкі Інстытута мастацтвазнаўства, фальклярыстыкі і этналогіі імя М. Т. Рыльскага НАН Украіны І. Ю. Федас;

к. ф. н., дацэнт, дацэнт кафедры тэорыі літаратуры БДУ Р. М. Кавалёва;

к. ф. н., дацэнт, галоўны рэдактар часопіса "Роднае слова", дацэнт кафедры сучаснай беларускай мовы БДУ У. І. Куліковіч;

к. ф. н., дацэнт, загадчык вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору пры кафедры тэорыі літаратуры БДУ Т. А. Марозава;

к. ф. н., дацэнт кафедры тэорыі літаратуры БДУ В. В. Прыемка;

намеснік галоўнага рэдактара часопіса "Народная асвета" У. У. Фалалееў.

Гэта ўжо чацвёртая навуковая фальклорна-этналінгвістычная канферэнцыя, якую з 2004 года ладзяць вучэбна-навуковая лабараторыя беларускага фальклору, кафедра тэорыі літаратуры, а з 2006 г. – і кабінет-музей беларускай народнай культуры пры фінансавай падтрымцы Навукова-даследчай часткі БДУ.

Кожны год канферэнцыя прысвячалася выдатным славянскім фальклярыстам: у 2004 г. – 80-годдзю Мікіты Талстога ("Праблемы ўсходнеславянскай фальклярыстыкі"), у 2005 г. – 220-годдзю Зарыяна Даленгі-Хадакоўскага ("З. Даленга-Хадакоўскі і праблемы комплекснага даследавання фальклору Палесся"), у 2006 г. – 80-годдзю А. С. Фядосіка ("Фальклор і этнакультура Палесся ў індаеўрапейскім кантэксце"). Асаблівасць усіх чатырох канферэнцый яшчэ і ў тым, што пачынальнікам, ідэйным натхняльнікам і арганізатарам названых першых дзвюх быў вядомы беларускі фальклярыст Васіль Дзмітрыевіч Ліцвінка, які заўчасна памёр летась.

У рабоце канферэнцыі ўзялі ўдзел 68 выступоўцаў – выкладчыкаў і навуковых работнікаў з 10 ВНУ краіны (не толькі са сталіцы, але і з Баранавічаў, Віцебска, Гомеля, Мазыра), 6 замежных ВНУ (з Беластока, Осла, Масквы, Адэскай вобласці, Львова, Прагі) і 5 навуковых інстытутаў (з Беларусі, Латвіі, Украіны).


Асноўныя блокі, ахопленыя канферэнцыяй: фальклорная спадчына Р. Шырмы і Г. Цітовіча (сябра і вучня Р. Шырмы) і праблемы адраджэння традыцыйнай культуры вёскі. Прагучалі даклады: "Выразныя сродкі ў асяродку прабывання беларусаў" Аляксандра Лакоткі, "Украінскія аўтографы Г. Цітовіча" Алеся Бельскага, «Спадчына Р. Шырмы на старонках часопіса "Роднае слова"» Уладзіміра Куліковіча, "Да пытання аб азяранскай гаворцы (на матэрыяле фальклорна-дыялекталагічных запісаў Е. Раманава)" Мікалая Прыгодзіча і інш. Працавалі чатыры секцыі – "Мова фальклору", "Фальклор у кантэксце этнакультуры", "Фальклор і літаратура", "Фальклор: тэорыя, збіранне, вывучэнне".

Выступленні скіраваны на ўсебаковую рэпрэзентацыю традыцыйнага і сучаснага фальклору, закранаюць стасункі фальклору і літаратуры, мову фальклору, агульнакультурныя працэсы. Аўтары аналізуюць фальклорна-міфалагічную традыцыю ва ўсіх яе формах і праявах – натуральнай (аўтэнтычнай) і апасродкаванай літаратурай – праз вывучэнне мастацкага асэнсавання беларускай ментальнасці, фальклорных і міфалагічных асноў мастацкіх твораў, рэмінісцэнцый і алюзій, месца фальклору ў структуры літаратурных твораў, асэнсаванне і вырашэнне тэарэтычных пытанняў фальклору, аналіз матываў, вобразаў, тропікі, стылю асобных фальклорных жанраў і інш.

Арганізатары і ўдзельнікі канферэнцыі ўпэўнены, што плёнам іх працы стане актывізацыя фальклорна-этналінгвістычных даследаванняў на Беларусі, увядзенне вынікаў гэтай працы ў навучальны працэс і выкарыстанне ў правядзенні фальклорнай практыкі.

Таццяна МАРОЗАВА,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

У гэтым годзе часопіс "Роднае слова" аднаўляе рубрыку "Дыялог з карцінай". Нарысы, эсэ і навелы пра творы беларускага мастацтва (рэпрадукцыі будуць змяшчацца на 4-й старонцы вокладкі) нам прапануе Віктар Карамазаў, пісьменнік, мастак, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Кастуся Каліноўскага, аўтар больш як дваццаці кніг: раманаў, аповесцяў, навел, эсэ "Падранак", "Пушча", "Бежанцы", "Дзяльба кабанчыка", "Проста ўспомніў я цябе", "Глядзіце ў вочы лемуру" ды іншых. У апошнія гады пісьменнік даследуе жыццё і творчасць выдатных беларускіх мастакоў – Вітольда Бялыніцкага-Бірулі, Станіслава Жукоўскага, Фердынанда Рушчыца, Антона Бархаткова, Гаўрылы Вашчанкі, Анатоля Бараноўскага. Пра іх яго апошнія кнігі: "Крыж на зямлі і поўня ў небе", "З вясною ў адным вагоне", "Зачараваная душа", "Брама", "Мой брат духоўны", "Антон". Цяпер В. Карамазаў даследуе абставіны смерці ў 1904 г. вядомага рускага мастака Мікалая Неўрава, які пэўны час жыў у беларускай вёсцы Лыскаўшчына, што ў Круглянскім раёне на Магілёўшчыне. Пра гэта – у новай кнізе Віктара Карамазава, якая неўзабаве выйдзе з друку.



Дыялог з карцінай

Віктар КАРАМАЗАЎ

ЗІМОВЫ СОН

ЭСЭ*

...Няшмат усяго – зімовы ўзгорак і на ім каплічка, – але адкуль такая ўлада іх над тваёй душою? Ад прасторы, незаплямленай свабоды, глыбознай цішыні ды чысціні, замглёна-снежнага блакіту ночы на зямлі ды ў небе?

Тут – улада мастака. Ён ведае душу прыроды, кожнага ў ёй парастка і людскую душу, ведае, як звесці іх ва ўзаемнай радасці, не разбурыўшы гармоніі свету і сусвету: усё – узгорак, каплічку, неба – прыўзняў у чысціні да Найвышэйшага і паказаў туды дарогу.

"Зімовы сон" – назваў Біруля свой пейзаж. Але яго блакітны сон стаўся нашай бяссонніцай, і мы называем яго блакітнай каплічкай. І больш няма пытанняў? Ёсць. І яны таксама нас хвалююць: калі і дзе гэтая казка напісана, у якім стане душы мастак яе пісаў і хто, ці ёсць ён, сведка?

Вядомы год – 1912. Вядома і тое, што Вітольд Каятанавіч пісаў у майстэрні мала. Паляўнічаму якое паляванне ў сценах дома? Пошук пейзажнага матыву, работа над ім былі ў яго паляваннем на нечаканае святло, на свой адмысловы тон, на мяккі цень, на цішыню і вусціш, на мімалётны настрой, на пераменлівасць настрояў і святла, на ўсё імклівае, імгненнае, мала кім заўважанае, што нечакана мяняе прыроду, чалавека, знікае таксама нечакана. Выбліснула і пагасла. А ты лаві той момант. Злаві і ўтрымай, нібы сінічку ў руцэ. Вось – злавіў каплічку ў блакітным сне.

Дык дзе ж яны былі – узгорак і каплічка?

"Аднойчы зімою, з'ехаўшыся на калядную ёлку ў Гарусава, мы, сябры-мастакі, выйшлі на паляванне. Каб скараціць дарогу ад вёскі да лесу, пайшлі праз возера на высокі процілеглы бераг, дзе стаяла хата селяніна Аляксея Кузёмкіна. Была раніца. Галіны старых бяроз, белыя ад інею, дыяментамі зіхацелі пад сонцам. Багданаў-Бельскі спыніўся:

– Якое прыгожае месца! Я хацеў бы, каб ты пабудаваў тут дачу.

Ён дастаў з кішэні сваю візітоўку, заламаў ражок і падаў мне як першы візіцёр на маёй будучай дачы.

Пажаданне сябра я перадаў жонцы Вользе Іванаўне. Яна была ў захапленні, і неўзабаве мы з ёю адправіліся да Кузёмкіна купляць тую зямлю. Гэта было ў снежні 1912 года, а вясною 1914 я з сям'ёю пераехаў на сваю новую дачу".

Вёска Гарусава і возера Удомля – Цвярская губерня. Туды на самым пачатку стагоддзя В. Біруля прыйшоў з сябрамі: Станіславам Жукоўскім, Аляксандрам Марававым, Мікалаем Багданавым-Бельскім і Аляксеем Сцяпанавым па слядах Ісака Левітана, свайго настаўніка і мастацкага куміра, і там застаўся на ўсё жыццё. Пакуль не пабудаваў дачу на беразе Удомлі, жыў па вёсках вакол Удомлі, больш – у Гарусаве, у вялікім доме Аракчэевых. Пакояў было шмат, хапала і гаспадыням, тром сёстрам, і гаспадару, і сябрам-мастакам. Звычайна збіраліся на пачатку зімы – палявалі і пісалі. На Каляды прыязджалі іх сем'і – жонкі, дзеці. Ставілі ёлку. Было шмат музыкі, спеваў, масак, інсцэніровак, жартаў, падарункаў. На сваю ёлку запрашалі суседзяў, вясковых дзяцей. У памешчыка Ушакова, які жыў у блізкай вёсцы Астраўно, купілі і прывезлі ў гарусаўскі дом раяль з чырвонага дрэва, на якім ці даўно Куўшыннікава і Турчанінавы, Ганна Мікалаеўна і Ганулія (Люлю), яе дачка, якіх кахаў Левітан, ігралі Ісаку Ільічу любімых ім Бетховена, Чайкоўскага, Шапэна, калі мастак жыў у доме Ушакова. У Гарусаве на раялі ігралі Вольга Іванаўна і Алёна Мікалаеўна, жонкі Бірулі і Маравава, выдатныя піяністкі. Багданаў-Бельскі і Мараваў ігралі на балалайках, якія вазілі з сабою разам з эцюднікамі і стрэльбамі. Усе спявалі. Днём у любое надвор'е пісалі эцюды.

Пасля святаў і зімовых паляванняў жонкі і дзеці ад'язджалі, хтосьці з мастакоў перабіраўся ў суседнія з Гарусавам вёскі, але Вітольд Каятанавіч адсюль не выязджаў – пісаў, паляваў і будаваў вялікі, з адборнай сасны, смаловай і духмянай, свой дом.

Ну, а блакітная каплічка? Яна, безумоўна, напісана з натуры, і калі стаяла там, дзе той зімою жыў Біруля, то дзе, у якім месцы? У Гарусаве? Ці ў нейкай з суседніх вёсак – Сігаве, Каскове, Шамардзіно. А можа, гэта тая цэркаўка святога Міколы-ўгодніка, якую на пачатку стагоддзя мужыкі перавезлі ў вёску Стан, паставілі на яе ўскраіне? Гэта, магчыма, яна сваім звонам пазней разнясе па-над Удомляй жалобу, калі памрэ Вітольд Каятанавіч у сваім, на Удомлі, белым доме – у "Чайцы".

Гадаць не будзем. Хіба нам мала таго, што ведаем? Блакітная каплічка не прыдуманая мастаком, рэальная, з таго самага берага, дзе жыў і пісаў свае цудоўныя пейзажы жыццёвым лёсам закінуты сюды беларус Вітольд Каятанавіч Бялыніцкі-Біруля.

* Пачатак эсэ змешчаны на чацвёртай старонцы вокладкі часопіса.

ВІТОЛЬД БЯЛЫНІЦКІ-БІРУЛЯ

Вітольд Каятанавіч Бялыніцкі-Біруля ўвайшоў у гісторыю рускага і беларускага мастацтва двух стагоддзяў – XIX і XX – як самабытны і таленавіты пейзажыст. Беларус паводле паходжання (нарадзіўся ў 1872 г. у сядзібе Крынкі пад Бялынічамі), ён захаваў вернасць роднай зямлі, хоць і вучыўся, і доўга жыў у Расіі. Мастацкую адукацыю атрымліваў спачатку ў Кіеве ў малявальнай школе Мікалая Мурашкі (1885 – 1889 гг.), потым у Маскоўскім вучылішчы жывапісу, ваяння і дойлідства ў Іларыёна Пранішнікава, Сяргея Каровіна, Мікалая Неўрава, Васіля Паленава (1889 – 1896 гг.); вярнуўся на радзіму, дзе правёў восем гадоў. У гэты перыяд шмат працаваў і адначасова выязджаў для ўдзелу ў выстаўках у Пецярбург, Маскву, на Захад.

Напрыканцы XIX ст., у 1890-я гг., яшчэ ў перыяд навучання, В. Біруля набыў вядомасць, творы яго выклікалі сур'ёзную зацікаўленасць сапраўдных аматараў прыгожага. Так, палатно "Наваколле Пяцігорска" (1892) было набыта Паўлам Траццяковым для яго галерэі. Гэтая падзея, безумоўна, вельмі ўзрушыла мастака, стала доказам трываласці выбранага ім шляху.

Прыкметным у творчасці В. Бялыніцкага-Бірулі быў уплыў Ісака Левітана. Слынны мастак паспрыяў Вітольду Бірулю і ў выставачнай справе, што, безумоўна, было неабходна для творчага станаўлення маладога таленту. З 1897 г. В. Бялыніцкі-Біруля ўдзельнічаў у выстаўках Маскоўскага аб'яднання аматараў мастацтваў, Маскоўскага таварыства мастакоў. З 1899 г. прадстаўляў працы разам з Таварыствам перасоўных мастацкіх выставак, а ў 1904 г. стаў яго правадзейным членам. Як у Расіі, так і за яе межамі, В. Біруля неаднаразова атрымліваў узнагароды (залаты медаль у Мюнхене за палатно "Час цішыні", 1909).

Вітольд Біруля дасягнуў неабходнай меры абагульнення, не трацячы пры гэтым канкрэтыкі месца. Ён знайшоў свой голас. Пейзажыст па-майстэрску распрацоўваў ледзь прыкметныя нюансы, характэрныя для таго ці іншага часу дня, пэўнай пары года. Палотны В. Бірулі – гэта пранікнёны расповед пра прыгажосць навакольнага свету. Карціны і шматлікія эцюды творцы вылучаюцца асаблівай тонкасцю, мяккасцю і непаўторным лірызмам, глыбінёй успрымання і перадачы жывога подыху прыроды.

Адна са значных прац Вітольда Каятанавіча – "Зімовы сон" (1911). Асноўная тэма пейзажа – мелодыя зімы. Каларыстычнае майстэрства дапамагае мастаку ўвасобіць тонкі, складаны стан прыроды, які цягнецца ўсяго некалькі імгненняў. Прырода спіць. Нібыта на пастаменце з белага снегу перад вачыма ўзнікае невялічкая царква. Мяккія, прыглушаныя шэра-блакітныя і бэзавыя тоны перадаюць адчуванне надыходу вечара. Кампазіцыя натуральная і дакладная, яна ахоплівае невялікую замкнёную прастору. Дзякуючы гэтаму сюжэт набывае камернасць, лірычнасць, шчырасць, характэрныя для "пейзажа-настрою".

Творчасць таленавітага мастака выклікала зацікаўленасць такога карыфея рускага рэалізму, як Ілля Рэпін. У лісце да В. Бірулі Ілля Яфімавіч адзначыў: "На выстаўцы, калі я даведаўся, што няма Вашых карцін, вельмі засумаваў па Вас. Я так звыкся асвяжацца душою перад Вашымі жывымі павевамі праўды, простасці і свабоды.

І… я заўсёды з новым і большым задавальненнем гляджу на Ваш пагорак, з хатамі, занесенымі снегам; люблю гэтыя бераж кі, што белымі краямі люструюцца ў горнай рэчцы" (Репин. И. Письма. Москва, 1969, т. 2, с. 263).

Вітольд Каятанавіч на працягу шматгадовага творчага шляху захоўваў вернасць выбранаму ім у маладыя гады мастацкаму метаду. Змена палітычнай улады, наступленне новай – савецкай – эпохі не змяніла тонкасці яго ўспрымання, не адбілася на каларыстычным строі яго палотнаў. Вернасць мастацкай мове і рэалістычнаму метаду не абмяжоўвала творчых пошукаў пейзажыста ў савецкія часы, калі, як вядома, пазітыўна ставіліся менавіта да рэалізму. Новая ўлада спрыяла пашырэнню творчай геаграфіі мастака.

Тройчы – у 1934, 1935, 1938 гг. – Вітольд Біруля наведваў Запаляр'е (Кольскі паўвостраў). Ён пісаў Баранцава і Белае мора, раку Церыберку, горы Хібіны, возера Вуд'яр. Пейзажыст працаваў у мясцінах, звязаных з жыццём і творчасцю Льва Талстога, Аляксандра Пушкіна, Пятра Чайкоўскага. Прыязджаў В. Бялыніцкі-Біруля ў Архангельск (1944 г.), дзе адлюстроўваў помнікі старажытнарускага драўлянага дойлідства XVI – XVII стст. У 1947 г. В. Біруля – у Беларусі. На роднай зямлі ім быў створаны вялікі цыкл эцюдаў, шэраг карцін ("Зялёны май", "Зазелянелі беларускія бярозкі" і інш.). У палотнах мастака з усёй пераканальнасцю паўстае маляўнічая прырода Беларусі. Яе лясы, балоты, ціхія рэкі, палі зноў захапляюць пейзажыста, які не быў на радзіме сорак гадоў.

На працягу ўсёй творчай дзейнасці Вітольд Бялыніцкі-Біруля меў прызнанне. Так, ужо ў 1908 г. ён стаў акадэмікам Імператарскай Акадэміі мастацтваў, у 1944 г. – народным мастаком БССР, у 1947 г. – народным мастаком РСФСР і правадзейным членам Акадэміі мастацтваў СССР.

Памёр знакаміты пейзажыст ва ўзросце 85 гадоў у 1957 г. у Маскве, пакінуўшы ў спадчыну вялікую колькасць сваіх твораў. Найбуйнейшая калекцыя работ Вітольда Каятанавіча налічвае больш як 400 адзінак, захоўваецца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь. У Магілёве працуе музей В. Бялыніцкага-Бірулі – філіял Нацыянальнага музея, дзе прадстаўлены жывапіс і мемарыяльныя рэчы мастака. У 2008 г. у пастаяннай экспазіцыі Нацыянальнага мастацкага музея запланавана адкрыццё асобнай залы, прысвечанай В. Бялыніцкаму-Бірулю. Храналогія твораў, што будуць экспанавацца, ахоплівае канец XIX – першую палову XX ст.

Вітольд Каятанавіч Бялыніцкі-Біруля – гэта адна з тых постацяў, што перадалі найлепшыя традыцыі мастацтва другой паловы XIX стагоддзя стагоддзю XX, выступіўшы, такім чынам, жывым увасабленнем повязі дзвюх вялікіх эпох.

Аляксей ХАРАК,
навуковы супрацоўнік
Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.

Ад рэдакцыі. *Як бачым, пісьменнік В. Карамазаў і супрацоўнік музея А. Харак падаюць розныя звесткі пра год стварэння карціны "Зімовы сон", пра месца смерці В. Бялыніцкага-Бірулі. А гэта значыць, што кропка ў даследаванні жыцця і творчасці мастака яшчэ не пастаўлена…*

Ірына КАЗАКОВА

ПРЫЙШЛІ КАЛЯДКІ – БЛІНЫ ДЫ АЛАДКІ

Народ шчыра вітаў зімовыя святы, асноўнымі з якіх былі Каляды і Новы год. На іх гатавалі бедную (посную), багатую і галодную куццю, калядавалі, шчадравалі, ладзілі ігрышчы-гульні.

На **посную куццю** (6 студзеня) стол засцілалі сенам і пакрывалі абрусам, ставілі посныя стравы (квас з грыбамі, аўсяны кісель з сытой, рыбу і інш.). Абавязкова кашу з ячных або пшанічных ці грэчневых крупаў (куццю). Уся сям'я садзілася за стол. Кожны павінен быў паспытаць усе стравы і асабліва куццю.

Багатую куццю святкавалі 13 студзеня, увечары перад Новым годам. Ставілі скаромныя стравы. На Палессі і Магілёўшчыне не менш за дванаццаць, а таксама кашу (куццю), прыгатаваную на сале або масле. Калі ўсе сядзелі за сталом, гаспадар адчыняў акно і клікаў мароз куццю есці, часам за акно кідалі лыжку кашы, у іншых месцах ставілі талерачку з лыжкай куцці на падаконне.

Галоднай куццёй (перад Вадохрышчам) завяршалі святкаванне Калядаў. З лыжкай куцці прасілі мароз не марозіць пасевы. Усе тры куцці мелі магічную функцыю: ушанаваць продкаў, заручыцца іх падтрымкай, уздзейнічаць на звышнатуральныя сілы, каб яны спрыялі ўрадлівасці нівы, прыплоду статку, здароўю сям'і, спору ў працы, прасілі або патрабавалі дароў.

РЭЦЭПТЫ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ КУХНІ ДЛЯ ЎРАЧЫСТАГА КАЛЯДНАГА СТАЛА

Куцця. Ячныя крупы прасеяць, прамыць у вадзе, усыпаць у гаршчок з падсоленым кіпнем і паставіць варыць да загушчэння, час ад часу перамешваючы драўлянай лыжкай. Потым паставіць у духоўку для даправання. Куццю ў гарачым выглядзе затлусціць тлушчам (свіным, барановым, ялавічным) або маслам і перамяшаць драўлянай лыжкай.

3,5 – 4,5 шклянкі крупаў, 8-9 шклянак вады, 50 – 60 г тлушчу, соль.

Сыта. Астуджаны кіпень наліць у глыбокую місу, пакласці крыху мёду або цукру, старанна перамяшаць з вадой.

2-3 шклянкі вады, 70 – 100 г мёду або 100 г цукру.

Хлебны квас. Жытні хлеб нарэзаць на лустачкі, высушыць, крыху падсмажыць на слабым агні. У невялікую драўляную бочку ўліць гарачую ваду, дадаць сухары, прарошчаны буйнамолаты ячмень, мёд, усё перамяшаць і паставіць на 2-3 дні для закваскі ў цёмнае халаднаватае месца. Перыядычна здымаць пену. Квас вытрымаць на холадзе 5-6 дзён, тады працадзіць.

200 г жытніх сухароў, 20 г ячменю, 50 г мёду, 5 л вады.

Аўсяны кісель. Развесці ў глыбокай пасудзіне з падсоленай вадой аўсяную муку або геркулес, паставіць у цёплае месца для закісання. Закіслую масу працадзіць праз сіта ў каструлю і варыць на невялікім агні, перамешваючы. Пры падачы на стол у кісель дадаць сіроп, прыгатаваны з ягад.

1 шклянка аўсянай мукі, 40 – 60 г ягаднага сіропу, соль.

Студзень. Свіныя ногі, вушы, хвасты апаліць на агні, пачысціць, памыць, разрэзаць на часткі і вымачыць 3 гадзіны ў халоднай вадзе, потым перакласці ў каструлю, заліць вадой і варыць на невялікім агні 4-5 гадзін. За 15 хвілін да гатоўнасці дадаць цыбулю, нарэзаную колцамі моркву, пятрушку, лаўровы ліст, перац, соль.

Звараныя прадукты дастаць з булёну, мяса аддзяліць ад касцей, дробна нарэзаць, раскласці ў талеркі, дадаць дробна нарэзаны часнок і заліць працэджаным гарачым булёнам. Талеркі паставіць у халоднае месца для застывання.

Падаваць з чорным хлебам, аржанымі блінамі, звараной у "мундзірах" ахалоджанай і абабранай бульбай.

1 кг свіных ног, вушэй, хвастоў, 1 цыбуліна, 1 морква, пятрушка, лаўровы ліст, 4 зубкі часнаку, перац, соль.

Вантрабянка. Разрэзаць на часткі свіныя лёгкае, сэрца, губы, дадаць абразнога мяса, варыць на слабым агні да няпоўнай гатоўнасці. Абварыць пячонку, парэзаць на невялікія кавалачкі. Нарэзаць на кубікі свежае сала са скуркай, усё пакласці ў вялікую эмаліраваную міску, дадаць спецыі (молаты перац, кмен, дробна парэзаны часнок, соль), усё старанна перамяшаць, пакласці ў добра вычышчаны свіны страўнік – абалонку для вантрабянкі. Напоўнены страўнік зашыць льнянымі ніткамі, зварыць на невялікім агні, потым пакласці на драўляную дошку, зверху накрыць другой драўлянай дошкай з каменем, паставіць на 26 – 28 гадзін у цёмнае халоднае месца. Гатовую вантрабянку нарэзаць на прадаўгаватыя кавалкі. Падаваць з чорным хлебам, аржанымі блінамі, ахалоджанай звараной у "мундзірах" і абабранай бульбай.

250 – 380 г пячонкі, 240 – 260 г сэрца, 280 – 300 г губ, 240 – 250 г абразнога мяса, 3-4 гарошыны перцу, 6-8 г кмену, 3-4 зубкі часнаку, соль.

КАЛЯДНАЯ ВАРАЖБА

На Каляды варажылі. Часцей за ўсё – пра будучы шлюб.

"Перад самай вячэрай бацькі, выправіўшы хоць дзеля чаго сваю дачку з хаты, пад міскі са стравай,

што стаяць на стале, падкладаюць: пярсцёнак пад адну, шчотку пад другую, а пад трэцюю – грабянец. І вось калі дзеўка сядзе вячэраць і выйме з-пад міскі пярсцёнак – гэта пэўны знак, што выйдзе за кавалера, калі шчотку – удавец прапануе ёй руку, грабянец жа прадказвае, што да самай смерці суджана ёй руту сеяць. Трэба тут дадаць яшчэ, што гэта варажба раз толькі робіцца, менавіта калі дзеўка пачынае семнаццаты год жыцця" (Federowski M. Lud białoruski na Rusi Litewskiej. Kraków, 1897, t. 1. C. 315).



Ірына Валер'еўна Казакова *– фальклярыст. Доктар філалагічных навук (2000). Закончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1989), аспірантуру Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі. Прафесар кафедры беларускай літаратуры і культуры філфака БДУ, загадчык кабінета-музея беларускай народнай культуры. Аўтар манаграфій "Этнічныя традыцыі ў духоўнай культуры беларусаў" (1995), "Міфалагемы і магія ў беларускім абрадавым фальклоры" (1997), "Сімволіка і семантыка славянскіх міфалагем (на матэрыялах беларускага фальклору)" (1999), дапаможніка "Беларускі фальклор: Курс лекцый" (2003).*

«У нас перад Новым годам дзеўцы можна даведацца, за каго замуж пойдзе. Трэба ўзяць шклянку вады, вакол яе запаліць 12 белых свечак (калі дзеўка зусім маладая, гадоў 17, тады хопіць 7 свечак) і за хвіліну да поўначы трэба апусціць у ваду новы пярсцёнак (без каменя і не са срэбра) і сказаць: "Дазволю знаць, з кім век векаваць". У пярсцёнку дзеўка ўбачыць твар свайго суджанага. За 1-2 секунды да 24.00 трэба адвесці вочы ўбок. Пасля 24.00 задуць свечкі, ваду выліць за вакно. У час рытуалу дзеўка павінна быць у пакоі адна» (зап. І. Казакова ад А. І. Касьянавай, 1918 г. н., у в. Канаўка Хоцімскага р-на).

РЭЦЭПТЫ НАРОДНАЙ МЕДЫЦЫНЫ

Зіма – пара не толькі святкаванняў, але і халадоў, і прастуд. Выратавацца ад хвароб або хутка вылечыцца дапамогуць народныя рэцэпты.

Адным з самых галоўных сродкаў народнай медыцыны з'яўляецца **мёд**. Бортніцтва на Беларусі мае вельмі старажытныя карані. Мёд лечыць ад вялікай колькасці хвароб. Але самае галоўнае, што натуральны мёд – прыродны ***імунастымулятар***.

Маленькая лыжачка мёду раніцай нашча і яшчэ адна, разведзеная ў шклянцы цёплай (майце на ўвазе: у гарачай вадзе мёд траціць карысныя ўласцівасці!) вады ці малака, на ноч перад сном... і ніякія БАДы (біялагічна актыўныя дабаўкі) вам не спатрэбяцца.

Мёд з сокам рэдзькі (1 чайная лыжка 3 разы на дзень) вылечвае ***зацяжны кашаль***.

Пры ***вушных захворваннях (атыт)*** можна закапваць у вушы (па 1-2 кроплі) неразбаўлены **сок хрэну**. **Нацёрты хрэн** выкарыстоўваецца і ў якасці гарчычнікаў.

Пры ***насмарку*** трэба **нацёртую цыбулю** (у марлі) прыкладаць на 10 – 15 хвілін да ноздраў.

Кашаль, коклюш, бранхіт вылечваюцца наступным чынам: 0,5 *кг* дробна парэзанай **цыбулі**, 50 *г* **мёду**, 400 *г* **цукру** трэба варыць у 1 *л* вады 3 гадзіны. Ужываць па 1 ст. лыжцы 4 – 6 разоў на дзень.

Пры ***прастудных захворваннях*** рэкамендуецца яшчэ піць **адвар ягад шыпшыны** замест гарбаты.

Ад высокага ціску. Пры высокім крывяным ціску трэба падкласці пад патыліцу асінавы пацурбалак (невялікі кавалак дрэва), праз 20 хвілін ціск пачне зніжацца (асіна павінна быць не сухая, а сырая). Дрэва, ад якога будзе адпілаваны кавалак, павінна быць здаровым і расці ў сярэдзіне лесу.

Ад прышчэй і вугроў. Каб пазбавіцца прышчэй і вугроў, трэба піць 3-4 тыдні нашча з раніцы за 30 хвілін да яды па 150 *г* настою з горкіх раслін (палын, крушына, кара дубу, піжма). Настой: змяшаць па вялікай лыжцы ўсіх раслін, потым адну малую лыжку гэтай сумесі заліць 0,5 *л* кіпню (вару), закрыць, загарнуць у анучку і пакінуць на ноч. Настой нічым не запіваць і не заядаць.

Ад дрэннага настрою (ад дэпрэсіі). Нашы продкі верылі, што калі прыкладна 1 гадзіну спяваць песні (на ўвесь голас), то ўсе дрэнныя думкі і дрэнны настрой абавязкова пройдуць. Спяваць лепш на прыродзе (у лесе, у полі).

Замест віягры! Калі (мужчына) хлопец будзе пастаянна ўжываць у ежу свежую пятрушку, сельдэрэй, зялёную цыбулю, то нават у пачэсным узросце ён не будзе мець ніякіх праблем. Не менш за 300 *г* пятрушкі на дзень – і вам ніколі не спатрэбіцца віягра!

Для свежага выгляду. Пазбегнуць ранніх маршчын, ацёкаў на твары, пазбавіцца стомленага выгляду дапаможа кантрастнае ўмываннe: спачатку халоднай, потым гарачай і зноў халоднай вадой – і так 3-4 разы. Потым трэба намачыць гарачай вадой ручнік, пакласці на 1-2 хвіліны на твар, прыціснуць рукамі, пасля зноў апаласнуць твар вельмі халоднай вадой.

Вада мае памяць і вельмі рэагуе на нашы эмоцыі. Калі п'яце ваду альбо ўмываецеся, прасіце ў вады здароўя і добрага выгляду, не забывайцеся падзякаваць ёй.

Будзьце заўсёды здаровыя!

Разам з краінай

Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ

МОЎНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ЖЫЦЦЯ СУЧАСНАГА БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСТВА

ДАКЛАД НА ГУМАНІТАРНАЙ СЕКЦЫІ ПЕРШАГА З'ЕЗДА ВУЧОНЫХ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

1. РОЛЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСАЎ І СТАНАЎЛЕННІ ІХ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

Любая натуральная мова як сродак зносін адыгрывае выключна важную ролю ў жыцці грамадства, камунікатыўныя патрэбы якога яна абслугоўвае. Не з'яўляецца выключэннем у гэтых адносінах і беларуская мова – нацыянальная мова беларускага народа, дзяржаўная мова нашай краіны.

Беларуская мова прайшла дастаткова працяглы і складаны шлях развіцця і заняла належнае месца сярод славянскіх народаў і на лінгвістычнай карце Еўропы. Сёння – гэта высокаразвітая літаратурная мова з багатым слоўнікавым складам і распрацаванай сістэмай норм, якая можа паспяхова абслугоўваць усе камунікатыўныя патрэбы сучаснага грамадства. Яна па-ранейшаму застаецца важнейшым элементам беларускай культуры, сімвалам нацыянальнай свядомасці, фактарам нацыянальнай адметнасці і ідэнтыфікацыі.

На працягу ўсяго свайго існавання беларуская мова адыграла выключную ролю ў гісторыі беларускага народа, у станаўленні яго дзяржаўнасці. Вядома, што ў Вялікім княстве Літоўскім беларуская мова таго часу (старабеларуская) выконвала ўсе функцыі дзяржаўнай мовы, выкарыстоўвалася ва ўсіх сферах жыцця тагачаснага грамадства (ад побытавай да дзяржаўнага справаводства).

Беларуская народна-гутарковая мова дазволіла беларусам захаваць і развіць сваю нацыянальную адметнасць і ў тыя неспрыяльныя часы, калі пісьмовая разнавіднасць беларускай мовы аказалася пад забаронай і на некалькі стагоддзяў былі прыпынены традыцыі беларускага пісьменства.

Выключна важную ролю адыграла беларуская мова ў станаўленні беларускай дзяржаўнасці ў пачатку XX ст. Сапраўды, нацыянальнае адраджэнне беларусаў у XIX ст. пачалося менавіта са стварэння новай літаратурна-пісьмовай мовы. Дзякуючы літаратурнай творчасці многіх выдатных дзеячоў беларускай культуры, сярод якіх выключнае месца займаюць постаці Максіма Багдановіча, Янкі Купалы і Якуба Коласа, беларускае пісьмовае слова шырока распаўсюдзілася па ўсёй тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю Расійскай імперыі, а сама беларуская мова набыла ўсе прыкметы літаратурнай мовы. Гэта было выключна важна. Таму што ў дадзеным выпадку спрацавала формула: ёсць самастойная літаратурная мова – ёсць народ з уласнай адметнай культурай і мовай, які мае права на сваю дзяржаўнасць. Несумненна, гэтая акалічнасць, магчыма, у першую чаргу стала асноўным аргументам на карысць стварэння БССР у 1918 г. Збыліся, такім чынам, прарочыя словы Янкі Купалы, які ў свой час напісаў: "І беларусу хопіць месца ў сям'і нялічанай славян".

Усім развіццём на працягу XX ст. беларуская мова даказала сваю жыццёвасць і неабходнасць. Нягледзячы на многія складанасці і праблемы, асаблівасці моўнай сітуацыі, яна заўсёды была бадай што асноўным фактарам падтрымання нацыянальнай культуры і нацыянальнай свядомасці народа.

Трэба адзначыць, што, нягледзячы на ўсе існуючыя праблемы і складанасці, беларуская мова і сёння займае ў сучасным грамадстве выключна важнае месца. Як і любая іншая натуральная мова, яна аб'ектыўна выконвае ў грамадстве тры асноўныя глабальныя функцыі: камунікатыўную (сродку зносін, якая аб'ядноўвае цэлы шэраг канкрэтных функцый), культурную (з'яўляецца часткай і сродкам нацыянальнай духоўнай культуры), ідэнтыфікацыйную (сродку нацыянальнай ідэнтыфікацыі і самаідэнтыфікацыі).

Беларуская мова сёння з'яўляецца рэальным сродкам зносін для значнай часткі беларускага грамадства. Аднак у сучаснай моўнай сітуацыі камунікатыўную функцыю яна рэалізуе не ў поўнай меры, паколькі істотная частка сучаснага беларускага соцыуму ў сваёй паўсядзённай дзейнасці карыстаецца пераважна рускай мовай.

Беларуская мова адыгрывае выключна важную ролю ў прэзентацыі культурнай прасторы беларусаў, у першую чаргу яе нацыянальна маркіраванай часткі. Сёння на беларускай мове створаны і захоўваюцца велізарныя культурныя каштоўнасці (помнікі старабеларускай пісьменнасці, творы сучаснай беларускай літаратуры, беларускі фальклор), якія атрымалі прызнанне ва ўсім свеце і складаюць значную частку сусветнай духоўнай культуры. І пазнаёміцца з гэтымі каштоўнасцямі можна толькі праз беларускую мову. А гэта азначае, што пры любых умовах беларуская мова ніколі не знікне бясследна, што яна будзе жыць, пакуль будзе існаваць цывілізацыя.

У сённяшняй моўнай сітуацыі ўзрастае роля беларускай мовы як фактара нацыянальнай свядомасці,

сімвала і сродку нацыянальнай ідэнтыфікацыі і самаідэнтыфікацыі. Менавіта гэтая роля беларускай мовы набывае ўсё больш самастойнае значэнне.

2. СУЧАСНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ Ў РАЗВІЦЦІ СІСТЭМЫ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

У XXI ст. беларуская мова ўвайшла з цэлым комплексам праблем, якія тычацца як асаблівасцей развіцця яе сістэмы, так і ролі і месца ў камунікатыўнай прасторы беларускага грамадства.

Парадокс развіцця і функцыянавання беларускай мовы ў XX ст. заключаецца ў наступным.

З аднаго боку, сістэма нацыянальнай беларускай мовы на працягу ўсяго мінулага стагоддзя паслядоўна і дынамічна развівалася, прайшла шлях ад пачатковага этапу фарміравання літаратурных норм да высокаразвітай літаратурнай мовы, здольнай паспяхова абслугоўваць усе камунікатыўныя патрэбы сучаснага грамадства. У гэты перыяд удасканальваюцца і шліфуюцца яе нормы, інтэнсіўна папаўняецца лексічны склад, фарміруюцца асноўныя функцыянальныя стылі, закладваецца аснова навуковай беларускай тэрміналогіі, ствараецца разнастайная па сваіх жанрах і змесце мастацкая літаратура. Ужо да другой паловы XX ст. стан развіцця беларускай літаратурнай мовы характарызуецца стройнай, разгалінаванай, упарадкаванай і дастаткова ўнармаванай сістэмай рознаўзроўневых сродкаў, што дазваляла ёй паспяхова абслугоўваць усе сферы грамадскай дзейнасці, у якіх беларуская мова выкарыстоўвалася або павінна была выкарыстоўвацца як мова тытульнай нацыі і родная мова большасці насельніцтва краіны.

З другога боку, развіццё і ўдасканаленне сістэмы беларускай літаратурнай мовы суправаджаецца паступовым выцясненнем яе з найбольш значных і ўплывовых сфер зносін. Фактычна ў сённяшніх умовах беларуская мова – мова тытульнай нацыі і першая дзяржаўная мова Рэспублікі Беларусь займае другараднае становішча ў моўнай сітуацыі. Яе роля зведзена да мінімуму ў такіх грамадскіх сферах, як дзяржаўнае кіраванне, справаводства, вышэйшая адукацыя, навука. А менавіта гэтыя сферы выкарыстання мовы ў сённяшнім грамадстве вызначаюць яе прэстыж і мажарытарнасць, а таксама фарміруюць прагматычныя фактары яе вывучэння. Істотна скарацілася і колькасць актыўных карыстальнікаў беларускай мовы. Адзначаная акалічнасць самым непасрэдным чынам уплывае і на развіццё самой сістэмы беларускай мовы, што адбіваецца, у першую чаргу, на развіцці асобных функцыянальных стыляў (афіцыйна-дзелавога, навуковага), фарміраванні асобных тэрмінасістэм.

Развіццё сістэмы беларускай літаратурнай мовы ў канцы XX – пачатку XXI ст. вызначаюць рознанакіраваныя працэсы і тэндэнцыі. З аднаго боку, **тэндэнцыя да інтэрнацыяналізацыі і працэсы збліжэння з суседнімі блізкароднаснымі мовамі**, з другога, **тэндэнцыя да нацыяналізацыі і працэсы адштурхоўвання.**

Тэндэнцыя да інтэрнацыяналізацыі ў асноўным звязана з інтэнсіўным пранікненнем у слоўнікавы склад беларускай мовы іншамоўных запазычанняў, галоўным чынам англа-амерыканізмаў, што звязана ў першую чаргу з развіццём новых тэхналогій, галін навукі, істотнымі зменамі ў грамадскім ладзе і палітычным жыцці краіны, а таксама ўзмацненнем ролі англійскай мовы ў міжнароднай камунікацыі. Спецыфіка беларускай мовы заключаецца ў тым, што інтэрнацыяналізацыя яе слоўнікавага складу і актыўнае пранікненне англіцызмаў адбываецца праз пасрэдніцтва рускай мовы і тым самым стварае ўражанне, часта справядлівае, менавіта рускамоўнага ўплыву і збліжэння беларускай мовы з рускай.

Тэндэнцыя да нацыяналізацыі ў беларускай мове канца XX ст. абумоўлена пурыстычнымі падыходамі, якія вельмі выразна праявіліся ў апошняе дзесяцігоддзе мінулага стагоддзя і маюць дэрусіфікатарскі характар. Таму тэндэнцыя да нацыяналізацыі ў беларускай мове накіравана ў значнай ступені на рэвізію існуючых моўных сродкаў ці тых, якія былі пашыраны ў нядаўнім мінулым. Пры гэтым галоўным крытэрыем адбору суіснуючых адзінак з'яўляецца ступень іх падабенства ці адрознення ад адпаведных адзінак рускай мовы. Найбольш выразна гэтая тэндэнцыя праявілася ў беларускім пурыстычным руху і абумовіла вяртанне ва ўжытак вялікай колькасці лексічных адзінак, што знаходзіліся на перыферыі моўнай сістэмы, шэрагу запазычанняў, якія таксама адпавядаюць "патрабаванням" нацыянальна-моўнага пурызму, калі адрозніваюцца ад адпаведных рускіх намінатыўных адзінак. Апошняе звязана ў першую чаргу з так званай зменай моўных арыенціраў з усходу на захад і ўключэннем у моўную практыку значнай колькасці паланізмаў.

Трэба прызнаць, што абодва працэсы ў развіцці сістэмы любой натуральнай мовы з'яўляюцца абсалютна заканамернымі і аб'ектыўнымі, калі яны ўзаемадапаўняюць адзін аднаго і садзейнічаюць развіццю і ўзбагачэнню слоўнікавага складу мовы. Аднак спецыфіка сучаснага этапу развіцця сістэмы беларускай мовы якраз заключаецца ў тым, што названыя працэсы маюць рознанакіраваны, узаемавыключальны характар. Калі працэсы інтэрнацыяналізацыі ў цэлым накіраваны на папаўненне слоўнікавага складу мовы ў адпаведнасці з патрэбамі моўнай практыкі, то працэсы нацыяналізацыі звязаны галоўным чынам з рэвізіяй існуючых моўных сродкаў, іх нарматыўнай пераацэнкай.

Таму, прызнаючы абгрунтаванасць і правамернаць пэўных зрухаў у слоўнікавым складзе сучаснай беларускай літаратурнай мовы, тэндэнцыі да змянення некаторых нарматыўных ацэнак, неабходна вельмі асцярожна адносіцца да любых эксперыментаў над мовай, якія могуць мець непрадказальныя вынікі. У сённяшніх умовах як ніколі неабходны разумны кампраміс паміж прыхільнікамі розных поглядаў на напрамкі развіцця сістэмы беларускай мовы, на характар яе літаратурных норм.

3. АСАБЛІВАСЦІ ФУНКЦЫЯНАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў СУЧАСНЫМ ГРАМАДСТВЕ

У сітуацыі двухмоўя, у якой вымушана існаваць і развівацца беларуская мова, істотна ўскладняецца роля натуральнай мовы ў выкананні ёю сваіх асноўных функцый (камунікатыўнай, культурнай і ідэнтыфікацыйнай). Таму на працягу ўсяго мінулага стагоддзя моўныя праблемы заўсёды былі ў цэнтры



Аляксандр Аляксандравіч Лукашанец *– мовазнаўца. Доктар філалагічных навук, прафесар. Закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт (1977), аспірантуру Інстытута рускай мовы АН СССР (1981). Дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі. Аўтар больш як 200 навуковых прац, у тым ліку манаграфій "Словаўтварэнне і граматыка" (2001), "Общество – язык – политика" (1988, сааўтар) і іншых, слоўнікаў "Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы" (2000, сааўтар), "Школьны словаўтваральны слоўнік беларускай мовы" (2006, сааўтар). У апошні час актыўна займаецца праблемамі беларускага правапісу.*

ўвагі грамадства, набываючы час ад часу асаблівую вастрыню і актуальнасць. Абсалютна заканамерна, што і ў першыя гады існавання незалежнай Рэспублікі Беларусь у канцы XX ст. гэтыя праблемы таксама займалі дастаткова істотнае месца ў жыцці дзяржавы. У выніку пэўнай паслядоўнасці дзеянняў з боку грамадскасці (пры гэтым у залежнасці ад моўных арыентацый і схільнасцей дзеянні асобных груп беларускага грамадства часта насілі рэзка процілеглы характар) і дзяржаўных рашэнняў заканадаўчага характару мы прыйшлі да сітуацыі дзяржаўнага двухмоўя. Сёння дзяржаўнымі мовамі ў нашай краіне з'яўляюцца беларуская мова як мова тытульнай нацыі і руская мова як найбольш пашыраная ў камунікатыўных адносінах мова.

Гэта замацавана ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і Законе Рэспублікі Беларусь "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь". Так, артыкул 17 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь устанаўлівае, што "Дзяржаўнымі мовамі ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляюцца беларуская і руская мовы".

Больш дэталёва гэта канстытуцыйнае палажэнне раскрываецца ў Законе Рэспублікі Беларусь "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь" (Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 187-3 ад 13 ліпеня 1998 г.).

"**Артыкул 1. Мэты заканадаўства аб мовах у Рэспубліцы Беларусь.**

Заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб мовах мае на мэце ўрэгуляванне адносін у галіне развіцця і ўжывання беларускай, рускай і іншых моў, якімі карыстаецца насельніцтва рэспублікі ў дзяржаўным, сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці, ахову канстытуцыйных правоў грамадзян у гэтай сферы, выхавання паважлівых адносін да нацыянальнай годнасці чалавека, яго культуры і мовы, далейшае ўмацаванне дружбы і супрацоўніцтва народаў.

Артыкул 2. Дзяржаўныя мовы, іншыя мовы ў Рэспубліцы Беларусь.

У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь дзяржаўнымі мовамі Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца беларуская і руская мовы.

Рэспубліка Беларусь забяспечвае ўсебаковае развіццё і функцыянаванне беларускай і рускай моў ва ўсіх сферах грамадскага жыцця.

Рэспубліка Беларусь праяўляе дзяржаўны клопат аб свабодным развіцці і ўжыванні ўсіх нацыянальных моў, якімі карыстаецца насельніцтва рэспублікі.

Дзяржаўныя органы, органы мясцовага кіравання і самакіравання, прадпрыемствы, установы, арганізацыі, грамадскія аб'яднанні ствараюць грамадзянам Рэспублікі Беларусь неабходныя ўмовы для вывучэння беларускай і рускай моў і дасканалага валодання імі.

Закон не рэгламентуе ўжывання моў у неафіцыйных зносінах, у зносінах членаў працоўных калектываў паміж сабой".

Разам з тым заканадаўчы статус беларускай і рускай моў і іх рэальнае функцыянаванне ў сучасным беларускім соцыуме ставяць перад грамадствам і перад навукоўцамі шэраг праблемных пытанняў.

3.1. Што такое дзяржаўная мова і дзяржаўнае двухмоўе?

Праблема заключаецца ў тым, што пры ўсеагульным побытавым усведамленні, што такое "дзяржаўная мова", ні ў прававых актах, ні ў навуковай літаратуры практычна немагчыма знайсці адназначнага і вычарпальнага вытлумачэння гэтага паняцця. Таму, відаць, можна ў асноўным пагадзіцца з тым азначэннем гэтага паняцця, якое даецца ў энцыклапедыі "Беларуская мова" (Мінск, 1994): "Дзяржаўнасць мовы – гэта юрыдычна замацаваны і рэгламентаваны парадак яе выкарыстання ва ўсіх або ў пераважнай большасці разгалінаванняў афіцыйнай сферы грамадскіх зносін…

Дзяржаўны статус мовы грунтуецца на арганізацыйных, кадравых, матэрыяльна-тэхнічных, культурна-асветных і іншых дзяржаўных мерах, прадугледжвае сістэму прававой аховы мовы на тэрыторыі адпаведнага дзяржаўнага ўтварэння" (с. 181). У такім выпадку **дзяржаўнае двухмоўе** – гэта юрыдычна замацаваны і рэгламентаваны парадак раўнапраўнага выкарыстання дзвюх моў ва ўсіх або пераважнай большасці афіцыйных сфер грамадскіх зносін.

Пры такім вытлумачэнні паняцця "дзяржаўнае двухмоўе" беларуска-рускае дзяржаўнае двухмоўе, безумоўна, трэба прызнаць найбольш дэмакратычным урэгуляваннем жыцця беларускага грамадства ў моўнай сферы, паколькі абедзвюм мовам гарантаваны аднолькавыя правы.

І гэта зноў жа замацавана заканадаўча. Параўнаем артыкулы 50 і 59 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь:

"Артыкул 50. Кожны мае права захоўваць сваю нацыянальную прыналежнасць, аднолькава як ніхто не можа быць прымушаны да вызначэння і ўказання нацыянальнай прыналежнасці.

Знявага нацыянальнай прыналежнасці караецца ў адпаведнасці з законам.

Кожны мае права карыстацца роднай мовай, выбіраць мову зносін. Дзяржава гарантуе ў адпаведнасці з законам свабоду выбару мовы выхавання і навучання".

"Артыкул 59. Дзяржава абавязана прымаць усе даступныя ёй меры для стварэння ўнутранага і міжнароднага парадку, неабходнага для поўнага ажыццяўлення правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь, прадугледжаных Канстытуцыяй.

Дзяржаўныя органы, службовыя і іншыя асобы, якім даверана выкананне дзяржаўных функцый, абавязаны ў межах сваёй кампетэнцыі прымаць неаб-

ходныя меры для ажыццяўлення і абароны правоў і свабод асобы.

Гэтыя органы і асобы нясуць адказнасць за дзеянні, якія парушаюць правы і свабоды асобы".

3.2. У чым заключаецца цывілізаванае разуменне сутнасці дзяржаўнага двухмоўя?

Нарматыўныя палажэнні названых вышэй дакументаў дастаткова выразна акрэсліваюць моўныя правы грамадзян і абавязкі дзяржаўных органаў і службовых асоб у сферы моўнага жыцця. Аднак у сучасным беларускім грамадстве ў гэтых адносінах існуюць істотныя праблемы, якія патрабуюць дзяржаўнай увагі. На сённяшні дзень надзвычай важна сфарміраваць у грамадстве цывілізаванае разуменне сутнасці дзяржаўнага двухмоўя і прывіць грамадзянам уменне жыць у прававым полі. Цяпер пад дзяржаўным двухмоўем звычайна разумеецца права грамадзяніна карыстацца той ці іншай мовай ва ўсіх сферах сваёй дзейнасці. І гэта правільна. Аднак не заўсёды выразна ўсведамляецца другі бок праблемы, а іменна тое, што дзяржава праз свае ўстановы павінна рэальна забяспечыць гэтае права кожнаму грамадзяніну. З гэтага вынікае, што кожны дзяржаўны служачы ці работнік дзяржаўнай установы менавіта як прадстаўнік дзяржавы павінен абавязкова валодаць дзвюма дзяржаўнымі мовамі.

Гл. 3, 4 і 5 Закону Рэспублікі Беларусь "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь":

"**Артыкул 3. Права грамадзян карыстацца іх нацыянальнай мовай.**

Грамадзянам Рэспублікі Беларусь гарантуецца права карыстацца іх нацыянальнай мовай. Ім гарантуецца таксама права звяртацца ў дзяржаўныя органы, органы мясцовага кіравання і самакіравання, на прадпрыемствы, ва ўстановы, арганізацыі і грамадскія аб'яднанні на беларускай, рускай або іншай прымальнай мове.

Рашэнне па сутнасці звароту афармляецца на беларускай або рускай мове.

Артыкул 4. Абавязак кіраўнікоў, іншых работнікаў дзяржаўных органаў, органаў мясцовага кіравання і самакіравання, прадпрыемстваў, установ, арганізацый і грамадскіх аб'яднанняў валодаць беларускай і рускай мовамі.

Кіраўнікі, іншыя работнікі дзяржаўных органаў, органаў мясцовага кіравання і самакіравання, прадпрыемстваў, установ, арганізацый і грамадскіх аб'яднанняў павінны валодаць беларускай і рускай мовамі ў аб'ёме, неабходным для выканання імі сваіх службовых абавязкаў.

Артыкул 5. Гарантыі правоў грамадзян пры разглядзе падаваемых імі дакументаў у дзяржаўныя органы, органы мясцовага кіравання і самакіравання, на прадпрыемствы, ва ўстановы, арганізацыі і грамадскія аб'яднанні.

Дзяржаўныя органы, органы мясцовага кіравання і самакіравання, прадпрыемствы, установы, арганізацыі і грамадскія аб'яднанні павінны прымаць і разглядаць дакументы, якія падаюцца грамадзянамі на беларускай, рускай мовах.

Адмова службовай асобы прыняць і разгледзець зварот грамадзяніна на беларускай, рускай мовах са спасылкай на няведанне мовы звароту цягне за сабой адказнасць у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам".

Для ўсведамлення гэтага на наступным этапе развіцця нашай дзяржаўнасці павінна быць праведзена вялікая растлумачальная і практычная работа. Ад гэтага ў многім будзе залежаць далейшае гарманічнае развіццё нашага грамадства. Больш таго, калі кожны грамадзянін нашай краіны будзе выразна ўсведамляць, што для таго, каб прэтэндаваць на тую ці іншую дзяржаўную пасаду, яму неабходна рэальна валодаць дзвюма дзяржаўнымі мовамі, зусім па-іншаму будзе выглядаць запатрабаванасць беларускай мовы ў грамадстве і зусім па-іншаму будуць ставіцца да яе вывучэння ў школе.


3.3. Як можна забяспечыць гарманічныя адносіны ў моўнай сферы?

Вырашэнне гэтай праблемы бачыцца ў фарміраванні грамадскага ўсведамлення высокага прэстыжу рэальна двухмоўнай асобы, якая ў першую чаргу валодае мовай тытульнай нацыі і з'яўляецца найбольш падрыхтаванай для рэалізацыі сваіх магчымасцей і амбіцый у сучасным шматмоўным і шматкультурным свеце. Менавіта фарміраванне культуры моўных адосін і моўнай адукацыі, прававой граматнасці насельніцтва ў сферы моўных адносін (г. зн. веданне грамадзянамі сваіх канстытуцыйных правоў, жаданне і ўменне жыць у прававым полі і патрабаваць ад органаў дзяржаўнага кіравання і службовых асоб выканання сваіх канстытуцыйных абавязкаў у адносінах да кожнай канкрэтнай асобы), высокай адказнасці і карэктнасці дзяржаўных органаў і дзяржаўных служачых за выкананне моўнага заканадаўства, такім чынам, павінна стаць адным з прыярытэтаў дзяржаўнай ідэалогіі на наступным этапе развіцця і паглыблення беларускай дзяржаўнасці. Толькі ў такім выпадку Беларусь зможа захаваць сваё нацыянальнае аблічча і прэтэндаваць на дастойнае месца ў сусветнай супольнасці. Існуючае беларускае заканадаўства пры яго безумоўным выкананні дазваляе істотна пашырыць поле выкарыстання беларускай мовы, узровень яе прэстыжу і ўсведамленне рэальнай запатрабаванасці.

Яшчэ адзін аспект моўнага жыцця нашай краіны, які таксама патрабуе пільнай увагі з боку дзяржавы, – гэта неадпаведнасць заканадаўчага статусу беларускай і рускай моў і іх рэальнага становішча ў грамадстве. Не сакрэт, што сёння мова тытульнай нацыі – беларуская – займае другарадныя пазіцыі ў большасці камунікатыўных сфер. І гэтая праблема таксама набывае ідэалагічнае гучанне. Справа ў тым, што моўнае жыццё – гэта вельмі далікатная сфера чалавечых адносін, таму нацыянальнай большасці звычайна значна цяжэй адстойваць свае абсалютна справядлівыя нацыянальна-моўныя правы ў параўнанні з нацыянальнай меншасцю. Любыя моўныя прэтэнзіі нацыянальнай меншасці, нават празмерныя, на эмацыянальным узроўні ўспрымаюцца як справядлівая барацьба за сваю роўнасць. А патрабаванні нацыянальнай большасці, нават калі яны цалкам апраўданыя, часта ацэньваюцца як нацыяналізм у сваім негатыўным значэнні. Таму і ў гэтай сферы неабходна вялікая растлумачальная работа па фарміраванні культуры моўных паводзін, што прадугледжана адпаведнымі артыкуламі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і Законам Рэспублікі Беларусь "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь".

ВІНЦЭНТ ДУНІН-МАРЦІНКЕВІЧ

КРЫЖАВАНКА



Па гарызанталі.

1. … – не каляска, сеўшы не паедзеш. **4.** … гаспадар з-пад Вільні – адзін з псеўданімаў Кастуся Каліноўскага. **11.** Назва вершаванай аповесці Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. **12.** Сатырычная камедыя, напісаная ў 1870 г. **13.** Вядомы кампазітар, дырыжор і педагог, аўтар музыкі для пастаноўкі на сцэне шматлікіх твораў В. Дуніна-Марцінкевіча. **16.** Вядомы верш Янкі Купалы, напісаны ў Ляўках у 1935 г. **17.** Від устойлівай сацыяльнай групоўкі людзей, што ўзнікла гістарычна. **18.** Нацыянальная культурна-асветніцкая ўстанова, якую арганізаваў у сярэдзіне XIX ст. В. Дунін-Марцінкевіч. **21.** … Прыгаворка – псеўданім В. Дуніна-Марцінкевіча. **22.** Раённы цэнтр на паўднёвым захадзе Магілёўшчыны, дзе ў сярэдзіне XIX ст. адбылася пастаноўка камедыі "Сялянка" ("Ідылія"). **23.** … Сабковіч – імя галоўнага героя сатырычнай камедыі "Залёты". **24.** Беларускі … – ганаровае імя, якое атрымаў у народзе В. Дунін-Марцінкевіч. **25.** Сярэдняя навучальная ўстанова. **26.** Мінская … – месца зняволення, дзе па прысудзе суда царскай Расіі адбываў пакаранне В. Дунін-Марцінкевіч у 1864 – 1865 гг. **29.** У камедыі "Ідылія" Уршуля – … камісара маёнтка. **34.** Назва фальварка каля г. Івянца, дзе з 1840 г. жыў і працаваў В. Дунін-Марцінкевіч. **36.** Імя беларускай піяністкі, кампазітара, удзельніцы рэвалюцыйнага руху на Беларусі ў 1860-я гг., дачкі В. Дуніна-Марцінкевіча. **37.** "Пінская …" – вядомая камедыя В. Дуніна-Марцінкевіча, напісаная ў 1866 г. **38.** Маска-персанаж у калядных, мікольскіх, вясельных абрадах на Беларусі, у наш час выходзіць з ужытку. **39.** … з-над Пцічы – псеўданім пісьменніка, гісторыка, краязнаўцы А. Ельскага, які прысвяціў В. Дуніну-Марцінкевічу свой верш.

Па вертыкалі.

2. Імя вядомага паэта, публіцыста Міцкевіча, паэму якога "Пан Тадэвуш" В. Дунін-Марцінкевіч пераклаў на беларускую мову. **3.** Магазін, лаўка. **5.** Прамысловая рыба сямейства карпавых. **6.** Традыцыйны танец, пад іншымі назвамі ("Кружкі", "Круток" і інш.) пашыраны па ўсёй Беларусі. **7.** Бабруйская павятовая … – навучальная ўстанова, у якой вучыўся В. Дунін-Марцінкевіч. **8.** Імя беларускага тэатральнага дзеяча, акцёра, рэжысёра Буйніцкага, дзейнасць якога знаходзілася пад вялікім уплывам В. Дуніна-Марцінкевіча. **9.** Беларускі паэт Язэп …, аўтар зборнікаў "Дні вясны", "Песні на руінах" і іншых, нараджэнец Мінскага раёна. **10.** У Старажытнай Грэцыі і Рыме настаўнік красамоўства. **14.** Вершаванае апавяданне В. Дуніна-Марцінкевіча, напісанае ў 1855 г. **15.** Масавае ўзброенае выступленне на Беларусі ў 60-я гг. XIX ст., якое падтрымаў В. Дунін-Марцінкевіч. **19.** Зусім невялікая колькасць чаго-небудзь. **20.** З дурнога куста і ... пуста (прыказка). **25.** Тое, што вылеплена. **27.** Мера аптэкарскай вагі, роўная 29,86 *г.* **28.** Горад у Беларусі, дзе ўпершыню ў 1852 г. ажыццёўлена пастаноўка драматычнага твора "Сялянка" ("Ідылія"). **30.** Той, хто піша кнігі, стварае музыку і інш. **31.** Людзі, нанятыя для апладзіравання артыстам або іх асвістання. **32.** Фігурка ў гульні, што адбываецца на дошцы ў клетачкі. **33.** Ручная прылада для падняцця і пераносу снапоў, сена, саломы і інш. **35.** "Благаславёная …" – апавяданне, напісанае В. Дуніным-Марцінкевічам на польскай мове.

Адказы.

Па гарызанталі. 1. Ласка. **4.** Яська. **11.** "Купала". **12.** "Залёты". **13.** Манюшка. **16.** "Лясэ". **17.** Этнас. **18.** Тэатр. **21.** Навум. **22.** Пухс. **23.** Антон. **24.** Дуляр. **25.** Ліцэй. **26.** Турма. **29.** Жонка. **34.** Лошыніка. **36.** Канстанцыя. **37.** Шляхта. **38.** "Цыган". **39.** Бацян.

Па вертыкалі. 2. Адам. **3.** Крама. **5.** Сазан. **6.** "Коло". **7.** Школа. **8.** Гнат. **9.** Глушэц. **10.** Рытар. **14.** "Вечарніцы". **15.** Паўстанне. **19.** Жменя. **20.** Ягада. **25.** Лепка. **27.** Унцыя. **28.** Мінск. **30.** Аўтар. **31.** Клака. **32.** Шашка. **33.** Віла. **35.** Сам'я.

Склаў **Лявон ЦЕЛЕШ.**

Установа «Рэдакцыя часопіса "Роднае слова"». Заснавальнік – Міністэрства адукацыі. Рэгістрацыйны нумар часопіса 346.
220035, г. Мінск, пр. Пераможцаў, 47, кор. 1, пад'езд 2 (уваход з вул. Гвардзейскай, код на ўваходзе: 43 + званок).
Р/р № 3015702170012 у Сталічным аддз. ААТ "Белінвестбанк" г. Мінска, код 739, УНН 190241571, ОКПО 37551965.

Тэлефоны: галоўнага рэдактара **(017) 203-35-17**, намесніка галоўнага рэдактара і рэдактараў **(017) 203-34-79**, адказнага сакратара **(017) 203-07-40**, галоўнага бухгалтара і справавода **(017) 203-24-69**. Факс **(017) 203-24-69**.
E-mail: **rodnaje_slova@tut.by**

Падп. да друку 03.01.2008. Фармат 60x84 1/8. Папера афсетная. Гарнітура «Minion Pro». Афсетны друк. Ум.-друк. арк. 13,02. Ум.-фарб. адбіт. 14,07. Ул.-выд. арк. 14,7. Тыраж 3677 экз. Зак. 3409.
Надрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва "Беларускі Дом друку"». 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

® Роднае слова, 2008